Уладзіслаў
Рубанаў

# Дзяўчына з начной кавярні



Уладзіслаў
Рубанаў

# ДЗЯЎЧЫНА З НАЧНОЙ КАВЯРНІ

Аповесці, апавяданні

МІНСК
«ЮНАЦТВА»
1994

ББК 84(4 Беи)6
Р82
УДК 882.6-93

*Для старэйшага школьнага ўзросту*

Мастак А. В. Дзмітрыеў

Р $\frac{8820600000—058}{М 307(03)—94}$ 56—94

ISBN 5-7880-0882-4

© У. Я. Рубанаў, 1994
© Малюнкі. А. В. Дзмітрыеў, 1994



# Аповесці

# Распусная,
# або Дзяўчына з начной кавярні

*Думал о любви.*

З дзённіка І. А. БУНІНА

I

У прыроду, як і ў чалавечую душу, убіўся вэрхал.

Снег выпаў не ў снежні, а толькі ў студзені. Белы, чысты, пахкі, ляжаў на тратуары тонкім, але шчыльным пластом, як файны дыван. Мяткевіч ішоў па ім і думаў, што ў дзяцінстве ягоным было суладнасці болей і ў прыродзе, і ў ім самім. Цяпер ён не ведаў, што тварылася ў грамадзе, у імя чаго яна жыла і працавала. Дзіўна! А вось той натоўп на прыпынку гэтак жа думае?

Зайшоўшы ў аўтобус, ён зусім міжволі слізгануў позіркам па твары дзяўчыны, што стаяла каля сярэдніх дзвярэй. Штосьці ў ягонай душы няпэўна варухнулася.

Аўтобус каля Траецкага прадмесця павярнуў направа; калі параўняўся з бальніцаю, Мяткевіч паціснуўся да выхада, каб перасесці на тралейбус. І тут ён зноў, ужо зблізку, убачыў дзявочы твар і, здаецца, здагадаўся, чаму яго перасмыкнула. На прыгожым, выразлівым твары мутнымі плямамі блішчэлі вочы — яны былі як бы зачараваныя, бясцямныя. Аўтобус пачаў тармазіць, і дзяўчына раптам адкінулася спінаю на дзверы і пачала асядаць. Яна была ў рудой дублёнцы і пушыстай лісінай шапцы, на плячы сумка. Рука ейная вяла трымалася за выгнуты поручань, падмаляваныя перламутравай памадаю вусны ціха прашапталі: «Дапамажыце мне...»

На гэтую просьбу-выдых Мяткевіч не мог не адгукнуцца. Усё-такі ён быў родам з той пары, калі яшчэ не цураліся міласэрнасці. Мяткевіч абхапіў дзяўчыну за стан і разам з ёю саступіў на асфальт. Пры сцяне бальніцы стаяла шырокая лава, і Мяткевіч пасадзіў на яе дзяўчыну.

— Што, ёй блага? — спытаў мужчынскі голас.

— Мусібыць, напілася,— пачуўся жаночы, незадаволены.

Мяткевіч баяўся, што людзі падумаюць, быццам ён вінаваты ці, прынамсі, да гэтае дзяўчыны мае дачыненне. Дзяўчына была зусім белая ў твары, павекі апускаліся на закочаныя пад лоб вочы.

Ён жахнуўся, што яна памрэ, і сказаў у нікуды, да людзей на прыпынку: «Паклічце доктара, вунь бальніца...» Хапіў жменю снегу і прыціснуў да дзявочага лоба. І лоб, і снег былі аднакава белыя і халодныя. На ягоную просьбу, здаецца, ніхто не адгукнуўся. Падышоў тралейбус, і людзі на прыпынку памяняліся. Цяпер гэтым, новым, не было да іх ніякае справы. Калі б дзяўчына магла сядзець без ягонай падтрымкі, ён зганяў бы па доктара. Адной рукою ён трымаў снег, другою падкатурхваў дзяўчыну. Нарэшце яна адплюшчыла вочы.

— Што з табою? — спытаў ён.

— Я накурылася... У «Юбілейцы»...

— Гм...— Мяткевіч разгубіўся. Не ведаў, што казаць.— Даўно?

— З гадзіну назад...

— Курыш даўно?

— Не памятаю...

— Як цябе завуць?

— Аксана.

— Цудоўнае імя. Дзе ты жывеш, Аксана?

— На Пуліхава...

Мяткевіч зразумеў, што ў дзяўчыны нехта з бацькоў вялікі начальнік. Можа, нават з ЦК. Ці варта звязвацца?

— Мала не даехала,— сказаў ён лагодным голасам.

— Вы прабачце... Мне ўжо лепей.

Цяпер ён глядзеў на дзяўчыну з цікаўнасцю. Прыемны белы твар з шырокімі чорнымі бровамі, з-пад лісінай шапкі выпіраюць цяжкія валікі густых русых валасоў.

«Яна падобна на італьянскую спявачку Раміну Паўэр, якая выступае ў пары з мужам»,— падумаў ён. Гушчыня ейных валасоў патаемна ўсхвалявала яго, але ён адагнаў гэтае недарэчнае пачуццё. Ён усё жыццё не даводзіў да канца знаёмствы з жанчынамі. Гэта быў ягоны недахоп. А можа, паводле нормаў прыстойнасці, гэта якраз добра. Па якіх нормах ён жыве — адзін бог ведае.

Наўмыснасці ў гэтым знаёмстве не было, было спачуванне. Спачуваць ён умеў, праўдзівей, не ўмеў быць жорсткім. Мабыць, зноў-такі гэта недахоп у нашым нячулым свеце. Часам Мяткевічу здавалася, што ён увесь з адных недахопаў.

— Вы можаце ісці, дзякуй...— сказала Аксана слабым голасам.

— А ты як?

— Я паеду...

— Можа, табе лепей пабыць на свежым паветры? Давай я правяду цябе да цырка, а там сядзеш на «пяцьдзесят сёмы» ці «семдзесят сёмы» і паедзеш.

Яна паднялася, узяла пад паху сумку. Мяткевіч баяўся, каб яна не пакаўзнулася і не ўпала. Не браў яе пад локаць, але ў кожную секунду гатовы быў падхапіць. Думаў, пра што весці гаворку. Дзеля цікаўнасці лезці ў душу дзяўчыне — нахабства, што ні кажы.

Як з разбітай чарніліцы выцякае чарніла, так са зраненай душы без прынукі выцякае балесная споведзь.

— А вы...— Аксана глядзела сабе пад ногі,— тут, у Мінску, так?

— Я тут працую. Калісь вучыўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце.

— Вы ўвесь час па-беларуску размаўляеце?

— Так.

— Вы артыст?

— Не. Я малюю.

Яна не стала далей распытваць, мабыць, баючыся ашукацца, а можа, у яе хапіла душэўнага такту не ставіць яго ў няёмкае становішча.

Каштаны з шырокімі і круглымі кронамі стаялі аснежаныя, як гіганцкія белыя шары. Вакол іх імгліліся, злятаючы, пылінкі інею, быццам мікраскапічныя зоркі вакол зямлі. На надкабінную стрэшку вялізнага жоўтага БелАЗа, што стаяў на пляцы ВДНГ, насыпала цэлую гурбу снегу. Праваруч сінімі доўгімі, закругленымі, бы маладзік, языкамі расцякалася па лёдзе вада ў Свіслачы.

Мяткевіч на імгненне забыўся пра сваю спадарожніцу, залюбаваўся наваколлем, размаляваным рукою маладога студзеня.

Аксана па-ранейшаму глядзела пад ногі, мабыць, баялася пакаўзнуцца. Відаць было, што ногі, абутыя ў вузенькія мыльнага колеру боты на тонкіх абцасіках,

слаба трымалі яе. Мяткевіч рады быў, што пайшоў яе праводзіць. Аксана была крыху ніжэйшая за яго, вузкаплечая, з тонкім станам, туга абцятым поясам дублёнкі. Яму было прыемна ісці з такою пекнаю дзяўчынаю, але адчуваў сябе няёмка. І покуль вырушылі на праспект, ён ужо засумняваўся, ці варта дзяўчыну праводзіць. Няпэўнасць, што стаяла за ягонымі стараннямі, мучыла яго. Высакароднасць добрая імгненнем, безразважнасцю, думаў ён, іначай — рацыяналізм.

На прыпынку насупроць цырка яны запыніліся.

— Вось і датупалі,— сказаў ён. Заўсёды лічыў, што першае слова ў размове дваіх за мужчынам. У галаве ў Аксаны, мусіць, праяснілася ўжо. Ён зразумеў гэта па ейных вачах, спаймаўшы на сабе іх спакойны і, здавалася яму, прыдзірлівы позірк. У яе былі вялікія вочы, якія за сваёй мутнаватасцю трымалі ў глыбіні пасавінаму шырока адкрытых зрэнак нязмерную тугу.

— Я вам удзячная. Я не спадзявалася...— Аксана раскрыла сумку, пакорпалася ў ёй і выняла тоненькую жоўценькую, бы макароніна, ручку з электронным гадзіннікам, адарвала з кніжачкі талон і, вылузнуўшы з-пад крыса дублёнкі точанае ружаватае калена, напісала яму лічбы тэлефона. Ён узяў талон — такі ж ружаваты, як і калготкі, што вабна і мякка высвецілі Аксаніна калена.

Талон з нумарам тэлефона стаўся нечаканасцю і даваў Мяткевічу волю фантазіраваць. Ён умеў на пустым месцы ўяўляць неверагоднасці, часам насуперак жаданням. Але тут, ідучы да станцыі метро «Плошча Перамогі», ён свядома маляваў разнастайныя сцэны жыцця.

## II

Аксана ведала, што гэта павінна было здарыцца, але ўвесь час адганяла думку. У яе часта кружылася галава. Ногі былі вялыя. Зашпільвала ці расшпільвала боты яна заўсёды з высілкам.

З «Юбілейкі», дзе правяла ноч з італьянцам, яна выйшла сама не свая. Віно, ложак, марыхуана адурманілі, атупілі яе.

Яна доўга не садзілася ў аўтобус, бо ведала, што пачне ванітаваць. Хадзіла ад прыпынку да прыпынку,

хапала, як рыба, адкрытым ротам халоднае смярдзючае паветра. Сэрца нездарова торгалася ў грудзях. Яна дастала пудраніцу, якую яшчэ ўчора ў рэстаране апусціў у сумку італьянец, раскрыла і глянула ў люстэрка. Пазнала толькі свае бровы, астатняе было чужое, змарнелае, знявечанае апухласцю.

Мінула каля гадзіны, покуль яна адважылася сесці ў аўтобус. Аўтобус крануўся — і галава быццам адарвалася, палящела па арбіце, высока ўгару, а тады ўніз, як бы пад зямлю... Ейны мозг шукаў іншапланецян, ці што?

...Яна ачнулася, калі ішла побач з маладым чалавекам у кірунку праспекта. Ёй было сорамна, яна не магла вольна размаўляць. Ён пытаўся, яна неахвотна адказвала. Ёй абрыдлі мужчыны і абрыдла гэтае жыццё, у якім пануюць хлусня і двурушніцтва.

Аксана помніць, што на развітанне дала мужчыну нумар свайго тэлефона. Навошта? Хоць і дзякавала, але няшчыра, па звычцы. Яна была ўпэўнена, што мужчына не патэлефануе. Ён проста дапамог ёй. За такою ён не пагоніцца. Ён, відаць, прыстойны, і ў яго, напэўна, ёсць сям'я. А яна? Яна дакацілася да мяжы, за якою небыццё.

Аксана стаяла каля Свіслачы; адсюль быў відаць яе дом. Яна чакала, покуль хоць крыху палюднее твар, набудзе жывыя рысы. Раз за разам яна паглядвала ў люстэрка і кляла сябе. Яна дакарала толькі сябе. Плакала ад бяссілля, бо стаць ранейшаю і пачаць жыць па-новаму яна не магла.

Дзякуй богу, галава яшчэ не развучылася ўспамінаць і думаць. Але яна не супроць, каб было іначай. Памяць міма ейнай волі, узбуджаная горыччу, адкінула яе на пяць гадоў назад...

Яна тады была вясёлая, здаровая, разумная дзяўчынка-сямікласніца. Добра вучылася, радавала бацькоў. Але ў нейкі час яна пачала нудзіцца, тужлівымі вачыма глядзець у цёмнае акно свайго пакойчыка. Здаецца, гэта сталася ўзімку. Вечары былі доўгія, і яна не ведала, чым заняцца. Кнігі, тэлевізар, магнітафон запаўнялі толькі часцінку ейнай душы, астатняе было адкрыта таямнічасці і невядомаму. Яна часцей пачала прыслухоўвацца на перапынках да сваіх аднакласніц. Ад іх упершыню пачула і пра хлопцаў, і пра віно, і пра парнаграфію, і пра цыгарэты...

Да вясны яна паспрабавала ўжо віна і цыгарэту. Нуда развеялася, і яна зноў стала жыць весела. А неўзабаве сяброўка Нінка пазнаёміла яе з хлопцам. Яго звалі Палуяша — гэта была мянушка, а сапраўднага імя Аксана не ведала. У мянушцы гучала пяшчота, прыемна лашчыла слых. У гэтым была свая прывабнасць. Аксана далучалася да незнаёмага свету, адчувала павевы атрутна-прыцягальнага халадку, ад якога дасюль надзейна засланяла бацькоўскае крыло.

У маі, калі чароўна і густа цвілі каштаны, Нінка падбіла яе з'ездзіць на Мінскае мора пазагараць. З хлопцамі — Палуяшам і Мамонам. Узялі палатку. Хлопцы напхалі рукзак віна і закусі. Спыніліся каля арэхавага куста на пагорку. Уніз да мора пакручаста збягала жоўтая сцежка, абапал якой бледна-ружовымі лёгкімі, бы матылькі, кветкамі цвіла дзікая шыпшына.

Весяліліся, слухалі запісы Майкла Джэксана, пілі даўкі чырвоны партвейн. Да ачмурэння. Міма хадзілі людзі — натоўпамі, парамі, у адзіночку. Нікому не было да іх справы. Калі сцямнела, палезлі ў палатку. Улегліся, але было цеснавата. Мамон здуру ляпнуў: «А зараз мы паслабанімся!» — і пагробся на Нінку. Палуяша ашчаперыў Аксану. Калі б ляжаў ціха, толькі цалаваўся, можна было б трываць. Але Палуяша лез пад сукенку. «Тармазі, Палуя... а то!..» — Аксана пляснула яму па твары. Яна была п'яная, і ёй было ўсё роўна, што ён з ёю зробіць, абы не **гэта**. «Ты махацца?» — завішчаў, як рэзаны, Палуяша, хапіў яе за ногі і вывалак з палаткі. Засела ў вачах: густая цемра, але месяц і зоркі такія яркія, што здавалася, відаць за тысячу вёрстаў. Аксане зрабілася страшна. Палуяша цягнуў яе ўніз па адхоне. Яна чаплялася рукою за кусты шыпшыны, абдзірала аб калючкі рукі; на твар ёй сыпаліся халаднаватыя вільготныя пялёсткі, прыліпалі, як прысоскі. Нінка не кінулася яе выручаць. Палуяша вывалак яе на сцежку — убітую, цвёрдую і слізкую, як лёд. Цягнуў доўга. Аксана не мела сілы супраціўляцца: і ад выпітага віна, і цяпер ужо ад абыякавасці. Палуяша ростам быў малы, але дужы, пруткі, бы кот, хваліўся, што займаецца ў секцыі каратэ. Ён кінуў яе на халодную, мокрую ад расы траву... Яна не заявіла пасля ў міліцыю, не прызналася бацькам. Нінка яе супакоіла: «Якое гэта згвалтаванне? Не бандыт жа. Гэта — любоў...» Так першы раз яна ўтаіла ад бацькоў свой боль.

Прыгадка яшчэ болей развярэдзіла ёй душу. Слёзы ліліся руччом і капалі ёй на грудзі — на дублёнцы чарнелі вузкія шнары. Яна глядзела на раку, а ёй блюзнілася, што яна сама ў вадзе: і холадна, і мутна. Дзікая качка стаяла на краі льдзіны на чырвонай скуранай назе, другую хавала пад сябе ў пер'е.

Аксана з паўгадзіны пахадзіла па набярэжнай, пудліва азіраючыся на людзей. Ёй здавалася, яны чытаюць ейную душу і ведаюць, хто яна такая. Без інтыму чалавеку цяжка існаваць. Яна адчувала сябе аголенай, як аблуплены банан, якім частаваў яе італьянец.

Два дні не была на працы. Дырэктару педвучылішча, у канцылярыі якога сядзела, сказала, што захварэла грыпам. Ёй і праўда было млосна, і калі гаварыла, шчыра глядзела дырэктару ў вочы. Ён быў у яе на кручку і ні ў чым не пярэчыў. А яна працаю не даражыла, ёй было ўсё роўна, дзе сядзець. Там, дзе патрэбна засяроджанасць, яна не змагла б працаваць. Думкі абрываліся, як гнілыя ніткі, цяклі запаволена, быццам нехаця.

Бацькам схлусіла, што паедзе выступаць у Слуцак. Цяпер ішла дахаты з каменем на душы. Паводзіла сябе з наўмыснай рухавасцю. І калі ўжо піла з маці каву, ёй і праўда ў нейкі міг здалося, што з ёю нічога не адбываецца. Яна ўзяла свежы часопіс «Бурда модэн» і пайшла ў свой пакой. Яркія, прывабныя жанчыны на вокладцы не выклікалі ў яе колішняй зайздрасці. Можа, праз гадзіну на яе навалілася страшэнная апатыя. Яна хадзіла з пакоя ў ванную, з ваннай на кухню, з кухні ў залу і здымала з сябе, з дывана, з крэсла парушынкі, ледзь бачныя варсінкі. Як бы міжволі і ў той жа час пры свядомасці, бо разумела сваё дзівацтва. Балазе маці выйшла да суседзяў.

Зазваніў тэлефон. Яна падняла трубку.

— Аксана? Як дабралася? Гэта Пятро — чалавек, які цябе праводзіў...

— Дзякуй. Пазваніце мне, калі ласка, другім разам.— Яна палажыла трубку. Дурніца, навошта з такою незадаволенасцю? Чалавек турбуецца, ён, лічы, выратаваў яе.

Аксана баялася класціся спаць. У вачах мроілася, плавалі чырвоныя, жоўтыя, зялёныя медузы. Ці ёсць такія ў сапраўднасці? На Чорным моры ў Крыме, куды кожнае лета ездзіць з бацькамі адпачываць, яна бачы-

ла толькі празрыста-блакітных. Гэтыя рознакалёрныя медузы ёй за апошні час абрыдлі. Гэта ж ненармальна. Няўжо ў яе парушылася псіхіка? Божа, узяць ды кінуцца з акна?

III

— Я не падуладная сабе, ты можаш рабіць са мною што захочаш... І я буду рабіць з табою, што ты пажадаеш. Я ў сне, я не арыентуюся ў жыцці. Я не магу-у. Божа, мо я звар'яцела? У мяне адчуванне, што мае мазгі аселі, між імі і чэрапам прастора, пустата...

Мяткевіч з Аксанаю сустрэўся ўжо трэці раз. Яны сядзелі ў кавярні з зачыненымі аканіцамі. Зала асвятлялася цьмяным бра. Мяткевіч бачыў, але не разумеў яшчэ, чаму вочы ў Аксаны з адной тугі. Хіба што з дамешкам трывогі. Падобна, Аксана звузіла свет сваёй душы ў кропку. Калі не расхіне яго, гэты свет, яна і праўда можа звар'яцець. Гэта жудасна. Мяткевіч па натуры быў крыху псіхолаг, ягоная назіральнасць нярэдка за дробяззю высвечвала праўдзівы чалавечы стан.

— Можа, да доктара схадзі,— няўпэўнена прамовіў ён.

— Баюся — гэта рэгістрацыя.

— Знаёмага няма?

— Толькі гінеколаг. Ён у дадзеным выпадку ні пры чым.

— А ў бацькоў?

— Ім прызнавацца... Трэба называць прычыну.

— Не зразумеюць?

— Дзе там са сваімі натацыямі!

Мяткевіч падпёр далонню шчаку. Аксана адкрылася яму, выпадковаму чалавеку, але не бацькам. Чаму? У гэтым ягоная заслуга ці проста ў яе няма выйсця? Але ёсць жа, мабыць, сяброўкі. Сяброўкі... Паспрабуй адкрыцца сяброўкам, хоць яны такія ж самыя. Легкадумныя, цынічныя, жорсткія. А галоўнае — ненадзейныя, здрадлівыя. Надзейныя на рандэву, але не ў горы.

Мяткевіч піў халодную каву, глядзеў у чорнае круглае люстэрка маленькага кубачка. Люстэрка выцягвалася ў эліпс, калі ён нахіляў кубачак да вуснаў, і зноў рабілася круглым, калі апускаў на стол.

Аксана сядзела, абхапіўшы галаву рукамі; тонкія белыя пальцы, пераплеценыя на глыбіню пазногцяў, прыгожа ляжалі на цёмных валасах. Яна была прыгожая ўся. З ёю прыемна сядзець тут, у кавярні, прыемна паказацца на людзях, знаёмым. Толькі не жонцы, канечне. Каля прыгожых асоб Мяткевіч адчуваў сябе ўтульна, раскавана. Іхняе хараство быццам улівалася яму ў душу, і яна супакойвалася, лагаднела, ён пачынаў цаніць жыццё, хоць і зведаў усю ягоную жорсткасць, несправядлівасць. Жывецца добра тым, часам думаў ён, каму не патрэбна ісціна. А такіх людзей болей, чым трэба, і праз іх акурат нелады ў свеце.

Як выратаваць гэтую дзяўчыну, прыбітую алкаголем, цыгарэтамі, бяздушнасцю мужчын, неразуменнем бацькоў? Ён покуль не ведаў. Але ведаў ён іншае: чагосьці дамагацца, пераадольваць чэрствасць чыноўнікаў дзеля другога яму заўсёды лягчэй і прасцей, чым дзеля сябе ці сваёй сям'і.

Аксана была рыхтык мумія, толькі цела, а вочы, душа ёй не належалі. Мяткевічу было да слёз шкада яе, але цяперашняя няпэўнасць абяззбройвала яго. Не бывае ж для чалавека тупіка.

— Аксана, я табе дапамагу,— сказаў ён цвёрда, каб яна паверыла. Вера, хоць маленькая, для яе цяпер багата значыць. А можа, веры ў такім стане ў чалавека проста не бывае?

Яна ўсміхнулася, да болю няшчыра, вымучана. Гэта не яна смяялася сваімі надзіва акрэсленымі вуснамі, гэта ўсміхаўся душэўны боль. Боль — як істота, якая ўсміхнулася. Няўжо такое можа быць, што ўсмешка прыляпілася да вуснаў, быццам кліпса да мочкі вуха?

Мяткевічу зрабілася боязна. У нейкае імгненне ён падумаў, што перад ім вар'ятка, але наплывы самых розных думак вымылі са свядомасці гэты страх.

Яны выйшлі з кавярні. Аксана маўчала. Бліскаўкі ад ліхтароў скакалі па мысах ейных ботаў. Мяткевіч не імкнуўся яе разварушыць. Яму думалася пра заўтрашні дзень. Сувязяў, каб Аксану ўладкаваць кудысьці ў бальніцу ціхачом, у яго не было. Ён не ўмеў заводзіць дзелавыя сувязі, праз гэта чуў папрокі ад жонкі. Ён пракручваў у галаве варыянт за варыянтам. Тэлефон даверу? Наўрад ці дапаможа. Пашукаць доктара на кватэры? Запросіць дурную суму — дзе ўзяць?

Мяткевічу ўжо самому было цікава праверыць сябе

на кемлівасць. Добра эксперыментаваць, калі справа не кранае цябе, горка пасміхнуўся ён.

Уначы яму прысніўся сон. Нібыта ён атрымаў новую кватэру. Пайшоў у райвыканком па ордэр. Загадчык кватэрнага аддзела недаверліва глянуў на яго: «Хто вы такі?» — «Я — Мяткевіч, Пётр Браніслававіч, працую на фабрыцы мастацкіх вырабаў...» — «А чым вы гэта можаце пацвердзіць?» — загадчык буравіў яго дзёрзкімі зялёнымі вачыма. «Вось мой пашпарт»,— Мяткевіч падаў агорнуты цэлафанам пашпарт. Загадчык зарагатаў, і рот ягоны пачварна расцягнуўся ўшыркі, а зялёныя вочы зверху і знізу заціснуліся барвовымі валікамі пухлін. «Мы ордэры выдаем без пашпартоў»,— сказаў ён такім размераным голасам, якім гавораць машыністы ў метро. Мяткевіч страшэнна здзіўлены...

Прачнуўшыся, ён колькі часу ляжаў у халаднаватасцішанай трывожнасці. Успомнілася адразу Аксана, сум ейных вачэй. Адчуў, што гэты сум перадаўся ягонай душы, што ён не зможа цяпер адкінуцца ад Аксаны. А чаму — спытацца б. Чым, чым яны адно з адным звязаны? Яму што, няма чаго рабіць, куды хадзіць, з кім сябраваць? Каханкі ў яго і праўда не было. Але ж і Аксана не каханка. Яна нават не звычайная дзяўчына, яна — распусная, хворая. Яна вартая пагарды. Так, але хіба на ёй трэба ставіць крыж? Яна ж зусім маладая. Яна яшчэ можа быць здаровай, гожай жанчынаю, кахаць, нараджаць, смяяцца, спакушаць мужчын. І калі ён, Мяткевіч, яе выратуе, яна, пэўна, стане ягонай каханкай, удзячнай, адданай, пяшчотнай. Яна ацэніць ягоную самаахвярнасць. Ёй сам бог не дазволіць быць інакшай. Прынамсі, усё будзе залежаць ад яго. Мабыць, нішто ў свеце так не цешыць мужчынскае самалюбства, як аблада над жанчынаю, упэўненасць, што яна гатовая на ўсё дзеля яго.

Брыдкаватасць на душы ўлеглася, і Мяткевіч адчуў нарэшце ранішнюю пругкасць сваіх думак. Ён устаў, памыўся, пачакаў, покуль жонка пойдзе на працу, і сеў за тэлефон.

— Алё, дыспансер? Скажыце, калі ласка, у горадзе ёсць кабінет ананімнага лячэння? Так... Ёсць? Будзьце ласкавы, адрас... Тэлефон? Ну давайце тэлефон.— Мяткевіч сутаргава хапіў ручку, якая зазвычай ляжала на трумо, і запісаў на сцяне нумар тэлефона.

Можа, хвіліны дзве ён сядзеў у крэсле бяздумна,

апустошаны і радасны. Здаецца, ён знайшоў выйсце. Праўда, жыццё часта разбівала ягоныя спадзяванні, як разбіваецца скінутае з гнязда яйка, навечна хаваючы задуманасць зародка.

Тэлефон, які яму назвалі, доўга быў заняты, гэтак жа як выклік таксі, як даведачная магазіна. Але на мэту цярплівасці ў Мяткевіча заўсёды хапала. Яе не хапала толькі на доўгія чэргі.

— Алё! Добры дзень! — Голас у Мяткевіча дрыжаў, і на тым канцы провада адразу падумалі, што іменна ён няшчасны.— Скажыце, у вас можна падлячыцца? Чарга на месяц? Шкада... Перш у доктара? У парадку жывой чаргі? Хоць і сёння? Дзякуй...

Мяткевіч сапраўды быў удзячны мілагучнаму голасу, які адказваў яму. Сэрца ягонае білася моцна і часта. Правёўшы далонню па лобе, адчуў на ім густы выпат. Так, здаецца, ад гэтае чаргі нідзе не дзецца.

## IV

Мяткевіч патэлефанаваў Аксане. Яна хадзіла на працу, але толку з яе было няшмат. Сама яму сказала: «Сяджу як самнамбула». Аксана адразу згадзілася з ім сустрэцца. Яна, мабыць, гатовая была на любы крок. Свядомасць ейная адмаўлялася аналізаваць, рабіць высновы, яна плыла самацёкам, як плыве рака воляю рэчышча.

— Паехалі,— сказаў ён, беручы яе пад руку.

— Куды?

— Пабачыш.

Яны селі на трамвай і паехалі ў бок Зялёнага Луга. Колы стукалі па рэйках цвёрда, як па камені. Мяткевіч спрабаваў жартаваць, але Аксана ні разу не ўсміхнулася.

Кабінет месціўся ў падвале звычайнага жылога пяціпавярховіка — шэрага, непрыветнага, якіх багата ў Мінску. Вузенькія, як тунелі, пафарбаваныя ў салатавы колер калідорчыкі былі заліты яркім, але мёртвым неонавым святлом. Гэта здзівіла Мяткевіча, бо ён думаў, што ў такой установе будзе змрок і сырасць.

Яны падаліся ўправа, чытаючы на дзвярах таблічкі, тады павярнулі налева, дзе была апранальня.

— Як трапіць да нарколага? — спытаў ён у мясісташчокай жанчыны за стойкаю.

— Вы першы раз?

— Так.

— Вунека дзверы.— Жанчына паказала сагнутым знявечаным пальцам на дзверы наўскасы ад сябе.— Але тудой зайшлі...

Мяткевіч толькі абрадаваўся, што няма праклятай чаргі, як яго апаліла: а раптам яго ўбачыць хтосьці са знаёмых! Як жа раней ён пра гэта не падумаў? Божа!.. Пусціць плётку толькі так. Дый без плёткі вядома, чаму сюды прыходзяць людзі.

Ён увесь сціснуўся. Яму хацелася зрабіцца маленькім шарыкам і вылецець адсюль праз фортачку. Ягонае вуха чуйна лавіла любы рып, стук, голас. Вочы ўпіваліся ў кожную чалавечую постаць, якая з'яўлялася на калідоры. Чорт! Мяткевіч ужо быў не рады, што так бязглузда рынуўся сюды. Не такі ж ён неразважлівы. Ведае род людскі: толькі б абылгаць, абняславіць сумленнага чалавека. Менавіта сумленнага і ўдачлівага.

За дзвярыма з таблічкаю «Урач-нарколаг» бубнілі галасы. Мяткевічу здавалася, што ён стаіць тут цэлую вечнасць. Аксана прыхінулася спінаю да сцяны, камячыла тонкую скураную пальчатку з зубчыкамі на пальцах.

Нарэшце з-за дзвярэй выкулілася жанчына ў злямчаным паласатым шаліку на галаве і ўслед — мужчына ў сіняй зацухмоленай куртцы.

— Дазвольце? — Мяткевіч, прапусціўшы наперад Аксану, зайшоў у кабінет. За сталом, на якім гарэла лямпа, сядзеў у белым халаце мужчына. Блізка адных з Мяткевічам гадоў. Ён падняў рыжыя бровы, як бы здзівіўся, абыякавым голасам запрасіў садзіцца.

Каля сцяны насупроць стала цьмяна адсвечвала блакітнай цыратаю нізенькая шырокая кушэтка. Леваруч пры закратаваным акне з ліловымі шторамі стаялі радком крэслы.

Мяткевіч з Аксанаю селі на крэслы.

Доктар штосьці пісаў на цвёрдым разлінееным квадраціку.

— Слухаю,— сказаў ён, не супыняючыся пісаць.

Мяткевічу няёмка было казаць безуважнаму чалавеку.

— Гэтая дзяўчына... мая сястра,— схлусіў ён, мабыць, так нахабна ўпершыню ў жыцці: баяўся, што доктар выставіць яго за дзверы, калі ўведае, кім ён

даводзіцца пацыентцы.— Яна звязалася з непрыстойнай кампаніяй і, здаецца, цяпер хворая...

Доктар зноў падняў свае рыжыя бровы, глянуў звужанымі пранізлівымі вачыма на Аксану.

— Замужам? — спытаў.

— Не,— хуценька адказала Аксана.

— Колькі табе гадоў?

Аксана замялася.

— Д-дваццаць.

Доктар другі раз пранізаў яе сваім позіркам. Дастаў са скрыначкі чысты папяровы квадрацік, штосьці ў ім пазначыў.

— Даўно пачала піць?

— З восьмага... не, сёмага класа.

— Толькі п'еш?

— Куру і...— Яна ўздыхнула.

— Доктару і на судзе трэба прызнавацца ва ўсім.— Голас у доктара быў гугнявы, з тоненькай скрыпучай ноткаю, якая гучала недзе ў носе. Мяткевічу і голас, і манера доктара не спадабаліся.

— Яна ўжывала і наркотыкі,— каб выручыць Аксану, дадаў Мяткевіч.

— Часта?

— Рэдка,— адказала Аксана.— Толькі з чужаземцамі.

Доктар паківаў галавою, прыцяў верхнімі балесначорнымі зубамі паўнаватую ніжнюю губу.

— Цяпер вось дзякуючы яму,— яна павярнула да Мяткевіча твар,— я трымаюся... Але мне цяжка. У мяне не хапае цярпення...

— Як завуць бацьку? — нечакана спытаў доктар.— Прозвішча можаш не называць. Брата?

— Васіль Міхайлавіч... Пятро...

— Хутчэй! Маці? З якога ты года? Калі пайшла ў першы клас? — Доктар пасыпаў на Аксану градам самых розных, нечаканых пытанняў, быццам збіраўся пасылаць яе кудысьці на сакрэтную працу за мяжу.

Аксана адказвала: дзе адразу, дзе з замінкаю, дзе папраўляла сябе, бо памылялася. Увесь гэты час доктар уважліва сачыў за ёю, рухамі вачэй, рук.

— Устань,— сказаў ён,— прайдзі. Рукі ўперад, прысядзь. Заплюшчы вочы. Пакажы язык. Сцісні зубы.

Мяткевіч сам з цікавасцю назіраў за Аксанаю і доктарам: «Што ён скажа?» Доктар быў надзіва спакойны.

Аксана яшчэ болей пабялела. Калі яна заплюшчвала вочы, вейкі ў яе дробна трэсліся.

— Даволі,— сказаў доктар.— Сядай.

Аксана села, і Мяткевіч чуў, як штурхаецца ў ейных грудзях сэрца.

— Колькі ты не п'еш?

— Два тыдні.

— Якую дозу магла за раз выпіць?

— Бутэльку, відаць, магла...

— Віна?

— Гарэлкі.

Мяткевіч па вартасці аціаніў мажлівасці Аксаны, ад чаго яму зрабілася сумна.

— Раю табе заняцца спортам,— сказаў доктар.— Ну, чымсьці такім, што б цябе захапіла. Спортам лепш за ўсё. Табе трэба як хутчэй абнавіць арганізм, а гэтаму садзейнічае рух... Дарэчы, больш паловы Амерыкі бегае. Вось і ты папрасі брата, каб дапамог табе. Тыдні праз два прыйдзеш і скажаш пра свае адчуванні. Дамовіліся? Покуль усё.

Мяткевіч час ад часу раніцаю бегаў, балазе каля дома быў школьны стадыён. Але Аксана жыве далёка, і не будзе ж яна праз горад ездзіць да яго. Ён успомніў, што ягоны сябар з выдавецтва мастак Сяргей Прылюк, які тады-сяды даваў яму на афармленне кнігі, ходзіць на вялікі тэніс. Хваліўся неяк, што дастаў японскія ракеткі.

Увечары таго ж дня Мяткевіч патэлефанаваў Прылюку.

— Сяржук, ты вялікі тэнісіст, ці не мог бы мяне падцягнуць да свайго ўзроўню? — пачаў ён з іроніі, адале ўталкаваў, што хоча з сяброўкаю пабегаць па корце. Прылюк скеміў імгненна, паабяцаў выбіць пропускі на корт у Палац спорту.

V

У пятніцу, калі яны спаткаліся пасля працы, Аксана была зусім благая, засмучаная. Пад вачыма ў яе праціснуліся сінія, мала не чорныя кругі.

«Яна вяне з кожным днём...» — са шкадобаю падумаў Мяткевіч.

Аксана была ў чырвонай куртцы, цёмна-сініх шта-

нах фірмы «Пума» і ў белых адзідасаўскіх красоўках. У руцэ трымала валізку.

Мяткевіч адчуваў, яе прыгнятае і тое, што ён, чужы чалавек, ахвяруе сабою, сваім часам дзеля яе. А можа, ён зусім нецікавы ёй. Калі да чалавека не маеш ніякай цікавасці — быць з ім адна пакута. Мяткевіч ведаў гэта па сабе.

Корт блішчаў ад свежай блакітнай фарбы, быў вялікі памерамі. Мяткевіч адразу адчуў прыліў бадзёрасці, хацелася скакаць і смяяцца. Аксана проста зачаравала: у белай кароценькай спаднічцы, белай блузцы і белых красоўках яна пырхала, як матылёк. Мяткевіч таемна любаваўся ейнай зграбнай паставаю, прыемна смуглаватымі нагамі. Але — нядоўга. Аксаны хапіла на пяць хвілін. Рухі ейныя сталі запаволеныя, ракетка вяла ўзлятала ў паветры — жоўты, як лімон, мяч пралятаў міма, гулка бухаў у высокі драўляны шчыт, спярэшчаны ўнізе чорнымі пісягамі. Аксана паказала рукою: досыць. Села на лавачку, абапёршыся спінаю на сцяну.

— Не магу,— сказала яна, памахваючы далонню перад тварам. Мяткевіч зразумеў, што на сёння хопіць.

Яны яшчэ тры вечары схадзілі на корт, за кожным разам скарачаючы гульню. Аб гэтым прасіла Аксана, скардзячыся на стому. Яе і праўда, бачыў Мяткевіч, тэніс не ажывіў, хутчэй забраў рэшткі сіл. Дзіва што. Гэтая гульня богам выбраных патрабуе працяглых трэніровак, прынамсі, здароўя. Аксана не мела ні таго, ні другога. Мяткевіч адчуваў па сабе, як абяссільвае гэтая беганіна з ракеткаю, калі мяч лятае з кута ў кут. Але яго натхняла вабная Аксаніна фігурка, а таксама адчуванне, што ён не дзеля сябе сюды прыходзіць.

— Табе не лепшае? — спытаў ён, загадзя ведаючы адказ.

Аксана пакруціла галавою. Вочы ейныя — божа! — проста лілі тугу, як на ўсю катушку адкручаны кран лье ваду. «Яна ж і пасадзіла сябе!..» — з болем і раздражнёнасцю падумаў Мяткевіч. Яму няма чым займацца, таму ён і ўгруз у гэтае валаводжанне. Праўду жонка кажа, што адбіўся ад сям'і, не гуляе з сынам і дачкою. Будучую каханку сабе лепіць, спадзяецца на ласкі. Нізкі разлік. Такога мужчыну трэба асуджаць. Ідзі ты ў рэстаран, тую ж кавярню, з'ездзі на экскурсію ды пазнаёмся з нармальнай, спрытнай кабетаю і цешся.

Ён разумеў сваё нікчэмнае становішча і бэсціў сябе, як блазнюка. Але расстацца з Аксанаю ён, адчуваў, не мог. Іхнія душы зрасліся якімсьці неверагодным чынам, касмічнаю воляю, ці што, і разрыў быў бы невыносны, як боль свежай раны. Для яго. Аксана, здаецца, была абыякавая да яго. І не толькі да яго. Да ўсяго. Да жыцця, прыроды, людзей, працы. Доктар, мабыць, няправільна паставіў ёй дыягназ. Відаць жа простым вокам, што Аксана выключыла сябе з жыцця, існуе як бы асобна, па-за ім, адрэзаная ад усяго свету.

Маразы ў сярэдзіне студзеня змяніліся адлігаю. Снег раскіс і пажаўцеў. З-пад колаў машын свістала на тратуар вадкая каша. Над горадам павіс густы і жаўтлявы, бы пакулле, туман, у якім хаваліся верхнія паверхі вышынных дамоў. Дрэвы хваравіта блішчалі чорнай, як абгарэлай, карою.

Такога надвор'я Мяткевіч не любіў. І ён сказаў Аксане, калі вярталіся ў апошні раз з тэніса, што кепска пачуваецца. Думаў, ёй зробіцца лягчэй праз тое, што не адна яна пакутуе, кожнаму цяжка ў жыцці.

— Мне цяпер заўсёды блага,— сказала яна сумным голасам,— баліць галава, абсыпае халодным потам...— Пасля маўчання: — Душу маю рве адчай. Ты не ведаеш, што такое адчай, калі выеш ад ламоты ў грудзях, стогнеш і лезеш на сценку... Мне пляваць на ўсё і на ўсіх. Я думаю, што са мною сталася. Я баюся начэй, адзіноты, бо з'яўляецца думка выкінуцца з акна. І, мабыць, выкінулася б, калі б не трэці паверх — не разаб'юся, толькі скалечуся.

— А бацькі што? — прыцінаючы ў голасе трывогу, спытаў Мяткевіч.

— Бачаць, што я сама не свая, дапытваюцца... Але хіба я прызнаюся ім, калі яны ўсё яшчэ лічаць мяне цнатлівай дзяўчынкаю? Дзякуй табе, Пеця. Мабыць, тое, што я адкрылася табе, і трымае покуль мяне ў гэтым чорным свеце... Я ў даўгу перад табою. Я на ўсё згодна. Калі я згодна на самагубства — я згодна на ўсё. Ты разумееш? Як падумаю, што маладая, а ўжо скончылася жыццё, нічога цікавага мяне наперадзе не чакае... Ат! — Яна па-мужчынску рэзка секанула рукою.

«Яе сапраўды трэба апякаць...» Трывога ў Мяткевіча ў грудзях нарастала. Які лёс, які бог звёў яго з гэтым няшчасным дзяўчом? Адзін бог — спачуванне?

— Я цябе не пакіну,— паабяцаў шчыра. Яна пацiснула ягоныя пальцы.

Праз пару дзён пасля гэтае размовы Мяткевіч расстараўся два абанементы ў басейн з саунай. Чамусьці ён не сумняваўся, што гэтае месца, дзе чалавек міжволі забывае на ўсе свае пякучкі, непрыемнасці, разняволіць урэшце Аксану, выпрастае душу, змые балесную маслянiстасць з ейных вачэй.

Аксана ішла за ім, як на повадзе. Яна даверылася яму ва ўсім. Разумела? Адчувала? Спадзявалася? Ці кахала? Смех. Яна здолела б, можа, і пакахаць, калі б магла марыць. А ў такім стане, як яна, не мараць нават у снах. Яе мара пахавана назаўсёды ў труне апатыі.

Басейн аднаго са сталічных НДІ быў пабудаваны на сучасны манер: медпункт, пакой для масажу, дзве сауны — мужчынская і жаночая, чаёўня. А воднае люстэрка проста цуд: пяшчотна-блакітнае ў кафельнай чашы, з рознай глыбінёю. Дзве вышкі для скачкоў. Электронны гадзіннік з вялікімі зялёнымі лічбамі. Каля шкляных сцен пад фікусамі ўтульныя драўляныя крэслы і лежакі, па якіх не пэцкалі фарбаю і да якіх прыемна дакранацца голым целам.

Мяткевіч радаваўся, што купіў у гэты сапраўдны рай абанементы.

— Хвілін праз пятнаццаць збягаемся ў басейне,— сказаў ён.

Аксане трэба было ісці ў дзверы налева, яму падымацца па мармуровым ходніку на другі паверх.

— Здымайце абутак,— адразу папярэдзіла яго маладзіца-спартсменка за столікам,— бярыце ў рукі ды ідзіце шукайце вольную шафку.

У незразумелай мітуслівасці Мяткевіч распранаўся, нацягваў плаўкі, кідаў у цэлафанавыя пакецікі мыла, вяхотку, плавальную гумавую шапачку. Думкі ягоныя былі скіраваны на Аксану.

Калі яны спаткаліся ў басейне, Мяткевіч не адразу пазнаў Аксану — такі быў кантраст між белым тварам і чырвоным целам. У чорным, як туш, купальніку, бэжавай шапачцы на галаве яна паўстала перад ім зусім новай і нечаканай. Жанчыну мы заўсёды распазнаём са здзіўленнем і па меры таго, як менш ды менш застаецца на ёй адзення. Апантаны, Мяткевіч шугануў у блакітны холад басейна проста з берага і,

толькі як вынырнуў, адчуў па ўсім целе тоненькія прыемныя колікі. Смеючыся, ён замахаў рукою Аксане. Яна асцярожна апусцілася па металічных драбінках, бясшумна легла на ваду і рыўкамі, гонячы перад сабою хвалю, паплыла да яго. Ён падаўся ёй насустрач, абхапіў за цёплы, яшчэ не астылы стан і некалькі разоў кружлянуўся разам з ёю.

«Няўжо ёсць на свеце большае шчасце, чым вось гэты міг?..» — радаваўся ён шчыра, як дзіця. Радасць была і праўда вялікая. Яе ўвесь вечар не магла зацьміць засмучанасць, якая памалу абвастралася праз тое, што Аксана была прыгнечаная, як і раней.

«Можа, яна працягвае піць і курыць марыхуану? — біўся ён у здагадках, не маючы права дакараць Аксану, быць недаверлівым да яе.— Яна ў трансе і не можа з яго выйсці. А доктар, мабыць, падумаў, што ў яе проста нервовы зрыў...»

Абанемент дазваляў хадзіць у басейн раз на тыдзень. Невыносным аказаўся гэты ад суботы да суботы час. Ён баяўся за Аксану. Выклікаў яе пасярод тыдня. Хадзілі па вуліцах, елі марожанае, пілі каву ў кааператыўнай кавярні каля парку Янкі Купалы. Забрылі на стадыён «Дынама» і пасядзелі ва ўтульнай ложы, куды зусім не намяло снегу і дзе быў зацішак. Нізкае слабое сонца неахвотна кідала на іх свае бляклыя промні. Дзе ўжо яму сагрэць Аксаніну душу?

— У гэтую суботу ў басейн пойдзем? — спытаў Мяткевіч, прыгадаўшы, што пасля першага разу вялікай бадзёрасці ў Аксаны не было.

— Я не магу нават хвіліну быць у сауне,— адказала яна строга, зласнавата, і Мяткевіч за гэтым ейным тонам адразу прачытаў адказ. Ён, сямейны чалавек, не мог дарэшты выкладацца на мітрэнгу з Аксанаю, хоць і цягнула яго магнітам да яе. Ён багата прысвяціў ёй часу, сваіх думак, намаганняў. Колькі такіх дурняў знойдзецца ў гэтым нялюдскім, чэрствым, як запечны пыл, свеце?

## VI

Мяткевіч з нецярпеннем чакаў другога паходу ў наркалагічны кабінет. Аксана доўга не згаджалася, мабыць, няёмка было перад ім, але ўпэўненасць у ёй не

адчувалася. Ён бачыў, што груз у яе на душы важчэе. Калі не скінуць яго, не сёння-заўтра ён раздушыць яе. І тады сусвет, яго энергетычнае поле падсілкуецца яшчэ адной зарана змарнаванай душою.

Толькі цяпер, за другім разам, Мяткевіч прачытаў на тонкай папяровай палосачцы, прыклеенай да таблічкі на дзвярах, што ў доктара грузінскае прозвішча, а завуць яго Ілля Рыгоравіч.

— Як здароўе, маладыя людзі? — ужо весялейшым голасам, як да старых знаёмых, звярнуўся ён.

— Кепска,— сказаў Мяткевіч, каб не пакідаць ніякіх сумненняў.— Ёй не палепшала. Хандрыць — як і хандрыла.

— Ну што ж, будзем лячыцца,— сказаў доктар і з прыскрынка, які высунуў са стала, узяў аркушык паперы. Пачаў на ім пісаць.— Прозвішча будзеце сваё называць ці выдуманае?

— Выдуманае,— апярэдзіў Аксану Мяткевіч.— Ну, скажам, Маркевіч Зоя Анатольеўна...

Доктар падаў спісаны аркушык Аксане:

— Вось вам накіраванне. Пойдзеце ў чацвёрты кабінет. Прама і направа. Возьмецеся на чаргу.

— Пакажы,— сказаў Мяткевіч, калі выйшлі ад доктара.

Аркушык дрыжаў у белай Аксанінай руцэ. Мяткевіч узяў яго ў свае рукі. Прадаўгаватымі і вастранькімі, як рыс, літарамі там было напісана: «У кабінет ІРТ. Накіроўваецца хворая Маркевіч Зоя Анатольеўна на курс іголкарэфлексатэрапіі. Дыягназ: хранічны алкагалізм, першая стадыя. Стан рэмісіі. Астэна-неўратычны сіндром». Мяткевіч не паверыў таму, што прачытаў. Шорхласць пракацілася ў яго па спіне. Яму скавала рухі. Ён сутаргава азірнуўся па баках. На калідоры там-сям былі відаць мужчыны і жанчыны ў белых халатах. Яны хадзілі з грэблівым выразам твару, пакрыквалі на хворых, як на быдла. Як і першы раз, Мяткевіча апанавала боязь. Калі, дасць бог, і не сустрэне каго-небудзь са знаёмых, дык хтосьці з медыкаў запомніць яго, а пасля ўбачыць па тэлевізары ці на выставе якой і расплошча па ўсім горадзе. А плётку ж толькі пусці. І гэтым шмат хто карыстаецца.

Утуліўшы галаву ў плечы, Мяткевіч шукаў той чацвёрты кабінет. Ён, на бяду, аказаўся ў самым канцы.

Насупроць яго на абабітай працёртай канапцы сядзелі два бледнатварыя бамбізы.

— Сюды? — кіўнуў Мяткевіч на пунсова-рубінавую «чацвёрку» на дзвярах. Бамбізы здурэла зарагаталі.

Над дзвярыма якраз загарэўся аранжавы плафон з чорнымі літарамі: «ЗАХОДЗЬЦЕ!»

Выйшла жанчына, маладая, статная, з сіняком пад вокам. За руку яна трымала хлапчанё гадоў адзінаццаці.

За бамбізамі ў таямнічыя дзверы з пунсова-рубінавай «чацвёркаю» зайшлі Мяткевіч і Аксана. Яны апынуліся ў цеснаватым пакоі. Злева былі ячэйкі кабін, завешаныя ружовымі шырмамі. У прасветы Мяткевіч убачыў, што ў кабінах на высокіх канапках ляжаць людзі.

— Дзе тут што? — прашаптаў ён, разгубіўшыся.

— Сюды, калі ласка! — пачуў ён жаночы голас і толькі цяпер заўважыў прачыненыя дзверы. Каля іх быў плакат — намаляваны ва ўвесь рост голы чалавек з безліччу кропак і ліній па целе.

У вузенькім, як труна, застаўленым вазонамі кабінеціку сядзела жанчына. Твар у яе быў не славянскі — ці то закаўказскі, ці яўрэйскі. Чорныя вочы глядзелі порстка і адначасна прыязна, лагодна, з вялікіх мяккіх вуснаў у любое імгненне гатова была выпырхнуць усмешка. Жанчына адразу выклікала ў Мяткевіча давер.

— Сядайце, калі ласка. Што за бяда вас прывяла? Вы былі ў Іллі Рыгоравіча? Ён накіраваў вас сюды?

— Так. Вось... Аксана... Гм. Зоя, дзе накіраванне?

Жанчына кінула кароткі позірк на пададзены Аксанаю аркушык, адсунула яго ўбок, да стоса паперак.

— Як ты сябе адчуваеш, Зоечка? — жанчына ветліва звярнулася да Аксаны.

— Мне цяжка... Ведаеце, мяне нічога не цікавіць. Мне здаецца, што я самая нешчаслівая...

— Хвілiначку. А чаму ты так лічыш, што нешчаслівая? У цябе ёсць муж...

Мяткевіч паварушыўся на крэсле. Аксана чула, што ў доктара ён назваўся братам.

— Гэта не мой муж.

— Ты не замужам? Але ёсць бацькі, брат, сястра, сяброўкі?

— Ёсць.

— Ну вось, бачыш. Цэлы свет. Табе дваццаць адзін, дваццаць два?

— Дваццаць.

— Цудоўна! Выйдзеш замуж, народзіш дзіця...— Жанчына казала да Аксаны, а Мяткевіч адчуваў, быццам цёплая хваля накочваецца на ягоную душу, лагодзіць, абмывае.

— Мне здаецца, што маё жыццё скончылася... Наперадзе тупік.

— Дарэмна ты, Зоя, так лічыш. Ты маладая, прыгожая. Столькі прыемнага цябе чакае. Трэба верыць.

— А ў што верыць? Дзеля чаго? Я не знайшла сябе...

Мяткевіч бачыў, што Аксана на мяжы надрыву, нацятая як струна.

— Вер проста ў радасць. Расчараванне — гэта па маладосці. Памыляецца той, хто шукае збавення ў віне, наркотыках...

— Я цяпер засяродзілася толькі на сваіх адчуваннях і не магу нічога з сабою зрабіць. Я не такая, як была, як усе. Часам мне здаецца, што я іншапланецянка...

— Ты адчуваеш, што нешта адбылося з табою?

— Так.

— Сны табе сняцца? — нечакана павярнула гаворку жанчына.

— Не.

— Дзіўна,— не ўтрымаўся Мяткевіч,— людзі ўсё жыццё п'юць, кураць, і нічога.— Ён перажываў, абараняў Аксану.

— Усё залежыць ад чалавека, яго ўзросту, нервовай сістэмы. Вось толькі ад мяне пайшлі жанчына з хлопчыкам. Ён адну шклянку віна выпіў і страціў памяць. Энцэфалапатыя. Другі ўжо курс лячэння праводжу — крыху вярнула да нармальнасці.— Жанчына падышла да Аксаны, памацала рукі.

За сценкаю хтосьці зашкрэбаўся, закашляў.

— Хвіліначку! — Жанчына лёгка выкаўзнулася за дзверы. Мяткевіч сядзеў поруч з Аксанаю і не ведаў, што казаць. Перавярнуўся свет. Яго ўразіла, што Аксана не бачыць сноў. Яму сны сніліся часта, яркія, каляровыя, сімвалічныя. Шмат якія з іх потым спраўджваліся.

За сценкаю гаманілі.

Вярнуўшыся, жанчына сказала:

— Я вазьму цябе, Зоечка, на лячэнне. Запішу на чаргу. Завуць мяне Бэла Якаўлеўна. Я працую па цотных з васьмі да семнаццаці, па няцотных — з дванаццаці да дваццаці адной гадзіны. Калі ласка, выбірай зручны для сябе час і праз месяц прыходзь. Прынось з сабою падпісаную тваім прозвішчам прасціну ў цэлафанавым пакеце. Яна будзе ляжаць тут у шафцы ўвесь курс лячэння. Ты будзеш засцілаць ёю канапку. А зараз праверым тонус тваіх сасудаў.

— Іголкамі? — вырвалася непасрэдна, па-дзіцячы ў Аксаны.

— Але.— Бэла Якаўлеўна ўзяла яе пад локаць, скіроўваючы да дзвярэй.

— Я баюся...— Аксана павярнулася да Мяткевіча.

— Гэта зусім не балюча, укус камара, дый толькі,— супакоіла Бэла Якаўлеўна.— Распранайся і заходзь у трэцюю кабіну. Блузку пакладзеш на тумбачку.

Аксана ўхапіла Мяткевіча за руку.

— Хачу з табою...

— Ну ты, далібог, як дзіця! — падбадзёрыў Мяткевіч.

Бэла Якаўлеўна дазволіла і яму зайсці ў кабіну. Рыхтуючы іголкі, спакойным голасам распавядала:

— Нічога незвычайнага ў гэтых іголках няма. Проста яны ўздзейнічаюць на біялагічна актыўныя кропкі... скарочана — БАК. Іх у чалавека больш шасцісот. Адкрылі кітайцы, яны разглядаюць хваробу як парушэнне раўнавагі ў размеркаванні энергіі «ян» (станоўчая сіла) — «інь» (адмоўная сіла). Карацей, у адным органе гэтай энергіі будзе лішак, у другім — не хапаць. Навука не такая складаная, як здаецца на першы погляд. У чым майстэрства рэфлексатэрапеўта? Дакладна знайсці кропку і ўвесці ў яе іголку. Тады сігнал пойдзе ў хворы орган...

Аксана ляжала на канапе белая, твар зліваўся з падушкаю. Мяткевіч слухаў Бэлу Якаўлеўну і дзівіўся не з ейных словаў, а з таго, што ён тут апынуўся. Колькі ж напластаванняў у жыцця, калі адна хвіля адкрывае цэлы пласт? У гэтай загадкавасці Аксана здавалася чужой і нерэальнай. Ён раззлаваўся на сябе за свае старанні і дзіўную паслядоўнасць. Ну, кахала б яго Аксана, тады зразумела: ён не павінен пакідаць яе ў бядзе. Але яна была як мумія, робат жаночага по-

лу, урэшце, лялька — без душы, пачуццяў, усмешкі і цяпла.

Бэла Якаўлеўна акрыла Аксану байкавай коўдраю.

— Калі ласка, пакладзі рукі ўздоўж тулава,— сказала яна і паставіла Аксане на жывот металічную ванначку з іголкамі. Аксана ўся напружылася, як ад току.

— Спакойна, расслабся... Я толькі дзве іголкі, вось сюды...— Яна ўзяла левую Аксаніну руку і пачала цiскаць вялікім пальцам якраз на згібе локця. Невялічкая іголка са шрацінкаю на адным канцы прыляпілася да рукі. Гэтак жа сама і да правай. Спачатку іголкі абвіслі, а потым наструніліся тырчком.— Вось і ўсё, дзетка...— усміхнулася Бэла Якаўлеўна.— Ляжы спакойна, можа з'явіцца санлівасць, цяпло ў целе... Гэта добра. Вам лепш не перашкаджаць ёй адпачываць,— звярнулася яна да Мяткевіча.

Мяткевіч выйшаў з кабіны. І ягоны позірк адразу спыніўся на плакаце каля дзвярэй. Чорных кропак і ліній на чалавеку было так багата, што здавалася: на яго накінулі рыбацкую сетку.

— А лініі? — спытаў Мяткевіч ужо зацікаўлена.

— Гэта мерыдыяны, па ходу якіх размяшчаюцца БАК,— адказала Бэла Якаўлеўна і націснула кнопку пад стальніцаю.— Мерыдыян сэрца, страўніка, нырак...

Адчыніліся дзверы, і ў пакой ухапіўся хударлявы, з учарнелым тварам мужчынка. Ён трымаўся ўпэўнена, сеў адразу на крэсла каля стала.

— Ну, як вашы поспехі, Віктар Пракопавіч? — спытала Бэла Якаўлеўна.

— Ужо лепш. Толькі адну цыгарэту ў дзень выкурваю. Больш не цягне,— засмяяўся мужчынка.

— А казалі, не кінеце,— мякка папракнула Бэла Якаўлеўна.

Яна, адчуваў Мяткевіч, сеяла вакол сябе лагоду. Такіх людзей ён сустракаў мала. Часцей тых, каторыя ўносілі ў душу бязладдзе і смуту. Яму хацелася даўжэй пабыць у такой незвычайнай утульнасці. Ён счах душэўна з Аксанаю і міжволі шукаў ратунку.

Мяткевіч глянуў на Бэлу Якаўлеўну і ейнага пацыента. З вушэй у мужчынкі, бы карэньчыкі, тырчалі іголкі.

— На вушной ракавіне каля ста дваццаці кропак,— сказала Бэла Якаўлеўна, перахапіўшы ягоны позірк.

Мяткевіч здзівіўся, хоць цяперашнія газеты шмат пісалі пра нетрадыцыйныя метады лячэння.

Бэла Якаўлеўна адхінула шырму Аксанінай кабіны.

— Вось, я так і думала, што ў цябе моцнае энергетычнае поле!..

Пачуўшы гэтыя словы, Мяткевіч абрадаваўся, што нешта ў Аксане задаволіла Бэлу Якаўлеўну.

Аксана выйшла з кабіны, абцягнула блузку. На ейныя шчокі наплыла нездаровая ружовасць. Вочы масляніста блішчэлі.

Мяткевіч падаў ёй дублёнку. Настрой ягоны дзіўна мяняўся. Аксана цяпер была блізкая, свая, быццам даўно знаёмая.

— Праз месяц чакаю,— нагадала Аксане Бэла Якаўлеўна.

## VII

Мяткевіч і Аксана спатkaліся на Ленінскім праспекце.

— Мяне хапіла на тыдзень,— паскардзілася Аксана.— Здавалася, паварот да лепшага адбыўся. Цяпер мне зноў тужліва, я вар'яцею...

— Ну што ты! — цвёрдым голасам сказаў Мяткевіч, каб адагнаць у Аксаны ўсякія сумненні.

— Не магу. Ні піць, ні есці, ні кагосьці бачыць... Так абрыдла, што зараз завыю ваўчыцаю.

— Слухай, можа, покуль вітаміны дапамогуць. Ты знясілела. Давай зараз жа пойдзем у аптэку і купім.

Вітамінаў у аптэцы не было.

Мяткевіч не даваў Аксане журыцца. Вынаходлівасць ягоная не мела межаў.

— Трэба з'ездзіць на Камароўку і купіць у бабулек шыпшыны — сама больш вітамінаў.

— Мяне засмяе мама.

— Бачыш, ты не страціла самакрытычнасці, і гэта добра.

— Пятро, калі б не ты... Я не ведаю, што ўжо са мною было б. Ты прабач мне за шчырасць, ты — бог. Так, на цябе трэба маліцца. Але ты мужчына ці не мужчына? Мне... Мне... мне сорамна, што ты нічога не дамагаешся. Хіба я зусім не вартая? Ты не мярзотнік, так... Ды я бачу, што табе падабаюся.— Пасля маўчан-

ня: — Іначай ты ніколі б не блытаўся са мною.

Мяткевіч і сам не разумеў да канца, чаму ён прыліп да Аксаны. Намеру на блізкасць ён не пялегаваў. Да кахання, здаецца, таксама было далёка. Такой вольніцы, каб думаць, дзе змарнатравіць час, ён даўно не меў. Адным суцяшаў сябе — спадзёўкаю, што калі-небудзь праясніцца заблытанасць іх дачыненняў.

— Прымі гэта проста як дарунак лёсу,— не то пажартаваў, не то ўсур'ёз сказаў Мяткевіч, але зачэпленае Аксанаю мужчынскае самалюбства не скаралася.— У мяне, зрэшты, ёсць кватэра, дзе мы можам папіць кавы і паглядзець відзікі.

Мяткевіч меў на ўвазе кватэру таго ж Сяргея Прылюка. Ён быў разведзены і жыў адзін. Часта падарожнічаў, ездзіў у замежныя камандзіроўкі, і кватэра пуставала.

Праз пару дзён Прылюк адплываў у далёкую Аўстралію. Ключ ён з радасцю пакінуў Мяткевічу і наказаў час ад часу забіраць пошту.

Аксану не здзівіла ні японская апаратура, ні амерыканскія і заходнегерманскія відэакасеты, ні бібліятэка з падпісных выданняў. Яна абыякава, з сумам на ўсё глядзела.

Мяткевіч сеў побач на канапу. Аксана адразу прыпала да яго. Ён прытуліў яе, дакрануўся лобам, шчакою, вуснамі да ейнай шчакі, потым пацалаваў у вусны. Яна была гатовая на ўсё, падатлівая, быццам паветраная.

— Устань, калі ласка...— Ён расклаў канапу.

Аксана моўчкі распранулася. Выпрастала да яго рукі. Ён, ужо таксама голы, абхапіў яе, і яны павольна, цалуючыся, апусціліся на канапу.

— Ты бог,— прашаптала яна.— Цяпер я дакладна дачакаюся таго сеанса іголкарэфлексатэрапіі...— І ці не ўпершыню за іх знаёмства ейныя вусны растуліла шчырая паўусмешка.

## VIII

Са страхам, што маці выявіць, Аксана ўзяла ў шафе прасціну. Яна аб'ездзіла ледзь не ўсе магазіны і нідзе не змагла купіць прасціны. Алоўкам — каб пасля можна было змыць — напісала на ражку сваё прыдуманае

Пятром прозвішча. Засунула прасціну ў цэлафанавы пакет і паклала ў сумку.

Аксана ледзь трывала, адчувала, калі не трапіць на іголкі сёння — штосьці ў душы парвецца. І ўсё. Пасля гэтага яна не верне сабе сваё «я».

Ішоў мокры хлапяны снег. Ляпіўся, бы цеста, на твар, на адзенне, на боты.

Каля дома яна спынілася. Без Пятра ісці ў кабінет баялася. Праз хвілю снег выбеліў яе ўсю. Яна патрэпала сябе рукавічкаю.

Нясмела падышла да знаёмых дзвярэй у падвал. Яны былі прачыненыя. Узялася за ручку — і здалося, дзверы зарыпелі на ўвесь зямны шар.

Пры кабінеце нікога не было, але плафон высвечваў: «ЗАНЯТА». Яна пачакала, покуль кабінет вызваліўся, і тады зайшла. Бэла Якаўлеўна пільна, аж занадта, паглядзела на яе, усміхнулася. Аксана распранулася, выняла з сумкі прасціну.

— Заходзь, калі ласка, у першую кабіну,— сказала Бэла Якаўлеўна.

Аксана заслала канапку, скінула блузку і легла.

— Сёння я табе пастаўлю тры іголкі.— У кабіну зайшла Бэла Якаўлеўна. Яна трымала ў руцэ ванначку з іголкамі. Паціснула ўказальным пальцам між броваў.— У цябе цудоўныя бровы.— Укалола.— Кропка інь-тан.— Паціснула на мяжы лоба і валасоў.— І валасы ў цябе цуд.— Укалола.— Кропка шэнь-цін.— Гэтак жа ўкалола дзесьці за цемем.— Кропка бай-хуэй. Ляжы спакойна. Можаш спаць. Санлівасць — сведчанне рэлаксацыі. Гэта тое, што трэба.

Аксана адчула цяпло. Яно бралася ад кропкі ўколу і гарачымі дроцікамі аплятала ўсё цела. Накацілася жудасная абыякавасць да ўсяго на свеце, нават да Пятра, пра якога з часу апошняга спаткання адно і думала. У такім стане, здавалася, і памерці лёгка. Было жаданне ляжаць і ляжаць. Але — заглянула Бэла Якаўлеўна.

— Уставай, дзетка. Як самапачуванне?

Аксана пэўна нічога не магла сказаць, намагалася выявіць змяненні, што адбыліся з ёю. Яна як бы глядзела на сябе збоку, з адлегласці, чужымі вачыма.

— Быццам панавіўся свет,— сказала яна, не ўпэўненая, што дала правільную ацэнку сваім адчуванням.

Аксана ішла па вуліцы, ёй хацелася смяяцца. Незра-

зумела чаму, дурны смех ірвaўся з грудзей, як пара з чайніка. Яна гэта ці не яна? Душа пераніцавалася. Зніклі кудысьці назойлівыя думкі, ад якіх няможна было адкараскацца. Няўжо яна і праўда думала, што звар'яцела?

Але праз якісьці час ногі пацяжэлі, галава стала пустая, без думак. І Аксана забаялася, што зноўку трапіць у самнамбулічны стан.

У гэтую ноч яна спала лепш. У нейкія прамежкі зусім правальвалася ў забыццё. Калі прачыналася, дзівілася яснасці ў галаве.

За другім сеансам Аксана сказала Бэле Якаўлеўне, што ў яе прапала назойлівае думанне.

— Таму што выйшла непраўдзівая інфармацыя, якою была забіта твая падсвядомасць. Ты маладая, і папраўка павінна наступіць хутка.

Аксана, разумеючы, што гэта апошні шанец, рупна хадзіла на сеансы. Бэла Якаўлеўна яе хваліла, што яна не мітусіцца між працаю і лячэннем, а цвёрда выбрала лячэнне. На такое здольны адно чалавек з вялікім інтэлектам, сказала яна. Звычайны чалавек не можа выбраць галоўнае — дамінанту, раздвойваецца ці растройваецца і разбурае сваю псіхіку.

Аксана ўбачыла, што зіма сёлета — рэдкая. Мяккі, пушысты снег. Яснае, трохі падсіненае паветра. На рабіне сядзела парачка снегіроў — такія ж чырвоныя, як і гронкі ягад, што панадзелі белыя шапачкі.

На яе наплыло замілаванне, якога яна даўно не зведвала. Можа б, пачуцці і не былі такія светлыя, калі б не існаваў Пятро. Нават і пасля блізкасці ён заставаўся для яе загадкаю, як і многае вакол, як, зрэшты, і сама для сябе. Але свядомасць ейная відочна прасвятлялася, думкі ўжо не цяклі адной каляінаю, а сягалі ў бакі, на прастор. У яе з'явілася патрэба разважаць.

Яна гатова была зараз маліцца і на Бэлу Якаўлеўну. Ейныя цёплыя, чуйныя рукі і лагодны голас быццам атульвалі Аксану эфірам цудадзейнага бальзаму. Абвастраўся зрок, вярталася забытая радасць далучанасці да жыцця.

Пятро з часу спаткання на кватэры толькі раз пазваніў ёй дахаты, спытаў, ці ходзіць на сеансы. Як яго ўбачыць? Ён не даў ёй нумара свайго тэлефона і нават не сказаў, жанаты ці не. А яе раней гэта зусім не цікавіла. Цяпер яна жадала ведаць пра яго ўсё. Яна з жахам

уявіла, што з ёю будзе, калі страціць Пятра. Пагасне свет, з яго зрынецца вялікая, самая прывабная частка.

Увечары, кладучыся спаць, яна думала пра Пятра, маліла бога, каб ён пазваніў ці хоць бы прысніўся. Яна выклікала яго ў сон. Але сны па-ранейшаму ёй не сніліся.

Аксана нервавалася.

І ў адну з начэй ёй прысніўся Пятро. Яны, узяўшыся за рукі, ідуць па лесе, шукаюць зацішны куток для блізкасці. Ды ўсюды людзі, і яны марна блукаюць сярод дрэў...

І ўсё роўна яна прачнулася з неймавернай лёгкасцю і радасцю на душы. Напявала і ў ваннай, калі чысціла зубы, і на кухні, калі піла каву.

Маці была на сёмым небе, бачачы, што ў дачкі мінуў крызіс. Яна не ведала прычыны гэтага крызісу, магла толькі здагадвацца. І нават ад здагадак ёй рабілася млосна.

## IX

Вечар.

— Я не разумею цябе, Пятро,— сказала жонка, лежачы ў ложку побач з ім.— Мабыць, ты завёў сабе каханку...

Такія перамовы між імі заводзіліся і раней, хоць не мелі пад сабою грунту, але псіхалагічна Пятро не быў абаронены ад такой нападкі. Жонка пасля сваіх словаў пільна ўзіралася ў яго, шукаючы на твары змяненні. Твар тварам, але ў душу не зазірнеш. І гэта прырода наўмысна так сатварыла, каб узаемаадносіны між людзьмі не заходзілі за разбуральную мяжу.

Жанчына надзелена інтуіцыяй большай, чым мужчына. Пятро і сам адчуваў, што ў яго, на дзесятым годзе сумеснага жыцця, памацнела абыякавасць да жонкі, ейных просьбаў і мілавання. Ці толькі Аксана ў гэтым вінавата? Можа, гады бяруць сваё і юначы запал з часам міжволі затухае? Прынамсі, на цяперашні момант ён адчуваў сябе вінаватым і не стаў уступаць з жонкаю ў перапалку.

— З чаго ты ўзяла?

— Ты паслабеў як мужчына і пачаў пазней прыходзіць дахаты.— Жонка праколвала яго позіркам.

— Радыяцыя дзейнічае,— аджартаваўся ён.

— А што гэта за нумар на сцяне запісаны?

— Знаёмы адзін, алкаш, даваў,— прыдумаў версію Мяткевіч, не сумняваючыся, што жонка пазваніла ўжо па гэтым нумары.

— Прынясі мне ў ложак каву.— Жонка так правярала ягоную вернасць ёй.

Пятро прадэманстраваў яе ў чарговы раз. Заварыў каву і прынёс жонцы. Але ягоны рыцарскі жэст сёння яе не заспакоіў.

— Вылічу — крыўдуй на сябе,— папярэдзіла яна.— Не забывай, дарагі, у цябе двое дзяцей.

Пятро не дакараў сябе за мітрэнгу з Аксанаю. Ён разумеў, што мітрэнга гэтая незвычайная, і апраўдваў сябе. Апраўданне — заўсёды штуршок да новага маральнага ўпадку. Які ж запас маральнасці дае чалавеку прырода, калі ён усё жыццё апраўдвае свае ўчынкі? Высакародныя, брыдкія, дробныя, вялікія...

Назаўтра Пятро патэлефанаваў Аксане. Сустрэўшыся, ледзьве пазнаў. З твару ў яе сплыла змрочнасць, як з кветак сплывае цень ад хмары. Яна смяялася, у рухах не было звыклай скаванасці. Пятру здавалася, што яна глядзіць на яго з вялікім, таямнічым здзіўленнем.

— Ты пекна выглядаеш,— не мог утрымацца ён ад камплімента.— Запішы мой тэлефон.

— Вяртаюся да сваёй колішняй формы,— скакетнічала Аксана, вымаючы з сумкі нататнік.

— З дапамогаю іголак?

— Так. Я адкрыла для сябе зусім новы свет.

— У тваім становішчы, мусіць, праца таксама лячэбны сродак? Працатэрапія так званая.

— Працуюць коні... А жанчыне патрэбна толькі прыгажосць. Прыгожы твар, прыгожае адзенне, урэшце, прыгожыя цыгарэты... Падабацца хочацца. Ну і ўсё такое... Без гэтага, павер, яна не можа... калі яна сапраўдная жанчына. Ёсць жанчыны і ёсць прачкі.

«Яна зусім не такая, як была,— падумаў Пятро.— Яна нахабная...»

Аксана была сёння як бы вопытней за яго, больш ведала і разумела. Ён яшчэ не сустракаў жанчыны, перад якою адчуваў бы сваю мізэрнасць. Іншы раз яму здавалася, што такіх жанчын увогуле не існуе.

І цяпер, перад іншай Аксанаю, яму зрабілася нават вусцішнавата. Што за птушка яна? Ён не меў вопыту

мецца з такімі незалежнымі жанчынамі. Да сённяшняга дня Аксана была звычайная бядотная дзяўчына, нават больш, чым трэба, пакорлівая, падатлівая і несамастойная. Унікальная жанчына-пластылін. Ён зразумеў, што яна была такая праз сваю хваробу, якая тармазнула ейныя жыццёвыя сілы. Цяпер яна акрыяла.

— Цябе цікава паслухаць,— сказаў ён, каб займець мажлівасць канчаткова прымераць апратку ейнага вопыту на сябе.

— Калі ўсё пачуеш — жахнешся.— Яна баялася гаварыць яму праўду.

— Я набяруся смеласці.— Пятру чамусьці рупіла ўведаць пра Аксану падрабязнасці. Навошта — не мог адказаць, але адчуваў, што за гэтым стаіць нешта важнае. Важнае для яго і для іх, але не для яе.

— Смеласць патрэбна мне.

— У цябе яна ёсць.

Доўга ішлі моўчкі. Аксана пакутліва змагалася з сабою.

— З восьмага класа я вяла распуснае жыццё,— нарэшце сказала яна і зноў надоўга змоўкла.— Спачатку з равеснікамі, у падвалах, на гарышчы, у вагонах і развалінах... Пасля са старэйшымі. Гэтыя вадзілі ў кафэ, рэстараны, на дыскатэкі. Віно, цыгарэтны дым, шмоткі... Ад шчасця гатова была памерці. Але патрабаванні ў жанчыны бясконцыя, праўдзівей, жаданне ўсё большай і большай увагі з боку мужчын бясконцае. Наступны этап — чужаземцы...

Пятро ўжо быў не рады, што вымусіў Аксану да споведзі. Ён не чакаў ад яе такой шчырасці: думаў, яна хітрэйшая. Шчырасць не заўсёды апраўданая. Але калі яна ёсць, то да канца.

— Гэта проста? — спытаў ён.

— Што?

— З чужаземцамі...

— Прынамсі, з маёй знешнасцю нон праблем. Выходзім з сяброўкаю на праспект Машэрава. Спыняем чужаземца: «Хочам з табою пасябраваць...» Адказ сто са ста: «Я — таксама».— «Але на вуліцы мы добра не наладзім сяброўства».— «У мяне гасцініца...»

— СНІДу не баялася?

— На той час не думаеш. Толькі раніцаю, як прачнешся, агортвае ледзяны, брыдкі жах. Да наступнай

сустрэчы... Ты прабач, я так смагну закурыць. Можа, сшыбнеш?

— Доктар забараніла?

— Так.

— Тады я на гэтае злачынства не пайду.

Аксана аблізнула сухія вусны. Яна відочна расхвалявалася, не кіравала сабою.

— Заткні вушы,— сказала са злосцю. І — пасля паўзы: — З інстытута мяне выгналі за ганарэю. Прыйшла на рэктарат пісуля з Прылуцкай... Дзікунства! Хіба нельга было на маё імя прысланы?

— Ты заразіла кагосьці?

— Ды не. Не было ў мяне ніякае хваробы. Думаю, што пераспала з хворым. Ён звярнуўся ў дыспансер, а там спыталі: з кім меў сувязь? Ён назваў сваіх трыперных партнёрак, у тым ліку і мяне... Нягоднік!

— Ляжала?

— Не. У сяброўкі знаёмы гінеколаг. Кандыдат медыцынскіх навук.

Толькі цяпер Пятро жахнуўся са свае легкадумнасці, з якою пайшоў на блізкасць з Аксанаю. Былі ўсе шанцы падхапіць якую-небудзь заразу. І тады ніякія жарты не здолелі б пераканаць жонку, што ён невінаваты. Але, здаецца, бог яго мілаваў. Значыцца, не такі вялікі ён і грэшнік. Гэтая наіўная думка падвесяліла Пятра. Чалавеку для пераходу з аднаго стану ў другі зусім мала трэба: слова, усмешка, думка, званок.

— Сяброўка таксама? — спыніўся на паўпытанні Пятро.

— Пайшла далей мяне. Не спала хіба што з іншапланецянінам. Была нават са стрыечным братам. Я пераспала два разы са сваім дырэктарам. Проста ў канцылярыі на стале за замкнёнымі дзвярыма. Затое карыстаюся ягонай паблажлівасцю...

«Божа, собіла ж мне сустрэцца!..» — Прыгнечанасць асядала на Пятра з усё большай сілаю. Зమаладушнічаць, памахаць ручкаю і пайсці прэч ён не мог. Надта шмат ён аддаў сябе Аксане, каб гэтак проста ад яе адкінуцца. Брыдкасці да яе ён і цяпер не адчуваў, наадварот, глыбока ў душы ягонай памацнела жаданне валодаць ёю. Што за пачвары гэтыя мужчыны?

— А дзявочы гонар?

— Пры чым тут наш гонар, цнатлівасць? Для прыроды гэта не мае значэння. Прырода дыктуе, і мы пад-

парадкоўваемся. Супроць ідзе толькі хворы чалавек. Так я лічу. Ты не згодны?

— Прырода, канечне, магічная штука...— Пятро не хацеў больш спрачацца, даводзіць нязгоду, бо не быў упэўнены ў сваёй праўдзе. Жыццё яго самога бязлітасна паскубла, каб не сумнявацца, што ён годна па ім ішоў. Каб не кроіць душы, ён запрасіў Аксану на кватэру Прылюка. Там у халадзільніку стаяла загадзя купленае ім сухое віно. Яму трэба расслабіцца, забыць на пачутае.

Аксана згадзілася, але была сумная.

Паўзмрок ад таршэра... Экран тэлевізара з выявамі голых людзей... Звон шкла... Пяшчотны шэпт... Перарывістае дыханне... Цемра мёртвага сну.

## X

Аксана выйшла з вучылішча. Быў сіні вечар. Дзень відочна падаўжэў. У студзені ў гэты час было ўжо цёмна. Аксана адчувала стому. Хоць яна паздаравела, энергіі на цэлы дзень ёй не хапала. Яна зайшла ва універсам «Рыга» і выпіла два маленькія кубачкі кавы з цукрам. Раней заўсёды піла без цукру: баялася патаўсцець.

Каля піўной стаяў натоўп мужчын. Чуліся крыкі, лаянка. Аксана грэбліва скрывілася. Яна не ведала, чым запоўніць вечар. Колісь такой праблемы ў яе не было. Тэлефанавала сяброўцы, і яны ішлі «здымаць». Але на бурнае жыццё яе надоўга не хапіла. Перастаралася. Цяпер яна з жахам усведамляла яшчэ горшы фінал, які мог яе чакаць. Але — замарачэнне, сустрэча з Пятром... Яна зрабіла адкрыццё: пра што ні пачынала б думаць — успамінала Пятра. Ён увайшоў у ейны лёс нечакана, у самую крытычную хвілю. Выкінуць яго цяпер з жыцця — гэта ўсё роўна што перакрэсліць і само жыццё. Але права на яго ў яе зусім мізэрнае, калі яно ўвогуле ёсць. Ложак — гэта яшчэ не права. У Пятра жонка, двое дзяцей. Ён сказаў ёй пра гэта ў апошнюю сустрэчу. Дарэмна яна ва ўсім яму прызналася. Бесталач! Гэта яго можа адштурхнуць. Але яна ніколі не жыла з аглядкаю, не баялася, што сказанае ёю павернецца супроць яе ж.

Аксана звярнула на вуліцу Сурганава, мяркуючы

выйсці на вуліцу Якуба Коласа і там сесці на трамвай. На яе парывам упаў вецер, пакаціў па снезе шэрую, як мыш, цукерачную абгортку. Ківаючыся, патрэсквалі тоўстыя, няўклюдныя галіны каштанаў. Насустрач ёй самавітай паходкаю ішлі два міліцыянеры з чорнымі гумавымі палкамі ў руках. Два негры неслі вялізную сумку пустых бутэлек, смяяліся — і зубы іх свяціліся ў прыцемку матавымі лямпачкамі. Негры таксама ўваходзілі ў ейны «кантынгент», яна з цяжкасцю пераадолела да іх грэблівасць. Божа, няўжо гэта ўсё было з ёю? Яна думала: як добра было б, калі б чалавек мог адцурацца ад свайго ранейшага жыцця.

У гэтую ноч Аксана зноў доўга не магла заснуць. Нават спалохалася, што за ёю зноў віжуе хвароба. Калі нападзе, яна, Аксана, не вытрымае. Без сумнення, не вытрымае. Божа, злітуйся!.. Няўжо табе патрэбна яшчэ адна маладая смерць? Ейная ўзбуджаная свядомасць выкрасала самыя жудасныя думкі. Палунаўшы над светам, яны ўсе сыходзіліся на Пятру. Ён — адзіны ратунак! З ім ёй добра, яна адчувае сябе ўпэўнена, спакойна. Ён далікатны ў ложку, не гвалтуе яе. Яна адвыкла ад прыстойнага абыходжання, яе прыніжалі, тапталі, здзекаваліся, а яна была бяссільная, яна была ў залежнасці, на ёй вісела бірка путаны. Яна звыклася з гэтай роллю і ўжо не верыла, што нешта памяняецца. Але бываюць цуды на свеце. Дык няўжо зноў вяртацца да ганьбы? Зноў у прорву?

Не, досыць! К чорту сорам! Хто думаў пра яе, калі штурхаў да сексу, алкаголю, наркотыкаў! Жорсткасць, эгаізм, злосць, бруд паўсюдна! Яны кіруюць людзьмі... Яе разбэсціў гэты свет, будзь ён пракляты! Каму патрэбна ейная прыстойнасць, хто яе ацэніць?

Уначы ёй упершыню сніліся прыгожыя сны. Прачыналася праз кожную гадзіну. Аналізавала сны, свой намер, што ўбіўся ў галаву яшчэ звечара. Намер быў страшны.

Раніца чулася ціхая. Туман падымаўся да самых вокнаў. Шыбы знадворку шарэлі ад кропляў, якія расцякаліся срабрыстымі шнуркамі. На голым клёне сядзела чорная надзьмутая варона. Гулка ляпаў песцік: за домам выбівалі дыван. Здурнела насіўся па снезе стракаты, з гарбатай пысаю і кароценькім хвастом эрдэльтэр'ер.

Аксана падмалявала бровы, вусны, налажыла пер-

ламутравыя цені. Дбайна прычасала валасы, туга сашчаміла іх гумкаю на патыліцы. Яна ні перад кім не збіралася красавацца. Проста, ахайная, дагледжаная, яна больш упэўнена сябе адчувала.

Глянула апошні раз у люстра і падышла да тэлефона. Яна не валодала сабою, а таму не магла спыніцца.

— Алё! Вы жонка Пятра? Як вас называць? Ягоная знаёмая... Каця? Дык вось, Каця... Пятро на працы, вы можаце мяне паслухаць. Гэта вельмі важна. І для вас. Вы не хочаце быць вінаватаю ў чыёй-небудзь смерці? Не, я нармальная... ва ўсякім разе, цяпер. Растлумачыць, хто я такая? Я каханка вашага мужа, Пятра... Хвіліначку, паслухайце, калі ласка... Не падумайце, што я звычайная «бэ». Нас пазнаёміла маё няшчасце. Пятро прыстойны, вам няма чаго на яго нападаць. Ён выратаваў мяне ад смерці... магчыма, самагубства. Я маладая, я хачу жыць. А без яго я зноў сарвуся. Кацюша, мілая, родная, аддайце мне свайго мужа. Не-не... Ён тут ні пры чым. Ён не ведае пра гэты званок. Я ўпэўнена, што ён не даў бы мне пайсці на такі крок. Я сёння ўсю ноч амаль не спала. Я не магу без яго. Калі вы не зразумееце мяне, я што-небудзь з сабою зраблю... Не, паверце, гэта не шантаж. Гэта апошні крык душы...— У Аксаны каціліся з вачэй слёзы — чорныя ад размытай тушы.

«Госпадзі, што я нарабіла?..» — Яна аслабела апусцілася на пуфік. Трубка адчайдушна пікала ў яе на каленях.

# Насустрач твайму сэрцу

## Частка першая

### ТРЫВОГА

*Лічу за факт усё,*
*што б я ні сказаў...*

АВІДЗІЙ

...Нарэшце Павел асмеліўся і зазірнуў пад ложак. Там ляжала мыліца. У пыле. Пыл лёгка, бы таполевы пух, засцілаў падлогу. Быў добра відаць і на самой мыліцы — варушыўся, як адуванчыкі на ветры. Мыліца, колісь новая, была чорная. Цяпер фарба на ёй аблушчылася, агаліўшы алюміній.

Ён не праціраў пад ложкам з таго часу, як засунуў туды мыліцу. І нават тады, калі пыл выкочваўся з-пад ложка мяккімі, лёгкімі шарыкамі, ён як бы не прыкмячаў яго і прымушаў сябе верыць, што пад ложкам чыста.

Глядзець на мыліцу і ўспамінаць было яму балюча. Балюча нясцерпна, да слёз. У мужчын слёзы часта замяняюцца спазмаю ў горле. Ад яе, спазмы, яшчэ цяжэй. Гэта ўсё роўна што святлу перакрываць ход.

Павел з хвіліну ўперыста глядзеў на мыліцу. На ўсю. Потым на часткі — на гумавы наканечнік, драўляную пярочку для рукі, касцяны чорны ўпор, што заціскаецца пад пахаю... Адзіная рэч, якую ён пакідаў у гэтым змрочным пакойчыку. Астатнія рэчы — чамадан, скрутак пасцелі, стосы кніг — вынес на ганак.

Здалося, што вочы засцілае пылавая завеса — пыл сухі, з дарогі. Вачам робіцца цёпла, як бывае тады, калі блізка нахіляешся да агню. Мыліца расплылася і трымцела ўваччу невыразнай шэрай палосаю, падобнаю на распятую шкурку зайца. Пыл пабялеў, што снег. Яго страсянула, і ён адчуў, як па спіне халадком пракаціўся шорах...

Павел выпрастаўся і нейкі момант бачыў перад сабою шэрую палосу мыліцы.

Нечакана папрасторнеў пакой, быццам хто рассунуў

сцены. З акна свяціла сонца — з раніцы густое і няяркае, як святло гасніка ў вясковай лазні.

Павел сеў на расхістаны табурэцік — самлелі ногі. На ложак не глядзеў. Нават баяўся павярнуць у той бок галаву. Мацаў невыразным позіркам падлогу: у шчылінах між масніцамі закарэў даўнішні бруд. Потым падняў вочы на сцяну: на ружаватай пабелцы цямнеліся чатыры маленькія плямкі. Там вісела геаграфічная карта Беларусі. Беларусь — на карце кляновы ліст. Зялёны і ядраны, як у шчодрае на дажджы лета. І бурыя плямы на ім. Гэта — раны, нанесеныя вайною,— так недарэчна падумалася яму аднойчы на ўроку геаграфіі, здаецца, у шостым класе, і памяць дасюль захавала гэты вобраз. І ўжо пазней ён дадумаў, што пражылкі на лісце — тыя ж рэкі, як вены на руках. Вены разносяць кроў. Так і рэкі жывяць зямлю. Вада — кроў зямлі.

Ён не думаў ужо пра мыліцу, стала цесна ў грудзях і душна пад кашуляю. Уяўленне малявала перад ім Сож, каля якога ён вырас. Глядзеў на шыбы акна, асветленыя лагодным сонцам, і ўжо не мог стрымаць жадання адчуць тварам і зрэнкамі жывое святло промняў.

Выйшаў на ганак. На нефарбаваным патрэсканым слонцы ляжаў, як тлусты вяпрук, скрутак пасцелі, абвіты ружовым шпагатам. На прыступках стаялі стосы кніг і чамадан.

Сонца ласкава абліло твар пяшчотным святлом. Вільготна блішчала лісце парэчак, што раслі ўсцяж нізкага парканчыка. Рубінава свяціліся забурэлыя ягады. На кожнай вісела знізу чыстая кропля. Наспружыненая, заціхла трава. Лёгкія бэзавыя воблачкі пырніку трымаліся за зямлю ценькімі, як ніткі, чорнымі сцяблінкамі — па іх паўзлі мурашы.

Ад ганка да весніц вяла цэментавая цёмная ад расы дарожка. Павел хадзіў па ёй амаль тры гады. І гэтыя шчарбіны, што там-сям адкрылі чырвоную, як морква, цэглу-сырэц, ад яго абцасаў таксама. Ступалі па ёй і ногі людзей, што прыходзілі да яго, Паўла. Ужо нават адно адчуванне, што нехта да цябе неабыякавы, прыносіць чалавеку імгненні шчасця.

Павел вярнуўся назад у пакой. Апошні раз. Прыжмурыўся, і на лобе ў яго адбілася глыбокая задуменнасць. Ён адчуў, што ў яго напружаную памяць

з невыразнай і далёкай імглы пачынае прабівацца вострае святло перажытага.

Здалося, хіснуўся пакой, як вада ад укінутага ў яе каменьчыка, і спаўзла некуды ўбок столь... Чамусьці і нечакана са страхам падумалася, што, відаць, з такімі адчуваннямі памірае чалавек. За лічаныя секунды ў ягонай галаве праносіцца выразнымі кадрамі ўсё жыццё і людзі, сярод якіх ён жыў...

## 1

Падобны на гіганцкі ліхтар кіёск стаяў каля ўвахода ў вакзал. Павел спытаў у кіяскёра, як знайсці яму рэдакцыю раённай газеты.

— На працу, новы карэспандэнт? — Кіяскёр, лупавокая сівая жанчына, мусіць, ужо навучылася тут, у багатым на незнаёмых людзей месцы, распазнаваць чалавека. Паўлаву руку адцягваў напакаваны чамадан.— Пяройдзеце пуці, будзе парк. За паркам вуліца. Па той вуліцы пойдзеце направа да перасячэння з наступнай. Звернеце ўлева, пойдзеце прама, і пяты дом злева будзе ваша рэдакцыя.

Павел падзякаваў, запомніўшы толькі адно, што трэба перайсці пуці, за якімі будзе парк.

Чыгуначнае палатно тут было шырокае, і, трохі пратупаўшы паўз яго, Павел трапіў на дошкі між рэйкамі — пераход. Збоч стаяў слуп з дзвюма коса скрыжаванымі паласатымі планкамі.

Ён перайшоў па вузкім, адно размінуцца, мастку пуці. І адразу ўбачыў парк. Здавалася, дрэвы трымалі на сабе высокае блакітнае неба. І сонца на ім было такое лёгкае, як адуванчык, і падобнае на адуванчык.

Ліпень — месяц сонца і адуванчыкаў.

Ад сонца не было ніякага схову. Яно бязлітасна смаліла. Курэла паветра, як празрыстая тонкая павуціна. І навошта яно так смаліць цяпер, сонца, калі зусім не трэба Паўлу, калі яму млосна ад думкі, што трапіў сюды, у Глушава — зусім незнаёмае месца, у якім трэба прыжывацца, быццам нанава нараджацца на свет? Чаму ж гэтае сонца хавалася за хмарамі тады, калі Павел быў месяц дома, у вёсцы, і, ходзячы з бацькам на луг, хацеў хоць трохі пацямнець, засмугліць цукровую белізну цела?

«Няўжо жыццё — гэта адны супярэчнасці? — думаў Павел.— Нават у прыродзе, дзе ўсё як быццам суладнае. Ці гэта яна, прырода, бывае жорсткая адно да людзей, а мы, людзі, да яе?..»

Павел спярша адчуў, што апынуўся ў перакрыжаванні вузкіх доўгіх ценяў. Потым ужо ўбачыў сябе ў акружэнні дрэў — выносістых, як мачты, тапаляў. Здалося, патыхнула ў твар свежаком. Паволі адкацілася дарожная млявасць, і на душы адразу палягчэла. Так бывае тады, калі, змучаны смагаю, пап'еш крынічнай вады, якая здасца салодкай-салодкай.

Парк быў стары і пануры, як кінутая за пакідзішча хата. Трава, даўно не кошаная, стракацела ад недакуркаў, шматкоў паперы, цукерачных абгортак, кавалачкаў шкла. Ствалы тапаляў знізу пакрываў зялёны шчыльны мох — кароценькі, як аксаміт. Ён парос, пэўна, увесну, калі было сыра. Тонкія пруцікі парасткаў браліся ад самага камля і на тоўстым ствале глядзеліся нязвыкла, журботліва-сумна. Такое пачуццё з'явілася ў Паўла, помніцца, год назад, калі ўбачыў у тралейбусе дыстрафічна недаразвітыя рукі ў здаровага, чырванашчокага мужчыны.

Павел забраўся ў глыб парку і сеў на лаўку. Каля яе была вытанцавана да зямлі трава. У кусце жоўтай акацыі на абламаным суку вісела брудная, у ружовых падцёках шклянка. Павел грэбліва зморшчыўся. І нядобра падумаў пра тых, што, уцякаючы ад жонак, дзяцей, ідуць сюды, у сховішча, несучы ў кішэнях бутэлькі з віном.

Міма лаўкі, шнырачы вачыма вакол сябе, прасунулася прыгнутая, бы крук, бабулька з ёмістай палатнянай торбаю, у якой у такт нястройнай хадзьбе пералíўна пазвоньвала шкло. Услед за бабулькаю тупаў рабы кот з абсмаленым хвастом — тонкім, як у свінні. Прыкмеціў Паўла, спыніў на ім свае янтарныя вочы; мурлыкнуў, падбег да лаўкі і пачаў нюхаць зямлю, потым Паўлавы туфлі.

Раптам уверсе нешта залопала і пачулася тугое: гугу, гу-гу... Павел задраў галаву: на таполі сядзела пара галубоў. Самец, попельна-шэры, з бэзавым бліскучым валляком, падсоўваўся шчыльней да самачкі, наструнена-прыгладжанай, узбуджанай, і лёгенька кляваў яе ў шыю, каля вока. Яна, паварочваючы зграбную галоўку бокам, недаверліва касілася на зямлю, на лаўку, дзе

сядзеў Павел, акурат разумела, што на тое, чаго дамагаецца яе галантны кавалер, не створаны поўны інтым.

Праз гэтую птушыную забаву Паўлу стала яшчэ маркотней. Як там Люда? Яны рассталіся з ёю няпэўна, нічога не паабяцаўшы адно аднаму. І ўвогуле ўвесь час у іх былі нейкія няпэўныя адносіны. Потым яна прыслала яму ў вёску пісьмо — ужо не з Мінска, дзе працавала, а з Плешчаніц, дзе служыў яе бацька і куды яна паехала адпачываць. Гэтае пісьмо ляжала цяпер у Паўла ў кішэні. Ён дастаў яго, разгарнуў: «...сумую. Тэатраў у нас няма. Дома афіцэраў таксама няма. Ёсць адзін рэстаран, дый то збіраецца там сумніцельная публіка... Вось прыехаў днямі Маскоўскі заацырк, прывезлі нейкіх дохленькіх сланоў, малпачак і птушак. Пойдзем з Андрэем глядзець сёння. Ты, я думаю, помніш майго пляменніка, так падобнага на мяне? Ён цяпер у нас, так што... Праўда, у выхадныя бываюць танцы на верандзе. Добра, што веранда побач, дык мы з сяброўкаю сходзім, як я кажу, пад веранду... Можа, наша расставанне і было крыху сухім, нейкім няпэўным. Але што трэба было, я ўбачыла і пачула. Часта чалавека можна зразумець па вачах. Ну а што я некуды спяшалася, табе здалося. Ты калісь казаў, што я магу добра іграць ролю закаханай. Не ведаю, ці так гэта, але тут мае здольнасці мяне падвялі. Гэта, калі хочаш, было адзінае выйсце — рабіць выгляд, што спяшаюся. Можа, таму, што ў такія моманты наступае паўза, якую не ведаеш, чым запоўніць, і тады вымаўляеш: «Ну, мне пара...» А можа, баішся нешта страціць і адыходзіш, каб гэтае «нешта» засталося з табою. Ці, можа, зноў загаварыла твая гордасць, якая, дарэчы, іншы раз чалавеку шкодзіць. І яшчэ мільён «можа»... Так што будзем лічыць наша расставанне загадкавым. Добра?»

Павел засунуў пісьмо назад у кішэню. Думкі неадчэпна віліся вакол яе, Люды. Яна, мусіць, сапраўды сумуе без яго. Так хочацца зноў у Мінск, убачыць там Люду і ўстрапянуцца ад яе порсткага пагляду. Першы раз, як толькі сустрэліся, яе вочы кальнулі яму ў твар, як рожкі дзікай казулі, хоць было бараніся ад іх.

Яны пазнаёміліся з Людаю ў сям'і паэта Ляшчэні.

Калі б Ляшчэню адкінуць гадоў дзесяць і калі б не была ў яго сівой яшчэ маладая галава, Павел мог бы назваць яго сваім сябрам, проста Мішам. А так — Міхась Пятровіч.

Колісь, вучнем, Павел дасылаў у піянерскую газету допісы. Іншы раз атрымліваў з рэдакцыі лісты, падпісаныя Ляшчэнем. Радасць была вялікая яшчэ і таму, што ў газеце Ляшчэня друкаваў свае вершы. А потым ён прыслаў Паўлу тоненькую кніжачку з аўтографам: «Майму добраму і стараннаму сябру, Паўлу Дробу, з пажаданнем удач у вучобе. Паэт Міхась Ляшчэня».

У дзевятым і дзесятым класах, якія заканчваў у райцэнтры, Павел ужо не меў часу пісаць у газету, і сувязь з Ляшчэнем абарвалася. Адно іншы раз, устурбаваны незразумелым глухім сумам, Павел успамінаў Ляшчэню і думаў, што ў далёкім Мінску ёсць чалавек, не проста чалавек, а паэт, які ведае яго, Паўла Дроба. Душа напаўнялася шырокім, быццам у маі, трапятлівым святлом.

Потым быў Мінск, універсітэт. І толькі аж на чацвёртым курсе знаёмы Паўла Вадзік Касабуцкі, што вучыўся двума курсамі ніжэй, а разам іх сабрала камсамольскае бюро факультэта, сказаў: «Забываеш, Дроб, старых сяброў... Ляшчэня здзівіўся, што ты тут і што я ведаю цябе...»

Вадзік Касабуцкі лічыўся на журфаку паэтам. Змяшчаў у насценгазеце вершы, да якіх не саромеўся рабіць прыпіскі: «Я шчаслівы тым, што нарадзіўся песняром сваёй зямлі і цяпер упэўнена пракладваю свой шлях у літаратуру. Аўтар».

Увогуле дзіўныя людзі паэты. У гэтым Павел пераканаўся, ходзячы да Ляшчэні. Спачатку разам з Касабуцкім, а потым і адзін.

У Ляшчэні заўсёды была кампанія. На кухні грымела такая гамана, што здавалася, трапляеш на вяселле ў вясковую хату, а ў сапраўднасці — на звычайную размову трох чалавек, якія лічылі сябе паэтамі.

Сам гаспадар, Ляшчэня, якраз быў чалавек флегматычны, і голас у яго гучаў густавата-прыглушана, ды ўсё роўна ад спрэчак не ўхіляўся і ён, кідаў тады-сяды рэплікі сваім тэмпераментным калегам.

Спрачаліся аб розным, а часцей, прыкмеціў Павел,— як пісаць і аб чым пісаць. Здаецца, ніколі б нават блізка не падумаў, што тых, хто складае вершы, турбуюць такія пытанні.

Невысокага росту паэт, з чорнымі вугельчыкамі вачэй і тоненькімі вусікамі над верхняй губою, якія рабілі яго падобным на цвыркуна, даказваў, што творы па-

вінны адлюстроўваць жыццё, паказваць чалавека на скрыжаванні праблем і канфліктаў.

— Ты хочаш сказаць, што мастацтва павінна ўзбагачаць чалавека жыццёвым матэрыялам? — удакладняў паэт у рудой скуранцы. Ён любіў піць віно з рыльца, на якое потым, адстаўляючы бутэльку сабе пад ногі, клаў радыску карэньчыкам уніз.— Ну гэтак жа, па-твойму, атрымліваецца, раз нашы творы павінны адлюстроўваць жыццё?

Першы паэт няўпэўнена згадзіўся, разгублена шукаючы ў думках, чым адказаць на тое, што зараз пачуе.

— Валіць на чалавека гэты жыццёвы груз і хаос, маўляў, разбірайся сам,— ты лічыш мастацтвам?

— Ты утрыруеш.

— Не утрырую, а хачу сказаць, што мы павінны ўзбагачаць чалавека не жыццём... яно і так багатае да немажлівасці, а думкамі аб жыцці. Ну, скажы, навошта нам паказваць яму тое, што ён сам не менш балюча, чым мы, адчувае на сабе? Словам, ці трэба і ці наша задача ўскладняць чалавеку жыццё?

— Ну дык вось мы і падносім яму на спадачку яго вялікасць жыццё, а ён ужо, зыходзячы са свайго вопыту, інтэлекту і гэтак далей, няхай думае...

— Каб раздумваць над жыццём, неабавязкова чытаць твае кніжкі, дастаткова глянуць у акно або зайсці ў магазін.

— Але ён не ўбачыць тое, што ўбачу я, паэт.

— А навошта яму твае вочы і твой слых? Ты дай яму свае думкі, што з'яўляюцца ў цябе, калі ты глядзіш у акно, а ён іх параўнае са сваімі і вызначыць, дзе ісціна і як лепш жыць. Дай яму сваё разуменне чалавечай душы, дабра, зла!

— Ты што, зусім адмаўляеш падтэкст?

— Падтэкст той, які ты маеш на ўвазе,— гэта штосьці туманнае, уяўная шматзначнасць, у якой у наш век НТР ніхто капацца не будзе. Ты дай чытачу думку з падтэкстам, і ён запіша яе ў блакнот. Вось Багдановіч:

З гэтых дзедаў суворых прыклад нам бы ўзяць
Не хіліцца з бяды, не пужацца агня,
Бо мы толькі тады дачакаема дня,
Калі нас не здалее змаганне злякаць.

Што гэта? Паэзія думкі! А твой верш на цэлую старонку, дзе адны маляўнічыя ілюстрацыі, якія нібыта ствараюць настрой, упэўнены, запісваць ніхто не будзе.

Ён яму не трэба, нічога не дае, а калі дае, дык толькі на тое імгненне, калі чытаеш. Гэта акурат як з яблыкам: пакуль грызеш — адчуваеш смак, а потым, калі з'еў, можаш адно ўявіць гэты смак. І толькі. А карысці ўжо ніякай.

— Братцы мае, вы пачалі зусім беспадстаўную спрэчку.— Ляшчэня тушыў недакурак на алюмініевай шапачцы ад бутэлькі.— Тут жа так проста: кожны паэт даносіць свае думкі і пачуцці да чытача толькі ўласцівым яму чынам. А прымаць ці не прымаць іх чытачу — не наш клопат. Усё залежыць ад таго, наколькі блізкімі мы аказаліся да жыццёвай праўды. Мастацтва не цярпіць фальшу! Вы забываеце на вельмі важнае ў вашай гаворцы паняцце — творчая індывідуальнасць. І вучыць некага пісаць так, як ты, прынамсі — нетактоўна. Аб чым Маякоўскі марыў? «Побольше поэтов хороших и разных». Розных, разумееце? Чытаць кніжкі прымушаюць толькі ў школе, а школьнікі, як вядома, гэта яшчэ не ўвесь чытач. І калі не прымяняць кніжку як сродак ад бяссонніцы, то за яе не пасадзіш сілаю чалавека, ён сам ведае і знойдзе, што яму чытаць.

Разважлівы, памяркоўны Ляшчэнеў тон на якісьці час астуджваў гарачыя галовы.

Такія не зусім зразумелыя размовы Паўлу даводзілася чуць даволі часта і, што рэдка бывала, нават падтрымліваць іх. Папраўдзе, ён пачуваўся ніякавата, асабліва тады, калі яго прымушалі піць віно, і, мусіць, ужо б адмовіўся хадзіць да Ляшчэні, каб не пасябраваў з Юркам, чатырохгадовым Ляшчэневым сынам. Юрка, белабрысы, хударлявы, у акулярах ад касавокасці, адно шкельца якіх было залеплена пластырам, быў надзіва цікавы малы. Павел часта вадзіў яго на вуліцу. Неяк прыпыніліся каля аўтамата выпіць газіроўкі. Юрка ўбачыў за шклом, дзе гарыць лямпачка, асвятляючы назвы сіропаў, вос і спытаў: «Яны грэюцца там?» А то ехалі ў тралейбусе, з якім стаў размінацца «Ікарус», і Юрка выгукнуў, паказваючы на акно: «Дзядзя Паша! Дзядзя Паша, глядзіце кіно!» Паспрабуй не павер цяпер, што ў дзяцей багатая фантазія.

Ляшчэнева жонка, маладая зграбная жанчына з тварам арыстакратычнай белізны, на якім выразна і наіўна-даверліва блішчэлі шэрыя вочы, працавала медсястрою і завочна вучылася на філфаку універсітэта. Яна, мусіць, ужо прывыкла да гармідару ў кватэры і,

здавалася, зусім абыякава падмятала з падлогі недакуркі, кардонныя кружкі ад коркаў, запалкі і попел.

Паўла сустракала зазвычай прыветліва, з усмешкаю, і ён кожны раз здзіўляўся чыстаму мармуру яе зубоў. І вось гэтая абаяльная сваёй прастатою жанчына адным днём — лета кацілася ўжо на восень — прывяла з сабою дзяўчыну, сяброўку па вучобе. Яны толькі што здалі экзамен па навуковым камунізме і з гэтай нагоды прынеслі бутэльку шампанскага. Звалі дзяўчыну Люда, і была яна блізка адных гадоў з Паўлам. Твар у Люды быў смуглы, мусіць, не толькі ад сонца, а яшчэ і таму, што сама прырода экіпіравала сваё дзіця ў такую смуглую скуру. Круглыя карыя вочы з блакітнаватымі бялкамі выпраменьвалі пранізлівае святло.

Павел адчуў гэта адразу, як толькі глянуў на дзяўчыну. І потым ужо за сталом, з бакалам шампанскага ў руцэ, ён раз-пораз адчуваў на сабе ейны пякучы пагляд, які, здавалася, пратыкаў душу наскрозь, як аловак паперу.

Як ні дзіўна, шампанскае амаль не падвесяліла іх, і гаворка вязалася напята і стрымана; яна была з тых гаворак, якія мала спрыяюць збліжэнню, а толькі, не даючы людзям выявіць сябе, сеюць між імі недавер ды пачуццё пагарды.

Люда сказала, што пойдзе дахаты, бо адчувае стомленасць. Павел, нечакана для сябе, намерыўся яе праводзіць. Такі ягоны жэст спадабаўся Ляшчэневай жонцы, яна шматзначна міргнула Людзе.

Бралася на вечар, але сонца ўжо не было: на захадзе стаялі густыя круглыя воблакі, ружовыя, як разрэзаны кавун. І ружовасць гэтая нараджала ў Паўлавай душы не то незразумелую трывогу, не то няпэўную, нейкую расплывістую мару.

У пыльных лужынах на тратуары плавала жоўтае лісце. І лісце тое чамусьці пахла грыбамі.

Люда з сумам глядзела сабе пад ногі — вострыя мысы яе туфляў неяк запаволена плылі над асфальтам; цокату абцасаў амаль не было чуваць, толькі ціхі шоргат, акурат ад лодкі, што ўспаўзае на пясок.

— Дзе жыве мадэмуазель Людміла? — Павел знарок сказаў фрывольным тонам — каб наладзіць гаворку.

— Судару трэба канкрэтна пытацца,— нечакана падтрымала ягоную гульню Люда.— Бо я магу сказаць,

што і ў Плешчаніцах, куды амаль кожныя выхадныя езджу да сваіх бацькоў.

— Ты нарадзілася ў Плешчаніцах? Я быў там, у сябра на вяселлі.

— Не, гэта — апошняе прыстанішча майго бацькі. Ён у мяне ваенны. А нарадзілася я ў Германіі, у Патсдаме.

— Нават так!

— Магу ганарыцца — пабачыла свет.

Павел здзівіўся. Сам ён покуль далей Мінска нідзе не быў, калі не лічыць экскурсійную паездку ў Ленінград. Беражна, у фальгавай рамачцы, захоўвае здымак, на якім стаіць ён каля серабрыстых таямнічых фантанаў Петрадварца.

І Павел у якісьці момант задуменнасці адчуў, што ідзе з Людаю не проста так, што наперадзе іх чакае калі не моцная дружба, то, прынамсі, блізкае сяброўства. Бывае ж іншы раз: толькі ўбачыш чалавека, яшчэ і не загаворыш з ім, а ўжо не сумняваешся: табе будзе прыемна бачыць яго, чуць голас, і ўсё, што звязана з гэтым чалавекам — людзі, пакой, рэчы,— спадабаецца табе, і думка аб ім будзе радаваць ды хваляваць ціхаю ўзрушанасцю сэрца.

Тралейбус павёз іх у раён Паўднёвага Захаду. Там Люда здымала аднапакаёўку. Кватэра належала старой, якая ад снегу да снегу жыла на дачы, недалёка ад Мінска, у мястэчку Зялёнае, і адно прыязджала два разы ў месяц: па кватплату і памыцца ў ваннай.

Вуліца паката вяла ўніз, тратуар быў няроўны, і Павел папрасіў у Люды дазволу ўзяць яе пад руку. Яна глянула на яго позіркам, з якога чыталася: «Не жартуй!» — і манерна адставіла локаць.

Каля пад'езда шасціпавярховага дома рос каштан, і шышкі ягоныя раскаціліся па зямлі маленькімі натапыранымі вожыкамі. Павел падняў адзін, спрытна вышчалукнуў з яго дзве бліскучыя рудыя палавінкі і аддаў іх Людзе.

— Твае вочы.

Гэта было так нечакана і смехатворна проста, што Люда спачатку разгубілася, а потым звонка засмяялася. Ёй спадабаўся жарт. Скрозь глыбокі, прыемны смех сказала:

— Сапраўды, нешта агульнае ёсць.

— Тады я забяру іх сабе — каб помніць...

— Калі палічыў, што было мала часу на запамінанне,— усё яшчэ ўсміхаючыся, сказала Люда,— магу даць больш. Запрашаю цябе ў дом. Люблю і ўмею рыхтаваць каву і... частаваць ёю гасцей.

Пакой быў даволі прасторны, з дыванамі на падлозе і сценах. Люда пасадзіла Паўла на канапу, дала альбом з фотаздымкамі. Сама пайшла на кухню. Неўзабаве вярнулася, ужо ў газавай ружовай хусцінцы на галаве, падала яшчэ кіпу фотаздымкаў у чорным канверце.

Павел паволі гартаў альбом і ўсюды, адну ці ў кампаніі, пазнаваў Люду, яшчэ зусім малую, з пухлымі шчочкамі і плаксіва скрыўленым роцікам, потым падрослую ўжо, перад школаю і ў школе — задумлівую каля дошкі і ўрачыстую на піянерскай лінейцы... Была ў Паўла такая асаблівасць зроку — пазнаваць на фотаздымках знаёмых людзей, нават тых, якія з узростам прыкметна змяніліся.

Вось серыя каляровых фотаздымкаў, проста на іх — у куточку — белымі сплюшчанымі літарамі напісана: «Поўдзень. Гудаута. 1973 год». Фатограф зняў Люду ў самых розных, часам нечаканых, паставах. Люда бяжыць, імклівая, наструненая, як птушка, насустрач тугім выпадам ветру і выгнутым зялёным грабяням хваль, што гатовы захліснуць яе з галавою... Рукі ў яе раскрылены, у іх таямнічае ўменне жанчыны дэманстраваць зграбную постаць. Жоўтым, празрыста-трапяткім полымем уюцца за спінаю валасы, і жыва ўяўляецца, як мякка ахінуць яны загарэлыя да чарнаты плечы і закрыюць сабою точаную глыбокую лагчынку між лапатак.

У чорным канверце былі фотаздымкі хлопчыка год пяці, вельмі падобнага на Люду, акурат гэта быў ейны сын. Такі ж крыху выпуклы лоб і пад ім круглыя дзяркатыя вачаняты, кірпаты нос і мякка прытуплены падбародак. Гэтае падабенства надта кідалася ў вочы там, дзе хлопчык быў сфатаграфаваны разам з Людаю — на руках у яе ці побач з ёю.

З адным здымкам Павел, здзіўлены, прыйшоў на кухню.

— Твой? — не мог ён стрымаць усмешкі.

— Мой... пляменнік,— Люда памешвала лыжкаю ў высокенькай жоўтай кававарцы, што стаяла на пліце.— Рэдкі выпадак: сын сястры, якая зусім не такая, як я, і тварам, і характарам, падобны на мяне.

— Любіш дзяцей?

— Прызванне, як пішаце вы, журналісты. Працую ў дзетсадзе.

— Выхоўваеш, значыць, будучую змену. Гэта высакародна, як... пішам мы.

Люда какетліва схіліла галаву і глядзела на Паўла аднымі блакітнаватымі бялкамі — гэта была яе прывычка.

Потым яны сядзелі за сталом і пілі каву з маленькіх фарфоравых кубачкаў, аблінееных залацістымі абручыкамі. Люда была спахмурнелая і ўвесь час глядзела ў акно. Ужо добра сцямнела. Можна было запальваць святло. Люда чамусьці не запальвала. Вяршок патухлага сонца яшчэ вытыкаўся над горадам, і лісце на верхавіне каштана барвяна блішчэла і варушылася. У закутку суседняга дома вецер круціў, падымаючы да самага даху, брудныя паперы.

Люда над нечым думала, і глыбіня ў яе карых вачах была таямнічая і ўражлівая.

Задуменнасць гэтую Павел часта бачыў на Людзіным твары і потым, калі пачаў сустракацца з ёю. Сустрэчы іх былі звычайныя. Хадзілі ў кіно, на канцэрты. Зрэдку наведвалі нават кавярню ці рэстаран, у якіх пілі каву і лёгкае сухое віно, а то проста бадзяліся па вуліцы, размаўлялі.

І была ў іх размовах, адчуваў Павел, недамоўка, якая псавала абаім настрой, надта Людзе. Словы развітання звычайна абрываліся на той ноце ў голасе, на якой пажылы чалавек, ківаючы галавою, прарочыць маладому незайздросную будучыню і робіць гэта так, каб яго не пакрыўдзіць.

Іншы раз Павел прыходзіў да Люды на кватэру. І яна тады як бы між іншым, ды з непрыхаванаю тугою ў голасе магла сказаць: «Здаецца, так прыемна было б сустрэць мужа, пацалаваць яго, прыхінуцца...» Або выпадкова пакінуць на стале сваю ашчадкніжку з трыма тысячамі рублёў ці паказаць райвыканкомаўскую паперу на кватэрную чаргу.

Паўлу тады рабілася шкада Люду, і нават уявіць было страшна, што можна яе пакрыўдзіць ці нешта развядзе іх і не дазволіць сумесна ладзіць жыццё. Ён, нявопытны, летуценны студэнт, думаў: «Няўжо з жаласці пачынаецца каханне?»

Вучоба ў Паўла блізілася да завяршэння, і Люда

зажурылася яшчэ больш. Вельмі часта турбавалася, куды яго размяркуюць. І турботы гэтыя, здавалася тады Паўлу, былі хутчэй спачуваннем, чым эгаістычным дзявочым разлікам: куды-небудзь далёка размяркуюць — ускладніць сабе жыццё. Як ён чыста глядзеў тады на свет!

...Павел сядзеў, ніца апусціўшы галаву. Хтосьці падышоў да яго. Цень слізгануў па нагах, пераламаўся каля паясніцы і дапоўз да грудзей. «Зноў бабулька?..»

Павел падняў вочы — і жахнуўся: перад ім стаяў чалавек з белым, як у мерцвяка, тварам; яе, гэтую белізну, яшчэ больш адцяняла густое чорнае шчаціння на худых пашчэнках. Вочы ў чалавека былі невыразныя, як плаўленае шкло,— так, падумалася, яны маглі памутнець ці то ад вар'яцтва, ці ад дзікага болю.

Чалавек колькі хвілін не міргаючы глядзеў на Паўла пустымі вачыма. Чалавек быў страшны. Не дай божа сустрэць такога чалавека ў незнаёмым, бязлюдным месцы, калі спалохаешся вераб'я, што znячэўку выпырхне з-пад ног.

— Курыць маеш? — мёртвым голасам спытаў чалавек, і словы прагучалі аднекуль знутры, быццам не з рота, а праз сценку грудзей.

— Не куру я!..— вырвалася ў Паўла. Страшны чалавек не адводзіў ад яго вачэй, у якіх цяпер, здалося Паўлу, застылі, мутна заплавіліся дакор і нянавісць і ад якіх ажно кружылася галава.— Няма ў мяне цыгарэт...— Павел паляпаў па пустых кішэнях.

— Я бачу.— Чалавек сеў на край лаўкі, уперыўшы позірк сабе пад ногі. У яго былі закаржанелыя ад гразі чаравікі без шнуркоў — языкі павылазілі і тырчалі, сагнутыя, як у зморанага сабакі.

Чалавек сядзеў не варушачыся, бы статуя.

Павел не ведаў, што рабіць: ці то ісці — а раптам ён кінецца ўслед? — ці сядзець і маўчаць.

— Сёння добрае сонца,— сказаў, нарэшце, ён. Чалавек міргнуў вачыма, але не зварухнуўся.— Пасля дажджу во прыпар, і так зяляніна буяе...— Словы самі злятаы з вуснаў — першыя, што прыходзілі ў галаву.

Чалавек быў як камень.

— Сапраўднае лета...

Чалавек не загаварыў, моўчкі падняўся з лаўкі і пайшоў. Павел паспеў заўважыць хваравіты бляск яго-

ных вачэй. Крыссе старэнькага пінжака з адарваным хлясцікам вольна матлялася, як перабітыя крылы ў птушкі.

«Дзіўны чалавек!..— выдыхнуў з сябе паветра Павел.— Не хацелася б пачынаць тут жыццё з жахаў».

Час быў абедзенны, і Павел не спяшаўся.

...Ён адчыніў дзверы прыёмнай рэдактара не пастукаўшы і пашкадаваў. Ды адступаць было позна. Дзяўчына, машыністка — ён бачыў яе са спіны,— перагнуўшыся праз два ссунутыя сталы, палівала з конаўкі вазоны, шчыльна выстраеныя на падаконніку. Ён паспеў ужо апусціць вочы на чамадан і шукаў месца, дзе яго паставіць. Дзяўчына села на крэсла. Трымала ў руцэ конаўку і не ведала, куды яе прыткнуць. Сядзела наструненая і збянтэжаная.

Павел падышоў да стала. У дзяўчыны былі блакітныя, чыстыя вочы і ледзь падведзеныя чорнай тушшу вейкі.

Павел сказаў, што яму трэба да рэдактара.

— Пятра Цімафеевіча няма,— адказала дзяўчына.— Будзе праз паўгадзіны.— Голас у яе быў ціхі і мяккі, здаецца, яго заглушыў бы самы нясмелы шолах лісця: няхай толькі прарвецца ў фортачку вецер.

Павел, адразу адчуўшы, што размовы, лёгкай, пуставатай, якая звычайна дае пачатак знаёмству маладых людзей, не атрымаецца, сказаў:

— Пачакаю на вуліцы, а чамадан пакіну тут.— Дзяўчына яму спадабалася.

Ён выйшаў. Сступіў з ганка на драцяны ходнік, потым на зямлю. Пад кустом бэзу, што наваліўся на зялёны штакетнік, стаяла лаўка, збітая з тоўстых планак. Бліжэйшы край лаўкі быў у цяні, і Павел сеў у гэты цень, падцяўшы пад сябе ногі, абутыя ў чорныя туфлі. Угледзеў на зямлі кучачку жоўтага пяску — лавіў на ёй вачыма дробных, што мак, мурашоў.

Пачуўшы лёгкія крокі, падняў галаву і ўбачыў дзяўчыну. Яна была ў доўгай зялёнай, з сінімі касачамі, сукенцы. На загарэлых тонкіх нагах какетліва сядзелі белыя на высокім абцасе басаножкі. Густыя каштанавыя валасы, мусіць, крыху штучна асветленыя, былі скручаны на патыліцы ў акуратную, тугую куклу, якая прыдавала галаве ганарлівую пасадку, а ўсёй постаці зграбнасць і лёгкасць.

Гледзячы дзяўчыне ўслед, Павел падумаў, што ёсць

у ёй нешта задзірлівае. І толькі цяпер чамусьці звярнуў увагу на будынак рэдакцыі. Ён быў аднапавярховы, ашалёваны вузенькімі дошчачкамі і пафарбаваны ў чырвона-руды колер. З частымі высокімі вокнамі без ліштваў, адно белыя рамы, з якімі кантраставаў чорны бляшаны дах.

— Добры дзень! — нечакана пачуў ледзь не пад вухам Павел. Каля яго спыніўся круглатвары, з пляскатым, як у качкі, носам малады чалавек. Ягоны жывот спраўна аблягала белая безрукаўка з вышытымі на кішэнях макамі.— Новенькі? Я так і падумаў адразу. Чакаем! Мая персона таксама ўладкоўваецца сюды...— Чалавек усміхнуўся, сеў побач. Выняў з кішэні працоўную кніжку з шэра-сталёвымі, растрапанымі па ражках вокладкамі. Глянуў на Паўла рудаватымі, блізка пасаджанымі вачыма. Паўла здзівілі зрэнкі — шырокія, як у ката прыцемкам, яны, здавалася, хавалі ў сабе шмат набалелага.— Толькі я не навічок...— Ён падаў Паўлу працоўную кніжку ганарлівым узмахам рукі.

Павел разгарнуў кніжку. У ёй было надзіва багата запісаў — некалькі старонак. Павел усё не чытаў: «Калгаснік калгаса «Уперад» Глушаўскага раёна... Загадчык арганізацыйнага аддзела Глушаўскага райкома партыі...» Глянуў на прозвішча: Аднамах Яўген Цітавіч, 1947 года нараджэння. Здзівіўся, што біяграфія для маладога чалавека вельмі багатая, і Аднамаху гэта спадабалася. Ён лізнуў языком па вуснах, усміхнуўся: скура на шчоках, чыста, да сіні выгаленых, напялася і заблішчала.

Ляпнулі дзверы, і на ганку з'явілася машыністка. Засланяючы рукою вочы, бо ў твар свяціла сонца, сказала, што прыйшоў Пётр Цімафеевіч. Павел сумеўся: няўжо прамаргаў? Калі? Аднамах, акурат прачытаў ягоныя думкі, супакоіў: у рэдакцыі двое дзвярэй, адны з тыльнага боку.

У Пятра Цімафеевіча, пажылога чалавека з рэдкімі кароценькімі валасамі на цемі, былі жвавыя, як у ваверкі, рухі. Ён як не падбег да Паўла, тыцнуў яму левую руку. Правая была скалечана ў вайну, не хапала трох пальцаў, пачынаючы ад вялікага, і ён трымаў яе ўвесь час, па звычцы, пад левай пахаю. Запрасіў садзіцца, паказаўшы на рад цвёрдых крэслаў паўз сцяну.

Павел аддаў накіраванне. Пётр Цімафеевіч стаў чытаць яго, прыціскаючы левай рукою да стала. Некалькі

разоў хіхікнуў, глянуўшы на Аднамаха, які сеў не каля сцяны, дзе Павел, а за стол. Аднамах што — журналіст бывалы, ужо працаваў на радыё, у рэдакцыі, адкуль і пайшоў у райком. Пісаць умее, раён ведае як свае пяць пальцаў. Яму і пасаду вышэйшую трэба даць — старшага карэспандэнта. Пётр Цімафеевіч зноў захіхікаў пад нос, ствараючы аб сабе ўражанне легкадумнага чалавека, хоць такі не быў. Проста ён паводзіў сябе як тыповы халерык, у якога да таго ж было раненне, а потым і турботлівая праца раённага журналіста папсавала нервы. А як быць з новенькім?

Аднамах, адчуўшы настрой Пятра Цімафеевіча, памалу, не спяшаючыся, устаў з-за стала. Паправіў крэсла. Ступіў быў да дзвярэй, ды затрымаўся, напомніў Пятру Цімафеевічу, што заяву ён аддаў яшчэ ўчора і яна павінна ляжаць у сейфе. Усміхнуўшыся Паўлу, выйшаў.

— Так-с, Павел Іванавіч Дроб... Што з вамі? — Пётр Цімафеевіч крутнуў лысай галавою. Становішча ў яго было нялёгкае, калі не сказаць — вельмі складанае. Прапануй пасаду карэспандэнта на сто дваццаць рублёў — можа пакрыўдзіцца. А новага чалавека няёмка крыўдзіць, адразу засмучаць. Пачынаць заўсёды трэба з добрага. Пётр Цімафеевіч шчыра перажываў і быў зусім бездапаможны ў сваёй мітусні. Асцярожна, як бы між іншым, гатовы ў любую хвіліну памяняць сваю думку, намякнуў Паўлу пра аклад. На здзіўленне, пачуў спакойны, цвёрды голас: «Хопіць». Але ў Пятра Цімафеевіча была яшчэ адна закавыка: як быць з Наташаю Мікрашэвіч? Ён забарабаніў пальцамі левай рукі па стале — у паліроўцы пазногці выцягнуліся доўгімі і тонкімі спіцамі,— правую руку засунуў пад паху. Чалавек жа працуе і, здаецца, не думае звальняцца. Але толку з яго... Толькі вершыкі крэмзае ды манікюрчыкі наводзіць. Ягоныя вусны зноў кранула блазенская ўсмешка.

Павел, наглядаючы за Пятром Цімафеевічам, не разумеў, што таго непакоіць. Чалавек як на іголках. Вось хапіў са стала шклянку і наліў з графіна вады, выпіў — і скрывіўся. Вада, мусіць, была цёплая. Графін стаяў на сейфе, куды смаліла зараз сонца.

— Ну добра, добра!.. Нешта прыдумаем,— сказаў Пётр Цімафеевіч, не то супакойваючы сябе, не то звяртаючыся да Паўла. Падхапіўся, паскроб левай рукою

патыліцу. Выкруціцца, не можа быць. Не сам, дык з божаю помаччу. Вось зараз пойдуць яны з Дробам да сакратара райкома партыі. Зараз? А хто народ будзе азадачваць? Ён думаў некалькі секунд і вырашыў, што народ — не дзеці, а дарослыя людзі, як-небудзь азадачыцца сам. Штодня адно і тое настаўляй ім: своечасова здавайце матэрыялы, добра вычытвайце пасля машынкі. Ужо язык забалеў. Ён адамкнуў сейф, кінуў туды накіраванне, замкнуў і паказаў Паўлу, што трэба ісці.

Пётр Цімафеевіч быў з тых кіраўнікоў, пра якіх гавораць: добры чалавек, але кепскі адміністратар. І ўсё роўна ён даслужыў да пенсіі і працягваў рэдагаваць газету. Улічваючы заслугі, рахуючы і ваенныя, з пасады яго не здымалі. Сам жа ён заявы не падаваў: як-ніяк, гонар і пашана. Рэдактар, дэпутат райсавета, член райкома партыі.

Газета тымчасова прыходзіла ў заняпад. Сваіх матэрыялаў ставілася мала. Старонкі запаўнялі БЕЛТА і ТАСС. Вёрстка была нікудышная. Паліграфвыкананне бляклае, лінейкі крывыя, клішэ аляпаватыя. Супрацоўнікі, адчуўшы слабінку, паводзілі сябе вольна, не набіралі і паўмесячнай нормы радкоў. З абкома партыі ўказвалі рэдактару на недахопы. Ён абяцаў выправіць становішча, але, па ўсім, не мог нічога зрабіць. Ведаў: пайдзі ў райком партыі прасіць дапамогі — там зразумеюць гэта па-свойму і паціснуць руку: калі ласка, на заслужаны адпачынак. Тым болей, у яго хворае сэрца.

## 2

Сакратаром райкома партыі была жанчына. Яна сядзела за доўгім радам сталоў у бэжавым касцюме і белай блузцы, з каўнерыка якой збягала ўніз вузенькая паска чорнага гальштука. Па кароткай стрыжцы светлых валасоў, маленькіх ясных вачах і сур'ёзна сціснутых бляклых вуснах угадвалася: у гэтай жанчыны аскетычная строгасць да сябе мяжуе з прыязнасцю да людзей, а стрыманасць — з уменнем шчыра, доўга і прыгожа гаварыць.

Павел павітаўся адразу, як толькі зайшоў у кабінет.

Сакратар прыветліва кіўнула галавою, запрасіла садзіцца да стала. Пётр Цімафеевіч шматзначна глянуў

на Паўла — так, быццам ён прывёў з сабою, няйнакш, замежнага госця.

— Здагадваюся: падмацаванне,— сказала сакратар мяккім голасам.— Ну што ж, будзем знаёміцца... Сакратар райкома партыі Зінаіда Якаўлеўна Сарокіна.

Павел назваў толькі прозвішча, але яна папрасіла яго назваць яшчэ імя па бацьку. Рукі ў Зінаіды Якаўлеўны ляжалі на стале — цемнаватыя ад загару і аплеценыя ценькаю сетачкаю глыбокіх рысак. Скмеціўшы, што Павел міжволі затрымаў на іх позірк, яна паварушыла пальцамі, як бы ствараючы атмасферу прастаты і даверу. Коратка, адно некалькі слоў, сказала, што праца ў партыйнай газеце — адказная, але райком партыі спадзяецца, што ён, Павел Дроб, апраўдае давер'е.

Пётр Цімафеевіч глядзеў на сакратара не міргаючы, на ягоным твары застыла чаканне. Ён, бачачы, што Зінаіда Якаўлеўна вядзе гаворку так, як быццам з пасадамі ўсё даўно вырашана, не ведаў, што рабіць з Мікрашэвіч, і, улучыўшы паўзу, сказаў пра гэта Сарокінай.

Яна паціснула плячыма: хіба Мікрашэвіч, з яе безадказнасцю, яшчэ не звольнілі? Дзіўна! Пётр Цімафеевіч прыўзняўся з крэсла і напомніў, што ў яе, Наташы Мікрашэвіч, ужо тры вымовы, апошняя з папярэджаннем. За карэспандэнцыю, у якой, не разабраўшыся, не параіўшыся з парторгам калгаса, напісала пра чалавека, які ў вайну быў паліцаем.

Павел убачыў, як з твару Сарокінай сплыло здзіўленне. На ім цяпер лёгка чыталіся думкі. Навошта няньчыцца з такой гора-журналісткаю, якая легкадумна ставіцца да свайго друкаванага слова. Была ж магчымасць задумацца. А цяпер ніякіх сумненняў: памылка найгрубейшая і трэба звальняць. У Пятра Цімафеевіча такой катэгарычнасці не было і не магло быць. Яго турбавала цяпер ужо тое, як ён скажа Мікрашэвіч пра звальненне. Ён шнарыў па стале вачыма, акурат прысаромленае дзіця. Сарокінай жа размова ўяўлялася простай: маўляў, у чым справа, новы чалавек, падрыхтаваны журналіст, са спецыяльнай адукацыяй, зацікаўлены ў працы.

Павел, тое-сёе зразумеўшы з ранейшай гаворкі Пятра Цімафеевіча, папрасіў пару слоў, чым спачатку крыху збянтэжыў, а потым здзівіў Сарокіну. Яна, паклаўшы сашчэпленыя рукі на стол, падрыхтавалася слухаць. Стала так ціха, быццам зараз у гэтым кабінеце

павінен быў грымнуць гром. Паўла раптам ахапіла хваляванне. Ён адчуў, што не зможа стрымаць дрыжыкаў у голасе. Крыху супакоіўшыся, сказаў, што, выходзіць, ён, Павел, адымае ў чалавека кавалак хлеба. Хіба не так?

Зінаіда Якаўлеўна адхілілася ад стала, зачапіўшыся за яго толькі кончыкамі пальцаў: маўляў, як вас разумець, таварыш Дроб?

Павел, перахапіўшы позірк сакратара, стаў распавядаць, чаму так думае; ды і як тут не думаць, калі іменна праз яго звальняюць супрацоўніка. Зінаіда Якаўлеўна яму запярэчыла: гэты супрацоўнік ужо даўно заслугоўваў звальнення і працаваў адно таму, што не было замены.

Голас у Паўла раўнеў. Усё як быццам правільна, так. Але кім будзе ён, Павел, у вачах гэтага супрацоўніка, ды яшчэ — дзяўчыны? Нягоднікам, і толькі. Вось, скажа, прыехаў і сагнаў мяне з майго месца. Ды яшчэ блат прыпіша. Ну гэтак жа? Зусім іншае было б, калі б Наташу Мікрашэвіч звольнілі да ягонага прыезду.

Пётр Цімафеевіч неспакойна тузаўся на крэсле. Мусіць, нечакана, зусім нечакана для яго павярнуў навічок гаворку. Трэба было б неяк паправіць хлопца, падказаць. Малады, гарачы. Нявопытны. Ясныя кропелькі вачэй сакратара глядзелі на Паўла: цікава, што ён хоча прапанаваць,— Зінаіда Якаўлеўна ўжо наперад угадвала логіку ягоных разважанняў. І ён не прымусіў яе доўга чакаць, хоць, відаць па ім, так заявіць яму было нялёгка:

— Мне, вядома, цяжка арыентавацца ў сітуацыі, але адно выйсце, як здаецца, ёсць: даць мне адмацаванне.

Зінаіда Якаўлеўна лагодна ўсміхнулася, пэўна, сама сабе, аблакацілася зноў на стол. Нейкі час маўчала, мусіць, думаючы, што для яго, Дроба, гэта, канечне, выйсце. Можа, нават і неблагое. Паедзе з адмацаваннем і ўладкуецца дзе-небудзь у абласной газеце ці зусім вернецца ў Мінск. А што скажуць ім, райкомаўцам? У вас слабая газета, мы накіроўваем падрыхтаваных журналістаў, а вы іх адсылаеце назад. Вох, і тонкая ды капрызная гэта рэч, кадравая палітыка!

— У вас што, няма жадання працаваць у нашай газеце? — спытала яна як бы трошкі разгублена.

Павел закруціў галавою: няправільна зразумелі. Ён

нічога не мае супроць Глушава, бо параўноўваць няма з чым: нідзе яшчэ не працаваў. Хоць са слоў іншых і ведае, быццам покуль не надта хто рвецца ў раённыя газеты. Дык вось, ён нічога не мае супроць Глушава, але не хоча браць на душу грэх.

Сарокіна стаяла на сваім: тых, хто сябе добра праяўляе, яны доўга не трымаюць, даюць, так сказаць, выхад на шырокі прастор. Павел не хаваў усмешкі: можа, наадварот, тыя, што дрэнна пішуць, не затрымліваюцца? Зрэшты, адзін выкладчык, які Паўлу ўвесь час сімпатызаваў, на выпускным вечары, узняўшы чарку, проста гэтак і раіў: «Ты там не вельмі старайся, дык лягчэй будзе ўцячы». Павел тады яшчэ не вельмі разумеў, адкуль і чаго ўцячы. Ён неяк спакойна глядзеў уперад. Зінаіда Якаўлеўна пры гэтых словах спахмурнела, і было відаць, як спаўзлі з лоба яе бровы. Аднак сказала мякка, што не раіла б маладому журналісту пачынаць з такім настроем працу ў рэдакцыі.

Павел падумаў, што сакратар не зразумела ягонага жарту. Ці то яна сапраўды такая строгая, ці не захацела выяўляць адразу сваю памяркоўнасць?

— Нам рэкамендавалі вас,— працягвала Зінаіда Якаўлеўна,— як здольнага журналіста. І мы зацікаўлены ў вас. Правільна я кажу, Пётр Цімафеевіч? Падтрымлівайце мяне.

Пётр Цімафеевіч кіўнуў галавою. І яшчэ ўспомніў, што пасылалі на яго, Дроба, пад'ёмныя. Зінаіда Якаўлеўна, засмяяўшыся, пляснула ў далоні: во, нават матэрыяльная залежнасць! Але зазваніў тэлефон, і яна падняла трубку. Паслухаўшы, сказала, што зможа прыняць хвілін праз дзесяць. Гаварыла і клала трубку, таму хілілася нізка да століка, на якім стаяў апарат.

Павел ніяк не мог супакоіцца, шкрэблася ў душы пачуццё віны, што межавалася не то з асуджанасцю, не то з расчараваннем. Мусіць, заўсёды гэтак бывае з чалавекам на новым месцы. І ён сказаў, што хоць, можа, і не мае права пярэчыць, але застаецца пры сваёй думцы.

— А вы ўпарты, малады журналіст! Паглядзім, якім прынцыповым у сваіх матэрыялах будзеце. Але, прабачце, гэта наша справа вырашаць, што да чаго і каго куды. Так што,— Зінаіда Якаўлеўна паднялася, няўлоўным рухам абцягнула з бакоў пінжак, падышла да Паўла і пацiснула яму руку,— жадаю поспехаў! — Павярнулася да Пятра Цімафеевіча: — Вы, калі ласка,

дапамажыце таварышу ўладкавацца... Спачатку мо ў гасцініцу, а там падшукайце якую-небудзь бабульку, каб узяла на кватэру.

Яны выйшлі з кабінета. Ідучы па гулкім калідоры і спускаючыся па сточаных нагамі прыступках, маўчалі. Толькі на вуліцы Пётр Цімафеевіч сказаў:

— Зараз забяжым у рэдакцыю, пазнаёмлю вас з супрацоўнікамі, а потым шафёр падкіне да гасцініцы... месцы, думаю, будуць.

Мусіць, ад таго, што добра нагрэлася паветра, сонца было млявае, ахутанае ліловай смугою. Цені ад яго ляжалі невыразныя, як выцвілая папера. Кашлатае лісце трыпутніку і драсёну, што раслі паўз плот, густа прыпудрыў пыл, і верабей, спуджана пырхнуўшы з вялай травы, падняў цэлае воблака.

Пётр Цімафеевіч паклікаў у кабінет усіх супрацоўнікаў. Павел зноў убачыў тую дзяўчыну ў доўгай зялёнай сукенцы і з тугою куклаю на галаве і чамусьці адразу адчуў, што гэта ейнае месца зойме ён. Не, дзяўчына не была зажураная, хоць, канечне, ужо ведала, што яе будуць звальняць. Наўпярок, яна бестурботна і залівіста смяялася — бліскалі дробныя роўныя зубкі. І праз гэтую ейную дзіцячую бестурботнасць Паўлу стала яшчэ больш шкада яе. Ён хацеў зараз толькі аднаго, каб яна зразумела, што ён, Павел, тут ні пры чым, што асабіста ён быў супроць ейнага звальнення. Ды што яго «супроць» у параўнанні з уладаю сакратара райкома.

Калі ўгамаваліся, Пётр Цімафеевіч павініўся перад Мікрашэвіч, потым ужо сказаў, што ў яе тры вымовы з папярэджаннем і ён аддае загад аб звальненні.

Дзяўчына перастала ўсміхацца, але ўсё роўна між растуленых вуснаў раз-пораз бліскалі дробныя, як гарошыны, зубкі. Толькі на імгненне апусціла вочы ў падлогу, і Павел убачыў, што ў яе прыгожа выгнутыя вейкі і выпуклы точаны лоб. Потым падняла галаву, глядзела перад сабою адкрыта і спакойна. Такой заяве яна здзівілася б, калі б тут не сядзеў новы таварыш, якога яна ўбачыла перш на лаўцы і адразу здагадалася, бо гаворка пра яго ходзіць ужо ад самага чэрвеня. Яна за гэты час паспела падрыхтавацца сябе да перамен.

Павел сядзеў сцяты, адчуваў: зараз на яго зірне яна, Наташа Мікрашэвіч, і ён не зможа застацца спакойным ад ейнага позірку, і яна падумае тады, што адно ён вінаваты ў звальненні. Павел слаба чуў, што казаў

далей Пётр Цімафеевіч, адно ўлавіў, што ён спяваў яму, Дробу, дыфірамбы. І не абышоўся без абавязковых пры такіх нагодах слоў: «Прашу любіць і жалаваць!»

Павел кіўнуў галавою, пакратаўся на крэсле. Усе паглядзелі на яго, здалося, пільна і прыдзірліва.

— У ваш аддзел, Ігар Харытонавіч...— Пётр Цімафеевіч сунуў пад паху правую руку.— Аддзел пісьмаў...— І чамусьці пасля паўзы дадаў: — Пакуль.

Павел пачуў «гм-гм» і зразумеў, што падаў знак загадчык аддзела пісьмаў. Праз два чалавекі, выткнуўшы наперад тоўстыя калені, сядзеў мажны дзяцюк у жоўтай тэнісцы. І кучары на галаве былі амаль такія, як тэніска, жаўтлявыя. І вочы, што на імгненне ўперыліся ў Паўла, мелі жоўтую радужку.

Нарада скончылася. Наташа паднялася, ступіла да Паўла і падала яму руку. Ён востра адчуў у сваёй далоні тонкія, што алоўкі, пальцы.

— Поспехаў вам, Павел! — сказала з дрыготкаю ў голасе Наташа. Павел спачувальна глянуў ёй у твар. Але ў яе здзіўлена раскрытых вачах — нечакана! — не было і кроплі дакору ці крыўды. Здалося, толькі шчырасць і дзіцячая непасрэднасць. І гэта, як усякая нечаканасць, збянтэжыла яго яшчэ болей. Ён ледзьве знайшоў словы, каб падзякаваць Наташы.

Ігар Харытонавіч паклаў на яго плячо руку. Яна была важкая і цвёрдая, як з сырога палена. Павёў яго ў свой кабінет, і ўжо там, седзячы за сталом, Павел разглядаў рукі свайго начальніка. Яны былі вялікія, густа парослыя рыжымі валаскамі, якія ад сонца срабрыліся; ён сціснуў кулакі, і пальцы пабялелі.

Ігар Харытонавіч меў не толькі высокі рост, але і крутыя плечы. Здавалася, ён глыбока ўдыхнуў у сябе паветра і застаўся такім — натапыраным, раздзьмутым у грудзях; моцная шыя трымала вялікую галаву, якая разам з рыжымі кучарамі вельмі ж нагадвала львіную. Ігар Харытонавіч сам увесь быў дзябёлы, як леў.

— Ну што, будзем працаваць! Маё прозвішча Касцяніцын,— сказаў Ігар Харытонавіч і ўсміхнуўся. Усмешка ў яго была робленая, сухая.— Заспакойваць не буду, работы хапае. Во так! — правёў далонню па шыі.— Па нашым аддзеле ідуць матэрыялы на тэмы прамысловасці, культуры, прыроды, быту... Ну і ўсё такое. І пісьмы, канечне, пісьмы!.. А кадр у мяне, чуў, быў не вельмі. Ды і ў самога часу ў абрэз. Я ж завочна

вучуся на журфаку, апошні курс... Курсавыя, кантрольныя, рэфераты ўсякія заядаюць!

«Во, адразу плакацца пачаў»,— падумаў Павел і сказаў:

— З гэтай мэтаю я і ехаў сюды — каб працаваць.

— Табе ж трэба прапісацца, мабыць... Ты яшчэ нідзе нічога?

— Яшчэ не. Але трэба ж.

— Давай у мяне, плошча дазваляе.

— Дзякуй вам.

— Заві мяне на «ты». Розніца ва ўзросце між намі невялікая, гадоў якіх шэсць. Не люблю напышлівасці.— Касцяніцын павярнуўся тварам да акна. І Павел паглядзеў туды: ішлі людзі — была відаць скрозь кусты бэзу вуліца.— Хоць мяне тут у рэдакцыі і не любяць, кажуць... і табе будуць навушнічаць, што я злосны, яхідны. Але я так не лічу! Я — за справядлівасць. Часам скажаш у вочы праўду — і ўжо кепскі. Не магу, як іншыя, з аглядачкаю, з «чувством, с толком, с расстановкой». Помню, ручку купіў, у шэсцьдзесят пятым годзе. З арміі прывёз. Такая добрая ручачка-самапіска... тады яшчэ шарыкавых у модзе не было. Пакінуў неяк на стале, і прапала яна. А ручка была, так пісала, як па масле! Ну я і закаціў... Вой! Ды што гэта я, разбалбатаўся... Дробязь такая — ручка.

Павел ледзь не душыўся ад смеху: «Помню, ручку купіў, у шэсцьдзесят пятым годзе... Падзея, нічога не скажаш!..»

— Адным словам, будзеш працаваць — будзеш бачыць,— працягваў Касцяніцын.— Ты зараз пойдзеш уладкоўвацца? Гэта... твой чамадан у прыёмнай?

— Мой.

— Можа, у мяне пакуль заначуеш?

— Ды не. Пётр Цімафеевіч абяцаў гасцініцу...

— Ай, гэты Пётр Цімафеевіч!..— Касцяніцын скрывіўся. Таямнічым шэптам прамовіў: — Скажу па сакрэце, нядоўга яму засталося кіраваць намі. Адправяць на пенсію. Але гэта не наша справа. Варона з куста, а дзесяць на куст. Значыцца, добра. Заўтра я з раніцы затрымаюся... там, па асабістых справах. Дык вось табе заданніца, так сказаць...— Ён нагнуўся, адчыніў тумбу. Доўга ў ёй корпаўся, перабіраў паперы. Нарэшце кінуў на стол два зашмальцаваныя, пацёртыя канверты.— Так сказаць, пісьмы чытачоў. Разбярыся ў іх... што

тут — скаргі, просьбы ці яшчэ якая трасца... Карацей, зрабі так, каб яны не віселі за намі... Апрацуй, а можа, і схадзіць куды-небудзь трэба, разабрацца.

Павел засунуў канверты ў кішэню пінжака.

— Добра, вечарам у гасцініцы прачытаю, пазнаёмлюся...

— Ну, а свой матэрыял... Пра што ж табе напісаць? — Касцяніцын падпёр кулаком шчаку, задумаўся.— Во! Напішы замалёўку пра муляра. Даўно не пісалі.

— Гэта... той, што фарбуе, і ўсё астатняе? — спытаў Павел, не падазраючы, што яго чакае.

Касцяніцын раптам пырснуў смехам. Доўга смяяўся, гледзячы на Паўла. Потым сказаў як бы паблажліва, прыцінаючы з'едлівасць:

— Муляр — гэта каменшчык, што называецца, а ты маеш на ўвазе маляра.

Павел ад такога промаху пачырванеў, збянтэжыўся, а Касцяніцын усё тым жа ментарскім голасам, але з бояззю пакрыўдзіць сказаў:

— Нічога, бывае... Толькі не хапайся адразу за працу! Агледзься, разглядзіся... Вунь, дарэчы, «уазік» падкаціў!

— Ат, усё роўна не будзе чаго рабіць,— сказаў Павел. Устаў, падаў Касцяніцыну руку. Ледзь не ўскрыкнуў, як той пацiснуў яе. Пайшоў у прыёмную па чамадан. Машыністка, яе звалі Света, была не адна. За сталом насупроць сядзела Наташа Мікрашэвіч. Вочы ў абедзвюх былі чырвоныя, у Светы — размытая пад вачыма туш.

Павел утаропіўся ў Наташын твар. Яна глядзела ў стол, потым павярнулася, устала, і ў вачах зноў не было ні дакору, ні крыўды. Павел, развітваючыся, адкрыта глядзеў ёй у вочы. І потым гэтыя вочы, поўныя нейкага гарэзлівага суму, доўга стаялі перад ім. Увесь вечар. І ўночы. І нават уранні, калі прачнуўся, першае, што ўспомніў ён з учарашняга, гэта вочы Наташы Мікрашэвіч. Без дакору і крыўды. І потым, ідучы па горадзе, баяўся сустрэцца з Наташаю.

Яшчэ з учарашняга добра помніўся прыезд у гасцініцу. Дзяжурная, з ліслівымі і хітрымі, як у лісы, вачыма, доўга вывучала Паўла. Адале здзівіла, ветліва звярнуўшыся: «Калі ласка, Павел Іванавіч, давайце за мною». Яна адвяла яго ў пакой. Тым жа ветлівым,

мяккім голасам прапанавала: «Вось тры ложкі... Калі ласка, выбірайце любы». Павел паказаў на ложак, што стаяў каля акна. «Я не раіла б вам гэты,— сказала дзяжурная.— Тут будзе вельмі шумна — побач аўтастанцыя, чыгунка...» — «Ат, раз ужо выбраў, то няхай»,— сказаў Павел. «Ну глядзіце самі»,— з незразумелаю прыязнасцю ўсміхнулася дзяжурная.

«Дзіўна спагадлівая»,— падумаў Павел, калі яна выйшла.

Пакой быў вялікі, але з адным акном. Якраз насунулася хмара, і ў пакоі стала змрочна. Павел уключыў святло — загарэлася лямпачка ў закропленым мухамі і шэрым ад пылу плафоне.

Невялікі столік быў засланы газетаю. На ім стаялі шкляная масіўная попельніца і рыжаваты графін з вадою, што пабралася каля сценак драбнюсенькімі срабрыстымі бурбалачкамі. Два цвёрдыя крэслы, адно з якіх — Павел пакратаў — хісткае, ножка прыкручана алюмініевым дротам. На сцяне рэпрадуктар «Сож» з адламанай катушачкаю-ручкаю, на месцы якой тырчыць адно шпянёк. За гэты шпянёк Павел і пакруціў — хрыпла зайграла музыка.

Павел разаслаў свой ложак і прылёг на яго. Адчуў, што стаміўся. Гудуць ногі і тлумна ў галаве. На душы няпэўнасць і нават страх: як тут жыць і што будзе з ім далей? Вольніца скончылася... Як прымуць яго, ці спадабаюцца матэрыялы? Тыя, што пісаў падчас практык, хвалілі і супрацоўнікі рэдакцый, і потым выкладчыкі. Нялёгкі ўсё-такі, калі папраўдзе, журналісцкі хлеб, нерваў шмат патрабуе. Паводле ЮНЕСКА, ці не на другім месцы журналісты па смяротнасці пасля цырульнікаў. Хоць усё тут адносна. Праца грузчыка таксама цяжкая, а для таго, у каго да яе прызванне,— паэзія. Паэзія... Успомніў Ляшчэню... Люду... Туга захліснула сэрца. Каб развеяць яе, узяў са стала затрэпаны нумар часопіса «Маладосць». Разгарнуў. У часопісе была надрукавана аповесць Васіля Быкава «Воўчая зграя». Стаў чытаць.

Павел доўга не мог заснуць. Варочаўся, раз-пораз даставаў з-пад падушкі наручны гадзіннік. Было яшчэ вельмі рана. Зноў заплюшчваў вочы — свядомасць не адключалася. Узяўся чытаць пісьмы. У адным ветэран вайны скардзіўся, што старшыня калгаса, чэрствы чалавек і бюракрат, не выдзяляе яму сена на карову, хоць

ёсць на тое пастанова Савета Міністраў. Скарга Паўлу была надта зразумелая. Такая ж бяда і ў ягонага бацькі. У другім пісьме — цэлы слупок подпісаў. Жыхары вёскі Крамянка не разумелі, чаму іх вёску аб'явілі «неперспякціўнай» і закрылі аўтобусны маршрут. Павел здзівіўся, што такія балючыя пісьмы залежваюцца, жаўцеюць у шуфлядзе Касцяніцына. Няўжо так цяжка змясціць гэтыя допісы ў газеце або паслаць на разгляд у райвыканком?

Падняўся а палове восьмай. Галава чыгунная, вочы баляць. Падумаў, што захварэў. Але памыўся, схадзіў у сталоўку, дзе вяла паторкаў відэльцам у шніцэль, пасядзеў у парку на лаўцы і адчуў, як прылівае бадзёрасць. Прабівалася скрозь лісце таполяў сонца, лашчылася да вачэй. На дождж учора так і не сабралася, хмары парагнала бокам.

Маладая маці вяла за руку маленькую дачку, мусіць, у садзік. На светлай галаве ў дзяўчынкі ўздрыгвалі вялікія блакітныя банты. Яна ажыўлена шчабятала, па-дарослаему павучальна адставіўшы ўказальны пальчык і раз за разам заглядваючы маці ў вочы. Маці задаволена ўсміхалася, і дзяўчынка з яшчэ большай захопленасцю сакатала пра сваю радасць.

Павел чамусьці пайшоў следам за шчаслівай параю. Наблізіўся да яе так, што голас дзяўчынкі стаў добра чуваць: «Я лепш за ўсіх намалявала... Я намалявала песню «Хай заўжды будзе сонца»... Мы яе часта спяваем». Маці схілілася, і ў куточку ейных вуснаў абазначыўся намёк на ўсмешку. Павел пашкадаваў, што не ўбачыў усмешкі ўсёй. На момант адвёў свой позірк убок: праваруч высіўся недароблены цагляны дом, без даху, з пустымі вокнамі, лічы, адны сцены. Вакол вэрхалам ляжалі дошкі, маткі дроту, папера, бітыя і цэлыя цагліны... І раптам пачуў: «Мам, а што гэта — вайна тут была?» Дзяўчынка паказвала рукою на недабудаваны дом. Маці, спыніўшыся, разгубілася, і на яе твары, зацямняючы святло ў вачах, адбілася трывога.

Далей, да самай рэдакцыі, Павел ішоў задуменны. «Новый день, куда ты приведешь?»

## 3

З месяц Павел жыў у гасцініцы як быццам няблага. Спакойна, ціха, а галоўнае, ні ад кога не залежаў, сам сабе гаспадар. У бакавушцы, дзе была гарачая вада і балея, мыў сабе сарочкі, шкарпэткі. А з нейкае пары гэты клопат, нягледзячы на Паўлаву нязгоду, узяла на сябе дзяжурная. Тая, з ліслівымі і хітрымі, як у лісы, вачыма, што сустрэла Паўла ў першы дзень і якую звалі Пелагея Ніканораўна. Яна, калі Павел быў на працы, забірала з шафы яго брудную сарочку, якую называла незразумелым словам «саколка», і несла дахаты. Адтуль ужо прыносіла вымытую і адпрасаваную, вешала ў шафу на плечыкі. Амаль праз дзень мяняла бялізну на Паўлавым ложку.

Павел гэтую клапатлівасць Пелагеі Ніканораўны зразумеў потым, калі яна спачатку асцярожна, адале ўсё часцей пачала ўпамінаць у размове імя сваёй дачкі Нюрачкі. А далей-болей, зусім не спускала яго з языка, распавядаючы пра такія падрабязнасці, што Павел крывіўся: «Яна ў мяне змалку харошанькая такая, пакладлівая... Хварэла часта, на ангіну ўсё. А то гады тры назад абсыпала ўсё цела... Ледзь залячылі, а кропачкі... беленькія, як проса, так і засталіся на скуры».

Аднаго дня, увечары, Павел з Пелагеяй Ніканораўнай сядзелі на лаўцы каля гасцініцы. Пелагея Ніканораўна хвалілася, што падышла чарга на «Запарожац», ды няма каму вадзіць машыну. Бацька, ветэран вайны, які станавіўся на чаргу, не мае правоў.

І тут да іх ціхенька падплыла дзяўчына ў жоўтай доўгай сукенцы з паяском. Павіталася. Села побач з Пелагеяй Ніканораўнай. Павел здагадаўся, што гэта і ёсць Нюрачка. Яна была далікатная, чыстая ў твары, уся светлая і пяшчотная, як пісклятка. Сядзела па-музейнаму нерухома, наструнена. Глядзіце і цешцеся!

— Вы ж маладыя,— неяк асабліва ласкава сказала Пелагея Ніканораўна,— схадзілі б у кіно... Красівае, кажуць... мужчына з восьмага нумара глядзеў учора.

Нюрачка збянтэжана паціснула плячыма.

«Будзе нетактоўна,— падумаў Павел,— калі ён не запросіць дзяўчыну ў кіно». Хоць са Светаю, якая з кожным днём яму больш і больш падабалася, яшчэ ні разу не хадзіў.

Калі, правёўшы Нюрачку, вярнуўся ў нумар, то

ўбачыў, што да яго, нарэшце, падсялілі двух мужчын: увосень камандзіровачных прыбавілася. Яны сядзелі за сталом і выпівалі, расчырванелыя і дабрадушныя, як пасля лазні. На разасланай на стале газеце ляжала тоўста нарэзаная каўбаса, стаяла высокенькая бляшанка з адагнутым вечкам, чырванеліся памідоры і вялікія звёны рыбы з белаю плямкаю пазванка.

Мужчыны ўзрадаваліся Паўлу, пачалі запрашаць яго да стала, але ён адмовіўся, сказаўшы, што мае клопат. Жыць у тлуме ды яшчэ ўвесь час адчуваць залежнасць ад Пелагеі Ніканораўны ён не мог. Трэба думаць пра новае жыллё, покуль хоць бы дзе-небудзь прапісацца. І ён успомніў Касцяніцына, які прапаноўваў яму адразу па прыездзе прапісацца ў яго. За гэты час ужо памяняўся рэдактар. Замест Пятра Цімафеевіча прыслалі новага — Ківайку Фёдара Андрэевіча.

Павел выбраўся да Касцяніцына між адзінаццаццю і дванаццаццю гадзінамі ў суботу. Сонца паволі набірала вышыню, і ў гэтым ягоным руху было штосьці вечнае і правільнае, чаго, здавалася, ніколі не парушыш. А чаму ў чалавечым жыцці не можа быць аднаго вось такога выверанага і цвёрдага кірунку? Кожны чалавек — лабірынт душэўных зломаў між пачаткам і канцом жыцця. Чаму?

Касцяніцын жыў на ўскраіне Глушава ва ўласным доме. Дом, вялікі, цагляны, з прыбудовамі, трывала і самавіта стаяў на зямлі. Рагатая антэна, як рука, высока выпрасталася ўгору, нібы чагосьці там прасіла.

Забетаніраваная дарожка падвяла Паўла да весніц. Ён доўга не мог іх адчыніць. Круціў бліскучую ручку-ражок, тузаў на сябе — весніцы не падаваліся, сядзелі як улітыя ў роўны завостраны штакетнік. На двары за драцяной загародаю белыя клышаногія качкі ганялі дзюбамі алюмініевую міску. Павісквaў і гроб лапамі зямлю навязаны на ланцуг шчанюк, вялікагаловы, з тонкай шыяй і дурасліва закручаным хвастом.

Нарэшце Павел палэпаў рукою па весніцах са знадворнага боку і намацаў там зашчапку. Весніцы адчыніліся ціха і плаўна, як у запаволеным і неагучаным кадры. Выцер на ганку аб ходнік ногі і націснуў на белую ўтопленую ў вушак кнопачку. Доўга стаяла цішыня, потым пачуўся кашаль, затупалі ногі. Шчоўкнуў унутраны замок, і дзверы адчыніліся. На парозе стаяў Касцяніцын у доўгай паласатай піжаме і пакаёвых тапа-

чках, аблямаваных па краях белым пухам. Сціснутыя вусны знявольвалі ўсмешку, ды яна выбівалася праз вочы, якія ядрана іскрыліся, бы кроплі на ледзяшах у сонечны дзень.

— А-а, Дроб!.. Заходзь-ка, заходзь... Я адзін дома, жонка з сынам паехалі да бацькоў...— Касцяніцын падсунуў нагою стаптаныя пантофлі.— Бяры.

Павел расшнураваў туфлі, усунуў ногі ў пантофлі. Касцяніцын ступіў у дом першы. У пярэдняй было змрочна. Не ўключаючы святла, ён адчыніў дзверы ў суседні пакой.

— Гасціная,— сказаў важна і таямніча, акурат баяўся, што Павел не зразумее сэнсу слова.

Гэта быў даволі прасторны пакой, застаўлены цёмнаю мэбляю. У высокай «сценцы» за шклом, падзеленым латунным дроцікам на квадраты, пераліваліся крыштальныя фужэры і вазы; у куце стаяла шырокая канапа з мяккаю паўкруглаю спінкаю; пасярэдзіне — масіўны стол на разьбяных, фігурных ножках і вакол яго нізкія плеценыя крэслы з выгнутымі падлакотнікамі; пад столлю вісела круглая люстра, падобная сваімі густымі вісюлькамі на рой пчол.

Скрозь шчыльныя ядвабныя шторы на вокнах цьмяна прабівалася з вуліцы святло. Касцяніцын пстрыкнуў выключальнікам. Ад люстры разбегліся па стале прамыя порсткія промні, і Павел нечакана падумаў: «Промні, хоць і ад люстры,— гэта ўжо прастор». Усміхнуўся.

Касцяніцын убачыў яго ўсмешку, зразумеў усё, ды нічога не сказаў, адно качануліся па шчоках жаўлакі. Дзіўны ён чалавек, Касцяніцын. Неяк прыйшоў ранкам на працу і расплакаўся перад усімі, што яго сын ад няма чаго есці крошкі па стале збірае. Усе з гэтага, вядома, смяяліся, бо ведалі пра Касцяніцына многае. Што ён жанаты на сваёй аднавяскоўцы, род якой спрадвеку лічыўся на Глушаўшчыне адным з самых заможных. І што яго, Касцяніцына, бацькі, працавітыя, рупатныя сяляне, таксама жывуць на шырокую нагу, маюць легкавік і першыя ў вёсцы купілі каляровы тэлевізар. Ведалі і тое, што Касцяніцын праз дзень ездзіць у вёску, то да бацькі, то да цесця, і вяртаецца назад з напакаванай сумкаю.

Касцяніцына людскі смех не бянтэжыў. Ён глядзеў на іх наіўнымі вачыма. Як глядзеў і тады, у тым анек-

датычным выпадку, пра які шмат гаварылі. Загадчык аддзела пісьмаў Плоймаш, пасля скандальнай гісторыі з жонкаю, пераехаў у Магілёў і вызваліў двухпакаёвую кватэру. Касцяніцын, не пытаючы ні ў кога дазволу і не чакаючы ніякага рашэння, засяліў яе, перацягнуўшы свае рэчы. Задурыў-задурманіў разгубленаму Плоймашу галаву: «Мне сам старшыня выканкома гарантаваў гэтую кватэру...» І той аддаў яму ключы.

Касцяніцын пераначаваў у кватэры толькі ноч, а назаўтра заявіўся інструктар райвыканкома: «Што за фокусы?..» — «Якія фокусы! — закрычаў Касцяніцын, наступаючы махінаю свайго цела на інструктара. Да нагі Касцяніцына хінуўся, шырока адкрыўшы вочы, пяцігадовы сын, і ён цягнуў яго за сабою.— Я даўно ўжо працую і не маю кватэры!.. І гэта належыць мне па ўсіх стацця́х!» — «Дапускаеце самавольства, таварыш Касцяніцын! Каб праз тры гадзіны жылплошча была вызвалена...» — У інструктара чырванелі на вачах жылкі. «Гэта вы самавольнічаеце, а не я! — узгарэўся Касцяніцын.— Колькі ўжо кватэр памяняў шафёр Сарокінай?.. Га? Маўчыце... Дык я скажу — тры! Выходзіць, для вас просты шафёр важней, чым я... Так?» Закусіўшы ніжнюю губу, вяршок якой потым нейкае імгненне быў белы, інструктар спакойна сказаў, прыбіваючы цвёрдым позіркам Касцяніцына да сцяны: «Нам лепш відаць, хто адчувае вастрэйшую патрэбу ў жыллі. Мы рознабакова падыходзім да гэтага пытання».— «Не выселюся з кватэры, і ўсё! Што хочаце, тое і рабіце!..» — Касцяніцын гладзіў па галоўцы сына, вачаняты якога, жоўтыя, як у бацькі, былі бездапаможныя і ўмольныя, бы медзякі на далоні ў п'яніцы.

Інструктар хмыкнуў, завярнуўся і моўчкі выйшаў. Было чуваць, як гулка цокалі яго абцасы. Праз гадзіну каля дома спыніўся міліцэйскі «газік». Касцяніцын убачыў у акно, як з яго вылезлі два рослыя, адзін з чорнымі грузінскімі вусамі, сяржанты.

...Касцяніцын звярнуў у пакой налева, над дзвярыма якога вісеў нацюрморт — вялікая чырвоная рыбіна з выпуклым дымчата-цьмяным вокам, доўгі чорны нож і чымсьці падобны да яго вэнджаны вугор.

— А вось гэта мой кабінет,— сказаў Касцяніцын.

— Нават кабінет маеш? — здзівіўся Павел, увайшоўшы ў невялікі, з высокаю столлю пакой.

— Дробязь! Людзі не гэта маюць...

— У цябе, брат, і замашкі!

Павел разглядаў кніжную шафку, шчыльна застаўленую падпіснымі выданнямі, стэрэарадыёлу «Сімфонія» і развешаныя на сценах гукавыя калонкі. На пісьмовым стале, перад якім стаяла крэсла-качалка, ляжала кніжка, з якой тырчала манікюрная пілачка. Павел прачытаў: Бальзак.

— Класікаю захапляешся!

— Класіка вучыць жыць,— Касцяніцын з'едліва ўсміхнуўся. Павёў Паўла на кухню. Правы кут кухні займала абліцаваная белай кафляю печ, невялікая памерам, ды з усімі адметамі звычайнай рускай печы — загнет, дзве пячуркі, пяколак, чарэнь.

— Пачакай,— сказаў Касцяніцын і выпнуўся з кухні. Павел пачуў яго зычны голас: «Як вы сябе адчуваеце, таварыш Дроб!» Здалося, быццам скаціліся словы ў якімсьці шумавым клубку, з печы і да яго, Паўла. Павел заглянуў на печ і ўбачыў над чарэнню плазам прымацаваную да столі гукавую калонку — такую, як і ў кабінеце. З яе ўжо выплывала спакойная мелодыя, і штосьці казаў, каструбавата вымаўляючы рускія словы, замежны спявак.

— Поўны камфорт: кушай і слушай,— сказаў Павел Касцяніцыну, які, вярнуўшыся, ужо не хаваў усмешкі.— І нават узімку можна пагрэць на печы плечы...

— Во, загаварыў вершамі! — усміхнуўся незразумела Касцяніцын.— Праўду кажаш. Бывае, вечарочкам... За акном завея, вецер, так засумуеш, так засумуеш, хоць гвалт крычы. Настрою радыёлу на замежны галасок, залезу на печ і слухаю-слухаю... пакуль не засну. Выручалачка!.. — Касцяніцын з любасцю паляпаў цвёрдай, дубовай далонню па печы.— А боршч зварыш!.. Смаката, на зубах растае... Хіба параўнаеш з газавай плітою? Але, паўтаруся, людзі не гэта маюць,— сказаў голасам, у якім зусім не было порсткасці.— Не магу чамусьці я ўгнацца за іншымі,— паскардзіўся. Сеў за стол, уздыхнуў, і плечы ягоныя яшчэ больш пакручэлі.— Не шанцуе мне... Вось у рэдакцыі вазьмі. Прыедзе нейкі аднекуль, год папрацуе — глядзіш, і гатова: член КПСС. Па-а-айшоў чалавек расці як на драждждах... Без членства ж у нас нікуды. Успомніш маё слова, і з табою гэтак будзе. А я і мясцовы, і па стажу самы стары, а ўсё

на адной пасадзе. У партыю ніяк не магу ўступіць... не прымаюць. Кажуць, папрацуйце яшчэ, падрыхтуйце сябе да гэтага адказнага моманту. Дык колькі можна рыхтаваць сябе, пытаюся? Што я дурней за ўсіх? Або п'яніца які, кепскі сем'янін? Ці праграму і статут не змагу вывучыць? Ці выконваць іх не буду? Бывае, што і ўсё жыццё трэба рыхтавацца, адказваюць. Вось і гавары што хочаш...

Касцяніцын змоўк, пацьмянеў ягоны позірк, акурат праваліўся глыбока ў душу. Сціснутыя, ляжалі на стале кулакі, як два камяні.

— А навошта табе ўсё гэта? — раптам спытаў Павел хутчэй па наіўнасці, чым з намерам.

У Касцяніцына здзіўлена тарганuліся бровы і варухнуліся пад валасамі вушы. Не ўпэўнены, што правільна зразумеў Паўлава пытанне, і, каб не нагаварыць лішняга, перапытаў:

— Што ўсё гэта?

— Гэты шык... І на двары багацце.

— Чалавеку ўсё трэба,— цвёрда сказаў Касцяніцын.— Што ёсць сёння чалавек без грошай? Нуль! Сёння два тыпы людзей карыстаюцца павагаю. У каго салідная пасада. І ў каго грошы. Што Бальзак казаў? Займей сілу, і людзі будуць паважаць цябе. Не так хіба? А пакольні пасада ў мяне, сам ведаеш, так сабе... ад мяне ніхто нічога мець не можа, то выйсце адно.— Касцяніцын свідраваў Паўла порсткімі зрэнкамі.

— А ты ніколі не задумваўся, якія людзі знаходзяць іменна гэтае выйсце?

— Амаль усе людзі.

— Усе людзі імкнуцца сцвердзіць сябе ў жыцці. Гэта так. Але як, чым, якімі сродкамі сцвердзіць?

— Упэўнены ў адным, што здольнасцей у наш век мала.

— Гледзячы куды гэтыя здольнасці скіроўваць... Калі толькі на ўласныя патрэбы, то гэтага, безумоўна, мала.

— Хацеў бы я пабачыць чалавека, які не на сходзе і не з трыбуны, а сам-насам пячэцца больш пра іншых, чым пра сябе.

Павел, здаецца, пачынаў разумець Касцяніцына. Падрабляецца пад дурненькага. Мусіць, многія людзі такімі б не былі і так бы сябе не паводзілі, калі б ведалі, што іх разумеюць. Але ж чалавеку, які разумее людзей,

цяжка жыць ужо таму, што яму здаецца, быццам і яго гэтак жа ўсе разумеюць.

— Гэта лухта, па-мойму, што табе не шанцуе ў жыцці,— сказаў Павел. Касцяніцын страпянуўся, доўга і пранізліва глядзеў на яго.

— Мне весялей на душы, калі я ведаю, што ў мяне ёсць... — голас сарваўся, і Касцяніцын кашлянуў.— Ёсць на сценах, на стале! І-і... пад сталом. Калі хочаш... — Адсунуў стол, і Павел убачыў прамавугольнік кароценькіх маснічын, на крайняй было металічнае кольца — з вуздэчкі. Касцяніцын падчапіў яго пальцам, адчыніў вечка.— Падвал мой...

У падвале было блакітна, як ад снегу: гарэла лямпачка дзённага святла; уніз крута збягала лесвіца.

— Заглянеш?

— Ды не варта! Адчуваю, твой падвал нагадае мне склад прадуктовага магазіна.

— І не толькі прадуктовага! — Касцяніцын быў узбуджаны, акурат ганчак, разгарачаны гонам. Яму ўжо цяжка было сябе стрымаць. Ён гатовы быў у гэтую хвіліну вылузнуцца са скуры, каб пачуць ад Паўла хоць якое захапленне. Павел глянуў краем вока ў падвал і зачапіўся за тоўсты скрутак дывана, туга спавіты ў цэлафан і абкручаны шпагатам. Такіх скруткаў было некалькі, і яны глядзелі, бліскучыя, з падвала, як ракеты з шахт.

— Гэта я называю кладоўкаю майго аўтарытэту.— Касцяніцын мог быць і дасціпным, як амаль усе злыя людзі.

— Усё гэта...

— Зайздросціш?

— Яшчэ як! — з'іранізаваў Павел.

— Усе людзі двурушныя.

— Гэта што — апраўданне?

— Канечне. Вось прыклад. Адзін таварыш пры высокай пасадзе... не буду называць прозвішча, ты яго ведаеш, выступаючы неяк перад намі, заклікаў жыць сціпла і сумленна. Усё правільна. А цяпер бачыш? — Касцяніцын паказаў на свае тапкі.— У такіх вось тапачках і ў халаціку «Волга» падкаціла ягоную жонку да універмага, а назад... праўда, з чорнага ходу, я знарок пацікаваў, выйшла ў югаслаўскіх боціках і норкавай футры. Як гэта разумець?

— Нахабства іншых зусім не дае нам права быць нахабнымі таксама.

— Чаму ж. Думаеш: а я чым горшы? Раз. І два — такія выпадкі сталі тыповымі. Вось і зайздросціш... зайздросціш ім, шчасліўчыкам. Жывуць сапраўды палюдску, прыпяваючы...

— Зайздрасць, як мне, маладому, здаецца, уласцівасць людзей, якія бачаць вартасць не ў самім чалавеку, а ў тым, што ён мае.

— А хіба вартасць не ў апошнім? І той жа Бальзак сказаў...

— Шкадую, Ігар Харытонавіч, што ўбачыў цябе такім... Лепш бы я не заходзіў...

— Ды ну, ды кінь ты, Павел.— Касцяніцын, мабыць, не чакаў ад Паўла такой крутасці і спалохаўся, што Павел разнясе аб ім нядобры погалас.— Што там — пагаварылі, а ты ўжо... Глупства ўсё гэта — размовы! Люблю пабалбатаць языком... А хто з журналістаў не любіць? Во зараз возьмем па грамульцы... — Касцяніцын замітусіўся ў хапошчах, адчыніў халадзільнік.

— Не, Ігар Харытонавіч, другім разам калі...

Касцяніцын стаяў збянтэжаны з бутэлькаю ў руцэ, плюскаў вачыма.

Ужо на двары Павел пачуў крокі і падумаў, што яго даганяе Касцяніцын, але, падняўшы галаву, убачыў маладую жанчыну. Яна несла ў руках дзве важкія сумкі. Побач шлэпаў у жоўтых гумавых боціках хлопчык. Павел зразумеў: вяртаецца ад бацькоў жонка Касцяніцына. Жанчына была ў блакітнай сукенцы з глыбокім выразам, у якім, акурат маятнік, матляўся на залатым ланцужку медальён з брыльянтавым вочкам. Яна павіталася, стрымана ўсміхнулася нафарбаванымі вуснамі.

Ідучы вуліцаю, не бачыў, як разбягаліся ад яго куры, што брындалі каля лужын. Нечакана прыбілася думка, што Касцяніцын цяпер будзе помсціць яму, Дробу, помсціць яўна і ціхачом. Ну і бог з ім! Ён, Павел, не баіцца ніякай помсты. Гэта нават добра, што ў яго з'явіўся вораг. Чалавек, які не мае ворагаў, сам нічога не варты.

Некалькі дзён Павел хадзіў на працу задуменны. За руку з Касцяніцыным не віталіся.

І новы рэдактар, Ківайка, нягледзячы на просьбу

Сарокінай і ўласнае абяцанне дапамагчы з кватэраю, покуль маўчаў. Рабіў ён якіясьці захады ці не, Павел не ведаў. Спытаць — не хапала нахабства, боКівайка, падаючы руку, хаваў вочы, і Павел не сумняваўся: рэдактар помніць пра абяцанне.

А час ішоў. Без прапіскі не ставілі на воінскі ўлік, і гэта непакоіла Паўла. Чаго добрага, з мінскага ваенкамата, дзе зняўся з уліку, пачнуць шукаць.

Падказаў Аднамах: «Брэшка, загадчык сельгасаддзела, жыве ў прыватнай хаце, пагавары з ім». Брэшка, чым здзівіў Паўла, згадзіўся схадзіць да гаспадыні. Тая згадзілася не толькі прапісаць Паўла, але і ўзяць на кватэру.

Такі варыянт, здавалася Паўлу, быў ці не самы лепшы. Як-ніяк, жыць са сваімі людзьмі заўсёды прасцей.

## 4

Павел затрымаўся на працы. Рабіў на заўтра макеты другой і трэцяй палос. І калі ішоў вуліцаю дахаты, у вокнах і на слупах гарэлі лямпачкі. Ліхтар апынуўся ззаду, і цень ад Паўла, доўгі, выразны, паслаўся наўскасы ў левы бок; калі ён супаў з кустом парэчак, што туліўся да плота, Паўлу здалося, быццам там стаіць чалавек.

Яшчэ з двара Павел пачуў, што ў прыдзелку бубняць мужчынскія галасы. «Зноў Брэшка з нейкімі бадзягамі!..» — падумаў ён. І яшчэ падумаў пра тое, што сёння не сцерпіць і абавязкова прабярэ Івана: колькі можна піць і вадзіць п'яніц. З першага дня, як толькі адправіў жонку з дзіцём да сваёй маці, у яго з'явіліся сябры. Няголеныя, чырванатварыя, з тупым позіркам вачэй, у завэдзганых штанах і кашулях. Ні ў чым не было і намёку на прасвятленне ці далікатнасць. Здавалася, іх нічога ў свеце не цікавіць, апроч гарэлкі ды цынічных анекдотаў.

Павел не памыліўся. За сталом сядзелі Брэшка і яшчэ двое. Павел здзівіўся, пазнаўшы ў незнаёмых людзей з каўказскіх народаў. Смуглы, з кароткімі сівымі валасамі і маленькай, як прыклеенай, плямкаю вусоў мужчына і чорны, што сажа, хлопец з арлiным носам. Ці то грузіны, ці армяне. Скуль яны тут?

Павел павітаўся і, не спыняючыся, пакіраваў у свой пакой. Ну дакуль гэта будзе цягнуцца? Ён што, ужо зусім алкаголікам стаў? Не, гэтыя штучкі трэба канчаць... Канчаць! Дзеля яго ж самога, Брэшкі, дзеля сям'і, дзеля дачкі, якой во ўжо змалку не шанцуе: то жывоцік, то дыятэз, то запаленне лёгкіх... Павел ужо не раз раскайваўся, што згадзіўся жыць з Брэшкамі.

Ён паставіў на крэсла «дыпламат», павесіў на цвік плашч. Рухі былі рэзкія і дакладныя. Паклікаў Брэшку.

Брэшка зайшоў з лёгкаю ўхмылачкаю і бляскам задаволенасці ў шэрых вачах. Растапыраныя вялікія рукі трымаў няўклюдна звесіўшы, як кенгуру пярэднія ногі. Ён зразумеў, што абурыла Паўла, і таму адразу сказаў:

— Стоп! Стоп, Павел!.. Тут не тое, пра што ты думаеш. Гэта не звычайная п'янка,— Брэшка гаварыў упэўненым голасам, а знаць, не хлусіў.— Я проста паспагадаў людзям. Цяпер толькі і паспагадае п'яніца або вар'ят. Яны прыехалі з Грузіі да сына, які тут служыць... Месц у гасцініцы не было, і яны пыталіся ў людзей, дзе можна заначаваць. Я пачуў і запрасіў да сябе.— Брэшка адкрыта глядзеў у вочы Паўлу, не сумняваючыся, што той зразумее яго.

Павел адчуў, што паспяшаўся і дарма напаў на Івана, дарма — за сённяшняе, а так, канечне, Брэшка заслугоўваў наганяю даўно.

Іван узрадаваўся, убачыўшы, што Павел не асуджае ягонага ўчынку. Тут жа запрасіў за стол. Павел адмовіўся, сказаўшы, што заўтра досвіткам едзе з шэфам у сталіцу і яму трэба прагледзець такія-сякія паперы.

Іван цвёрда ўзяў Паўла за руку.

— Яны ж цябе запрашаюць. Сам ведаеш, што значыць для грузіна гасціннасць. Добрыя, простыя людзі...

Мусіць, занепакоены тым, што доўга няма гаспадара, у пакой уткнуўся носам хлопец. Гледзячы на Паўла, сказаў з прыемным грузінскім акцэнтам:

— Давай, кацо, поужинаем... Хорошё поужинаем. Чача ест, апэльсин ест, индюк ест. Давай, дорогой!

Павел згадзіўся.

На стале стаяла адпітая бутэлька. Проста на газеце ляжалі апельсіны і лупіны ад іх, пашматаная тушка індыка і горка жоўтых, падобных на аладкі, праснachкоў. Каля канапы, на якой сядзеў пажылы грузін,

стаяла белая пластмасавая каністра. Крыху воддаль — скураная сумка, на баку якой у рамачцы пад слюдою пабліскваў партрэт Сталіна.

Пажылы грузін маўчаў, але вусны былі неспакойныя.

Хлопец наліў у чарку чачы і падаў Паўлу. Павел, беручы, падумаў, што размаўляць трэба на рускай мове.

— Ну так и вы же,— Павел паглядзеў на Івана і паказаў рукою на пустыя чаркі.

— Мы ўжо, Павел... — Іван хітнуў галавою, і Павел зразумеў па яго вачах, бліскучых і цьмяных, якія, здавалася, вось-вось выкруцяцца з арбіт, бы вінты,— што ён не даказаў.

— Выпей, дорогой, за здаровье нашего солдата... Чьтобы честно служил, хорошё служил!

Чача пілася мякка і была амаль прэсная на смак. Павел нават здзівіўся, як лёгка апусцела чарка, акурат чача сама выпарылася. Звычайную гарэлку ён піў пакутліва.

Хмель заявіў аб сабе вельмі хутка. І досыць моцна. Піць яшчэ Павел не пажадаў, спаслаўшыся зноў на заўтрашнюю паездку ў Мінск.

— О, Минск!.. — усклікнуў пажылы грузін і далей сказаў па-грузінску. Хлопец пераклаў:

— Минск хороший город, герой город!..

Іван з грузінамі не-не ды і браў у руку чарку. Грузіны пілі больш, чым ён, але не п'янелі. Самі пілі, закусвалі, не запрашаючы адзін аднаго, як гэта назойліва робіцца ў беларусаў. Івана развезла, ён смактаў цыгарэту, апусціўшы галаву. Грузіны толькі пераміргваліся. Нарэшце хлопец, паклаўшы Івану на плячо валасатую руку, сказаў:

— Слабой солдат, плохо пьёшь... Учис пыть, дорогой!

Іван падняў галаву. Вочы ў яго былі мутныя. Слаба ўсміхнуўся. Мармытнуў сабе пад нос і раптам, як штосьці пільнае ўспомніўшы, устаў і падыбаў у другую палову хаты. Адтуль пачулася шорганне і крэкт.

Іван прынёс гармонік. Гэты маленькі, абшарпаны, з паржавелымі канцікамі мяхоў гармонік належаў гаспадыні. Колісь на ім вучыліся іграць ейныя дзеці, сын і дачка, ды музыкантамі так і не сталі. Гаспадыня не ўзяла яго з сабою, пакінула ў брудным чорным футарале. І зрэдчас, па толькі яму вядомых позывах, Брэшка

ўспамінаў пра гармонік, выцягваў яго з-пад ложка і рыпаў. Тых, хто сядзеў з ім, прасіў падпяваць. Ён любіў адну песню, марскую, напісаную, мусіць, самадзейным артыстам, у якой былі словы пра горка-салёныя хвалі, што ўздымаюць марака бліжэй да сонца. Адну яе і рыпаў, нястройна, збіваючыся, і толькі чуйны слых мог улавіць у матыве суладнасць.

Іван расцягнуў мяхі, нязграбна пакратаў пальцамі пішчыкі, паправіў на плячах рамяні, і кіўнуўшы галавою Паўлу, маўляў, давай, схіліў яе да планкі.

— Каронная!.. — крыкнуў ён і зайграў, прытупваючы нагою. Паспрабаваў заспяваць, ды язык варочаўся непаслухмяна, чапляўся за зубы, і замест слоў з Іванавых вуснаў злятала сыканне. Магічнае слова «хваля» ў яго гучала як «сваля».— Павел!..

— Не трэба, Іван,— сказаў Павел.— Потым штонебудзь адколеш нам, а цяпер лепш пазнаёмімся бліжэй.

Хлопец, які ўвесь час сачыў за Паўлам, зразумеў, што той сказаў.

— Зураб мэня зват... — Ядраныя, чорныя вочы ў хлопца захоплена блішчэлі.

— Памагай, Зураб! — зноў крыкнуў Іван.

— Да как же я? Я нэ знаю белорусский язык. Руський слабо знаю... Мой отэц почты и руський нэ знает. Я школу кончаль, политэхнический институт кончаль. На грузынском языке училь. Руський плохо училь. В сэдьмом классе на учитэля бросался... не хотэл учит руський. Дурной быль, совсэм дурной быль. Тэперь жялею...

— Чаще к нам приезжайте,— запрасіў Павел.

— Спасыб, болшой спасыб!.. Ви хороший люды. Ми били в часть. Сорок лытров чячи у нас било, две канистра било... видишь? Таких две канистра. Осталось пятнадцат лытров. Завтра брата отпустят, домой в Грузыю отпустят, на дэсат дней. Поедэм домой. Мац посмотрит на сина, на солдата посмотрит...

— Сорак літраў чачы? — нечакана падняў галаву Брэшка. Здавалася, ён ужо спіць.

— Да у нас это не грузын, когда он не имэет пятьсот лытров чячи, полтора тысячи лытров вина... С винограда всо, с винограда дэлают. Болшой сад имэешь, подвал имэешь... Дэсять тысячь даёт за год сад. У вас нэту такой доход. Ви бедный люды.

— А отец твой еще работает? — спытаў Павел.

Зураб закруціў галавою.

— Нэ-э! Отэц мой инвалид война. Нога у нэго лэвая болыт. Давно нэ работает... Пэнсыя у нэго за война.

На пінжаку пажылога грузіна паблісквалі планкі ўзнагарод, сярод якіх былі тры ордэнскія.

Пажылы грузін зразумеў, што гаворка ідзе пра яго, кінуў круты позірк на Паўла, потым на сына.

— Мужэственный быль, храбрый солдат быль мой отэц. И сину, солдату нашему, наказ даль, чьтобы служиль честно, служиль хорошо...

— Мой отец тоже участвовал в войне,— сказаў Павел, і позірк ягоны стаў строгі і засяроджаны.

Пажылы грузін спыніў нерухома вочы, а Зураб выгукнуў:

— О! У тэбя отэц тожь война... — І далей, гледзячы на бацьку, гаварыў па-грузінску. Той заміргаў чорнымі вейкамі, акурат на яго дзьмуў парывісты вецер, угодліва паляпаў Паўла па плячы, потым чамусьці пацісну́ў руку і нешта сказаў. Павел зразумеў толькі два словы «вайна» і «Сталін», амаль праз слова — Сталін, Сталін... І Павел спытаў у Зураба, чаму Сталін у такой пашане.

Зураб пераклаў Паўлава пытанне бацьку. Той здзіўлена таргануў чорнымі бровамі, заснаваў рукамі, а на галаве заварушыліся кароткія сівыя валасы, сказаў, акурат прастагнаў:

— О, Сталын! О, Сталын!.. — І нешта хуценька забалбатаў, літара «ц» часта траплялася ў словах, і таму яны вымаўляліся як бы з металічным прыплясам.

— Он говорит, Сталын — болшой гений, болшой человек. Сталын фашизм задушил... Задушил своим гением.

«Крывавая гісторыя Сталіна ўжо сказала сваё слова,— падумаў Павел.— Вуснамі мільёнаў ахвяр сказала. І яшчэ скажа!»

— Сталына всэ знают, и малий и старий,— узбуджана гаварыў Зураб.— Уважяют Сталына. Вэтераны война уважяют. Всэ помнят Сталына!..

— Я тоже совсем рано услышал имя Сталин. Оно было тогда у каждого на устах... — Паўлаў позірк ламаўся ў самых зрэнках і не выходзіў з іх, заварочваўся ў глыбіню.

— Ты помнишь Сталын?.. — Вочы ў Зураба забегалі шустрымі вадзянымі жучкамі.

— Я помню тот черный день для нашей семьи... — Голас у Паўла задрыжаў.

— Когда умэр Сталын?

— Нет. Когда на десять лет потерял отца.

Пажылы грузін пільна сачыў за Паўлам.

— А в чем дэло? Он же воевал.— Зураб лыпаў вачыма. Пажылы грузін абіраў апельсін, падкалупваў цвёрдым чорным пазногцем вялікага пальца лупіну і асцярожна клаў яе, ярка-аранжавую, на газету.

Брэшка, схіліўшы галаву на гармонік, шумна дыхаў, і з куточка ягонага рота выцякала на планку сліна.

...Грузінам, мусіць, надакучыла слухаць Паўла, і Зураб пачаў наліваць чачу. Капнуў крыху ў чарку і Паўлу.

— Выпэй, Павэл! Отэц мой хочет сказац тост. Выпэй за тост!.. И будэм ложиться спац. Тэбе завтра на Минск. Понэмаем!

Пажылы грузін устаў, скрывіўся, памацаўшы левай рукою нагу, абцягнуў пінжак і паправіў планкі ўзнагарод. Гледзячы ў вочы Паўлу, сказаў з моцным акцэнтам:

— Дружьба!.. З руським народам навэки дружьба!

Стоячы, Павел бачыў паверх фіранак выразны круглы і аранжавы, як апельсін, месяц. Дзьмуў вецер. Зоркі мігцелі, і залацісты німб вакол іх напамінаў белазубую грузінскую ўсмешку.

## 5

...Людміла заявілася проста ў кабінет да Паўла. Яна была ў шэрым плашчы з капюшонам. Прычоску зрабіла, мусіць, у цырульні. Збоч галавы, загінаючыся на патыліцу, ляжаў тугі тоўсты валік скручаных валасоў. Павел недзе чуў, што такую прычоску называюць «Плюнь мне ў вуха». У капюшоне на спіне жаўцела скурчаная лісціна: перш чым зайсці, Людміла, мусіць, хадзіла па парку і думала.

Яна была ўпэўнена, што змяніць ужо нічога нельга, і гэта было відаць з апошняга пісьма, якое прыслаў ёй Павел з Глушава і ў якім прызнаўся, што сябруе з дзяўчынаю па імені Света. Але ёй проста было цікава па-

глядзець — хоць бы! — на тую, што змагла перайсці ёй дарогу. Паглядзець і параўнаць з сабою, каб ведаць сабе цану. Так і сказала яна Паўлу халодным голасам. І дзе толькі падзелася яна, тая лагодная, пакладлівая Люда? Крычала, скардзілася, што ў няўдалы час нарадзілася, у час дэфіцыту на мужчын; маўляў, сказалася дэмаграфічная хваля — рэха вайны, і выйсце для жанчын адно: змагацца за мужчыну, жанаты ён ці нежанаты. І шчаслівая тая, хто не аддасць свайго выбранніка астатнім, утрымае яго каля сябе. З'едліва сказала: можа, дзе ў тундры і не так, яна там не была, але жыве сярод людзей і ведае псіхалогію жанчын і мужчын.

Павел, здаецца, ніколі не бачыў Людмілу такой агрэсіўнай.

— Няўжо ты хочаш намаляваць ідылічную карціну,— крычала яна,— стаяць у рад мужчыны, а нам, жанчынам, падыходзь ды выбірай?

Не, ён не гэта хацеў сказаць. Ён хацеў сказаць, што жанчын, якія паводзяць сябе сціпла, прыстойна, карацей, па-жаночы, адразу прыкмячаюць мужчыны. Бо якраз сучасныя жанчыны, як яму думалася, і ён нават пісаў пра гэта ў артыкуле на маральную тэму, у сваім імкненні да нечуванага бляску і ўседазволенасці страцілі сваю даўнюю прывабную якасць — жа-ноц-касць. Парадокс, але факт! На першае месца ў іх выйшаў уласны эгаізм. Я! Пляваць, што не падабаюся мужу, затое падабаюся іншым. Выходзіць, муж проста так, для тылу, а сама жыву як хачу. Сям'я — гэта саюз мужчыны і жанчыны, заснаваны не толькі на жаданні мець дзяцей. Бедныя дзеці... Спрэчка, настойлівасць Людмілы распальвалі і яго, Паўла. Банальна, але душа для сям'і — перш за ўсё. Іначай гэта не саюз, а кампанія з двух чалавек, для разладу якой часам больш значыць нямытая талерка, чымся для сувязі — дзеці.

Людміла ганарліва хмыкнула: кожны прыстойны чалавек павінен мець яшчэ адказнасць. Але што такое адказнасць перад сям'ёю для большасці? Апраўданне сваёй няздольнасці наладзіць кантакт з іншым чалавекам. Адсюль — толькі каханне! Людміла, было відаць, сумнявалася ў тым, што казаў Павел. Ён разважаў так, быццам пражыў бог ведае колькі і не раз ужо развёўся. Але што тут дзіўнага! Вунь у дзіцячым садку можна наслухацца такога, што за вушы возьмешся, не кажучы ўжо пра так званых акселератаў. Помніцца, яшчэ ў сту-

дэнцтве ішоў неяк па вуліцы і пачуў за спінаю знаёмы голас: «У жывёл, уключаючы і антрапоідаў, канчатковая мэта індывідуальнага развіцця — працяг роду. Хоць на працягу жыцця жывёла выконвае шмат розных больш ці менш важных функцый, галоўная з іх — функцыя ўзнаўлення сабе падобных... Не ведаеш, што такое антрапоід? Антрапоід — гэта чалавекападобныя малпы...» А чый голас — не можа здагадацца. Агледзеўся: выкладчык этыкі хлопчыка за руку вядзе. А хлопчыку гадаў шэсць-сем, не больш.

Людміла, страпянуўшыся, папрасіла, каб Павел пазнаёміў яе са сваёй каханай, але хацела б пабыць з ёю з вока на вока. Яна ўсміхнулася: «Бяспеку гарантую». І Павел зноў здзівіўся яе дзёрзкасці. Зрэшты, нічога страшнага. Ён ужо гаварыў Свеце пра яе, Людмілу. Каб папярэдзіць Свету, набраў нумар тэлефона прыёмнай.

— Святло? — Іншы раз, пад настрой, ён называў Свету Святло.— Да цябе зараз прыйдзе Людміла. З Мінска... Яна прыехала. Так, зараз. Тут у меня. Ну а што? Проста пагаварыць, кажа.— Павел паклаў трубку.— Аўдыенцыя дазволена.

Людміла адчыніла дзверы прыёмнай і ўбачыла, як дзяўчына за сталом тузанулася і схавала ў сумку люстэрка. На падаконніку ляжала наспех складзеная кіпа папер. «Праставатая...» — падумала Людміла адразу. Дзяўчына пачырванела, паднялася і глянула на яе чыстымі блакітнымі вачыма. Яна была ў бледна-ружовым крымпленавым плацці, высокая, на доўгіх стройных нагах.

Людміла павіталася, нахабна разглядваючы дзяўчыну.

— Добры дзень вам! Сядайце... — Дзяўчына бянтэжылася перад напышлівай госцяю. Людміла яшчэ больш напусціла на сябе фанабэрыі.

— Я пастаю. Доўга займаць твой час не збіраюся,— Людміла, ідучы да акна, рэзка крутнулася.— Ты ведаеш, хто я? Ведаеш. Але будзь спакойна, я не прыехала забіраць у цябе Паўла. Я не такая... Таму давай размаўляць адкрыта, без хітрыкаў.

— А я не ўмею з хітрыкамі...

З рэдактарскага кабінета выйшаўКівайка, апрануты ў новы бэжавага колеру касцюм, спыніўся, уважліва паўглядаўся ў незнаёмку; пачаў корпацца ў паперах на падаконніку. Людміла маўчала, іКівайка зразумеў

вельмі хутка, што замінае размове. Запаліўшы цыгарэту, зноў зачыніўся ў кабінеце.

— Вы Паўлава сяброўка, што ў Мінску, так? — пакорліва-ціхі голас дзяўчыны ледзь не рассмяшыў Людмілу: «Кажа так, быццам я не Паўлава, а яе сяброўка...» — Мне Павел расказваў пра вас...

— Што расказваў? — раўніва вырвалася ў Людмілы.

Дзяўчына сарамліва ўсміхнулася, пацiснула плячыма.

— Не ведаю... Казаў, што вы нарадзіліся ў Германіі, што вы шмат чаго бачылі...

— А пра мае жаночыя вартасці ён што-небудзь казаў табе? — напірала Людміла.

— Не, здаецца... Толькі захапляўся вашымі прыгожымі вачыма... І сапраўды, я сама бачу, што ў вас вельмі прыгожыя вочы. Каб мне такія... — У дзяўчыны, як у лялькі, страсянуліся вейкі.

«Або наіўная на самай справе, або прыкінулася рахманай авечкаю... Ты многае з маёй красы хацела б, дзяўчынка, мець», — зларадна падумала Людміла і хмыкнула:

— Навошта? У цябе таксама арыгінальныя вочы.

— Ой, не смяшыце! — І чырвань густа заліла ейны твар.

— Але ж Паўла прывабілі...

— І нічога не прывабілі!.. Мне шкада ўсіх людзей. І Паўла шкада стала... Мне хочацца рабіць так, каб яму было добра... — Дзяўчына ўжо не гаварыла, а мармытала, запіналася. А Людміла настойліва дапытвалася, удакладняла кожнае слова, каб не пакінуць яго непраясненым і не вярэдзіць душы.

«Закахалася, любушка!.. Рабіць так, каб яму было добра,— з'іранізавала Людміла.— Ну яна, зразумела... Хлопец прыгожы, журналіст, з вышэйшай адукацыяй, якой сама яўна не мае... А ён? Што прывабіла яго ў гэтай «святой прастаце»?»

— Вось я, калі шчыра,— стрымана сказала Людміла,— не бачу ніякай тваёй перавагі нада мною.

— Мне нават і параўноўвацца з вамі сорам!.. — Разгубленасць з'явілася ў вачах у дзяўчыны.— Вы такая... уся зграбная, разумная, гарадская... Ну хоць на вітрыну!

— А чаму тады так атрымалася, як ты думаеш?

— Як атрымалася? — не зразумела дзяўчына.

— Што Павел прамяняў мяне на цябе.

— Ніхто нікога не праменьваў.— Дзяўчына гнула, упіраючы ў стол, указальны палец.— Я ні аб чым Паўла не прасіла... Усё атрымалася неяк само сабою... Я нават спачатку не прымала Паўлавай увагі, і гэта яго злавала. А мне балюча, калі нехта злуецца... Ён такі лагодны са мною... Павел.

«Здаецца, у ёй няма нічога магічнага... І чым толькі яна зачаравала яго, «святая прастата»?» — здзіўлялася Людміла ўсё больш і ўжо не магла стрымаць сябе. Голас стаў сухі.

— Вось як ты думаеш, чаму Павел адвярнуўся ад мяне? Калі быць шчырай — і не толькі Павел. Мяне кахалі мужчыны, але чамусьці заўсёды часова. Спачатку я не зважала на гэта, мне нават падабалася мець шмат паклоннікаў... Але рана ці позна кожная жанчына, нават самая распусная, усур'ёз задумваецца над жыццём.

— Я, можа, не маю права казаць пра вас... вы такая незвычайная, але... мне здаецца, што вы... — Дзяўчына глянула на Людмілу і хуценька апусціла вочы.— Што вы...

— Кажы, я не пакрыўджуся,— Людміла любавалася доўгімі прыгожымі вейкамі дзяўчыны, якія шчыльна закрылі маршчынкі пад вачыма.

— Мне здаецца, што вы не зможаце каго-небудзь кахаць.

Людміла бліснула вачыма, на шыі затузалася і сутаргава затрымцела жылка.

— Вы толькі будзеце думаць, што трэба кахаць, а кахаць не будзеце... Я, магчыма, памыляюся, але адчуваю вось... Вы і Паўла не кахалі...

«Па-мойму, ён падвучыў яе!..»

— Хопіць! Дзякуй. Я не хачу цябе больш слухаць. Ён перадаў табе свае думкі, а мне яны вядомыя. Сваіх ты не маеш, як і кожная... — «Як сказаць: тупая? Вясковая? Простая?» — простая дзяўчына.

— І нічога Павел мне не перадаваў. Я ж бачу, як мы з ім... І я зусім-зусім не думаю, ці будзе Павел маім мужам...

«Наіўная! Як ты заскачаш, калі станеш за пліту!..» — Людміла аж кіпела.

— Я больш вам нічога не буду казаць, прабачце... —

Дзяўчына глянула на Людмілу і села на крэсла.

Людміла доўга стаяла нерухома, потым тыцнулася тварам у далоні і прытулілася да сцяны.

— Супакойцеся... Ну што з вамі? Я не хацела вас пакрыўдзіць. Я сказала сваю праўду...

— Ты ні ў чым не вінавата... Я абкрадзеная жанчына! І ўжо нічога мяне не выратуе...

— Ну навошта вы так сябе караеце? Вы прыгожая, культурная і маладая... Мне здаецца, у вас усё будзе добра.

— Не суцяшай мяне, калі ласка! Я не трохгадовае дзіця.— Людміла паднесла да лоба кулакі і ўткнулася імі ў сцяну.— Для жанчыны шчырасць — гэта забойства. Лепш хлусіце жанчыне і кажыце салодкую няпраўду...

— Ну супакойцеся, я вас прашу.— Дзяўчына кранула яе за плячо.

— Адыдзі, калі ласка... Ты такая жорсткая, як і ўсе,— сказала Людміла, павярнуўшыся.— Я бачыла толькі абман, ліслівасць... Я прывыкла да іх, як жывёла прывыкае да гукаў, якімі клічуць яе да ежы. Ох, няшчасная я!.. — Яна абхапіла рукамі галаву, і было відаць, як бялелі ейныя пальцы.— А ты будзеш шчаслівая... з Паўлам. Я зайздрошчу табе і кажу пра гэта не баючыся. Я заўсёды была мужная жанчына і ніколі, як іншыя, не хавала сваёй зайздрасці. Да чаго я дайшла і што са мной творыцца, госпадзі?.. Я выкрываю ў сабе тое, што людзі хаваюць на самае дно сваіх суконных душ... Можа, я таму і нешчаслівая, што зайздрошчу адкрыта. І пакутую адкрыта... І сумую адкрыта. Ты, калі ласка, даруй мне і не слухай мой істэрычны лямант. У мяне зашмат накапілася ў душы балючага. І калі не пазбаўлюся ад яго, магу пакончыць з сабой. Аднаго разу, замкнуўшыся ў кватэры і залезшы пад коўдру... я ўжо прадумала, успару нажніцамі вены на руках. Яшчэ раз прашу, не зважай на маю істэрыю. Я хачу шчасця!.. — Людміла гучна захліпала.

Ківайка адчыніў дзверы свайго кабінета. Людміла пачула і кінулася з прыёмнай.

## 6

Уначы прыціснуў першы замаразак.

Гэта ўбачыў Павел, выйшаўшы на вуліцу. Ён быў у сінім плашчы і белай кашулі пры гальштуку. З таполяў, акацый густа, з журботным, сумным шэптам сыпалася ўраз сцямнелае лісце. Толькі бэз стаяў зялёны і ядраны, акурат вечназялёнае дрэва. Свяціла сонца, растапляючы кволую шэрань. Шыферныя дахі сталі цёмнымі ад вільгаці, з іх курылася лёгкая, блакітнаватая пара і капалі рэдкія празрыстыя кроплі.

Павел ішоў па тратуары. З высокай грушы-дзічкі, што расла збоч, нападала шмат дробненькіх бураватых ігруш, і яны мякка хрупалі пад нагамі.

Павел хваляваўся і, можа, таму ўсё так востра бачыў вакол сябе. Хваляванне яго было зразумелае, яно было як водгулле пяражытага і перадуманага.

Сарокіну ён сустрэў у прыёмнай. Яна, трымаючы ў руках шамоткія лісты тонкай папяроснай паперы, штосьці тлумачыла машыністцы. Павел павітаўся, і яна сказала яму, як здалося, абыякавым голасам, каб заходзіў у кабінет і хвілінку пачакаў.

Сарокіна ўчора позна вечарам вярнулася з паездкі па раёне, у якой перажыла некалькі непрыемных момантаў. Яна правярала наглядную агітацыю. У апошнім на маршруце калгасе, самым блізкім ад райцэнтра, ёй сапсаваў настрой плакат на антырэлігійную тэму, напісаны моваю і ў тоне трыццатых гадоў. Яна, здаецца, тактоўна паўшчувала старшыню і парторга, якія суправаджалі яе. І тут раптам старшыня закалаціўся, нема закрычаў і як падкошаны ўпаў на зямлю. Яго пачала біць сутарга. Твар пасінеў, з рота паперла белая, як малочны перагон, пена, заліла грудзі.

Яна разгубілася, не ведаючы, што рабіць. Парторг хуценька апусціўся на калені, ашчаперыў аберуч старшынёву галаву, прыпадняў. Ён, мусіць, ужо ведаў, што ў старшыні эпілепсія, і не раз дапамагаў яму.

Ей, Сарокінай, потым ужо было не да плакатаў.

Павел зайшоў у кабінет, сеў каля сцяны на крэсла. Першы раз, калі быў тут з Пятром Цімафеевічам, ён шмат чаго ў кабінеце не заўважыў і цяпер здзівіўся гэтаму. Каля процілеглай сцяны стаялі тры высокія сцяблы кукурузы з прыстаўленай да іх мернаю лінейкаю і сноп жыта з тоўстымі каласамі і наклеенай на яго

паперкаю. У шафцы арэхавага дрэва блішчалі фарфоравыя кубкі з надпісамі, якія здалёк нельга было прачытаць, ляжалі і віселі чырвоныя вымпелы, апраўленыя жоўтымі кутасамі і з вышытымі на іх гербамі.

Сарокіна, зачыняючы светлыя падвойныя дзверы, з парога спытала:

— Як жыццё маладое журналісцкае, таварыш Дроб?

— Дзякуй! Пакуль няма на што скардзіцца.

— Упісаліся ўжо ў калектыў, раён вывучылі?

— Канечне. Год працую, як-ніяк. Цяпер — толькі наперад! — У райкоме партыі Паўлу чамусьці з самага пачатку хацелася размаўляць жартаўлівым тонам — з кім бы ні было. Ці то сама атмасфера схіляла да гэтага, ці проста была ўпэўненасць, што тут працуюць людзі, якія зразумеюць цябе ва ўсім і ўбачаць тое сур'ёзнае, што стаіць за жартам. А можа, увогуле такім чынам выяўлялася звычайная чалавечая годнасць: не прыніжацца перад тымі, ад каго залежыш. Словам, Павел не ведаў сам, але як толькі прыходзіў у райком, яго заўсёды задуменны, засяроджаны выгляд мяняўся калі не на гарэзлівы, то, прынамсі, на раскаваны і як бы ўрачысты.

— Ды надта не спяшайцеся,— сказала Зінаіда Якаўлеўна, сядаючы на сваё месца за папярочным сталом.— Народная мудрасць вучыць: не той наперадзе, хто абагнаў, а хто за сабою іншых вядзе.

— Я разумею. І ў заяве напісаў: «Хачу быць у авангардзе будаўнікоў камунізму».

Сарокіна кіўнула галавою.

— Кватэра як? — спытала, мусіць, назнарок аддаляючы галоўную размову.

— Пісаць — умовы не вельмі, але жыць можна.

— Жаніліся б вы,— усміхнулася Сарокіна, гледзячы на Паўла выразнымі блакітнымі кропелькамі вачэй.— Пазнаёміліся б з якой-небудзь глушаўскай дзяўчынаю... Ці іх, на вашу думку, у нас няма? — Яна зноў усміхнулася. На лацкане пінжака бліснуў значок дэпутата: праз акно глядзела сонца, і паліроўка стала адбівала промні на сцяну за спінаю сакратара.

— Чаму ж. Вы трошкі спазніліся з парадаю, Зінаіда Якаўлеўна,— Павел злёгку пачырванеў, ён не мог не ўспомніць тут пра Свету.

— Ну вось! Дык за чым справа? І кватэру хутчэй атрымаеце.

— Дзякуй вам за добрыя словы.

— Вы не пакрывілі душою, калі толькі што называлі матыў свайго ўступлення ў партыю?

Павел адчуў на сабе прыдзірлівы позірк сакратара.

— Дзе-дзе, а тут чалавек, мне здаецца, павінен слухаць толькі сэрца, і слухаць шчыра,— сказаў Павел.

— Бывае, што інтэлігент уступае ў партыю з кар'ерысцкіх меркаванняў. У вашай рэдакцыі ёсць такія людзі.

— Я іх, бадай, ведаю.

— Ну і што вы скажаце, напрыклад, пра Касцяніцына?

— У мяне яшчэ на самым пачатку была з ім размова,— сказаў Павел і затрывожыўся: ці варта і ці тое гаворыць, чаго чакае ад яго Зінаіда Якаўлеўна? А можа, трэба пра штосьці іншае казаць? Раптам яна, Сарокіна, абвінаваціць яго зараз у нагаворах на людзей... Можа, ён, малады журналіст, не мае ніякага права выносіць прысуд? І Павел, каб не паклёпнічаць, змаўчаў пра спрэчку на кватэры Касцяніцына. Не сказаў ён і пра тое, як пасля гэтага на «лятучцы» Касцяніцын накінуўся на яго, Паўла: «Ды ён заваліў усю работу аддзела! Хіба з такімі журналістамі, як Дроб, узнімеш газету, калі ён тыднямі носіць у кішэнях пісьмы чытачоў?» Павел і праўда, заняты ўладкаваннем, прамарудзіў з тымі двума пісьмамі, не даў на іх адказу. Касцяніцын крычаў, абураўся, зіркаючы на рэдактара. А пра тое, што пісьмы праляжалі тры месяцы ў яганым стале некранутымі, нічога не сказаў, утаіў. Ён, Павел, тады не апраўдваўся: усе і так зразумелі, хто ў чым вінаваты.

— Можна мець усё... і грошы, і пасаду, і машыну, ды не мець галоўнага — павагі ад людзей.— У голасе Сарокінай была цвёрдасць.— Кожны першакласнік пра гэта скажа.— Сарокіна адштурхнулася рукамі ад стала. Устала, прайшлася па кабінеце. Спынілася насупроць Паўла — ён падняўся.— Дык вось, Павел Іванавіч, райком партыі за вашу кандыдатуру. Афармляйце дакументы... Калі ў вас наступны партсход?

— У канцы месяца.

— Добра. Будзем заканчваць. У мяне ў дзесяць нарада сакратароў пярвічных партыйных арганізацый.

Там і перагавару яшчэ раз з Чартковым. Да пабачэння!

Павел выйшаў з райкома. Сонца пранікла скрозь апушчанае ўніз веццe ніцых вербаў, што раслі абапал заасфальтаванай алеі, гарэзліва кранулася ягоных шчок. Вузенькае блакітнае лісце густымі гурбачкамі ляжала на траве пад вербамі, і, калі нізам прыпадаў вецер, яно дробна варушылася жывою шэрсткаю, напамінаючы Паўлу бераг і хвалі Сожа, яго сталёвы бляск пад раніцу, глухую ад малочна-белага туману і насцярожана-прыціхлую ў холадзе густой расы цішыню.

І ён раптам адчуў: яму стала сумна, і нейкі час думка, што гэты сум нішто не зможа развеяць, не давала яму спакою. Быццам хтосьці, усемагутны і бязлітасны, нахабна адабраў у яго радасць жыцця і пасеяў у душы сумненне ў сваёй даўгавечнасці.

Мусіць, так бывае з чалавекам, калі ён, спазнаўшы шчасце, раптам адчуе страх ад таго, што шчасцем гэтым не суджана будзе нацешыцца. І тады віна перад зямлёю, якая дала яму жыццё і якую ён міжволі, у сумятні турбот, абыходзіць удзячнасцю, хоць бы такой простай і звычайнай, як успамін пра маці, сціснe сэрца так, што яно мала не замрэ.

Не ведаў яшчэ Павел Дроб, што роўна праз месяц ён вымушаны будзе пабываць у сваёй Малінаўцы. Але — перш будзе сход, на якім яго будуць прымаць у партыю. І на гэтым сходзе Павел адкрые для сябе адну важную ісціну: не ўсе з тых людзей, што, паціскаючы табе руку, аддана глядзяць у вочы і ледзь не клянуцца ў вечным сяброўстве, у душы жадаюць табе дабра і ўдачы; наўпярок, там, дзе можна, тонка і прыхавана — вох, як яны ўмеюць гэта рабіць! — нацягнуць каля ног здрадлівую нітачку подласці. І яшчэ: чалавек, не ўпэўнены ў сабе, ніколі не зможа пахваліць іншага, будзе баяцца, што страціць свой шанец на пахвальбу; прызнаць перавагу кагосьці над сабою можа толькі чалавек з бясспрэчнымі вартасцямі, гэтак жа як бяссільным можа быць толькі той, хто мае сілу.

Гэта ён, Чарткоў, які хадзіў заўсёды ў чысценькім, адпрасаваным касцюме і любіў у гардэробе дапамагчы жанчыне апрануць паліто, зрабіў у пратаколе няпэўны запіс: «Працуе не горш за астатніх». І гэта яго замаскіраванае «працуе не горш за астатніх» было небяспечнае, як ціхамірна скручаная змяя. Павел не ўстаў і не папрасіў змяніць фармуліроўку, але — спахмурнеў. І зу-

сім не таму, што лічыў, быццам працуе лепш за ўсіх, хоць, калі верыцьКівайку, так яно і было, а таму, што гэта быў наўмысны разлік. Павел даўно заўважыў, што Чарткоў, хоць і затойваецца, вельмі неабыякавы да ягоных матэрыялаў, ладу ў працы. А таму і зразумеў: Дроба можна выбіць з каляі несправядлівасцю. Ён яе надзіва тонка адчуваў і востра на яе рэагаваў, за што недалёкія людзі абвінавачвалі яго ў самалюбстве. Усе беды на зямлі, лічыў Павел, ад несправядлівасці. Няхай толькі чалавек адчуе, што бура ў акіяне — гэта справядлівасць, і ён будзе дзьмухаць на гэты акіян дзень і ноч без стомы. Толькі вось дакажы яму, што гэта справядлівасць. Але ж справядлівасць, як і праўда і дабро, не існуе сама па сабе, яна нараджаецца ў змаганні з несправядлівасцю.

Радуйся, Чарткоў, напісаў бы ты пра каго іншага, хто добра піша, сумленна працуе, ён, Павел, паказаў бы табе «працуе не горш за астатніх». А так што ж, разКівайка маўчыць, апусціўшы галаву і закрыўшы вока кэсмаю валасоў. Павел не баіцца за сябе, не дрыжыць за гонар свайго мундзіра і яму не патрэбны танненькі аўтарытэт. Не без усмешкі прыгадваў выпадак з Чартковым. У той вечар іх было пяцёра. Далучыліся яшчэ дзве маладзенькія выхавацельніцы дзетсада. Яны выйшлі на дружыну. Ішлі па цэнтральнай вуліцы Глушава. Вясёлы настрой даваў шырокую волю смеху, досціпам і жартам.

Павел, кранууўшы Чарткова за рукаў, туга абвязаны акуратна разгладжанай чырвонаю павязкаю, іранічна спытаў, ці былі ў яго прыводы ў міліцыю. Чарткоў перш агляну ўся на бакі, адале зусім сур'ёзным голасам адказаў: «Не». Павел здзівіўся: не зразумеў жарту? Брэшка напусціў на твар строгасць і, па-змоўніцку міргнуўшы Паўлу, ляпнуў:

— Будуць!

Чарткоў, здаецца, таксама сцяміў, што да чаго, і пераключыўся на жартоўны тон. Маўляў, нічога не баюся, у мяне знаёмы начальнік міліцыі — замне справу. Павел, зрабіўшы такую міну, быццам убачыў іншапланетны карабель, падкузьміў Чарткова, што той карыстаецца яшчэ і блатам. Чарткоў сцяўся, адчуўшы, што трапіў на кручок. Ён надта баяўся, каб якая непрыстойнасць не кінула на яго цень. Гэта ўсе ведалі, і таму кпілі з яго. Зрабіў рахманыя, бяскрыўдныя вочы — «цяля-

чыя», як сказала адна жанчына ў сталоўцы, калі ён, апранаючы яе, насміхнуўся, быццам яна не прывучана да джэнтльменскіх паслуг.

Тым часам згушчаўся восеньскі змрок. На голых кустах язміну чарнеліся камячкі, здалёк падобныя на вераб'ёў, не адрозніць — у голле наўблытвалася пучкамі лісце. У такія вечары становіцца журботна на душы, шкадуеш, што неўзаметку праляцела лета і трэба будзе перажыць зіму з маразамі, завеямі і хваробамі.

Яны трымаліся разам, не разыходзіліся і адчувалі сябе раскавана. Зусім не горш, чым тая гуллівая публіка, што пачала збірацца на танцпляцоўку, адкуль грымела музыка. Нарэшце Чарткоў звярнуў у парк на асфальтаваную дарожку з вузка пабеленымі краямі. Усе моўчкі пайшлі за ім. Чарткоў пашыўся ў зараснікі бэзу. І раптам гукнуў іх.

— Наткнуўся на некага,— буркнуў Брэшка незадаволена.— Пайшлі.

Чарткоў нахіляўся над лаўкаю, заглядваючы ў твар чалавеку, які ляжаў ніц і на спіне якога клубком скруціўся кот і свяціў абыякавымі зялёнымі вачыма. Ці не той гэта, якога бачыў Павел у першы дзень свайго прыезду ў Глушава?

Брэшка ўсчыркнуў запалку, асвяціў галаву чалавека. Гэта быў малады хлопец з сіняком пад вокам. Адну руку ён падклаў пад шчаку, другая звешвалася да зямлі, і на ёй, набрынялай, выпучваліся вены і была відаць татуіроўка: «Не забуду мать родную». Брэшка ўспомніў, што ведае гэтага чалавека, ён працуе ў міжкалгасбудзе. І павярнуўся, каб ісці. Чарткоў незалюбіў, маўляў, на сёння жартаў хопіць, і тузануў хлопца за руку. Брэшка зноў падышоў да лаўкі і сказаў Чарткову, каб не чапаў знаёмага. Чарткоў рэзка абарваў яго: «Толк ад дзяжурства павінен быць! А то скажуць, прасачкавалі. Да начальства дойдзе...» Ён хапіў хлопца за плечы, з сілаю тармаснуў. «Дапамагайце!» — звярнуўся да выхавацельніц, якія збянтэжана ціснуліся адна да аднае. На тым месцы, дзе яны стаялі, зямля была здратавана вострымі шпількамі ад іх туфляў.

Яны паднялі п'янага і павялі. Ён ішоў спакойна, не ўпіраючыся, адно квола трымаўся на нагах. Брэшка тупаў ззаду, апусціўшы галаву. Калі апынуліся на цэнтральнай вуліцы, па якой ішлі людзі, ездзіла на веласіпедах шустрая блазнота, шчабятлівымі групкамі

таўкліся дзяўчаты-падлеткі, хлопец раптам зусім выразна сказаў: «Рваных я не маю, гадзіннік прапіў... Ніякага з мяне навару...»

Чарткоў павярнуў п'янага ўлева — на Савецкую. Той пакорліва падпарадкаваўся. Павел здзівіўся: навошта круга даваць? Чарткоў усіх ашаламіў: «Міма райкома партыі павядзем. Можа, Сарокіна ўбачыць».

Пасля сходу была парткамісія. За сталом сядзелі — усе як адзін сівагаловыя, з бескампраміснымі вачыма дзядзькі, аднаго з якіх, старшыню, Павел трохі ведаў. З усіх дадзеных камісію пільна зацікавілі звесткі пра бацьку. Павел напісаў усё, што ведаў, ды гэтага аказалася мала. «Патрэбны дакладныя даты бацькавай біяграфіі ваеннага часу. Дак-лад-ны-я»,— паўтарыў старшыня камісіі па складах, гледзячы на Паўла, які сядзеў побач з ім, каля акна. За акном шумеў дождж, вада шчыльна сплывала па шыбах, і таполі расплывістымі, невыразнымі абрысамі мітусіліся ў вачах. Павел задумаўся: «Як быць? Бюро ў наступны аўторак. Трэба ехаць».

«Няўжо, няўжо што-небудзь з бацькавага мінулага перашкодзіць мне ўступіць у партыю?» — ідучы дахаты, трывожыўся Павел. Вада намыла на дарозе выспачкі жаўцяку, і калі Павел ступаў на іх, жаўцяк ядрана парыпваў, ажно ламіла ў скронях. Па каляінах і між імі беглі ручаі, шырокія і вузенькія, прамыя, як стрэлы, і звілістыя. Але ўсе яны мелі адзін кірунак, адну мэту — трапіць, уліцца ў прастор вады, каб даць ёй сілу і даўгавечнасць. Можа, не кожны ручай дацячэ, можа, нейкі па ходу перасмягне, а то сустрэне перашкоду і не пераадолее яе...

Каля піўнога павільёна Павел зноў убачыў таго бледнага, худога чалавека. Павел не мог без жалю і вусцішнай знямеласці глядзець на яго, як даведаўся, безнадзейна хворага, абпрамененага. Цяжка было ўявіць, што чалавек ходзіць па зямлі з неадчэпнай думкаю пра заўчасную смерць. Чаканне нават шчасця і радасці — гэта заўсёды сіла волі і вытрымка. А смерці?.. Няўжо чалавек такі моцны, што і чаканне немінучай смерці не можа штурхнуць яго за мяжу адчаю і самазабойствам пазбавіць сябе ад гэтага пакутлівейшага чакання? Але — мёртваму нічога не трэба, а жывому трэба ўсё.

Чалавек быў у рудым, зацыраваным на плячы белымі ніткамі пінжаку і гумавых ботах. Маленькія мутныя вочы ў глыбокіх вачніцах блішчэлі, а голас быў нудны і плаксіва-расцягнуты, як у птушкі на апошнім подыху.

— Я кажу праўду!.. Людзі азвярэлі... Людзі хочуць вайны,— размахваў рукамі чалавек.— Людзі робяць бомбы... Гэтыя бомбы абпраменілі мяне, абпраменяць і вас... У мяне вагі засталося пяцьдзесят адзін кілаграм з бальнічным халатам. Я нікога не баюся, косці нікому не патрэбны... Я кажу праўду. Косці нікому не патрэбны. Бомбы зробяць з людзей адны косці і попел.

Чалавек выпростваў малітоўна рукі. Людзі праходзілі міма яго, здзіўлена, а то і з усмешкаю касіліся, і не ўсе, як здалося Паўлу, спачувалі хвораму чалавеку.

— Праўды ніхто не хоча слухаць... Праўда нікому не патрэбна. Я кажу праўду.

Чалавек раптам затупаў нагамі ў вялікіх ботах і заспяваў:

> Расцветали яблони и груши,
> Поплыли туманы над рекой...

У чалавека ад напругі тузалася левае знявечанае крыло носа і на лобе выступалі кроплі поту. Чалавек змогся, перастаў спяваць. Хлопец у замасленым камбінезоне з кішэньчыкамі на каленях даў яму закурыць.

Чалавек прагна глытаў дым, на шыі сутаргава варушыўся востры кадык.

Павел, аддаляючыся, думаў...

Чалавек, адыходзячы ў магілу, не хоча забіраць з сабою сваёй праўды. Праўда павінна жыць далей, чым сам чалавек. Памірае праўда, і ейнае месца не пустуе. Яго займаюць няпраўда, хлусня, выдумкі. За праўду трэба змагацца нават тады, калі яна ў самым зародку, бо зародак — гэта ўжо надзея на вялікае. Хто ведае, якая праўда ў гэтага абпраменёнага чалавека. Можа, яна — проста плён хворай фантазіі? Але праўда патрэбна ўсім. Вось і ў яго, Паўла, пытаюць пра бацьку.

Лёгшы спаць, Павел доўга не мог заснуць. Колькі хваляванняў наканавана чалавеку!.. Цікава, так задумана жыццём ці проста дадзена чалавеку на тое, каб скараціць яго век? Можа, каб чалавек жыў вечна, ці нават доўга, даўжэй, чым жыве, парушылася б нейкая сістэма ў цывілізацыі? Можа, сама прырода стварыла для чалавека такі век? І намаганні падоўжыць яго

проста неразумныя. Бо ў прыродзе ж, звыклай, не змарнаванай усемагутнай тэхнікаю, усё ў суладдзі, узважана і разлічана, кожная травінка, кожны жучок... А чалавек — хто?

Цікава, вельмі цікава ўсё гэта... Але няма пэўнасці. А можа, якраз і не трэба даходзіць да пэўнай кропкі? Можа, пасля яе пачне рушыцца ягоны мозг, як пясчаныя сцены цацачнага замка, не вытрымаўшы інтэлектуальнага напружання? Можна, скажам, паверыць, што чалавек запраграмаваны прыродаю як пэўны элемент у створанай ёй жа сістэме гармоніі. Дай гэтаму элементу лішні зарад — і на другім баку сістэмы загарыцца чырвоная лямпачка: «Бяда!»

...Сон абарваў думкі Паўла.

## 7

Павел ніколі не прасіў бацькоў, каб яго сустракалі, адно папярэджваў, што выязджае, як зазвычай, вячэрнім аўтобусам. І кожны раз бацька з маці прыходзілі на шашу. Дзесьці ў поўнач, у глухі і мёртвы час. Стаялі, чакалі сына.

Павел, пад'язджаючы да сваёй павароткі, углядаўся ўперад, лавіў позіркам слупы, сцежкі, парэнчы мастоў, што бліскалі ў святле фар і з неймавернаю хуткасцю адбягалі назад у цемру. Год не быў дома. Праваруч павінен быць помнік: стомлены салдат схіліў ускудлачаную ветрам галаву, у адной руцэ трымае аўтамат, у другой — каску. Яго паставілі тут не так даўно, гадоў дзесяць назад. Павел добра помніць, як і яны, школьнікі, хадзілі па лесе, па мясцінах былых баёў. Раскопвалі пагоркі, акопы, збіралі астанкі людзей: чарапы, косці, сатлелыя шматы адзежы, падэшвы ад ботаў, гузікі. Зносілі ўсё ў вялізныя шырокія труны, якія потым пад жалобныя гукі закапалі ў зямлю і паставілі наверх салдата на масіўным пастаменце. І людзі тады, што сабраліся з усяго раёна, плакалі і галасілі па гэтых касцях, як па нябожчыку. Павел бачыў, як бацька яго ўвесь час моршчыўся, захінаў плячом твар. Потым, сагнуты, выбраўся з натоўпу. Яго сівая галава плыла над стракатым людскім морам, як воблачка. Пайшоў, хістаючыся, бы п'яны, у сасоннік. Павел хацеў быў кінуцца за ім, ды якраз да помніка чаканным крокам

падышлі зусім маладзенькія, у шчыгульнай, новенькай форме салдацікі з аўтаматамі на грудзях. Афіцэр з дзвюма зорачкамі на залацістых, ажно слепяць вочы, пагонах даў каманду, і салдацікі адным махам нацэлілі аўтаматы ў неба. Павел здагадаўся: будуць даваць салют.

— Агонь! — скамандаваў афіцэр, і цішыню, якая раптам нязвычна зазвінела ў вушах, цвёрда прашыла «тра-та-та».

Павел глядзеў, як выскокваюць з аўтаматаў і стукаюцца аб пастамент жоўценькія, бліскучыя, як жалуды, гільзы, зусім непадобныя на тыя зеленаватыя і доўгія, што калісь густа валяліся на палях, па беразе Сожа і ў пяску на ўзлеску.

Дахаты бацьку прывяла маці. Ён быў прыгнечаны, сумны і разгублены. Звярнуўся да маці: «Дай сто грам, калі прыберагліся дзе, сэрца шчыміць...» Выпіўшы, павесялеў. Прынёс вады, потым сядзеў на лавачцы з мужчынамі, што жыва гаманілі, і курыў.

Павел глядзеў у акно на вуліцу і чуў мужчын.

— Хто ведае, чыіх там касцей больш — нашых ці нямецкіх,— сказаў бацька.— Вярнуўшыся з вайны, я бачыў трупы...

І потым, ужо дарослы, Павел часта задумваўся над гэтымі бацькавымі словамі. Людзі невінаватыя, што жывуць у пэўны час. Час бязлітасны і жорсткі да іх быў заўсёды. Інакш, мусіць, нельга. Ёсць урокі ў школе, а ёсць урокі гісторыі. Першыя вучаць дзяцей, другія — пакаленні.

...Фары аўтобуса выхапілі пастамент і ногі салдата, вышэй — чорны, няпэўна праяўлены ў цемры сілуэт. Месячнае святло цьмяна і мройліва цадзілася скрозь вяршалле сосен, што раслі тут густа і высокімі, як мачты.

Бацька з маці стаялі на левай абочыне шашы, пад бярозкаю, разгалістай і густой, бы венік. Гэтую бярозку, маленькую і крывую, выдраную з зямлі колам трактара, які буксаваў, выцягваючы на дарогу даўжэзны сасновы хлыст для слупоў на высакавольтную лінію, калісь пасадзіў Павел. Тады, калі ездзіў у раён у школу.

«Зноў прыйшлі...» — падумаў ён пра бацькоў са спагадаю і ўдзячнасцю. Маці была з кійком у руках. Павел пацалаваўся з маці, адчуўшы, як яна лёгка, бы

павешаная на дрот апранаха, падалася да яго. Рука ў бацькі была сухая і цвёрдая, што смаляк. Павел лёгка, сцішаным голасам папракнуў бацьку і маці: дарэмна турбаваліся, прабег бы і адзін гэтую вярсту ад шашы.

— Ага,— не згадзілася маці.— Аднаму ж па лесе страшна. Дзікоў цяпер развялося страх колькі! Вунь пракуроравага цесця нядаўна разарвалі...

— Самы страшны звер — гэта чалавек, матка,— сказаў бацька, і голас у яго быў глухі, але ўпэўнены і мудры.— Для яго нічога ўжо святога няма...

— Божачка ж мой, божа!.. — забожкала маці.— Што ета будзе? Атаму етага нарабілі па ўсім свеце. Як таго хлеба... быццам яго есці можна. З'еў — і сядзі сыты. Ці ж мала той вайны было... — Маці хліпка задыхала.

— Дурныя галовы і прыдумваюць розныя штучкі-дручкі забіваць людзей, нішчыць... Чытаеш па газетах, глядзіш па тэлевізары... Я б з імі, такімі вылюдкамі, не цацкаўся. Мы... — Голас у бацькі задрыжаў,— пакутавалі нявінныя ў сталінскіх лагерах. А тут...

— Ну нягож! Дурныя людзі і дурныя, што праўда, то праўда. І навошта іх толькі царамі ставяць. Ставяць, а ён на вайну падбівае народ... А ў самога ж, нябось, і дзеці ёсць, і ўнукі... Не, мусіць, няма дзяцей. Бо калі дзеці свае, пра вайну не думаецца... не, не думаецца,— перайшла на шэпт і шаптала сабе маці, бы якое заклінанне.

— Палітыка, Маруся... Тут палітыка,— глуха сказаў бацька.

— Хай ён з етай сваёй паліцікай за пуню сходзіць ды падатрэ!..

Ішлі моўчкі доўгі час — бацька скурыў цыгарэту. Кожны думаў пра сваё. Дарога прывідна святлела ў цемры, якая спераду вузка падымалася, а над сасоннікам шырока распрасталася ў бакі, як гіганцкая птушка, і на гэтых магутных чорных крылах ярка бліскалі неспакойныя далёкія зоркі.

Павел раз-пораз выбіваўся з каляіны і тады чапляўся нагамі за тугі і клейкі, што воск, пясок. Маці папіхалася кійком і мацала ім дарогу. Бацька тупаў ззаду. Павел чуў ягонае дыханне, шумнае, з сіпеннем у грудзях.

— Ці ж надоўга ты, сынок? — спытала маці. Лініі

яе твару цьмяна і журботна вырысоўваліся.

— Пару дзён пабуду,— адказаў Павел.

— Мала... — нудным голасам сказала маці.

— У водпуск прыеду да вас на цэлы месяц.

— Калі яшчэ той водпуск!.. Дзесяць разоў памяняеш свае словы.

«Крыўдзім мы, дзеці, сваіх бацькоў, што не думаем пра іх жаданне часцей і даўжэй бачыць нас...» — падумаў Павел з горыччу.

...Разбудзіла Паўла муха. Уедлівая, куслівая восеньская муха. І скуль яна толькі ўзялася? Спачатку поўзала па назе, потым пераляцела на твар, і Павел ужо не мог ад яе адкараскацца: «Во ўвялілася!..»

Маці паліла ў печы. Ставіла ў качарэжнік то чапялу, то вілкі, злівала ваду і выходзіла ў сенцы. Нямоцна стукалі дзверы. За сцяною, на двары, бацька вастрыў пілу. Глуха шоргаў аб зубцы напільнік. У шчыліну між фіранкаю і падаконнікам Павел бачыў мокрыя шыбіны, куст каліны з пунсовымі ягадамі, сабранымі ў тугія пучкі, якія хітаў вецер. Бачыў свежую яснасць неба і ў ёй празрыстае сонца. Дзесьці ў канцы вёскі суха і спёрта траскатаў трактар.

Павел саскочыў з ложка, памахаў рукамі, адганяючы рэшткі сну, і пабег мыцца.

— Во, акурат! — сказала радасна маці.— І снеданне гатова, цёплае... Бацька казаў, што ў дровы пойдзеце.

— Я ўжо чую, пілу вострыць.

Памыўшыся, Павел выйшаў з хаты на двор. Зямля была цёмная і сырая, таіла халадок. Павел здрыгануўся ад нечаканага лопату птушыных крылаў і ўбачыў над галавою галубоў. Так блізка, што здавалася, яны во-во сядуць на плечы. Ён няўцямна глядзеў на бацьку, не разумеючы, скуль такое галубінае нашэсце.

— Ты бачыш, як яны адразу цябе прызналі,— здзівіўся бацька. Ён сядзеў на слонцы, прыціснуўшы сабою пілу. У руцэ трымаў напільнік з сіняй калодачкаю. Худы загарэлы твар моршчыўся ад задаволенасці.— Мае пестуны, гадую,— кіўнуў на падстрэшша, дзе блізка адна каля аднае віселі галубятні.

Раптам адзін галуб сеў Паўлу на плячо. Павел убачыў яго чырвонае насцярожанае вока і жоўтую з кручкаватым кончыкам дзюбу.

— Яны зусім ручныя ў мяне,— сказаў бацька з гонарам у голасе.

— А навошта яны табе?

— От проста так, няхай жывуць... Весялей з імі.

— Здзяцінеў ты, бацька, пад старасць,— усміхнуўся Павел, гладзячы голуба па крылах.

— Вынесі ім з кладоўкі круп... там, у мяшку.

Павел завярнуў у кладоўку; вынес цэлую міску ячных круп, высыпаў іх галубам. Галубы затаўкліся, заскакалі, засланіўшы сабою крупы. Яны былі снежнабелыя, чыстыя на мокрай цёмнай зямлі.

— У лес надумаўся? — спытаў Павел, назіраючы, як галубы, завінаючыся, падымаюць ружовыя спадыспаду крылы.

— Трэба дроў хоць возікаў якіх пяць загатовіць. А то з сельсавета покуль дачакаешся, дык снег ляжа. Во паснедаем і пойдзем у Максімаўку... Я там асінак добрых нагледзеў, і бярозкі пракідаюцца. Заадно і пагаворым.

Паснедаўшы, яны падаліся ў Максімаўку. Праз гароды сцежкаю, абапал якой стаяў зрудзелы чарнобыль. Павел насунуў скаржанелыя кірзавыя боты і цяпер шкадаваў, што не абуў, як раіла маці, чаравікі. Правы заднік цёр пятку. Павел нёс сякеру, адчуваючы плячом вострую дзюбачку джала.

На сядзібах дождж павымываў бульбу, і яна была падобна на жоўтыя бурбалкі. Бацька, гледзячы на яе, ківаў галавою, і на лобе ды шчоках у яго глыбелі маршчыны.

— Я, тата, у партыю буду ўступаць,— сказаў Павел, прыцінаючы хваляванне.

— У партыю? — перапытаў бацька, зіркнуў на сына і перавярнуў пілу зубцамі ўніз. Зубцы зачапіліся за пінжак.— У партыю, значыць... кхы-кхы! Патрымай-ка пілу, я закуру.

Бацька прыпаліў цыгарэту.

— Добра, сын, што з бацькам раішся. Добра... — Голас у бацькі раптам стаў сухі і строгі.— А ты ўпэўнены, што дастойны ў партыю? Калі чалавек для партыі нуль, ні тое ні сёе — яму няма чаго ў ёй рабіць. Разумееш, ня-ма. Я не хачу, сын, каб ты зрабіў так, як зрабіла ў нас адна маладая даярка... з Лісовіч. Пайшла ў райком партыі, да сакратара і заявіла: «Я — член партыі, у мяне сярэдняя адукацыя — давайце мне кі-

руючую пасаду!» Не трэба тады ўступаць, сын...

— Ёсць такія і сярод нашага брата. Я з Сарокінай, сакратаром райкома, ужо гаварыў пра гэта.— Задумаўшыся, Павел нейкі час маўчаў.— А ты чаму, тата, не ў партыі? — асцярожна спытаў, бо раней ніколі не задаваўся такой думкаю.

— Паступаў, ды...

Трывога, быццам з неба лівень, абрынулася на Паўла, затапіла свядомасць. Ён колькі хвілін стаяў як аглушаны, глядзеў удалеч, на калгасны сад, у якім бурштынавай жаўцізною адсвечвалі цяпер ігрушыны, на ўзаранае жытнёвае поле з ужо шэрымі гурбамі сцірт, на вузкі шнурок бярэзніку і за ім шыферныя дахі лісовічскіх хат.

— Ты, сын, не хвалюйся... Табе маё мінулае не пашкодзіць,— хрыпла сказаў бацька.

Максімаўкаю звалі балота між Малінаўкаю і Лісовічамі. Даўней яно было дрыгвяністае, амаль непраходнае для чалавека, і асака, дзягіль, гарошак, мячэўнік, якімі балота бучна зарастала, выспявалі, жухлі ды прападалі марна. Нават у самую спёку ў ім грузлі каровы, і пастухі, праганяючы чараду, звычайна залучалі яе ад балота. Затое ў балоце было процьма маліны. Падымеш каліва — ажно ўгінаецца! Вяліся дзікія качкі-лапаноскі з белымі валлякамі і шыза-блакітнымі крыламі, а ў невялічкіх сажалках, шчыльна зацягнутых зялёнай раскаю, можна было натаптаць тлустых мядзяна-бліскучых карасікаў і піскլявых уюноў, якія, калі сыпнеш на іх солі, рабіліся жоўтыя і гнуткія, што лыка.

Цяпер балота наскрозь распалавініла прамая, бы страла, меліярацыйная канава, і ў ім не так гразка, можна смела хадзіць у ботах. Каровы пасуцца аж да самай восені, і нават увесну не заплываюць іх глыбокія сцежкі. Пачахла маліна, а траву заглушыў жоўты высокі мох з малюсенькімі галоўкамі на тонкіх і пруткіх, як дроцікі, чаранках.

Павел з бацькам браліся ўздоўж канавы. Уроўні з імі ляжалі кучы дымчата-сівога балотнага жвіру, па якіх кругамі бегалі рудыя вастрахвостыя яшчаркі і ляніва карабкаліся пластмасава-гладкія жукі-насарогі. У адным месцы ім напаткаўся вуж. Ён самавіта сцягнуў сваё доўгае і гнуткае, як вяроўка, цела з асветленай

сонцам кучы і схаваўся ў альховым карчы, мусіць, абраным на зімовішча.

— Сёлета, казалі, у балоце шмат было вожыкаў,— сказаў бацька.

— Відаць, гадаўя развялося?

— Ды бытта не...

Яны, адчувалася, размаўлялі адно таму, каб не маўчаць, нечым запоўніць няёмкую, гнятлівую паўзу.

— Вось тут і распачнем,— паказаў бацька пілою на асіны. Яны былі гонкія, высокія, з атласнай зеленаватай карою.— І на кані сюда можна пад'ехаць... во як ішлі, паўз канаву.

Бацька выбраў крайнюю ад канавы асіну і, сагнуўшыся, чыркнуў раз-другі па ёй пілою. Павел падышоў, узяўся за пілу з другога канца.

Яны падрэзалі асіну і, скіраваўшы ў прагал, павалілі. Бацька, запыхаўшыся, сеў на паваленую асіну. Пілу заціснуў між калень; забыўшыся, паслабляў калені, і яна падала.

## 8

...Ён, Іван Дроб, падаваў заяву ў партыю. Толькі адзін раз, і больш — ніколі. Яго зняважылі, і самае прыкрае — свае людзі, з якімі разам араў, сеяў, піў гарэлку, дзяліўся цыгарэтаю. Спагадлівыя і добрыя не ўсе, шмат маскіруецца пад добрых і спагадлівых.

Сход праводзілі ў школе. Быў ясны, ціхі вечар, напоены водарам сасновай кашкі. Сакратар партарганізацыі зачытаў заяву. І тут устае Пятрок Хлябцэвіч, маленькі, шчуплы; ён заўсёды хадзіў у замасленым камбінезоне, а на сход надзеў цёмна-зялёную кашулю. «Нам што, партыя не дарагая! Каго мы прымаем, чалавека з варожага стану?..» Так і сказаў: з варожага стану. Іван тады не стрымаўся, ускіпеў: «А ты, заморак тылавы, з якога стану?» Намякнуў, што Хлябцэвіч — даносчык. «Ну-ну, толькі без пагроз!..» — самаўпэўнена прыкрыкнуў на Івана Хлябцэвіч, і было відаць, як захадзілі на шчоках жаўлакі. Праз гэтыя жаўлакі людзі ведалі, затаіў Пятрок злосць ці не.

...Яны прыйшлі проста на выган, дзе Іван Дроб пасвіў коней. Праўдзівей, пад'ехалі да канавы на чорным лімузіне, а пасля ўжо перабраліся па кладках. Іх

было двое мужчын. З планшэтамі пры боку. Ці то напраўду яны былі такія высокія, ці рабілі іх такімі доўгія скураныя плашчы.

«Дроб Іван Мацвеевіч?» — спытаў адзін з мужчын, трымаючы ў кішэні плашча руку. Дроб стаў белы, як снег. Ужо ведаў, што такія людзі проста так не прыязджаюць.

Яны далі падпісаць яму паперу, якую падсунуў на планшэтцы другі мужчына, маладзейшы з твару. І Дроб на дзесяць гадоў загрымеў у Сібір. А за што? Ён праваяваў усяго толькі дваццаць восем дзён. Дваццаць восем дзён вайны... Малодшага лейтэнанта ўзвода сапёраў Івана Дроба фашысты падабралі кантужаным на полі бою пад Барысавам. Ён быў скрываўлены, ляжаў без прытомнасці з выпрастанымі на захад рукамі. На сярэдні палец была ўздзета пустая гільза. І вакол, і пад ім — толькі пустыя гільзы.

Пасля доўгіх бадзянняў фашысты адправілі яго ў Германію як «жывы экспанат рускай стойкасці». І ачуняў ён, з цяжкасцю і болем, ужо там, у далёкай і ненавіснай яму Германіі.

Яго купіў у лагеры тоўсты рыжы баўэр, і ён замест паласатай формы пачаў насіць старэнькія штаны і куртку, якія даў яму гаспадар.

Баўэр трымаў жывёлагадоўчую ферму.

Наўме было адно — акрэпнуць. І тады... дужаму, маладому мужчыну не трэба пазычаць смеласці. Ды ежа ў баўэра была мала лепшая, чым у лагеры: раніцаю — кавалак хлеба са скрылікам цвёрдага сыру і чай, у абед — міска пустога баршчу, храсткаватае каровінае вуха і кубак падсаloджанай вады; вячэраў адной невялікаю зваранаю рыбкаю.

Пасля сенажаці, куды баўэр пасылаў яго, і пякельнага сонца праз увесь дзень кружылася галава і жоўта было ў вачах, усё роўна як глядзіш у вадзе. Баўэр галіў начыста галаву, і яна таксама была жоўтая і бліскучая, як гарбуз.

Іван падбіраў на сметніку лімонныя лупіны і, горкія, ссохлыя, еў іх. Трысціў маладымі зубамі каровіныя маслы, якія баўэр выносіў свайму сабаку — чорнай, са свінцова-тупымі вачыма аўчарцы.

Неўзабаве ў баўэра з'явілася яшчэ адна парабчанка — Стэфка, чатырнаццацігадовая польская дзяўчынка, па-даросламу сур'ёзная і кемлівая, як сарока. Іван

размаўляў на беларускай мове, і яны добра разумелі адно аднаго. Стэфка была цягавітая і ўвішная, як шматдзетная гаспадыня. Так падумаў пра яе Іван з горкім сумам, калі пачаў хадзіць з ёю разам на сенажаць. Ён касіў канюшыну, яна сушыла яе, разбіваючы пакосы граблямі.

— Мо пан воды хцэ? — пыталася яна, зіркаючы то на мокрую Іванаву спіну, то на сонца.

— Хай паненка прынясе,— адказваў Іван, адно таму, што ведаў: дзяўчынцы падабаецца рабіць яму прыемнае.

Дзяўчынка бегла з бляшанкаю да крыніцы, узятай у акуратны венчык зруба, толькі бліскалі жаўцізною пяткі і ўздрыгваў на макаўцы русы віхорчык.

Ён прагна піў ваду. Стэфка глядзела, як варушыцца ў яго на шыі вялікі коўцік. Потым ён лавіў цвыркуна, браў яго за крылцы і змазваў рудой густаватай вадкасцю, што выпускаў цвыркун — «ёдам», драпіны на яе тонкіх загарэлых нагах. Дзяўчынка звонка смяялася. Ёй, мусіць, было казытліва.

Неяк надвечар, калі з захаду патыхнула прахалодаю і пагусцела над галавою неба, а грому не было чуваць толькі праз тое, што бесперапынна і трывожна стагналі самалёты, на сенажаць прытупацеў баўэр з сабакам на павадзе.

Ён аж калаціўся, торкаў пальцам у неба, разяўляў рот і «шнэлькаў», маўляў, набліжаецца навальніца, і трэба хутчэй складваць у копы сена. Галава туга блішчала, і на ёй добра выдзяляўся бледна-ружовы рубец. Роўны, шырынёю з аловак, ён збягаў з цемя і заканчваўся на лобе крыжыкам у форме фашысцкай свастыкі — так баўэру, відаць, па ўласнай згодзе зашылі рану.

Баўэр насядаў: шнэль! шнэль! Граблі мільгалі ў Стэфчыных руках, як стрэлы бліскавіцы.

Іван браў віламі невялікія ахапкі сена і зносіў у капу. Пот заліваў яму вочы, за каўнер сыпалася пацяруха, і шчымела на спіне скура.

Стэфка спатыкнулася на купіну, паляцела потырч, і баўэр тузануў яе за руку — як не адарваў.

— Шнэль!

Сабака гыркнуў і напяў повад.

І раптам — баўэр дзіка зароў. Іван ажно здрыгануўся. Стэфка трымала ў руках граблі з адламаным

крайнім зубам. Баўэр выхапіў у Стэфкі граблі і пачаў тыцкаць імі ў яе твар. Яна баранілася рукамі. З разбітых вуснаў пацякла тоненькай нітачкаю на падбародак і шыю кроў.

Іван аднёс ахапак сена ў капу і, вяртаючыся назад, адчуваў, як сутарга зводзіць на вілачніку пальцы. Ён наблізіўся да баўэра. Сабака недаверліва сачыў за ім, і на задніх лытках яго перакачваліся ад напругі мышцы. Іван адвярнуў галаву, нібыта браць сена,— і, рэзка крутнуўшыся, апусціў вілы на шырокую лабатую галаву сабакі.

Баўэр знерухомеў з граблямі ў руках, вочы палезлі з арбіт. Сабака з раструшчанай галавою качаўся па зямлі і сцінаў свой вывалены набок язык.

Другі ўдар вілаў патрапіў баўэру акурат па крыжыку ў форме фашысцкай свастыкі. Баўэр перакінуўся на спіну, і зубцы вілак мякка ўехалі ў яго выпучаны жывот.

— Пабеглі! — хапіў Іван за руку збялелую Стэфку.

Да вечара яны прасядзелі ў балоце. У тоўстым старым пні ад вольхі знайшлі гняздо дзікай качкі і падсілкаваліся свежымі яйкамі. Потым усю ноч прабіраліся да берага Рэйна, адкуль, ведаў Іван, штораніцы адпраўляецца параход — не важна куды: абы з'ехаць, уцячы з гэтай страшнай зямлі. На параход трапіць было цяжка, амаль немагчыма. Немцы аддалі загад: калі судна возьме на борт падазронага чалавека, камендатура забірае з каманды трох чалавек і на вачах расстрэльвае.

Было зусім рана. Параход стаяў на прычале, і калі з-за хмар выплываў месяц, труба яго цьмяна льснілася, а на мосціку быў відаць вартавы. Ён курыў, час ад часу ўспыхваў каля твару калінава-чырвоны агеньчык.

Іван і Стэфка сядзелі, зашыўшыся ў куст вербалозу. Іван прыхінаў да сябе Стэфку, грэў яе і думаў пра сваю Марусю... Вайна не дала ім нацешыцца маладосцю. Дзе яна цяпер і што з ёю?

Унізе, пад берагам, бяздумна вуркатала вада. Прыкра зныбелі каля вушэй камары, і гэта было найгорш. Іван круціў галавою і адчуваў тварам халоднае слізкае пруцце вербалозу.

Іван мучыўся: што рабіць? Стэфка, сагрэўшыся, заснула. З яе ўсё роўна быў кепскі дарадчык. Выйсце адно, толькі адно: прашмыгнуць непрыкметна на параход і куды-небудзь затачыцца. А як прашмыгнеш?..

Вартавы стаіць не адыходзячы. І не дрэмле. А хоць бы і драмаў, дык на мосціку з ім не размінешся — пачуе.

Пачынала світаць. На ўсходзе пасвятлела неба. Там была радзіма, і гэта было святло з яе боку. Горла сцялося, нельга было каўтнуць сліну.

Ён разбудзіў Стэфку. Чакаць светлай раніцы было гэтак жа небяспечна, як і спрабаваць пранікнуць на параход. І ён выбраў апошняе: хай будзе што будзе.

— Стэфка,— прашаптаў ён,— збірай камяні. Толькі асцярожна. Я таксама буду.

Ён напіхаў у кішэні камянёў.

— Ты чакай тут і пільна-пільна сачы за мною. Як махну рукой — бяжы да мяне.

Іван берагам падпоўз да буданчыка, ад якога да вартавога было зусім блізка. Вартавы сплюнуў у раку недакурак — Іван чуў, як ён засіпеў у вадзе,— і абхінуўся на парэнчу.

Іван кінуў з-за буданчыка камень — туды, дзе на другі бок мосціка цямнеліся крытыя шыферам пабудовы. Потым яшчэ і яшчэ... Нарэшце камень трапіў акурат — шпокнула. Вартавы выпрастаўся. Было ціха-ціха, ажно звінела ў вушах. Іван бачыў, як вартавы пратупаў па мосціку з канца ў канец. І толькі спыніўся — Іван зноў шыбнуў на пабудовы камень. Вартавы кашлянуў, сышоў на бераг. Калі ішоў па мосціку, рыпелі масніцы. Іван запусціў яшчэ адзін камень. «Вас іст дас?..» — пачуў устрывожанае.

Вартавы, наставіўшы аўтамат, пакраўся да пабудоў. Іван падняў руку, робячы знак Стэфцы, і як толькі вартавы схаваўся за вуглом, махнуў ёю. Стэфка, босая, нячутна, як птушка, падляцела да яго. У міг вока яны апынуліся на параходзе. Залезлі ў трум, там было цёмна і востра пахла мазутай ды ржою. «Трапілі ў складскі адсек»,— падумаў Іван. Ён укусіў сябе за руку, бо яму заклала ад напружання вушы і ён нічога не чуў. Стэфка трымалася за яго куртку. Ён знайшоў яе руку, халодную, што лёд, ціскануў раз-другі, даў знаць: трымайся. У Стэфкі дробна стукалі зубы, як гарошыны ў бразготцы.

Вочы асвоіліся, і павіднела тым часам. Іван убачыў скрыні, бочкі, цэлы засек каменнага вугалю ў куце. Ён інтуітыўна зачапіўся позіркам за бочкі: выйсце.

Плылі яны доўга, цяжка сказаць — колькі, бо для іх пастаянна была ноч...

...Бацька, уздыхнуўшы на ўсе грудзі, адчайна махнуў рукою і войкнуў: рука лучыла на пілу. Кроў выступіла на рабраку далоні кроплямі, потым пацякла ў рукаў тонкаю ніткаю.

— Во, бачыш... параніўся,— спакойна сказаў бацька, трымаючы навісу руку і гледзячы, як капае кроў на стракатую лісціну глухой крапівы: кап — і лісціна ўніз, кап — і лісціна ўніз...

— Давай перавяжу, тата... Во ад майкі аддзяруласкут.

Бацька крыва ўсміхнуўся, таргануў параненай рукою, пакратаў пальцамі, і вышэй запясця ўспучылася мяккая галінка жыл.

— Я не столькі праліў крыві, а гэта... Перастане сама.— Падняў галаву і нейкі час не зводзіў вачэй з Паўла.— Але, сын... чым супакойваю сябе... яна, вось гэтая мая кроў, чыстая перад сумленнем. А людзі як хочуць, так няхай і думаюць.

Кроў з бацькавай рукі бруснічынамі пунсавела на траве. І Павел бачыў яе блізка ад сваіх ног і чуў, што гаварыў бацька.

## 9

На шашу Павел выбраўся рана. Адзін. Бацьку адгаварыў, каб не ішоў праводзіць, толькі ногі біць.

Уранні яскрава відаць, якая пара года на двары. Вецер назмятаў пад частакол рудога лісця, і цяпер на ім густа блішчаць кволыя іголачкі інею. Неба, зацягнутае паласатымі, як звітыя вяроўкі, хмарамі, рабізною высцілае глыбокае дно лужын. Каля берагоў лужыны пабраліся тонкім лядком, які трымціць, быццам знізу яго хтосьці падварушвае. Змярцвела-сцятае, стаіць балотца, ужо амаль голае, і скрозь яго віднеецца поле, панылае і пустое, калі не лічыць рэдкіх капцоў.

На шашы Павел доўга не стаяў. Яго падабрала спадарожная машына. Злез каля самай аўтастанцыі — цаглянага старога будыначка, у франтоне якога чарнела вялікая круглая дзірка. Пры касе тоўпілася шмат людзей, і Павел занепакоіўся, ці возьме білет.

Раптам у рэпрадуктары зашумела, адкашлялася жанчына.

— Увага, таварышы!..

«Зараз аб'явіць, што з-за тэхнічнай непаладкі аўтобуса рэйс адмяняецца...»

— Таварышы, увага! — Голас жанчыны здаўся Паўлу трывожным.— Паслухайце, калі ласка, аб'яву. Жанчыне-парадзісе, якая знаходзіцца ў нашай бальніцы, патрабуецца неадкладна... паўтараю — неадкладна, кроў: першая група, адмоўны рэзус... паўтараю — першая група, адмоўны рэзус. Вялікая просьба да тых, у каго аб'яўленая група крыві: тэрмінова прыбудзьце ў радзільнае аддзяленне бальніцы.

Ёсць адно правіла для чалавека, які чуе крык аб дапамозе,— не думаць пра сябе. Усё тваё, што надавала жыццю сэнс і значнасць, не існуе больш у гэтым свеце. Гэта туман, за якім нічога няма. Ты на нейкі час выключаешся са сваіх, нават самых патаемных, мар, планаў, надзей, жаданняў. Ты міжволі пачынаеш жыць па самым чыстым законе чалавечага быцця.

Чалавеку неадкладна патрэбна кроў... Парадзісе... Два жыцці... Першая група, адмоўны рэзус. Так! Даўно, яшчэ ў школе, у Паўла бралі аналіз крыві на групу і рэзус. І тады яму сказалі... Чорныя бліскучыя вочы дзяўчыны з-пад белай шапачкі, на якой чырвонымі ніткамі быў вышыты маленькі, помніцца, крываваты крыжык. Дзяўчына тады не вельмі добра сказала: «У цябе, Дроб, першая група, адмоўны рэзус. Запомні. Кожны павінен ведаць сваю групу крыві... Вось будзе вайна, цябе параняць, а ты не будзеш ведаць, якая ў цябе кроў, і памрэш...»

Павел падняўся з лаўкі. Людзі заварушыліся, ажывіліся галасы. Мусіць, адны не ведалі сваёй групы крыві, другія ведалі толькі групу і не ведалі рэзусу, трэція ведалі тое і другое, ды яно не адпавядала. Перад чацвёртымі перш за ўсё стаяла пытанне: ісці або не ісці здаваць кроў?

Старэнькі сівы дзядок, што падпіраў спінаю сцяну, а сябе — гладкім арэхавым кійком, прыцюпаў да акенца касы і, шамкаючы бяззубым ротам, сказаў, што ён стары донар, здаваў кроў яшчэ ў грамадзянскую вайну і мае падзяку ад самога Будзённага і што ў яго, здаецца, першая група. Дзяўчаткі, што стаялі ў чарзе, слухаючы, ціха і сарамліва пасмейваліся.

Павел пабег па шашы, мяркуючы, што яго дагоніць спадарожная машына і ён яе спыніць. Адрывала руку напакаваная сумка. Дарма не пакінуў у аўтастанцыі.

Гэта, здаецца, было выратаванне. З двара жоўтага будынка выязджаў матацыкл з каляскаю. Павел бязладна, як вар'ят, замахаў рукамі. Матацыкл спыніўся. Стаяў, пускаючы з выхлапных труб тонкі сіні дымок. За рулём сядзеў малады дзяцюк. У яго быў круглы, як рэпка, твар і ўлітая ў каўнер сарочкі тугая шыя.

— Што скажам? — сустрэў ён Паўла пытаннем.

— Мне ў бальніцу... Там жанчына памірае.

— На жаль, не па дарозе,— паспачуваў дзяцюк, і матацыкл скрануўся з месца. У вачах у Паўла нейкі час стаялі тугая шыя матацыкліста і зашмальцаваны каўнер сарочкі. На беражку асфальту ляжаў плоскі чорны камень, і Павел ледзь не хапіў яго ды не кінуў у спіну матацыклісту.

Павел не чуў, як яго дагналі блакітныя «Жыгулі». Адно ўбачыў іх, калі яны спыніліся паперадзе яго. Імі кіравала пажылая жанчына ў рагавых акулярах і з ушпіленымі ў мочкі вушэй завушніцамі-гарошынкамі.

— Вы, малады чалавек, мусіць, вельмі спяшаецеся? — спытала жанчына, прачыніўшы дзверцы.— Магу прапанаваць свае паслугі.— Яна прыбрала з пярэдняга сядзення часопіс «Мода» і каляровую разбухлую касметычку.

— Дзякуй! — Павел не марудзячы ўскочыў у «Жыгулі».

— Паказвайце, куды вам,— папрасіла жанчына.

Будынак радзільнага аддзялення стаяў сярод старасвецкіх высокіх клёнаў. Калісь ён належаў да гаспадарчых пабудоў барскага памесця. У клёнах было шмат дуплаў, у якіх вяліся шпакі. Цяпер, перад адлётам у вырай, шпакі заўзята сквірчэлі. Зямля пад клёнамі была жоўтая ад апалага лісця. І на дарожках было лісце, толькі бруднае.

— Аб'яўлялі, што парадзісе патрэбна кроў,— сказаў Павел жанчыне ў халаце, што спешна ішла яму насустрач.

— У вас першая група, адмоўны рэзус?.. — чамусьці здзівілася жанчына.— Тады за мною.

Жанчына павяла Паўла па доўгім шырокім калідоры, асветленым лямпамі дзённага святла. Потым яны звярнулі ўлева і падняліся на другі паверх. Яшчэ падымаючыся па прыступках, Павел чуў пранізлівы жаночы крык. Ён напаўняў, здавалася, увесь будынак.

— Так, здымайце, калі ласка, плашч, апранайце

халат. І вось гэта... — Жанчына наклала Паўлу на твар марлевую павязку, завязала матузкі на патыліцы.— Вы здавалі калі-небудзь кроў?

— Не.

— Ведаеце парадзіху?

— Не.

— Хто паслаў?

Павел не ведаў, што адказаць. Не гэта было цяпер галоўнае.

— Высакародства... — усміхнулася жанчына. Яе рухі былі ўпэўненыя і дакладныя.— І так, будзем рабіць непасрэднае пераліванне крыві — ад вас і парадзісе. Яна не можа разрадзіцца, у яе адкрыўся крывацёк, яна страціла шмат сілы... Ёй патрэбна ваша кроў. І не толькі ёй, а і таму, хто прагне на гэты наш шматпакутны свет. Хадземце.

Яны зайшлі ў палату, асветленую вялізнымі круглымі люстрамі. На шырокім стале, вакол якога стоўпіліся людзі ў белым, ляжала маладая жанчына і слаба стагнала. У яе былі скусаны да крыві вусны, з жоўтага твару сыпаўся буйны пот. Вочы ў жанчыны былі заплюшчаны. Ніжэй падбародка Павел не асмеліўся глянуць. Вострыя пахі ўмомант задурманілі галаву, і ён хуценька перавёў позірк на акно. Прымушаў сябе любавацца клёнамі, галінкаю з адным лістом, што кранаўся шыбіны, успамінаў Сож, яго халодныя хвалі, як яны сціналі грудзі і лашчылі твар, здымаючы стому...

— Сюды-сюды,— пачуў ён голас. Звярталіся да яго.— Кладзіцеся.— Паказалі на высокую канапу, што тулілася да стала, на якім ляжала пад прасцінаю парадзіха.— Вам блага?

Павел пакруціў галавою. Лёг на канапу, яго, як і парадзіху, накрылі прасцінoю.

— Дайце вашу левую руку... Та-а-ак. Кропельніцу... Шпрыц...

Ён пачуў, як пачала слабець рука. Застагнала парадзіха. Прашаптала: «Мама...» — потым сказала яшчэ раз: «Мамачка...» — і закрычала нема і пакутліва.

Павел, сцяўшы зубы, зацята кратаў халоднымі пальцамі левай рукі. Гулка і часта стукала ў грудзях сэрца. Кружылася галава, у вачах — быццам пласцінка і на ёй кусты, трава, кветкі... Усё мітусіцца ў шалёным карагодзе, і сам, здаецца, таньчыш разам з кустамі,

травою і кветкамі... «Ну спыніце ж вы карагод!..»

І раптам — плач! Хрыплы дзіцячы плач шыбануў у вушы. У Паўла пачало праясняцца ў вачах, і ён убачыў у сябе перад тварам светлую пляму — прасціна была мокрая ад поту. Адхінуў яе. Жанчына-доктар трымала, высока падняўшы на руках, ружовае дзіцятка. Яно дрыгала ножкамі, квола апусціўшы ўніз лабатую галоўку з запухлымі вачыма, і плакала шырока разяўленым ротам.

— Ну, як вы? — Да Паўла падышла жанчына, якая прывяла яго сюды.

— Нармальна... Толькі піць...

Яна падала шклянку з вадою. Ён прыпадняўся і жахнуўся: стол, на якім ляжала жанчына, прасціна былі чырвоныя. Шчаслівы позірк у маладой маці патухаў, і яна ўпала патыліцаю на падушку — страціла прытомнасць.

Павел, зрабіўшы некалькі прагных глыткоў, аддаў шклянку жанчыне.

— Вялікае вам дзякуй! — сказала жанчына.— Вы пакіньце, калі ласка, нам свой адрас. Мы перададзім яго нашай маладой маці. Цяпер вы, можна сказаць, парадніліся...

Ён выйшаў на вуліцу з дзіўнай думкаю ў слабой галаве і ніяк не мог прымірыцца з ёю, гэтай думкаю. Няўжо сапраўды можа быць так, што ягоная кроў штучна перадалася іншым? А з ёй, крывёю,— і жыццё. Ён жа выратаваў жыццё—жанчыне і немаўлятку. І, выходзіць, перадаў ім свае звычкі, рысы характару, тэмперамент? Наіўна, канечне ж, наіўна было разважаць так, ведаючы хоць якія законы генетыкі, ды Павел не мог забараніць сабе, нават пасмяяўшыся, думаць. Ён глядзеў вакол сябе ўжо іншымі вачыма, на дрэвы і неба, на людзей і будынкі, і бачыў ва ўсім гэтым новую сутнасць.

Неба над горадам было светлае, аж белае, толькі далёка, на самым схіле, чорным полагам вісела хмара; яна, адчувалася, з часам вырасце, нагоніць змроку і холаду, балазе чуўся вецер; голыя дрэвы стукалі галінамі, здавалася, хтосьці раздзірае склееную гуму. Да слупа з аб'явамі прыліпла жоўтая кляновая лісціна, падобная на чалавечую руку.

## 10

У дзверы пастукалі, і Павел падаў голас, надта не зважаючы на стук, бо за дзень да яго заходзіў так, са стукам, не адзін чалавек. Яму гэта не падабалася. Чамусьці заўсёды думаў, што, стукаючы, заходзяць толькі бюракраты да бюракратаў. Але ж не ўпікнеш чалавека, не паправіш яго, маўляў, заходзь проста так, з адным «добры дзень».

Парог пераступіла незнаёмая жанчына, павіталася і стаяла, трымаючы спераду дзвюма рукамі перакідную дамскую сумку. Перабірала ў пальцах вузкі раменьчык і быццам намыкалася ступіць, ды супыняла сябе.

Павел запрасіў жанчыну да свайго стала, паказаў на крэсла. Жанчына, покуль ішла, плаўна, дробным, прыгожым крокам, не спускала з Паўла дапытлівага позірку. Села на край крэсла і, расхінуўшы крыссе паліто, паставіла на калені сумку. Павел глядзеў на жанчыну амаль безуважна, як бы прапускаючы міма позірку яе твар,— каб не бянтэжыць.

Жанчына была апранута ў паліто рудога колеру, які пасаваў да яе карых вачэй. На каўнер прышыта футра чарнабуркі, з лапкамі і сплюшчанай мёртвай галавою. Вусны ў жанчыны былі ўпартыя і цвёрдыя, блішчэлі ад густой памады, яна іх часта сціскала, і тады па краях выпіналіся тонкія рубчыкі. Павел падумаў, што і словы з гэтых вуснаў будуць такія ж — упартыя і цвёрдыя.

Але голас у жанчыны аказаўся надзіва мяккі і пявучы, з тою ноткаю адавочнай ліслівасці, якая з'яўляецца толькі ў размове разнаполых асоб, калі адна з іх, часцей — жанчына, падумае перад гэтым, што прыналежнасць да процілеглага полу павінна паўплываць на адносіны да яе.

— Вы старшыня мясцкома?

— Я.

Жанчына села зручней на крэсла, і гэты рух яе быў какетлівы, і сумка, здалося, стаяла на каленях таксама какетліва, блішчалі прыткнутыя адзін да аднаго шарыкі зашчапкі, назву якой далі самі жанчыны — «пацалуначак».

— У мяне ёсць да вас справа...

— Калі ласка.

— Асабістая...

Павел засмяяўся ў душы. Жанчына сваімі манерамі

чымсьці напомніла яму Маўрыкіеўну, пад якую падрабляецца артыст Танкоў і якую разам з яе сяброўкаю Аўдоццяй Нікіцічнай бачыў нядаўна на навагоднім «Блакітным агеньчыку».

— Слухаю. Калі ласка.

— У вас у рэдакцыі колісь працаваў такі... Плоймаш.

Павел ускінуў у здзіўленні бровы і тут жа зрабіў сур'ёзны выгляд: жанчына падціснула вусны, і на іх востра абазначыліся рубчыкі.

— Хоць вы... малады, мажа, і не помніце...

— Я ведаю, што ён працаваў загадчыкам аддзела пісьмаў,— сказаў Павел, прыгадваючы гісторыю Касцяніцына з кватэраю.

— Я... яго былая жонка... Мы з ім развяліся.

Павел, слухаючы, бачыў: жанчыне цяжка гаварыць.

— Гэта вельмі скандальная гісторыя... — Жанчыне захліствала дыханне.— У выніку ён... усімі праўдамі і няпраўдамі адсудзіў у мяне дзяцей... Ведаеце, двое дзяцей.

Павел моўчкі слухаў, хоць і зрывалася з языка пытанне: «А пры чым тут я?»

— У маці аднялі дзяцей... Вы, мусіць, яшчэ нежанаты і да канца не ўяўляеце, што гэта такое — адняць у маці дзяцей. Якая ганьба!.. А ён — мярзотнік! — словы пачалі вырывацца ў жанчыны пругка і лёгка, як мячыкі.— Сам жа быў нячысты... у жыцці і ва ўсім тым, што здарылася. Ён узвёў на мяне паклёп. Дабіўся — паверылі: «Амаральныя паводзіны маці несумяшчальныя з прынцыпамі савецкай сям'і — пярвічнай ячэйкі камуністычнага грамадства». А сам жа... прабачце, тры разы лячыўся ад трыперу. Мне няма выйсця іншага, як прызнавацца вам ва ўсім.

Жанчына змоўкла, часта дыхала, і было відаць, як высока падымаюцца ейныя грудзі і нясцерпна зіхацяць на каўняры кропелькі ад сняжынак.

Павел пра ўсё гэта ўжо чуў — і не раз; не заткнеш жа вушы сабе і не зашнуруеш рот людзям, якія ва ўменні перамываць костачкі іншым дасягнулі, мусіць, ужо гранічных рэкордаў, даючы волю самай смелай фантазіі.

— Чым магу дапамагчы?

— Я яшчэ не ўсё вам сказала... Гэта не так проста сказаць, і я губляюся...

— Калі ласка.

— Я ўжо сказала, што вымушана прызнавацца ва ўсім. І нават раскрыць наша інтымнае жыццё... Вы — журналіст, змагар за справядлівасць, урэшце, дарослы чалавек. Ён, мой муж, быў слабы як мужчына. Мы жылі з ім вельмі рэдка, лічыце, з самага пачатку, як пажаніліся... І зусім не ў частаце справа... Калі я адчувала яго, я адчувала, што ён слабы... Мне было трыццаць два гады. Я не буду вам тлумачыць, што такое жанчына ў гэтым узросце і падставы для якіх думак дае ёй нямоглы муж. Так у мяне з'явіўся паклоннік, значна старэйшы за майго мужа. Мне з ім было цікава. Цікава, і толькі, улічыце. Для жанчыны так многа значыць, калі ёю захапляюцца. Муж здагадаўся, што ў мяне хтосьці ёсць, і помсціў мне тым жа, звязаўся з неахайнымі жанчынамі... І ўвогуле ён быў беспрынцыповы чалавек... Цяпер я падышла да таго, што мне ад вас трэба.— Жанчына перавяла дыханне. Павел глянуў на яе і не ўбачыў вялікай узрушанасці ў вачах — яны секлі з вузкіх шчылін рудымі агеньчыкамі, як кулямёт з амбразуры дота. Адно на матавай белізне шчок іграў кволы румянец, як, бывае, ірдзіцца напаленае да чырвані жалеза.

Павел утупіў позірк у адну кропку — на імклівую драпінку на паліроўцы стала, што бегла ад пісьмовага прыбора ў накірунку левай рукі жанчыны.

— Гатовы слухаць далей,— сказаў ён.

— Пяць гадоў назад ваш прафсаюзны сход разбіраў майго мужа за парушэнне вытворчай дысцыпліны... ну і за ўсё такое! — Жанчына паварушыла пальцамі і доўга вывучала Паўла, імкнучыся ўлавіць, ці правільна ён зразумеў ейны жэст. Пальцы ў яе былі пухнатыя, з вузкімі палакіраванымі пазногцямі, на мезенцы правай рукі пераліваўся брыльянтавы пярсцёнак.— Я хачу, каб вы аддалі мне пратакол таго сходу...

Павел выдыхнуў з сябе паветра, спакойна сказаў:

— Я, вядома, не адказваю за тое, што было да мяне... Дарэчы, дазвольце спытаць?

— Калі ласка, пытайце.

— Навошта вам той пратакол?

— Ну дзеці ж! — Здаецца, жанчыну раззлавала, што Павел такі нездагадлівы.— Ён абняславіў мяне праз газету і прысудзіў сабе дзяцей. Я хачу даказаць, што і ён не такі святоша, як ім паказаўся на судзе.

— Зразумела. Дык вось, я не адказваю за тое, што было да мяне, і не ведаю, ці захаваліся старыя паперы. Хутчэй за ўсё, не.

— Вы паглядзіце, калі ласка.— Жанчына малітоўна прыціснула да грудзей рукі.

— Мне няцяжка, я пагляджу.— Павел узяў з прыскрынка звязку ключоў і, выбраўшы з яе самы большы, падышоў да нізкага сейфа, які стаяў у куце, прыкрыты зверху лапушыстымі лістамі бягоніі. Адчыніў маленькія квадратныя дзверцы, якія тонка, па-мышынаму пікнулі, і выняў з ніжняга адсека дзве сінія папкі з наклеенымі на іх паперкамі: «1964—1969 гг.» і «1969—1975 гг.».

— Калі, вы сказалі, гэта было?

— У сямідзесятым годзе... Здаецца, так.

Павел узяў верхнюю папку, другую ўкінуў назад у сейф і, сеўшы за стол, развязаў матузкі.

— Вось тут, па ідэі, павінен быць... калі ёсць.

Жанчына стала побач з Паўлам і, нахіліўшы галаву, пільна сачыла, як ён перабірае пажоўклыя паперыны.

— Та-а-ак, сямідзесяты год...

Жанчына нахілілася яшчэ ніжэй. Павел чуў шчакою яе дыханне і пах цыгарэты.

— Няма. Вось усе пратаколы.— Павел глянуў на жанчыну. У яе на твары быў такі выраз, бы ў дзіцяці, у якога дарослыя адабралі цацку, і яно спрабуе ўцяміць, з ім пажартавалі ці адабралі напраўду; вочы не мігалі, і ў гэтай іх утрапёнасці было таксама дзіцячае здзіўленне. Паўлу няцяжка было здагадацца, што жанчыну такі адказ не задаволіў і што яна будзе настойваць пашукаць яшчэ.

— Дазвольце я,— папрасіла жанчына, і Павел падсунуў на край стала папку.

Жанчына старанна перабрала ўсе паперы, і, сочачы за яе ўвішнымі пальцамі, Павел чамусьці падумаў, што яны, мусіць, умеюць спрытна лічыць грошы.

— Тут няма,— сутаргава праглынула словы жанчына. Павел прынёс ёй другую папку. Жанчына гэтак жа старанна перагартала і яе.

— Шкада! — уздыхнула яна і бездапаможна апусціла руку на стол. Было чуваць, як ляснуў пярсцёнак.

Павел паклаў папкі ў сейф.

Жанчына глядзела ў акно, і вочы яе, здавалася, былі такія ж пустыя і мёртвыя, як шкло. На двары ціха сы-

паўся снег. Сняжынкі завісалі на галінках бэзу, краналіся шыб і нячутна саслізгвалі ўніз. Тугою ружоваю марляю зацягнула небасхіл. Села на галінку сінічка, і Павел выразна ўбачыў яе жоўтае брушка, раздвоенае чорнай палоскаю. Сінічка цвіркнула, скокнула з галінкі на галінку, страсаючы снег — ён сыпаўся лёгкім сінім дымком,— заторкала дзюбачкаю-шыльцам у скурчаны сухі лісток. Павел сачыў за сінічкаю і лёгенька пасміхаўся, быў удзячны, што хоць на хвілінку яна забрала ягоную ўвагу.

— Калі вы канчаеце работу? — спытала жанчына, і слова ейныя даляцелі да Паўла суцэльным глухім, як скрозь вату, гукам.

— У шэсць нуль-нуль.

— Я магу сустрэцца з вамі... пасля?

— Вы бачыце ў гэтым патрэбу?

— Вельмі вострую патрэбу.

— Ну тады, калі ласка,— сказаў Павел, але яго перапыніў тэлефонны званок, і ён падняў трубку. Званілі з друкарні — не хапае інфармацыі на першую паласу. Калі скончыў размаўляць, жанчыны ў кабінеце ўжо не было. Адно раставаў на падлозе прынесены ёю снег, і Павел чамусьці ўспомніў нясцерпна пякучыя кропелькі на каўняры паліто ў жанчыны.

«Дзіўна ўсё гэта!.. — усміхнуўся ён, падсоўваючы да сябе макет.— Відаць, што сачыняе жанчына на хаду».

Выйшаўшы з рэдакцыі, Павел адразу ўбачыў жанчыну. Яна стаяла на процілеглым баку вуліцы каля гароднінная ларка і разглядвала праз шкло парыжэлыя, запыленыя і ўсыпаныя дохлымі мухамі газеты, якімі былі засланы паліцы,— узімку ларок не працаваў. Павел пакіраваўся да яе. Яна краем вока таксама ўгледзела Паўла і, спуджана тузануўшыся, паспяшалася яму насустрач. Усмешка на ейным твары была вінаватая і да прыкрасці салодка-вымучаная. Такія ўсмешкі Паўлу не падабаліся. Ён лічыў, што ўсмешка — самая шчырая на чалавечым твары грымаса.

— Ах, прабачце!.. — расчулена выдыхнула жанчына.

«За што?!.» — ледзь не вырвалася ў Паўла, ды ён сказаў спакойна:

— Не хвалюйцеся.

— Ну што вы! З-за мяне лішні клопат... Вам куды ісці?

Павел паказаў на залом вуліцы, абазначаны метраў за трыста шырокім сінім шчытом, на якім былі ўказаны накірункі і адлегласць да Магілёва і да Масквы.

— З вашага дазволу і я з вамі прайдуся... — У вачах у жанчыны пераліваўся бляск, быццам у іх разпораз успыхвалі і гаслі іскрынкі.

Снег перастаў сыпацца. Усё было да дзіўнага бухматае, нават ствалы таполяў аблеплены з таго боку, адкуль дзьмуў вецер. Здавалася, у паветры вісіць суцэльная застылая снегавая заслона. Яснай сінню пахла паветра, глыбока дыхалася. Папяловымі воблакамі нерухома стаяў у небе густы паравозны дым. Тратуар быў роўна засланы чыстым некранутым снегам, і з-пад ног слаба чуўся крухмальна-цнатлівы стогн сняжынак.

— Я не проста так, як вы ўжо, мусіць, здагадаліся, іду з вамі,— сказала жанчына. Лапка з каўняра матлялася, і кіпцюрык шкрэбаў па перламутравым гузіку паліто.— Вам даводзілася назіраць, як людзі знаходзяць між сабою паразуменне? Прабачце за безалабернае пытанне.

— Чаму ж не? Я лічу, што людзі ва ўсім і ўсюды павінны знаходзіць паразуменне. А як жа інакш? Гэта не вузкае пытанне,— Паўла раптам пацягнула на развагі.— Не будзе паразумення між людзьмі — не будзе яго і між краінамі... — Павел усміхнуўся, і ў тым, што гаварыў далей, была ўжо іронія.— Цяпер шмат гавораць пра іншыя цывілізацыі... Дык не будзе паразумення між намі, зямлянамі, і тымі, што лятаюць на талерках.

— Ой, дзякуй вам!.. Гэта ж так добра, што вы ўсё разумееце! — ледзь не ўсклікнула на ўсю вуліцу жанчына, і акуратныя бровы яе ад здзіўлення пераламаліся.— Мне прасцей будзе з вамі дамовіцца...

— Гледзячы наконт чаго,— сказаў Павел зусім сур'ёзна, чаго, відаць, жанчына не чакала. Яна спатыкнулася, крануўшыся рукою Паўлавага пляча.

— Прабачце!.. Я... усё пра тое ж, пра свой канфлікт з мужам,— зноў сказала жанчына тонам Маўрыкіеўны.

— Дык жа, здаецца, мы з вамі ўсё выяснілі.

— Усё. Але варыянты — не ўсе. І я хацела б вас прасіць згадзіцца з адной маёй прапановаю. Зразумець мяне, бедную жанчыну, і згадзіцца... Я вас так прашу!..

Павел глядзеў на камячок снегу, што прыляпіўся на мыс чаравіка.

— Пратакола няма... можа, недзе згубіўся. Але ён быў... Быў — гэта дакладна. Я помню той год... Нешчаслівы для мяне год. Юрачка, сын, паламаў нагу, і я вымушана была вярнуцца з Есентукоў зусім незагарэлая. Яшчэ ў той год абакралі наш падвал... забралі мае італьянскія боцікі. І муж мне тады сказаў, што яму хапае сваіх перажыванняў... Дык вось... я вас вельмі прашу. Мне здаецца, тут нічога складанага няма. Прашу, каб вы афармілі пратакол, што называецца, заднім чыслом...

— Я на такі крок не пайду,— цвёрда сказаў Павел, акурат яшчэ раней здагадаўшыся, што хоча ад яго жанчына, і прыдумаў ясны адказ, ды ўсё роўна ў голасе было чуваць здзіўленне.

— Вы не жартуеце?

— Якія могуць быць жарты.

— А чаму вы не можаце пайсці на такі крок? — Жанчына ўтапіла ў каўнер галаву.— Вы ж нічым і нікольні не рызыкуеце. Клянуся сваімі дзецьмі, якія, як вы зразумелі, мне дарагія, што ніхто пра гэта ведаць не будзе.

— Усё роўна.

— Я так спадзявалася, што вы зразумееце мяне... — Жанчына запаволена, як лялька, плюскала вачыма.

Паўла пачынала раздражняць настойлівасць жанчыны.

— У гэтым — не.

— Я вам аддзячу. І не толькі добрымі словамі... — Жанчына прыціснула дзвюма рукамі да грудзей сумку, глядзела на Паўла, шукаючы змен у ягоных прыжмураных вачах.

— На што намякаеце? — спытаў ён халодным, ды стрыманым голасам.

Яна пстрыкнула зашчапкаю сумкі, і Павел убачыў на дне, разам з флакончыкам лаку і памадным патрончыкам, пачку грошай.

— Вы не па адрасе, грамадзянка, звярнуліся! — голас у Паўла ледзь не сарваўся на крык.

— Ды ў гэтым жа няма нічога незвычайнага!..

Павел паглядзеў на жанчыну працягла і са здзіўленнем. Яна што, вар'ятка? Ці на прастачка разлічвае? Здаецца ж, ён зусім не даваў ёй намёку павярнуць гэтак

справу. «Многія людзі...» Пляваць ён хацеў на такіх людзей! Узбуджаны, Павел падумаў: вось зараз возьме і скажа так жанчыне. Проста ў твар.

— Пляваць я хацеў на такіх людзей!

Жанчына спалохана зграбла пад паху сумку. Спынілася, разявіўшы рот, і было відаць, як выплывае з яго тонкая пара.

— Так-так! — Павел убачыў, як вочы ў жанчыны звузіліся, а рубчыкі на вуснах пацвярдзелі.

— Ты хам! — завішчала жанчына.— Ты самы звычайны хам! А я спадзявалася, што ты чалавек. А ты — малады нявыхаваны хам. Як толькі такіх зямля носіць?

Паўла не збянтэжылі ейныя словы. Ён даўно ўжо ведаў, што ў недалёкіх, самалюбівых людзей заслужыць марку выхаванага чалавека можна толькі ўніжэннем. Але ўніжацца ён не збіраецца! Ён узяў жанчыну за локаць.

— Хадземце.

Жанчына тарганула рукою.

— Куды?..

— Вунь бачыце за пуцямі жоўты будынак? Туды.— Павел рашуча глядзеў на жанчыну, і ў ягоных вачах не было і знаку гарэзлівасці. Яна зразумела, што ён не жартуе, што ён, гэты малады нявыхаваны хам, сапраўды можа адвесці яе ў міліцыю. Яна надзіва жвава крутнулася, ажно адляцелі з падэшваў ашмёткі спрасаванага снегу, але ён моцна трымаў яе за руку.

— Пусціце!..

— Я сказаў, хадземце!

Жанчына пабляднела, вочы яе пакруглелі, у іх была ўжо не злосць, а — спалох. Здаецца, яна гатова была павініцца.

З дзвярэй міліцыі выйшла група дружыннікаў, і Павел чакаў, калі яны наблізяцца. Жанчына стаяла спінаю да іх. Дружыннікі ледзьве сунуліся, і ў Паўла быў час падумаць. Можа, адпусціць? Можа, ён занадта ўжо строгі з ёю? А яна проста легкадумная жанчына. Калі б толькі так, было б паўбяды. Яна...

Павел гукнуў дружыннікаў, якія параўняліся з імі. Яны падышлі. Ён сказаў, што трэба разабрацца з гэтай жанчынаю, чаму яна сябе так паводзіць. Позірк у жанчыны быў пануры і цяжкі, яна вопрама глядзела на Паўла, быццам хацела запомніць ягоны твар. У Паўла

варухнулася нават трывога: такія людзі, як гэтая асоба, здольныя на ўсё, на любую брыду.

І потым, выйшаўшы з міліцыі, дзе падпісаў акт, ён думаў пра жанчыну. Думаў з нястрымнаю, адчайнаю горыччу. Божа мілы! Павел не мог, хоць забі, паставіць побач: радасць — толькі адну-адненькую радасць! — жыцця на зямлі і грошы. Радасць бачыць праз акно свайго пакоя, як лопаецца, раздваіўшыся на зубчыкі, пупышка бэзу, і шчасце ад таго, што кашалёк твой лопаецца ад грошай.

Бачыце, ёй спатрэбіўся пратакол, якога, відаць, і не было. Мацярынскія пачуцці абудзіліся. «Я так спадзявалася, што вы зразумееце мяне...» Рассмяшыла, паненка!

Паўла калацілі дрыжыкі, і мышца на шыі сутаргава зводзіла сківіцы. Ён хапаў сухім ротам паветра, падчапіў з узбочыны дарогі жменьку снегу, укінуў у рот. Адчуў свежы гаркавы холад. Задрыжала пад нагамі зямля, з правадоў зрываўся і падаў камякамі снег — па рэйках на поўным ходу прамчаўся, пакінуўшы за сабою вялікія, што мядзведзі, клубы густой пары, гнуткі і чорны, як вуж, састаў цыстэрнаў. Пару тут жа падхапіў вецер, панёс насупроць таполяў, хаваючы ад вачэй вершаліны.

## 11

Званок быў нечаканы. Бадай, самы нечаканы за ўвесь час, што Півайка жыў і працаваў у Глушаве рэдактарам райгазеты. Званіў з Магілёва сам Буры. Півайка пачуў у трубцы спакойны і наўмысна раўнадушны голас: хто з начальства пакажа, што ён саромеецца або адчувае сябе няёмка. Яму ўсё дазволена.

— Гэта Сцяпан Данілавіч Буры, начальнік упраўлення, вас турбуе. Ага... Хочам у вашы краі на рыбку...

— Калі?.. — спытаў Півайка з трывогаю, як бы спалохаўшыся, што не паспее падрыхтавацца да сустрэчы гасцей. Зусім разгубіўся. І заўсёды вось так: прывучыў сябе разважаць запаволена — і, хоць лопні, адразу не сцяміш, што да чаго. А паламаць галаву не заўсёды выпадае часу, нават над матэрыялам. Толькі справаздачы з раённых пленумаў ды сесій і піша. А над імі ўсяго і клопату, што пераказаць дакладчыка і коратка тых,

хто выступіў у спрэчках. Вось і скачы, як зайчык! Ён паспрабаваў уклініцца ў тое, што гаварыў на другім канцы провада голас, але яму не ўдалося. Ці то Буры не любіў, каб яго перабівалі, ці ў яго самога яшчэ не выспела думка, каб яе можна было выказаць лагічнай фразаю. І Фёдар Андрэевіч паспяваў вымаўляць толькі «калі ласка».

— Калі ласка, Сцяпан Данілавіч!.. Пасля суботніка, кажаце? Калі ласка! Не-не, не сумнявайцеся!.. Калі ласка, калі ласка!..

Івайка паклаў трубку, выняў з кішэні крымпленавага пінжака насавік і выцер лоб. Адкінуўся на спінку мяккага крэсла, крутнуўся на ім, шумна выдыхнуўшы з грудзей паветра,— так заўсёды рабіў пасля нервовага напружання; наліў з графіна ў шклянку вады.

«Так-так... — пахітаў ён галавою, стросшы на лоб, які зноў заблішчэў, пасмачку мяккіх чорных валасоў, за якія калісь у маладосці дзяўчаты называлі яго дабраком.— Нічога сабе дэлегацыя!..»

Івайка падняўся з крэсла. Ён быў сярэдняга росту, без лішняй паўнаты, але і не худы, з прыгожымі, незвычайна зялёнымі вачыма ў апраўцы рудаватых веек. Глыбокія складкі на лобе сведчылі, што яму даводзіцца шмат думаць і моршчыцца.

Заклаўшы за спіну рукі, пачаў хадзіць па кабінеце; часта бываючы на розных нарадах, употай назіраў за прывычкамі і рухамі другіх начальнікаў, баючыся чымсьці недарэчным кінуцца ў вока.

Івайка, калі шчыра, не баяўся абласнога начальства. Газета, здаецца, была на добрым рахунку і ў абкоме партыі, і ў тым жа ўпраўленні. Але ж, як і кожны б на ягоным месцы, адчуваў той незразумелы страх, што міжволі сочыцца ў душу, калі трэба сустракаць людзей, ад якіх залежаць твой лёс, кар'ера. І, вядома, не было б нічога падобнага, калі б яму пазваніў, скажам, сябражурналіст, няхай нават з самой Масквы.

Адмовіць Бураму ён не мог. Па-першае, рыбалку не так ужо і складана арганізаваць. Па-другое, адмовішся — цябе могуць няправільна зразумець, маўляў, некампанейскі, дзікаваты. Такіх не вельмі паважаюць у вярхах, у якія ўсе мы, грэшныя, мецім. І па-трэцяе, блізкі кантакт з начальствам, здаецца, яшчэ ніколі нікому не шкодзіў.

Івайка быў чалавек аналітычнага розуму і ўсё гэта,

вядома, разумеў, праўдзівей, зразумеў цяпер, патупаўшы па кабінеце з кута ў кут, як мядзведзь па клетцы. Але ў людзей такога складу мыслення ёсць адна якасць, якая часта выручае іх. Гэта — інтуіцыя. Там, дзе трэба скеміць імгненна, яна робіць сваё. Менавіта інтуіцыя падштурхнула Ківайку гаварыць на гэты раз «калі ласка».

Так, цяпер варта абдумаць, што стаіць за гэтым «калі ласка». Аднаму яму тут, відаць, не справіцца, трэба кагось далучаць. Намесніка? Намеснік Чарткоў, на чатыры гады маладзейшы за яго, Ківайку, не падабаўся яму. Чалавек як быццам неблагі, шчыра адгукаецца на загады, але... Гэтае «але» стрымлівала Ківайку. Чарткоў быў занадта мяккі, мяккі да прыкрасці. Ніколі не раззлуецца, не павысіць голасу, хоць да раны яго прыкладвай. Далікатненькі з усімі, як адуванчык, ліберальны нават з тымі, хто відавочна несправядлівы ці вінаваты. Чым прымусіць, загадаць давесці да ладу матэрыял, лепш сам яго перапіша. І зноў ніякай незадаволенасці. Не, гэты — не!

Ніжэй на службовай прыступцы стаяў Павел Дроб, адказны сакратар. Хлопец скончыў журфак і прыехаў сюды, у Глушава, па накіраванні. Ківайка цаніў Паўла за тое, што з ім было лёгка працаваць. Ён пісаў жывыя, цікавыя матэрыялы, з густам афармляў газету, часта ўносіў каштоўныя прапановы наконт новых рубрык і тэм. А галоўнае — Дроб ніколі не крывадушнічаў, не маніў і лішняга не гаварыў, у чым незычліўцы спрабавалі ўгледзець хітрасць. Але ж не мог ён, хлопец з галавою, схіляцца да праставатасці там, дзе яна магла паўплываць на яго аўтарытэт, нарэшце, кар'еру. Хоць ён, Ківайка, ніколі не лічыў кар'ерыстам Дроба, бо першая прыкмета кар'ерызму — прыстасавальніцтва, падлізванне, чаго за Паўлам ён, здаецца, не заўважаў. Потайкі яго мог назваць кар'ерыстам хіба адно Чарткоў, які, бачачы, як ён, Ківайка, хваліць Дроба, думаў, што Дроб убіўся ў ласку рэдактару недарма.

Выбар на Паўла падаў яшчэ і таму, што ён сябраваў з машыністкай Святланаю, бацькі якой жылі ў вёсцы ці зусім на хутары. Павел ужо ездзіў да іх, Святланіных бацькоў, і неяк распавядаў яму, што там вельмі маляўнічае месца: блізка рэчка, лодачная станцыя, бярозавы стары гай, бяскрайні луг, словам, як ён сказаў, «экзотыка, якая натхняе на лірыку». А дзядзька Свят-

ланін нібыта на лодачнай станцыі служыць вартаўніком.

Чалавек, які прывык доўга смакаваць кожную дробязь,Ківайка акрэсліў у думках план і выйшаў з кабінета, шчоўкнуўшы французскім замком.

Імжэў дробненькі ліпучы дождж. Ужо каторы дзень. Ад яго замяшалася пад коламі машын і нагамі людзей клейкая гразь. Блішчалі мутныя лужыны, з іх выцякалі ручаі, сачыліся па дарозе да толькі ім вядомай мэты. Паветра туманнае, надта зводдалі: зямля, на вясну абноўленая, ужо дыхае глыбокім цяплом.

Павел Дроб жыў на кватэры каля самай шашы. Сёння ён адпрасіўся на пленум райкома камсамола, які ўжо, мусіць, скончыўся, іКівайка меркаваў, што Павел будзе дома. Апроч Паўла, у хаце жыла сям'я загадчыка сельгасаддзела Брэшкі. Умовам не пазайздросціш, канечне. Але што ён,Ківайка, мог зрабіць, нават сямейныя не ўсе маюць кватэры, хоць і працуюць у рэдакцыі не адзін год.

З невыразным пачуццём не то віны, не то сумуКівайка адчыніў весніцы. Падворак браўся зарастаць маладою травою, востра пахла парэчкаю, што клалася галлём на нізкі парканчык, і гаркавым, непрыемным з град — непадалёк, ля чыгункі, быў склад мінеральных угнаенняў, якія дзень і ноч пыліліся.

Апынуўшыся ў цеснаватым прыдзелку, застаўленым старой прадранаю па кутах канапаю, сталом і дзвюма табурэткамі, Фёдар Андрэевіч кіўком галавы павітаўся з Брэшкавай жонкаю, высокаю худою жанчынаю з бляклымі вачыма і піскліва-пявучым голасам. Яна ветліва ўступіла госцю праход, хаваючы за спіну мокрыя дзіцячыя калготкі, якія збіралася несці ў сені.

Павел адчыніў дзверы свайго пакойчыка.

Ківайка падаў Паўлу маленькую і мяккую, як у жанчыны, руку. У цёмных Паўлавых вачах да цікаўнасці падмешвалася чаканне. Павел стаяў перад шэфам у сінім шарсцяным трыко і ружовай кашулі.

— Разбягайся куды можна! — развёў рукаміКівайка. Павел бачыў, што ў рэдактаравых словах больш жарту, чым сур'ёзнасці, і знарок моргаў вачыма. УКівайкі была рыса, якая Паўлу не падабалася: калі нешта абвяшчаў і хацеў уразіць, дык спачатку выдаваў самае што ні на ёсць ашаламляльнае. А калі і гэта не дзейнічала, казаў: «Ну толькі не чырванеи...» Пасля

такіх слоў мала хто ўтрымаецца і не пачырванее — эфект дасягнуты.— Буры едзе!..

Павел быў надзіва спакойны: грахоў, здаецца, у іх не было. Не так даўно атрымалі Ганаровую грамату Дзяржкамвыда за якаснае паліграфічнае выкананне газеты і перамаглі ў рэспубліканскім конкурсе на лепшае асвятленне тэмы прыроды.

— Аперацыю трэба правесці,— ужо спакойна сказаўКівайка.

— Я не партызаніў, Фёдар Андрэевіч,— усміхнуўся Павел. Ягоныя вочы мякка свяціліся і глядзелі адкрыта.

— Ды дзела такое... Прыязджаюць на рыбу.

— На рыбу? Добры намер.

Дроб, як і чакаўКівайка, падтрымаў яго, можа, нават і падумаў: зробіць шэф вялікую прамашку, калі не завабіць да сябе абласное начальства. Страціць яшчэ адзін шанец вырвацца ў абласную газету.

Павел, вядома, не падумаў так, але і супроць таго, што да іх у Глушава едзе начальнік упраўлення па паліграфіі, нічога не меў. Раз ёсць дамова з рэдактарам — то калі ласка! Ён, падначалены, павінен адно вітаць шаноўных гасцей. Дый самому, як ні кажы, цікава пабачыць таго ж Бурага, пра якога шмат даводзілася чуць і размашысты, уладны подпіс якога заўсёды стаяў на ўсіх паперах з Магілёва.

— А як гэта лепш арганізаваць? — Як ні дзіўна, але ў голасеКівайкі была, бадай, бездапаможнасць. І ён не хаваў яе, а, наўпярок, паказваў. Каб не падумалася часам Паўлу, што ўсё тут лёгка. Яму,Ківайку, хацелася як болей клопату ўскласці на Паўла. І таму ён быў просты і шчыры, хоць, прызнацца, і не любіў выпінаць свайго няўмельства ці няведання.

Павел таксама ніколі не лавіў у Лабчанцы рыбу. Таму не ведаў, ловіцца яна там ці не. Але, бачачы, як хвалюецца і перажываеКівайка, баючыся пачуць ад яго катэгарычнае і рэзкае, як стрэл: «Нічога не будзе!» — задумаўся. А што, калі з'ездзіць да Свецінага дзядзькі, у разведку, так сказаць? Ён жа будзе ведаць пра рыбу. Хата на самым беразе. Не хаваючы ўсмешкі, падаў гэтую ідэюКівайку. Той шчыра, як дзіця, абрадаваўся, бо разумеў, што рызыкаваць тут небяспечна. Скажы Бураму на авось, што рыба ловіцца, прыедуць, а клёву і блізка няма. Не, падводзіць начальства

не прынята. Начальства прывыкла верыць і ва ўсіх стараннях падначаленых ні каліва не сумняваецца. Толькі не трэба адкладваць паездку.

Павел дзядзьку Юрася ведаў не вельмі добра і, уяўляючы, як яму будзе цяжка аднаму з незнаёмым пажылым чалавекам, прапанаваў запрасіць у паездку і Свету. Ківайка скрывіў міну, маўляў, якія могуць быць сумненні. І далей ужо дзелавым, сур'ёзным голасам сказаў, каб праз гадзіну Павел чакаў яго на шашы. Ён па-змоўніцку падміргнуў і выйшаў з пакоя.

## 12

Настрой у Марыі быў сапсаваны яшчэ да прыходу на кватэру. Яна зайшла ў магазін, як заўсёды пасля працы. Там таўклося багата людзей: прадавалі танную цяляціну. Марыя ледзь знайшла канец чаргі, стаяла, нецярпліва паглядваючы на тоўстую прадаўшчыцу, як быццам яна адна, марудлівая ў рухах, была вінавата, што няма парадку ля прылаўка. Нарэшце выбілася да вагаў і... ледзь не вылаялася ўголас: прадаўшчыца ўзважвала апошні кавалак мяса, торкала ў яго металічнаю рагацінкаю, і было чуваць, як стукае ў шалю костка.

Насупленая, Марыя пайшла ў гастраном, каб купіць на вячэру з дзесятак яек. Яна заўсёды злавалася, калі бачыла, што нехта нешта купляў, а ёй не хапала. Варта было камусьці на працы — яна працавала ў бібліятэцы — заікнуцца наконт нават не дэфіцытнай пакупкі, як яна тут жа раўніва дапытвалася, дзе куплялі, акурат баялася, што яе абышлі і яна застанецца ні з чым, без таго, што ёсць у іншых.

Фёдара дома не было, і на душу Марыі напаўзла яшчэ адна хмарка незадаволенасці: «Зноў справы...» Яна лічыла і была ўпэўнена, што праца канчаецца на той хвіліне, якая замыкае распарадак дня. І ніякіх пабочных спраў! Усё! Пасля шасці гадзін яна прымала спазненне мужа толькі на пятнаццаць хвілін, неабходных на дарогу ды на пакупку цыгарэт. Ёй, вядома, і ў галаву не прыходзіла думка, што яе «жалезны закон» перашкаджае мужу. Бо журналісцкая праца ненармаваная. Яна працягваецца, лічы, дзень і ноч. Выношваеш, абдумваеш матэрыял — тады пішаш. А коль-

кі няўвязак розных. То райсельгасупраўленне са зводкамі спазняецца, то супрацоўнік загуляў і несвоечасова здаў матэрыял, то яшчэ якая трасца... А з лінатыпамі што творыцца! То ламаюцца, то свінцу ці набору няма, то лінатыпістка захварэла... Хто гэта ўсё ўлічыць, ды і многае іншае, што не прадугледжана распарадкам дня?

Вось так часта бывае, што жанчына несвядома, шчыра жадаючы, каб муж выбіўся ў людзі, становіцца перашкодаю на шляху да гэтых «людзей». І Марыя, як і многія жанчыны, якіх яна ведала, не разумела крыку мужчын: жонкі дарагія, калі вашы мужы талковыя, не п'юць, часта вядуць размовы аб працы, кар'еры, не заступайце ім, не пярэчце. Вы ж як стрэлкі компаса: куды ні круціся — накірунак адзін, ваш.

Марыя паставіла на кухні сумку з яйкамі, пайшла ў спальню пераадзявацца. Скінула з сябе ўсё верхняе. Акуратна склала адзенне на спінку канапы. Ступіла да трэльяжа. Яна любіла, калі заставалася адна, павыкручвацца перад трэльяжам, палюбавацца сабою. Павярнулася спінаю і, адхіліўшы галаву, пачала разглядаць свае ядраныя клубы, шчыльна прыстаўленыя адна да аднае ногі. Правяла рукамі па тугіх, яшчэ не атлусцелых баках і недарэчна, аж пачырванела, падумала, як прыемна, мусіць, адчуваць іх мужу, калі яны лашчацца. Стала бокам да трэльяжа — так добра былі відаць грудзі.

Ей спадабалася ўсё ў сабе. І паколькі яна жыла толькі для сябе і сваёй сям'і, яе радаваў толькі свой дабрабыт, а пра астатніх яна не думала, то ў яе ніколі не зараджалася нават патайной думкі здрадзіць мужу, хоць яна і ведала, што жанчыны, у якіх ёсць чым завабіць мужчыну, пры выпадку не супроць пафліртаваць. Марыя прывыкла адно браць і мець выгаду ад іншых і цешыцца за кошт іншых, і таму ніколі б не дазволіла сабе прынесці асалоду камусь чужому. Жанчыны такой натуры, хоць і думаюць, што ашчаслівілі б любога мужчыну, заўсёды верныя жонкі. Вернасць — у эгаізме.

Марыя здрыганулася — зазвінеў званок. «Нарэшце!..» — здагадалася, што прыйшоў муж. Яна накінула на сябе жоўты фланелевы халат і, на хаду зашпільваючы, паспяшалася да дзвярэй. Адразу ўбачыла, што Фёдар у добрым настроі, і гэта закранула яе, зварухну-

ла ўжо прыціхлую злосць. Яна нахмурылася, зашоргала пантофлямі па дыване — так заўсёды паказвала незадаволенасць. Сама лепш панерваваць чалавека — гэта пакінуць яго па-за ўвагаю, застацца абыякавым да яго.

Фёдар гэтага не ўлічыў. Ён моўчкі скідваў туфлі ў пярэдняй, заняты думкамі пра паездку ў Ведравічы. Была ў яго кепская, як лічыла Марыя, прывычка: паказваць усім сабою, што тоіць нейкую важную навіну, і чакаць, покуль жонка запытае.

Марыя, згараючы ад цікаўнасці, таксама не магла пераадолець у сабе зацятасці. Размова заўсёды пачыналася ў іх з чагосьці дробязнага.

Марыя грымела на кухні патэльняю. Нарэшце пачуўся ейны голас, сухі, рэзкі:

— Дзе быў дасюль?

Фёдар адказаў сваёй заўсёднай фразаю, якую наперад ведала жонка і не зважала на яе.

— Справы, справы, жонка!

— Табе нічога не трэба! Ты пайшоў спакойны і прыйшоў спакойны.

Марыя, як цяпер кажуць, мела рацыю: Фёдар амаль не займаўся бытам. Зрэдку хадзіў у магазін па хлеб ды ў выхадныя іншы раз памые пасуду. Што ён стаяў у баку ад гаспадаркі, вядома, была вінавата і яна сама. Яна настолькі раўніва ставілася да кожнай хатняй дробязі, што не магла даверыць мужу нават такі нехітры клопат, як мыццё шкарпэтак. І, добра ведаючы, што не дасць яму нічога зрабіць, усё роўна злавалася, быццам яна прымушала яго, а ён не хацеў, адмаўляўся.

— Можа, што памагчы? — У Фёдара і каліва не было жадання спрачацца і гуляць у маўчанку з жонкаю.

— Надумаўся...— хмыкнула Марыя, наразаючы тонкімі скрылькамі сала пад яечню. Голас у яе нібыта памякчэў. Ей і самой не столькі хацелася сварыцца з мужам, колькі не прамінуць і сёння папракнуць яго ў гультайстве. А як добра было б, калі б рупіўся яшчэ і ён, як гэта бывае ў людскіх сем'ях.— Вынесі смецце.

Фёдар, ажаніўшыся з Марыяй, ніколі не дакараў сябе за свой выбар. Была яна іменна такая жанчына, якая і патрэбна чалавеку, які народжаны менш для сям'і, а больш для працы. Таму, вызваліўшы яго ад хатніх клопатаў, яна падоўжыла яму час для працы. Ён

часта браў матэрыялы дахаты, зачыняўся ў кабінеце і вычытваў іх, а то пісаў свае.

За дзесяць гадоў сумеснага жыцця ў іх нарадзілася толькі адно дзіця — сын, якога назвалі Дзянісам. І, як звычайна бывае ў такіх бацькоў, вырас ён пестуном — бялявым, як і маці, але з бацькавымі зеленаватымі вачыма. Быў вельмі капрызны. Што ні скажы — не тое. Што ні зрабі — не так. Што ні дай есці — нясмачна. І калі б Марыю папракнулі, што сама сваімі ўступкамі і патураннем сапсавала сына, яна б вельмі пакрыўдзілася за такое абвінавачанне.

Месяцы тры назад Фёдарава маці выйшла на пенсію, і яны аддалі Дзяніса ёй гадаваць. Покуль у школу. Адлучыць ад сябе сына Марыі было нялёгка, хай сабе і ў надзейныя рукі. Марыя склала свякрусе цэлы графік, ажно з дванаццаці пунктаў, як, што і калі рабіць Дзянісу і няньцы. Яе, Марыіна, маці стала пенсіянеркаю раней, але яна не даверыла ёй сына толькі таму, што тая жыла блізка каля рэчкі. А ў Марыі яшчэ з маленства засеў унутры гэты страх перад вадою. Васьмігадовым падлеткам яна баўтанулася з моста ў ваду, і яе ледзьве выратавалі. Цяпер адзін напамін пра рэчку кідаў яе ў халодныя дрыжыкі.

Столькі пражыўшы, увогуле зладжана і нябедна, можна было б займець ужо і другое дзіця, ды Марыя, наўпярок жаданню Фёдара, вырашыла, што ёй хопіць і аднаго. Тут зноў сказаў сваё слова сляпы эгаізм яе натуры. Ёй не хацелася раздвойваць нават сваю мацярынскую любоў. Так усё, што было ў ейнай душы, яна аддавала аднаму Дзяніску, і яе палохала думка, што трэба будзе аддаваць сябе яшчэ некаму, каго няма, а значыць — чужому. Магчыма, і нядобра так думаць, толькі ж перамагчы сябе яна не магла, а ўявіць, што і другое дзіця будзе такое ж ейнае, як і Дзяніска, было страшна.

Фёдар рэдка пярэчыў жонцы і амаль ва ўсім згаджаўся з ёю. Нават тады, калі праўда была на яго баку. І, маючы волю, з жонкаю быў зусім бязвольны. У кампаніях гэта іншы раз давала мужчынам падманлівую зачэпку абзываць яго бабаю ці, прынамсі, мужычком, з якога можна віць лыка. Ніхто, вядома, не думаў ды і наўрад ці паверыў бы, што яго залішняя згодлівасць ішла ад вялікага кахання да Марыі. Ён, зрэшты, да яе

і не ведаў жанчын, што таксама нямала значыла для сямейнага ладу.

Скончыў школу, адслужыў армію, уладкаваўся ў Глушаўскую ПМК меліярацыі і завочна паступіў на факультэт журналістыкі універсітэта — даўняя, школьная мара. Выпадак звёў іх з Марыяй. Райком прафсаюза арганізаваў экскурсію ў Хатынь, і яны апынуліся ў адным аўтобусе — на суседніх сядзеннях. Ён адразу загледзеўся на сваю суседку, на яе белыя, шаўкавіста-мяккія валасы, на круглыя калені, якія бялелі ў вачах нават тады, калі ён глядзеў уперад. Вопытны чалавек, убачыўшы такую дзяўчыну і зацікавіўшыся ёю, ніколі не спытае: «Дзе яна працуе?» Яго пытанне будзе з напаўадказам: «Дзе яна сядзіць?» Марыя ў той час, яшчэ не скончыўшы Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум, сядзела ў прыёмнай начальніка райсельгасупраўлення.

Вяртаючыся назад, экскурсанты заначавалі на прыродзе, каля самага Дняпра. Спаць уладкаваліся хто дзе: старэйшыя ў аўтобусе, маладыя разышліся па лузе, пазашыліся ў стагі духмянага сена. І зноўку яны, цяпер ужо патайком сочачы адно за адным, разам падышлі да стога. Ад выпітай за вячэраю гарэлкі і ад хвалявання, што застаўся з вока на вока з дзяўчынаю, Фёдару было горача. Туман у лагчынах ляжаў белы, як снег, і валасы на плячах у Марыі былі такія ж нясцерпна белыя. Тая ноч засела ў памяці Фёдара салодка-хмельнай згадкаю назаўсёды. Яны не спалі, цалаваліся аж да раніцы, і ён ці не ўпершыню спазнаў атрутнае шчасце ад дзявочай пяшчотнасці, даверу. І цяпер, калі ўглядаецца ў зорнае неба, яму ўспамінаецца той далёкі туманны луг каля Дняпра і белавалосая трапятліва-нясмелая Марыя. Ружовае святло зары кружыць яму галаву незразумелымі, радаснымі пачуццямі... А калі паедзе ў вёску да маці касіць сена, доўга кволіцца і слабее ад яго водару, падобна чалавеку, што перажывае моманты найвышэйшага ўзрушэння.

Тады, у стозе, яму здалося, гэтае адчуванне засталося і цяпер, што пацалунак Марыі — мяжа асалоды і што лепшай дзяўчыны не знойдзеш у цэлым свеце. Хоць, вядома ж, тое самае магло быць у яго і з другой дзяўчынаю, якая б спадабалася яму і з такой пяшчотаю даверылася ў незвычайным, экзатычным месцы. Мусіць, кожнаму юнаку, які смела адпіў з келіха дзявочай ласкі, здаецца, што шчасце яго бясконцае і адзінае,

адсюль і думка пра неадкладную жаніцьбу. Добрае тут у тым, што, носячы ў сэрцы гэтае адчуванне ўсё жыццё, чалавек захоўвае вернасць. Шлюб легкадумны тоіць у сабе небяспеку выявіць неўзабаве духоўную розніцу між мужам і жонкаю, пасля чаго сям'я рана ці позна, але абавязкова распадаецца. І гэта — кепска.

На шчасце, Фёдара і Марыю гэтая небяспека абмінула. Марыя была надта прыгожая і па-свойму разумная жанчына, каб ад яе адмаўляцца. І па тым, як у размовах Фёдар часта ўжываў «мая», «мая Марыя» замест «жонка», проста «Марыя», можна было меркаваць, што ён ганарыўся сваёй палавінаю і ведаў: на ягоную жонку заглядваюцца іншыя мужчыны і ў душы зайздросцяць яму, ФёдаруКівайку.

Фёдар вынес смецце, паставіў вядро ў ванную. Яшчэ падымаючыся па лесвіцы на трэці паверх, ён вырашыў не выпрабоўваць сваё і жончына цярпенне. І так правініўся перад ёю: не папярэдзіў, што затрымаецца, пойдзе да Паўла Дроба.

Ён падступіўся да жонкі, паклаў ёй на плячо сваю маленькую пухлаватую руку.

— Выхадныя прапалі,— пачаў, як заўсёды, здалёк. Марыя не паварушылася. Але глянула на яго прыязна светла-сінімі і крыху лупаватымі вачыма. Ён зразумеў гэта як жаданне слухаць яго далей.— Буры прыязджае на рыбу... пасля суботніка.

Фёдар часта ў сямейнай гутарцы ўпамінаў прозвішча начальніка абласнога ўпраўлення, і Марыя, не распытваючы, зразумела, што гэта за птушка Буры. Звычайна і яна прымала ўдзел у мужавых кампаніях і ведала ягоны калектыў не горш, чым свой бібліятэкарскі. І хоць яна шмат каму не падабалася за свой востры язык і вольнасць у размовах, ніхто ні разу не паправіў яе, не абарваў, бо яна была жонкай рэдактара, і ўсе ведалі, што, заслужыўшы непрыязнь у яе, не чакай спагады і адКівайкі.

— Адзін? — спытала стрымана.

— Каб жа адзін... Але якая ў нас тут рыба. І чаму яны выбралі Лабчанку? — Фёдар паціснуў вузкімі плячыма, і вочы ягоныя засвяціліся тою загадкавасцю, якою ён зазвычай хацеў засведчыць сваю кемлівасць.— Але мы прыкінулі з Дробам. Будзе ўлоў!

— Глядзі ж, дахаты прывязі свежай рыбы,— Марыя, ужо згаджаючыся адпусціць мужа аднаго, усё

ж не магла не папрасіць адплаты за кампраміс, на які пайшла: муж паедзе, паспытае свежанькай рыбы, а яна не, будзе сядзець дома.

Фёдар змоўчаў. Яму не вельмі падабалася гэтая жончына сквапнасць, якая была ўжо ўсімі прыкмечана. Але ён ніколі не злаваў на Марыю: баба яна і ёсць баба. Ён цаніў жонку за іншае. Яна ніколі не пярэчыла яму тады, калі для яе было відавочным: тое, што муж робіць, спрыяе ягонаму рэдактарству. І наступныя словы, сказаныя жонкаю, успрыняў як радасць:

— Дык, можа, начавaць прывядзеш да сябе?

— А не, мая ластавачка,— засмяяўся Фёдар.— Дзякуй! Мы там, на беражку... Яны і едуць сюды, можа, адно дзеля гэтага.— Ён прыхінуўся да жонкі і адчуў, якая яна дарагая яму.

## 13

Павел выйшаў да шашы. За мостам шашу перасякала чыгунка. Рэйкі белымі жыламі злучалі Глушава і лес, быццам прыцягваючы адно да аднаго. Каля сіняе будачкі стаяла жанчына з жоўтым сцяжком у руцэ.

Пад'ехаў на «ўазіку»Ківайка. Покуль Павел адчыняў дзверцы і залазіў на пярэдняе сядзенне, каля будачкі апусціўся шлагбаум — як нага агромністай зебры.

Ківайка нецярпліва трымаў на пластыкавай галоўцы перадачы, усярэдзіне якой быў уроблены сувенірны «Алімпійскі агонь», маленькую пухленькую руку — яна падрыгвала: мерна працаваў рухавік. У такіх выпадках, як сённяшні,Ківайка меў звычку вадзіць машыну сам. Насіў у кішэні законныя правы шафёра-аматара. Навошта лішняе вока, хоць і падабраў, здаецца, неблагога шафёра, праўдзівей, пераманіў яго з «Сельгастэхнікі» большым акладам. Шчыра шкадаваў начальнік упраўлення, падпісваючы загад аб звальненні Савянкова: «Калі б каму-небудзь іншаму аддаваў свайго шафёра, яшчэ б патаргаваўся за яго. А табе, Андрэевіч, уступаю. Залаты хлопец, надзейны! Не толькі добра галы забівае...» А па-другое, пры шафёрыКівайка няёмка сябе адчувае: і чарку лішнюю не возьмеш, і ад жарціка грубаватага ўстрымаешся, і не падміргнеш вясёлай жанчыне.

Прамчаўся пасажырскі поезд «Масква — Баранавічы». Цёмныя лужыны на брустверы пакрыла дробная рабізна. І яшчэ доўга стаяла ў вушах татахканне колаў на стыках рэек.

— Ведаеш, дзе Света жыве? — сур'ёзным голасам спытаў Івайка, затаіўшы ў зялёных вачах усмешку.

Павел разгадаў яго, аджартаваўся: адкуль мне ведаць?

— На вяселле хутка паклічаш? — як ні ў чым не бывала працягваў Ківайка.

— Адразу, як толькі будзе...

Падруліўшы да сіняй з мудрагелістымі разьбянымі ліштвамі хаты, Ківайка спыніўся. Павел вылез і папраставаў у двор. З хаты яны выйшлі ўдваіх. Света несла ў руках вялікую чырвоную сумку і злёгку памахвала ёю. Сама была апранута ў блакітны плашч, доўгія цёмныя валасы падвязала зялёнай стужкаю.

Яны селі на задняе сядзенне, абцягнутае пярэстай цялячай шкураю. Свецін твар, мусіць, нядаўна памыты, ясна і туга блішчэў, як спелы яблык. Вочы мякка праменіліся ў паўзмроку. Быццам сонечныя зайчыкі, яны саграvalі Паўла. Яму было прыемна сядзець побач са Светаю. Яна прыўзнялася, закрыла крысом плашча калені. Інстынктыўна, а не таму, што саромелася Паўла. Ён зусім не чужы ёй, Павел.

Павел адчуваў гэтую Свеціну ласку і ад замілавання мружыў вочы. Здаецца, зусім нядаўна яны былі незнаёмыя, чужыя людзі. Як выразна ўсё помніцца! Ягоны прыезд, прыёмная рэдактара...

«Уазік», дрогаючы на выбоінах па краі асфальту, бег уперад. Размінаючыся са стрэчнымі машынамі, ад'язджаў далёка ўбок, ледзь не да самага кювета. Яго часта абганялі легкавыя аўтамашыны. Ківайка ўчэпіста трымаўся маленькімі рукамі за руль, незадаволена мармытаў:

— Горш, як у Глушаве, дарог нідзе няма. А тут, як назло, амартызатары селі...

Павел таксама бачыў, што шаша разбітая, далёка не аўтастрада, і ведаў, што селі амартызатары. Але ён ведаў яшчэ адну прычыну — чаму кідала з боку на бок «уазік». У Ківайкі быў зусім малы вадзіцельскі вопыт. Павел пра гэта не сказаў, бо ўдарыў бы па самалюбстве Ківайкі, які аднойчы прызнаўся: «Страшэнна люблю вадзіць машыну...» Сапраўды, чаму так: іншы раз даво-

лі аднаго неабдуманага слова, і роўны лад жыцця парушаецца? Павел спытаў пра іншае:

— А на якой машыне Буры прыедзе?

— Ты ведаеш, Павел, я і не папытаўся. Сказаў толькі нумар... здаецца, 32—95. Ну, пэўна ж, «Волга» будзе!

Павел, задаволены, пахіліўся да Светы і пачаў распавядаць ёй пра смешныя здарэнні з часоў студэнцтва. Яна шчыра, але стрымана смяялася. Тады каля вачэй збіраліся пучкамі маршчыны.

Збоч расступаліся і як усё роўна выстрайваліся ў адзін шнурок стромкія сосны. Кара на іх цьмяна бліскала ў вокны.

«Уазік» звярнуў з шашы, пакаціў па бярэзніку, у які ўразалася калдобістая, у лужынах, дарога. Чуваць было, як у днішча пругка білі струмені вады, выляталі на абочыну, абліваючы зрудзелы леташні верас, белы, як пакулле, сівец і заваленыя тонкія бярозкі, што наяршыліся абсечаным на венікі галлём. Адале дарога выскачыла на поле, павышэла. Яе тут падсыпалі гравіем і жаўцяком, і «ўазік» без натугі адольваў яе. Поле, перааранае з восені, ляжала тлустай, цяжкой плахаю, патрэсканай у спадзінах, дзе нядаўна высахла вада. Там-сям бяleліся, як шматкі снегу, камякі вапны, тапырыліся шэрыя, як вожыкі, чубкі ржышча.

Вёска паказалася ім адразу ўся. Хата Свецінага дзядзькі была крайняя. Ён зусім нядаўна, гады два назад, калі стаў на лодачнай вартаўніком, перавёз яе з хутара ў Ведравічы. А Свеціны бацькі па-ранейшаму засталіся жыць там, як яны казалі, у выгадзе: лес, луг, поле адразу за дваром. Раздолле сабе і скаціне.

Свецін дзядзька, звалі яго Юрась, жыў адзін, бабылём. Дзіву можна было давацца, як ён, перавёзшы хату і нанова паставіўшы, зусім не змяніў яе вонкавага выгляду. Яна была ўсё такая ж нізкая і панурая, якая стаяла і на хутары. Вокны без ліштваў, вузкія, як байніцы, глядзелі з-пад дранкавай страхі на свет асцярожна і абыякава, быццам іх мала цікавілі машыны, што праносіліся міма, абдаючы смярдзючым гарам, табуны кароў, якіх выганялі з двароў людзі. Хата заплюшчыла вочы на свет ці, можа, проста ўвесь час драмала ў патаемнай пагардзе да ўсяго шумнага, мітуслівага і яркага.

Гаспадар, мусіць, учуўшы машыну, выйшаў з хаты.

Каранасты, як збіцень, аброслы да самых грудзей сівымі валасамі. Бронзавымі плітамі выпіралі з кудзелі валасоў скулы. З-пад броў востра свяцілі чэпкія, цвёрдыя кропачкі вачэй.

Вылез з будкі чорны, з белымі нагамі і правым вухам сабака і забухаў зычным брэхам. Юрась цыкнуў на яго, махнуў пальцам. Сабака сціх, падтуліў хвост і, гледзячы на людзей, трывожна цягнуў у сябе паветра.

— А-а, госці!..— Юрась саступіў з ганка, пазнаўшы каля машыны Свету і Паўла.Ківайка першы падбег да гаспадара, падаў яму руку, праяўляючы такім чынам свой дэмакратызм.

Юрась ведаў, што ёсць у Глушаве рэдактарКівайка, і, можа, нават бачыў на якой нарадзе ці дэманстрацыі. Аб ім не раз упамінала і Света. Але ён не ведаў, што калісь паКівайкавым загадзе спрамілі Лабчанку. Забыў, а хутчэй не пачуў тое прозвішча, якое называў тады экскаватаршчык.

— Не зважайце, што ў мяне тут рэзрух... Па совісці сказаць, толькі з лодачнай...— Юрась, сашчапіўшы на грудзях рукі, кланяўся і запрашаў гасцей у чыстую палову хаты. У яго быў крамяны голас, які даходзіў да зубоў, а там прышчэмліваўся языком, і словы вымаўляліся з прысвістам.

Ківайка з Паўлам таўкліся ў парозе, не ведаючы, ці то скідаць туфлі ды ісці ў чыстую палову хаты, дзе, чуваць было, працаваў тэлевізар, ці застацца тут, у прыдзелку, і адразу распавесці гамонку.

— Фёдар Андрэевіч, ну праходзьце, калі ласка,— зачырванеўшыся ад таго, што ўзяла на сябе ролю гаспадыні, сказала Света.

Хата дыхала цяплом і водарам святаянніку. Адразу каля дзвярэй, справа, стаяла печ, абліцаваная белай кафляю.

Ківайка вырашыў адкласці размову на потым. Лепш пачаць яе непрыкметна, здалёку, быццам выпадкова. Нахабствам не заўсёды і не ўсюды возьмеш, хоць тут, канечне, яго ніхто і не адчуў бы.

— А я во «У свеце жывёл» уключыў,— сказаў Юрась, калі яны зайшлі ў чыстую палову хаты.— Пра Чырвоную кнігу расказваюць... Шмат жывога на свеце вымірае... Сядайце, глядзіце. А я покуль на кухні патапчуся.

— Калі ласка, Фёдар Андрэевіч.— Света падсунула

даКівайкі крэсла. Юрась глядзеў тэлевізар, відаць, з ложка, на якім ляжала скамечаная падушка ў парудзелай наўлечцы.— І ты, Павел, сядай. Будзьце як дома...— І выйшла. Павел пачуў ейны голас на кухні: «Дзядзюш, давайце я вам памыю, прыбяру...» — «Дзякуй, Святланка! У мяне надта і няма чаго мыць».— «Сарочкі, пасцельную бялізну давайце...» Потым бразгалі вёдры, пругка лілася вада. Сіпела на пліце.

Павел сказаўКівайку, што пойдзе дапамагаць Свеце, і ўбачыў, як той зморшчыўся. Не хацеў заставацца адзін.

Света, падвязаўшы цыратовы фартушок, перабірала апранахі. На Паўлаву прапанову Юрась замахаў рукамі, маўляў, справімся самі, а Света абрадавалася. Яна ўсміхнулася, згодліва кіўнула галавою. Ён узяў з лавы пустыя вёдры.

Калодзеж быў недалёка, за хлявом, але ісці да яго трэба было міма сабачай будкі. Павел спачатку сумеўся, але ўспомніў, што сабакі нападаюць звычайна на тых, хто паводзіцца палахліва ды няўпэўнена. І ён смела папраставаў да сабачай будкі. Сабака правёў Паўла ціхамірным позіркам. Бакавым зрокам Павел бачыў чырванаватыя бялкі скошаных сабачых вачэй.

Калодзеж з калаўротам быў глыбокі і цёмны. Дна Павел не ўбачыў, як ні жмурыў вочы. Вядро, акаванае тоўстымі жалезнымі абручамі, доўга падала ўніз. Павел прытрымліваў гладкую качулку далонню; свістала, набраўшы абароты, ручка. Вядро пляхнулася аб ваду, напяла, патануўшы, стальны трос.

Павел успомніў сваё дзяцінства, як узімку ездзіў на саначках па ваду. Гэта быў вялікі давер маці — праз яе ж страх,— пускаць яго аднаго да нізкага слюдзяніста-абледзянелага зрубчыка. Завея круціла так, што, здавалася, толькі высунься з хаты, і яна сарве цябе з зямлі, падхопіць і знясе на край свету, дзе страшна і адкуль ты, калі нават застанешся жывы, ніколі ў жыцці не выберашся. Ён знаходзіў на печы старыя, свае і бацькавы, лахманіны, усцягваў іх на сябе, а потым яшчэ апранаў фуфайку, падпяразваўся рамянём. Ногі абуваў у вялікія лапленыя катанкі, у халявы якіх хаваліся калені: кепска ісці, затое ногі ў поўнай свабодзе, аж гарацьад цеплыні.

У сенцах стаяў пусты бітон з адчыненым вечкам. Паўлік вельмі любіў закрываць гэтае вечка. Спачатку

яно ядрана ляпала, потым ён націскаў на язычок, які туга падаваўся, бо пад вечкам была гумавая пракладка, суха шчоўкаў. Калі была ў бітоне вада, яна пырскала ва ўсе бакі. Браў бітон за вушы, нёс на двор. Выцягваў з-пад павеці драўляныя санкі, умошчваў на іх бітон. Цягнуць санкі лёгка па ўкатанай дарозе. А ў завею? Санкі ідуць юзам, сунуць перад сабою снег, глыбока асядаюць палазы.

Да калодзежа з-за лёду цяжка падступіцца. Дарослым прасцей, яны бяруцца рукою за цэбар і тады ўжо, трымаючыся, ступаюць на лёд. Паўлік да цэбра не дастае. І таму спачатку бяжыць туды, дзе сляга ўтыкаецца сваім канцом у снег. Ашчапервае яе і падымае — цэбар, апускаючыся, чапляецца за цвік, які маці наўмысна ўбіла ў слупок.

На бітон патрэбна чатыры вядры. І Паўлік, узяўшыся абедзвюма рукамі за паленца, да якога прывязана пачопка, цягне санкі. Туга рве насустрач вецер, забівае дыхавінне. І ад гэтага радасна, быццам з кімсьці змагаешся і пераадольваеш яго. Сэрца трапечацца ад гонару — мужчына павінен быць дужы.

Успамінаючы, Павел паволі круціць ручку, і цяжар вядра адпіхвае яе назад. Кроплі падаюць з вядра ў калодзеж і суха звіняць унізе...

«Такое, здаецца, простае рэчыва — вада, а яна ж — жыццё. Жыццё! Як гэта сказаў вядомы амерыканскі біяхімік Альберт Сент-Дзьёрдзьі? Вада з'яўляецца матрыцаю жыцця...»

У чыстай палове хаты тым часам гаманілі Юрась іКівайка.

— Ну, дык што да нас пажалавалі? — спытаў Юрась, падносячы крэсла і ставячы яго перадКівайкам.

— Ды от праязджалі... тут Света да бацькоў надумалася...—Ківайка запінаўся, падбіраючы, як лепш сказаць, каб і не прагаварыцца загадзя і не вельмі забываць, дзеля чаго прыехаў.— Словам, вырашылі перад святамі турнэ зрабіць!..

— Турнэ, так? — Юрась засмяяўся, не зусім разумеючы сэнсу чужога слова.

— Надвор'е во ніяк не ўсталюецца,— пашкадаваўКівайка, пераводзячы гаворку на просты лад.

— Ану яе, непагадзь етую! — з адчаем сказаў Юрась.— Пчолы во ніяк пасля зімы не акрыяюць...

Падкармліваю сіропам. Не ведаю, як яно будзе і летам... А! — махнуў рукою.

— А што такое?

— Ды кветак цяпер мала. Грэчку ў нас не сеюць... Нібыта яе скучылі ў адзін калгас. Далёкі... І ваабшчэ, я не зразумею, што робіцца на свеце!..— Юрась паварушыў бровамі.

— Пчолам гора, а рыбе, мусіць, яшчэ горш?

— Па совісці сказаць, сёлета не тое што мінулыя гады. Няма жывых рэк — няма і рыбы...

— Дык цяпер, пэўна, і лавіць забаронена? — Ківайка ўпэўнена дабіваўся свайго.— Мы артыкул Роліча, галоўнага нашага паляўнічага і рыбалова, друкавалі...

Юрась нахмурыўся, вочы зноў схаваліся пад навісь броў, і твар стаў глухі ды пануры, як стары замшэлы пень.

— Ды не, адною вудачкай можна... Адною можна. Вунь у нас баба... ета, Марша Лапуцька, зладіла язя больш кілаграма. На вудачку.

— Дзе? — наструніўся Ківайка.

— А во недалёка, за мостам... Мусіць, дурны які трапіўся,— усміхнуўся Юрась, каб жартам адвесці падазрэнне, крый бог, падумае госць, што схлусіў.

— А іншымі якімі снасцямі ловяць? — наступаў на гаспадара Ківайка.

— Чаму ж не. Ловяць. Павукамі, тэлевізараў навыдумлялі... Ловяць, хто не лянуецца. Нават чужыя прыязджаюць.

Ківайка падлавіў зручны момант:

— Можа, і нам падскочыць на выхадныя?

— У любы дзень можаце. Мне весялей будзе.

— Мы не адны. Да нас высокае начальства прыязджае...— Ківайка быў шчыры, бо ведаў, што з простымі людзьмі заўсёды хутчэй дамовішся, калі не будзеш круціць-вінціць хвастом, а скажаш напрамую, адкрыта.

— Мусіць, з Магілёва? — спытаў Юрась.

— У тым-та і соль! — надаў Ківайка словам таямнічы сэнс.— І тут без улову не абыдзешся...

— Разумею... Давайце, покуль зусім не сцямнела, сходзім з вудачкамі на рэчку. Пакажу вам месцы.— Юрась устаў, запрашаючы ўслед за сабою і госця.

Яны падышлі да пуні, дзе Юрась у падстрэшку хаваў вуды.

Юрась выцягнуў з-пад страхі пуні тры вудзільны, доўгія, гнуткія, з ляшчыны. Тонкай змейкаю іх абвівала жылка. Аддаў вудзільны Паўлу, сам узяў лазовы кош. Півайка курыў, хаваючы ў стрэшкаю сагнутых пальцах цыгарэту: дзьмуў вецер, а каля пуні стаяў стажок сена.

Света памахала ім у акно рукою, перастрэўшы Паўлаў позірк, усміхнулася: «Ні пуху ні пер'я!» Павел адчуў, як радасць разлілася па душы, захліснула грудзі. Ён якісьці час ішоў бяздумны, баючыся страціць трапятлівае пачуццё. А яго ж, гэтага пачуцця, магло і не быць, калі б не разлука, разлука з Людмілаю, якая паказала, што няпэўнасць у адносінах была невыпадковая. У іх не было кахання, а толькі цікавасць адно да аднаго. У Паўла была цікавасць звычайная, якая можа быць у студэнта да прыгожай, з таямнічымі вачыма дзяўчыны. У Людмілы... А вось у Людмілы, цяпер ужо няма сумнення, быў разлік выйсці замуж. І гэта пацвердзіў ейны прыезд сюды, у Глушава. Гэта страшная штука — закранутае жаночае самалюбства!

Да рэчкі набіралася метраў трыста. На берагах не было ні хмызняку, ні дубоў ці ляшчыны. На роўным, як патэльня, лузе віднеўся каля небасхілу цёмна-буры шнурок. Над ім цяпер квола ружавела сонца за плёнкаю хмар.

Яны ішлі да рэчкі нацянькі, праз мокры луг. Бераг быў глеісты, слізкі, акурат мыла, і зямля выкручвалася з-пад ног.

— Пададзімся ўверх, там сушэй,— сказаў Юрась.

Павел глядзеў на ваду. Мутная, з жоўтаю пенаю, яна шалёна імчалася ў паката зрэзаных берагах, несла на сабе трэскі, галлё, леташнюю траву, зрэдку выныравалі з яе лабатыя разбрынялыя, падобныя на баброў дошкі.

— Ета ж не рэчка, чорт! — бурчаў з густых валасоў Юрасёў голас.— Чорта зрабілі!.. Летам вады той верабʼю па калена. Жаўцяку намывае, ляжаць гурбы, што цюлені.

Ківайка нязграбна шлопаў у літых гумавых ботах і, здавалася, думаў аб адным: як не ўпасці, не распластацца тут, на здрадліва гладкім беразе.

— А раней што, не такая была Лабчанка? — спытаў Павел, загадзя ведаючы адказ.

— Го, раней! — уздрыгнулі ў Юрася бровы і зноў

насунуліся на вочы, як стрэхі хаты на вокны.

Яны спыніліся за нізінаю, у якой прыкра чвякалі ногі, саслізгвалі з купін, і тады рудая твань пырскала аж на твар. Павел падрогаўся, правяраючы, ці трывала стаяць ногі.

— Тут пакідаем,— сказаў Юрась, разматваючы вуду.

Павел зКівайкам таксама наснудзілі свае вуды.

Разышліся па беразе.

Павел усчапіў на кручок маленькага рудога чарвячка, закінуў вуду — трымаючы вудзільна перад сабою, зыбнуў яго гнуткім кончыкам, выпусціўшы адначасна з рукі кручок. Паплавок з гусінага пёрка стаў дыбарком. Плынь падхапіла яго, панесла. Павел пасунуўся берагам, не спускаючы вачэй з паплаўка. Гэкнуў збоку Юрась, прысядаючы, лэпаў рукамі па зямлі, і пад імі бела бліскала, усё роўна як люстэрка. «Адзін ёсць!» Глянуў на свой паплавок — і кальнула пад грудзямі. Жылка напялася, а паплавок ледзь віднеўся з-пад вады. Таргануў вудзільна на сябе і зразумеў, што кручок за нешта зачапіўся. Ён патузаў жылку. Яна не падавалася, звінела, як струна.

— Сом? — да яго падышоў Юрась.— Дай-ка! — узяў у Паўла вудзільна; да рук ягоных прыліплі лускавінкі. Тузануў жылку туды-сюды, уверх, і яна паслабела, правісла. Аддаў вудзільна Паўлу, папярэдзіў, каб сачыў за глыбінёю, бо яна мяняецца тут на кожным кроку.

Ім не пашанцавала. Тры невялікія Юрасёвы падлешчыкі ды дзве плоткі, спайманыя Паўлам,— вось і ўвесь улоў.Ківайка нават не пабачыў клёву і цяпер хадзіў разгублены. Ужо не лавіў, а толькі зацята курыў, кідаючы ў ваду недакуркі.

Вечарэла. Спадаў з неба густы змрок, зліваўся воддаль з зямлёю, якая паволі настывала, сцінался, і быццам яе, зямлі, дыханне, плаваў над ёю тонкі сівы туман, там-сям праткнуты высокімі ружовымі мяцёлкамі конскага шчаўя. Свісталі крыламі, падавалі з вышыні дзяркаты голас чыркі, ды іх ужо не было відаць. Яны кружылі над галовамі, не знаходзячы месца, дзе прываднiцца.

— Нямаш рыбы...— сумным голасам сказаў Юрась і страсянуў галавою, такою ж сівой, як і туман. Пачаў наматваць на вудзільна жылку.— Не паслухалі мяне,

спрамілі Лабчанку...— Голас у Юрася пераламаўся.— Загубілі! А я ж...— Валасы на твары заварушыліся і схавалі пад сабою пліты скул і вочы, нібы іголкі — лычык патрывожанага вожыка.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Спачатку задрыжала хата, і пасыпаўся са шчылін у столі пясок. У вокны свяціла сонца, і промні ягоныя, што кладліся касяком на падлогу, пагусцелі, стала відаць, як у іх мроіцца залацісты пыл.

Хату трывожыла ад вуліцы.

Юрась адлажыў патранташ, падышоў да акна. Скрозь вузенькае, як асака, лісце пакаёвай пальмы ўбачыў на дарозе экскаватар. Ён поўз у бок моста. На выслізганых да бляску белых зубах каўша скакалі бліскаўкі. Юрась адчуў, як паслабела ў грудзях і адваліліся ногі: «Прыехалі ўсё-ткі!..»

Экскаватар перапоўз мост, крута ўзяў улева, блізка падсунуўся да берага Лабчанкі і спыніўся. Лёгка адмахнуліся дзверцы маленькай, як шпакоўня, кабіны, і на зямлю саскочыў экскаватаршчык. Узяўшы рукі ў бокі, патупаў па беразе, самавіта, як гаспадар. Капырзнуў нагою зямлю, падняў штосьці каля ног, кінуў у раку. Вада выгіналася між карчоў, дрыжала валавяным зыбам, клекатала на перакатах.

Экскаватаршчык зноў пагробся ў кабіну. Газануў, і воблачка дыму, растаючы, паплыло ў той бок, куды бегла Лабчанка. І раптам жалезная лапа экскаватара паднялася, потым рэзка клацнула ўніз — і вострыя бліскучыя зубы ўпіліся ў бераг. Экскаватар закрахтаў, дужа падцінаючы пад сябе лапу, і яна мякка танула ў зямлю. Экскаватар выдыхнуў новае воблачка дыму, і лапа падняла ў паветра гурбу зямлі, аднесла яе ўбок і выпусціла, толькі бліснула белае карэнне мячэўніку.

У Юрася памутнела ў вачах. Ён, у адной кашулі, босы, выскачыў з хаты. Падбег, задыханы, да экскаватара, замахаў рукамі. Экскаватаршчык прачыніў дзверцы, збавіў газ. Ён быў худы, маленькі, зусім падлетак. Скаліў рэдкія зубы і ад здзіўлення выпучваў вочы.

— Што, дзядуля?

— Злазь сюды! — крыкнуў Юрась, сціскаючы кулакі.

— Ну што, што ты хочаш? — крыўляўся экскаваташчык.— Кругом? Так! Шагам — арш? Так!

— Злазь, кажу, маць тваю!..— злаваўся Юрась, стукаючы кулакамі па каленях.

— Ты што, дзядуля, напраўду звар'яцеў? — Экскаватаршчык акругліў вялікія вочы. Твар ягоны пабялеў, і на верхняй губе стаў відаць цёмны пушок.

— Будзеш Лабчанку спрамляць?..

— Так точна, таварыш адмірал! — Экскаватаршчык, відаць, нядаўна з арміі, паднёс да скроні брудную руку.

— Я табе во зараз як спрамлю, дык матка родная не пазнае! — Юрась ступіў да экскаватара, але той дзіка рыкнуў, і ён спыніўся.— Ты думаеш, смаркач, што з яе будзе пасля твайго спрамлення?.. Па совісці сказаць ...!

— А што ты на мяне бочкі коціш, адмірал? Ідзі з Півайкам, прарабам, лайся. Ён мяне пасылаў, ён і пра норму спытае...

— Не хачу я ведаць ніякіх крабаў-прарабаў! Прэч адсюль, нягоднік, каб і духу твайго тут не было!..— гарачыўся Юрась. І раптам панік, згорбіўся.— Я на етай рэчцы радзіўся... У вайну, ранены, вадою з яе спасаўся... ета, можна сказаць, кроў мая цячэ, а не вада. А ты...

— Маё дзела маленькае, зразумей ты, дзядуля...— Голас у экскаватаршчыка памякчэў.— Мне Ківайка сказаў пачынаць з Ведравіч... Іншыя ў другім месцы прыступілі.

Юрась засланіў шырокімі далонямі валасаты твар, і паміж пальцаў у яго заблішчэлі на сонцы слёзы. Экскаватаршчык не разумеў, чаму плача гэты кудлаты чалавек. Нервова кусаў ніжнюю губу, але з кабіны не вылазіў.

На вялых нагах Юрась павярнуўся і пасунуўся двору. Экскаватаршчык з жалем глядзеў яму ў спіну.

Уначы Юрасю прысніўся сон, быццам браканьер, нізенькі, на крывых нагах чалавечак, падчапіў вялікім трайным кручком ягонае сэрца і выдзірае з грудзей. Боль пранізвае ўсё цела, ажно коле ў мазгі. Ён хапаецца за жылку, цягне да сябе, ды жылка, слізкая, тонкая, выцякае з рук. Ужо не хапае сілы змагацца... І вось грудзі раскрыліся, сэрца вырвалася з іх і забурліла па рацэ, афарбоўваючы вакол сябе ваду ў чырвоны колер. На процілеглым беразе стаіць браканьер і так гучна рагоча, што з вербалозін асыпаецца лісце... Ды каля самага берага сэрца раптам зашыпела, акурат нагрэты

камень, заскакала і — разарвалася, захліснуўшы ўсё, і неба, крывёю...

Юрась прачнуўся. Білася ў грудзях сэрца, бы птушка, якой звязалі крылы, і не было чуваць, як цікае на сцяне гадзіннік. «Можа, сышла спружына? Дык не ж, учора заводзіў... Колькі там часу?» Ён устаў. Калені дрыжалі. Было роўна тры гадзіны — знаць, толькі што гадзіннік адлічыў тры ўдары. Юрась не чуў. Ён звечара шмат думаў і заснуў позна. Ды і сон які, адна верзяя. Ажно цяпер звініць у галаве. Ён выцер далонню лоб, схадзіў на кухню, папіў нагбом з трохлітровага слоіка чайнага грыба.

Падышоў да акна, што глядзела на раку, адхінуў фіранку. У небе вісела поўня. Вочы адразу ўперліся ў экскаватар. Ён цямнеў каля моста бездапаможнаю бліскучаю глыбаю. Юрась доўга стаяў перад акном, варушыў пашчэнкамі. Экскаватар, здавалася, выдзіраў вочы.

Юрась пачуў, як хрумснулі ў кулаках пальцы. Мала што вытрымала, не скрышылася б, калі б трапіла зараз у іх. Нават з каменя, мусіць, пасыпаўся б пясок. Ён адступіўся ад акна, сарваў з біла ложка штаны. Стаў хапатліва сунуць у іх ногі. Ківаўся, стоячы, як бусел, на адной назе. У кашулі зашпіліў не ўсе гузікі.

Узяў у кладоўцы сякеру і выйшаў на двор.

Сабака вылез з будкі і смачна пазяхнуў, аж віскнуў,— бела аскаліліся зубы. І вастрыё сякеры было белае, з блакітнаватым адлівам. Юрась зіркнуў на месяц, і тое, што было светла, амаль як удзень, праясніла свядомасць.

«Ад сякеры будзе звон, лепш даўбешкаю...»

Ён узяў з-пад пуні даўбешку. Тады, калі разбіваў на дровы чачоцістыя бярозавыя кражы, вычасаў яе з дубовага камля. Не чуючы яе ў руках, пасігаў да экскаватара. Не краўся, ішоў смела, як ходзяць сумленныя людзі.

Экскаватар стаяў, уткнуўшыся каўшом у бераг. Блішчалі, аддраеныя зямлёю, зубы. Пяць зубоў, як на чалавечай руцэ пальцаў. Кабіна была зачынена і, пэўна, замкнута. У дзверцах адлюстроўваўся месяц, круглы, ядраны і чысты.

Юрась выпраставў плечы, размахнуўся і з сілаю апусціў даўбешку на гэты нясцерпна яркі месяц. Пырснула ва ўсе бакі шкло, зацокала ў ваду. Месяц спакойна свяціў з неба, а кабіна зеўрала глыбокай чарнатою.

Юрась адступіўся і пачаў малаціць даўбешкаю па бліскучых зубах. Коўш ляжаў нерухома, і толькі зіхатліва блішчалі, як дражніліся, пачварна ашчэраныя зубы. І Юрась азвярэла біў па гэтых зубах. Валасы засланялі яму вочы, ды ён не адкідваў іх, глядзеў скрозь валасы, быццам скрозь краты. Спыніўся тады, калі распатлачаная даўбешка зашчамілася між зубоў, і ён не змог яе вырваць. Тады зарагатаў пераможна і радасна.

Марша Лапуцька, якая ў тую ноч якраз чакала, калі апаросіцца свіння, і таму не спала, дзяжурыла з ліхтаром каля пуні, чула гэты рогат і разнесла па Ведравічах чутку, што Юрась Верхаводка здурнеў.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

...Юрась уздыхнуў, скамянеў і доўга глядзеў у зямлю, сабе пад ногі.Ківайка апёк цыгарэтаю пальцы і цяпер прыкладваў да іх камячок глею.

Павел глядзеў на раку, на яе цёмнае рухомае цела, якому было балюча і нязручна ў гвалтоўна зрэзаных берагах, і яно гучна, неяк па-чалавечы ўсхліпвала.

— У раён выклікалі мяне... за ета дзела...— Юрась варухнуў плячыма, і галава павышэла над імі.

— За бунт,— падказаўКівайка.— Ой, што мы, цывілізацыя, робім! Страх падумаць! — У яго не хапіла смеласці прызнацца, што гэта па ягоным загадзе экскаваторшчык прастаў Лабчанку. Але і яму, тады прарабу, загадалі. Паспрабуй не падпарадкуйся... Адно дурні на ражон і лезуць.

— Ага, знаць... Я і кажу старшыні выканкома: «Я ж ета... і прыстаўлены аберагаць прыроду...» — «Для вас жа,— адказвае,— лепей робім, каб хлеба болей было, пашаў культурных, а вы... Даўбешкі ў рукі». Я зноў на́грудкі: «Рэчка!» І даскакаўся, заплаціў сто рублёў штрафу... за экскаватар. Тады і кінуў сваё егерства. Не мог... не мог на ўсё ета спакойна глядзець...

Ужо зусім сцямнела. Высыпалі на небе зоркі, зялёныя і дробныя, што няспелы гарох. У Юрасёвай хаце свяціліся вокны. Зрэдку мільгаў на фіранцы цень.

Сыра было ў ногі: туман пагусцеў і ўжо быў відаць зблізку. У кашы, які нёс Юрась, бялелася рыба, як хто сыпнуў туды снегу.

Света сустрэла іх у сенцах, трымала ў руках мокрую анучу. Падлога жаўцела, выскабленая, мусіць, нажом.

— Ну што? — спытала яна.

— Пуста! — сказаў Ківайка.

— Во-о-ё-ёй!..— Света напраўду перажывала, не магла падняць вачэй на Ківайку, акурат па яе віне не лавілася рыба.

— У каго пуста, а ў каго густа! — сказаў Юрась і страсянуў кош.

— А я вам бульбы спарыла на вячэру,— пахвалілася Света.— І гуркоў з пограба дастала...

Размовы за вячэраю былі самыя розныя. Пра мір і пра Алімпіяду, месцам правядзення якой выбралі Маскву, пра чэшскае піва, што прывезлі ў акуратна запакаваных кардонных скрынях у Глушава, і пра рыбу, пра новыя выбары ў Амерыцы і фашысцкую дыктатуру ў Чылі... Вялася тая звычайная гамана не надта абавязаных адно аднаму людзей, якая, апроч таго, што заўсёды выпадковая, вельмі хутка ўсім надакучвае.

Ківайка неўзабаве прапанаваў Паўлу выйсці пакурыць, хоць і ведаў, што Павел не курыць. Яны спыніліся на ганку. Ківайка закурыў, прыхінуўся плячом да дзвярэй. Пусціў дым, і ён паплыў у святле месяца белы, як шкумат ваты. Ядрана забразгаў ланцугом сабака. Дзесьці на вёсцы спявала жанчына. У волкім паветры добра чуліся словы:

Наша рэчанька глыбока —
Лентачкай не змераеш,
А мой міленькі далёка —
Вечарком не збегаеш.

— Людзі весяляцца!.. Чуеш, Павел? Жыццё-ё-ё... Жыві не хачу! Вось так... Што такі сумны, га? — Ківайка хітнуўся, паклаў Паўлу на плячо руку, цёплую, акурат толькі трымаўся ёю за батарэю. Яму раптам цюкнула ў галаву думка, зародак якой ужо даўно насіў у падсвядомасці. Але ці то не хапала смеласці выказаць яе раней, ці то лічыў, яна не выспела да такой яснасці, каб яе са спакойнай душою можна было ўводзіць у вушы. Прынамсі, Ківайка, добра ведаючы, што намечанае здзейсніць, усё адкладваў свой намер на пазнейшыя часы, аж покуль не адчуў упэўненасць, вядома, дзякуючы не толькі ўладжанай справе, але і чарцы, на якую не паскупіўся Юрась Верхаводка.— Хочаш? — тармаснуў ён за плячо Паўла.— Гавары, хочаш?

Павел, не прымаючы Ківайкавага чапляння і трохі

раззлаваны ягонай пустой балбатнёю, знарок напусціў на сябе абыякавасць. Злёгку прыжмурыўшыся, глядзеў міма Півайкавых вачэй — на вуха, якое ад месячнага святла ўзялося срабрыстым абадком.

Ківайка хмыкнуў.

— Хочаш... зраблю цябе сваім намеснікам?

Прапанова сапраўды была нечаканая. Павел, засмяяўшыся, падумаў, што сёння рэдактар можа паставіць яго нават на сваё месца. Але пасля ўбачыў, што ўсё не так проста, як здаецца. Паўлава несур'ёзнасць Ківайку не спадабалася. І не таму, што Дроб пасмяяўся з ягоных шчырых намераў, а таму, што палічыў іх за пустое, за дробныя выбрыкі.

— Ну, дык як? — Ківайка аж прысеў, сілячыся да канца зразумець Паўла і заадно казырнуць: глядзі, які я спрытны.

Павел, зразумеўшы, куды хіліць шэф, хацеў усё-ткі перавесці размову на жарт, думаючы, што гэта адаб'е ў Ківайкі жаданне настойваць ці, прынамсі, прымусіць усумніцца.

Ківайка дзівіўся ўсё больш. Яму былі неўпрыцям такія паводзіны падначаленага. Рушыўся вынашаны ім намысел. Цяперашні ягоны намеснік, Чарткоў, яму не прыглянуўся. А гэты Дроб, ён што, наіўны ці то прымае яго, рэдактара, за олуха цара нябеснага? Дык памыляецца, маладзён! Ківайка, як той барометр, чуйны і дакладны. Ён не проста так, за нейкую дробную паслугу ці за прыгожыя вочы, хоча павысіць Дроба. Ківайка, лічы, адразу ўбачыў, што Дроб варты пасады намесніка. Не, не тое што ён якісьці там выбраннік, адзіная ў сваёй асобе персона. Шмат людзей заслугоўваюць лепшага, ды камусьці здаецца, што яны не заслугоўваюць і таго, што маюць. А тут? Тут якраз усё будзе добра. І райком, упэўнены, падтрымае кандыдатуру Дроба. Маладым, як, зрэшты, і ўсім астатнім, не надта падабаецца сядзець доўга на адным крэсле, праціраецца хутка ад нецярплівага ёрзання, ім усё наперад ды наперад давай ход. Яны, старыя, павінны даваць дарогу, акурат рэгуліроўшчык машыне, а калі трэба — саступіць. Ён, Ківайка, заўсёды быў высакародны, як і маці. Вось і саступае! Але чаму ўпарціцца Дроб?

— Падумай, Павел, табе ж трэба расці,— надзіва выразна сказаў Ківайка.

Паўлу, бадай, лесціла, што рэдактар так высока

ставіць яго, мусіць, напраўду паважае. Але дарэмна ён лічыць, што Павел імкнецца да кар'еры. Сумленна працуеш, добрыя матэрыялы пішаш, дык ужо і кар'ерыст. Так, выходзіць? Памыляецца. Павел ніколі не хваляваўся і не хвалюецца за сябе і за сваю будучыню. Помніцца, і ў школе не хваляваўся, потым ва універсітэце, і цяпер вось тут... Ён заўсёды спакойна глядзеў уперад. Нават у часы няўдач і расчараванняў.

Ківайка быў не да канца шчыры, як амаль ва ўсіх выпадках, праяўляў двурушніцтва. Чамусьці ён не сумняваўся, што Павел Дроб здольны ўзвысіць не толькі самога сябе. Так, дальнабачны чалавек і рэдактар, ён, Ківайка, павінен улашчваць Дроба і дзеля сваёй кар'еры. Зробяць газету добрай — у першую чаргу пахвала будзе рэдактару і заслугі прыпішуць за ўсё менавіта яму. Сказаць яму пра гэта ці не?

— Ты, Павел, работнік, за якога я павінен трымацца рукамі і нагамі, як васьміног. Разумееш? І я не хачу цябе крыўдзіць.

Паўла кальнулі Ківайкавы словы ў самае сэрца. Выходзіць, ён, Дроб, толькі цацка ў рэдактаравых руках, якую можна пераставіць на любое месца, куды захочацца і дзе спадабаецца. Павел сказаў Ківайку рэзка, проста ў вочы, што ён не кар'ерыст і на танныя падачкі не кідаецца. Ківайка як бы трохі сумеўся. Апраўдваючыся, прыкрыўся шчырасцю, якая нібыта, часам насуперак волі, выцягвае нават самае патаемнае з ягонай душы. Дроб не пабаяўся сказаць, што думае пра ягоную шчырасць, і гэта, відаць, зусім астудзіла Ківайку. Ён на якісьці час замаўчаў, адно шумна дыхаў, і з ягонага рота едка пахла цыгарэтным дымам. Потым стаў гаварыць спакойна, з паблажлівасцю да Паўла, адкрыта запабягаючы перад ім. Маўляў, не трэба тушавацца. Не дзеці ж, а дарослыя, разумныя людзі. Развялі анцімонію: кар'ера, кар'ерыст... Канечне, не ўсе ж такія, як Чарткоў, падхалімы, гатовыя сценку лобам прабіць, каб толькі заслужыць пахвалу. А навошта, спытацца, лезці, вылузвацца са скуры?

Ківайка, бачыў Павел, адступаў, згладжваў напал і спрэчку. Во якія, аказваецца, ягоныя прынцыпы. Не тое што Юрась Верхаводка. Столькі гадоў прайшло, а ён на сваім. І па-ранейшаму перажывае за Лабчанку. Паспрабуй перавярні ў ягонай душы што-небудзь. Хоць

яны, старыя людзі, і непрыкметныя ў жыцці, але цягавітыя, нязломныя. Жывуць, працуюць...

— Эх!..— уздыхнуўКівайка.— Позна ўжо, Павел, а то я б табе даказаў, што ты яшчэ... толькі не крыўдуй, зусім хлапчанё. Сталець табе трэба, брат!..— І шматзначна паляпаў па спіне.

Павел не адказаў. Сапраўды было позна. Вокны ў хаце патухлі ўжо. Толькі з кухні падала святло. Мусіць, яшчэ не спала Света. Чакала іх, каб напаіць чаем.

На душы ў Паўла стала маркотна, хацелася застацца аднаму. Тое, што ён пачуў, ведаў, будзе доўга непакоіць. А покуль яно было няпэўнае: і верылася, і не верылася. Гэта была першая размова зКівайкам на такой ноце. Навошта ён,Ківайка, павёў яе? Нешта крышылася і пратэставала ў Паўлавай душы. Што іменна, покуль не ведаў. Адчуваў: калі не забудзе, працаваць з ранейшаю заўзятасцю ён не зможа. Не тое што не зможа. Проста яму будзе нецікава, нават абразліва працаваць, носячы ў галаве думку, што ў ягоны шчырасці сумняваюцца. Не, лепш усё гэта забыць. Зрабіць скідку на тое, штоКівайка быў п'яны, і забыць. Яно, мусіць, і праўда: выпіў чалавек, дык і набалбатаў абы-чаго, а заўтра сам будзе не рады.

14

У ранішняй сумятні, яшчэ сонца слабое, кідалася ў вочы, што людзі неслі з сабою клуначкі, сеткі, сумкі, а мужчыны проста ішлі з адтапыранымі кішэнямі. Твары ва ўсіх былі светлыя, святочна ўзрушаныя.

На суботнік не прыйшоў адзін Касцяніцын. Пазваніла з паліклінікі ягоная жонка і сказала: «Захварэў малы, Ігар застаўся з ім».

Сонца расшчодрылася на ласку і цяпло. Бялела, падсыхаючы, леташняя трава, і ў ёй бездапаможна вяла блыталіся маладыя парасткі. На дарожках хрупалі пад нагамі цёмныя круцялькі зямлі, якую выкінулі напаверх дажджавыя чарвякі. Паветра дрыжала, і ўсё, на што глядзеў, здавалася чыстым, зварушліва-маладым.

Ківайка быў у новым шарсцяным трыко, са старых чаравікаў вылазілі вязаныя шкарпэткі. Маленькай турысцкай сякеркаю ён высякаў у кусце бэзу атожылкі.

Густая чорная кэсма, што выбілася з-пад капелюша, закрывала правае вока. Капялюш, заплямлены белаю фарбаю, ляжаў сваімі акрайкамі на вушах.

Павел выграбаў з-пад штакетніка счарнелае лісце, патрушчанае бадыллё лебяды, шэрую паперу, якую прыбіў вецер. Ад грабель на зямлі заставаліся чорныя пісягі. Як на полі пасля сеялкі.

Павел у сіняй балоневай куртцы і джынсах. Ужо цёпла, і ён без шапкі. Вецер забаўляўся з валасамі. То кідаў іх, светла-русыя, як лён, на лоб, то захмыльваў назад, то, як далонню, прылізваў набок, і тады праз усю галаву бялеўся роўны шнурок.

Ківайка гукнуў Брэшку, які насіў з Аднамахам торф пад клумбу. Зрэшты, не зусім торф, а жужаль, што засталася пасля брыкету, які за зіму спалілі ў грубках. Папрасіў яго раскласці агонь, каб паліць смецце. Ківайка і сам курыць, але ўпікнуць заўсёды стараецца Брэшку і даручае рабіць яму ўсё тое, на што патрэбны запалкі.

Выпуклыя шэрыя Брэшкавы вочы ліхаманкава блішчэлі і яшчэ больш адцянялі пад сабой цёмныя, аж рудавата-зялёныя, глыбокія кругі.

Брэшка кінуў насілкі — уверх завіхурыў руды пыл. Любка Мялова, карэспандэнт з аддзела Брэшкі, зажмурылася. У шэрым кароценькім палітончыку, нізенькая, з круглымі рудымі вочкамі і тонкім носам, яна была падобна на восеньскую адкормленую курапатку. Любка непрыязна глядзела на Брэшку. Усе жанчыны ставіліся да яго з пагардаю. Бадай адна Света была ласкавая да яго. Брэшка гэта адчуваў і дзе толькі можна хваліў машыністку. Але ягоная пахвальба Свету бянтэжыла, а не радавала.

Сярожка, пяцігадовы Аднамахаў сын, перастаў падаваць Любцы палавінкі пазелянелых цаглін, якімі яна абкладала краі клумбы, і таксама ўставіўся на Брэшку.

— Што, замест Сідаравіча абаронцам бярэшся? — пасміхнуўся Брэшка з Сярожкі, але ўпікнуў гэтым Любку, маючы на ўвазе іх з Чартковым патаемнае каханне. Чарткова, як і Аднамаха, усе называлі толькі імем па бацьку.

Дзіўны гэты хлопчык, Сярожка: прасветлены — ну проста льдзінка! — тварык з рабенькім, як ластаўчына яйка, носам і шустрымі вачыма. Сярожка схіліў да пляча галаву — какетнічаў.

Любка, хмыкнуўшы, адвярнулася. Пачала ўплішчваць у зямлю палавінку цагліны. Брэшка паляпаў, акурат дошкамі, далонню аб далонь. Падышоў да Паўла. Спытаў, як справы, адно дзеля таго, каб зачапіць. Нахіліўся над кучаю смецця, пачаў выбіраць сухія паперыны.

— Толькі па-ўдарнаму! — з лёгкасцю ў голасе сказаў Павел і глянуў у бок клумбы. Брэшка, міргнуўшы, усміхнуўся. Пацікавіўся, дзе Чарткоў,— Любка месца не знаходзіць.

— Выклапатаў у шэфа дазвол, каб адбыць у распараджэнне райкома партыі.

Брэшка хітнуў галавою, паварочваючыся да Івайкі, які набліжаўся да іх. Івайка, падышоўшы, кінуў вастрыём у зямлю сякеру. Папрасіў у Брэшкі закурыць. Доўга качаў у пальцах «прыміну». Прыкурваючы, мала не схаваў свой твар у Брэшкавых далонях, складзеных прыгаршчамі.

— Толькі вунь там далей распальвай агонь, а то дыму наробіш,— сказаў Івайка Брэшку і махнуў рукою на далёкі кут агароджы — з цыгарэты вылецела іскрынка і перад самай зямлёю згасла. Брэшка, трымаючы ў руцэ скамечаную паперу, пасунуўся, куды паказаў рэдактар. Абцасы чаравікаў шкрэбалі па зямлі. Брэшка хадзіў, амаль не падымаючы ног. Так хадзіць яго прывучыла палуба.

— Ну, як настрой, Павел? — спытаў, падбадзёрваючы ўсмешкаю і сябе, і Дроба, Івайка. Прызнацца, успамін пра гаворку на ганку ў Верхаводкі ўсё яшчэ вярэдзіў душу, хоць назаўтра рэдактар чуўся вінаватым, адкрыта запабягаў перад Паўлам, ды прабачэння ўсё-ткі не папрасіў. Зрэшты, яно і не патрэбна Паўлу. Між ім і Івайкам ужо даўно афіцыйнасць была толькі вонкавая. Адзін на адзін яны паводзілі сябе проста, амаль нароўні, калі не лічыць зварот: «ты» і «вы».

Івайка і Павел апынуліся тут, у Глушаве, амаль адначасна, з розніцаю на месяц. Івайка, пасля Мінскай ВПШ, атрымаў месца Пятра Цімафеевіча, які вымушаны быў, нарэшце, пайсці на пенсію. Спачатку, як і Павел, Івайка жыў у гасцініцы. Яны разам хадзілі ў сталоўку, вечарам у кіно. І гэта зблізіла іх. І, відаць, не толькі гэта. Людзей зводзіць яшчэ і тое, што яны бачаць ці інтуітыўна адчуваюць у сваіх блізкіх адносінах карысць.

Ківайка пацёр вялікім пальцам шчаку, прыпадняў капялюш, хітнуў назад галавою, адкідваючы з лоба валасы, і зноў насадзіў капялюш.Ківайка чымсьці быў замаркочаны. Нават просценькі загад ён ніколі не аддаваў, папярэдне не пазваніўшы пракурору ці суддзі. Павел пасміхаўся з гэтага, але не асуджаў рэдактара. Самы малады рэдактар у вобласці, страхуецца. Але сам на ягоным месцы, думалася, такога не рабіў бы, хоць і ведаў, што той, хто не цэніць сваё самалюбства сам, не дае цаніць яго і астатнім.

Павел чакаў, што скажаКівайка. Глянуў — дзе Брэшка. Той стаяў на карачках, нізка схіліўшы галаву. Проста з-пад яго валіў дым, уздымаўся ўгору і там ужо, у гонкім галінні маладых тапаляў, раставаў без следу. Павел перавёў пагляд на клумбу. Света стаяла спінаю да яго. Вецер варушыў ейныя цёмныя валасы, выпушчаныя з-пад чырвонай вязанай шапачкі на плечы.

— Мне здаецца, Свету трэба адправіць у Ведравічы раней,— нарэшце сказаўКівайка.— На электрычцы. Тое-сёе няхай падрыхтуе... Як?

Света акурат павярнулася, і Павел кіўнуў галавою. Света страпянулася, і, покуль ішла, Павел глядзеў ёй у вочы. Яна падышла, трымаючы растапыраныя, у пяску, рукі наводдалі.

— Фёдар Андрэевіч кажа, каб ты на электрычцы раней пад'ехала да дзядзькі,— сказаў Павел.Ківайка стаяў і калупаў наском чаравіка смецце. Па-кацінаму прыжмуранымі вачыма сачыў за Светаю. Ягоныя маленькія вусны шчыльна скаліся і былі падобныя на шырокую птушанячую дзюбку.

— Во добра! — узрадавалася Света.— Хоць у хаце прыбяру...

— Значыць, дамовіліся, так, Света? —Ківайка стрымліваў радасную ўсмешку.— Адпускаю цябе раней з суботніка.

— Яшчэ трошкі падсоблю Любе...

— Ну, глядзі сама,— дазволіўКівайка.

Яны разышліся. Павел узяў прыстаўленыя да штакетніка граблі. Ад цяпла, што ішло зверху на зямлю, казытліва было нагам, абутым у скураныя, на «маланцы», боты. Карцела разуцца. Павел уявіў, як адчуў бы голымі падэшвамі сухія травінкі, каменьчыкі, грудкі зямлі. Аж заныла сэрца. А малы, помніцца, хадзіў босы па лесе, па сухіх раструшчаных шышках. Рудая

ігліца падміналася, як мяккая шэрстка, мякчэйшая за цяперашнія дываны.

Як жа хутка бяжыць час!.. Памяць страчвае багата чаго, ды вечным застаецца ў ёй каструбаватая паверхня планеты Дзяцінства, вакол якой бясконца кружыць маленькі спадарожнічак — чалавечае Сэрца.

Павел глянуў на неба: вочы хацелі прастору. Жоўтая кара на таполях слюдзяна льснілася і, здавалася, набліжала сонца. Тонкія галіны далікатна падпіралі чысты блакіт, на якім толькі дзе-нідзе выступалі белыя нерухомыя воблачкі. Чалавек на зямлі вечны. Бо тое, што трэба табе, камусьці трэба будзе і пасля цябе. А потым — яшчэ камусьці... Вясна была для Паўла заўсёды шчаслівай парою трывожных роздумаў і незразумелых пачуццяў.

Да Паўла падбег Сярожка. Павітаўся ў другі раз. Зморшчыўшы рабенькі нос, спытаў:

— Можна мне смецце ў касцёр насіць?

Павел абапёрся на граблі, усмешліва міргнуў:

— А перш скажы, хто касцёр распаліў?

— Брэшка.— Сярожка называў усіх так, як, чуў, называлі дарослыя.

— А клумбу хто робіць?

Сярожка замігаў белымі вейкамі, зачапіў адзін за адзін указальныя пальцы і захітаўся ў бакі.

— Света і Любка...

— Твае нявесты?

— Так...

— От гэта голас! — Павел ляпнуў хлопчыка па плячы.— І яшчэ скажы: хто вунь з рыдлёўкаю стаіць?

— Тата мой.

— А сякерай махае? — паказаў наКівайку.

— Райком.

— Хто-хто?

— Райком,— цвёрда сказаў Сярожка.

— Які райком? — ужо смяяўся Павел, зразумеўшы, што «райком» для Сярожкі азначае «начальнік».

— Наш.

— Ну, раз ты ўсё ведаеш — бяры смецце і насі ў касцёр.

Як і меркаваўКівайка, абшар вакол рэдакцыі падчысцілі за паўдня. Сіратліва віўся з кастра касмыль дыму.

Вокны ў рэдакцыі аж зіхацелі, як тонкі першалёд.

Пастаралася Піліпаўна, прыбіральшчыца. Яна, у вылінялым халаце, стаяла цяпер разам з усімі, чакала адКівайкі каманду. Піліпаўне было крыху больш пяцідзесяці, ды яна выглядала на старэйшую. Маршчыністыя шчокі і лоб рабілі твар маленькім, без пары звялым. Вочы былі б цьмяныя, калі б не прабівалася са зрэнак незразумелая, загадкавая насцярожанасць — прыкмета ці прымхлівага, ці недаверлівага чалавека.

— Папрацавалі мы добра,— бадзёрым голасам сказаўКівайка.— Можна разыходзіцца. Толькі, просьба: покуль не лазіць па вуліцах і не мазоліць людзям вочы.

Павел глянуў на Любку Мялову. Яна стаяла зажураная і ціхая — ніякай радасці. Не было побач Чарткова. З іх адносін ужо смяяліся. Кроку адно без аднаго не могуць ступіць, а што ў іх каханне — адмаўляюць. Тое, што ўтойваецца, заўсёды выклікае цікавасць. Усе, хто мог, чапіліся да Любкі і Чарткова. Чарткоў спакойна ўсміхаўся, аднаго разу, падагрэты Касцяніцыным, сказаў: «Калі і жанюся на Мяловай, то гэта будзе чыстая выпадковасць». Аднамах тады пажартаваў: «Сідаравіч жэніцца толькі пасля таго, як выберацца з раёнкі».

Брэшка і Аднамах стаялі крыху воддаль і перашэпталіся.

— Ну што, Брэшка, гайда дахаты! — гучна сказаў Павел да Брэшкі. Той лыпнуў вачыма, зірнуў на Аднамаха і прамямліў:

— Не, Павел, не пайду... Мне яшчэ трэба... у адно месца.

Павел не сумняваўся, што Брэшка з Аднамахам замышляюць выпіўку. Але адгаворваць Брэшку не стаў. Ведаў, дарэмная трата часу. А ён, Павел, спяшаўся. Пайшоў дахаты адзін. Як толькі пераступіў парог, Тэрэза тут жа спытала, дзе Іван, і, не чакаючы адказу, задундзела, як муха, сваім піскліва-пявучым голасам:

— Вечна як нелюдзь!.. Зноў прыцягнецца на рагах. Што за чалавек, папытаць бы ў яго? Не можа і дня без гэтае гадасці! Во-ё-ёй!.. Каб ім рукі паадсыхалі, хто яе выпускае, атруту...

Павел ужо сотню разоў чуў гэтую «песню» Брэшкавай жонкі. І заўсёды дзівіўся з яе. Здаецца, пасля такой кляцьбы яна павінна была б закляваць свайго мужа. Дык не ж: іншы раз буркне на яго, а то і зусім прамаўчыць. На людзях ніколі не абурыцца на Івана, адно

махне рукою ды ўсміхнецца. Невыразна, неяк асуджана. І ў бляклых вачах ейных тады столькі абыякавасці і, здаецца, тугі. Жанчыны не разумелі яе, Тэрэзу.

Пажаніліся яны з Брэшкам не зусім звычайна. Тры гады назад. Яна тады працавала загадчыцаю клуба ў вёсцы, дзе жыў Брэшка. Ён служыў на флоце. На другім годзе службы яму далі дзесяцідзённы водпуск. Ссумаваўшыся на палубе па дзяўчатах, ён не пагрэбаваў нават сухарлявай, старэйшай за сябе Тэрэзаю. Яна, прачуўшы, што прыехаў Іван, зайшла вечарам да яго-най маці, з якой ужо зналася, нібыта пазычыць нітак. На Балтыку Брэшка паехаў патэнцыяльным бацькам.

Цяпер Брэшкі мелі дачку Аксану. Жылі на прыватнай кватэры. Гаспадыня, удава, выправіўшы дзяцей у свет, выйшла замуж за адстаўніка і перайшла да яго жыць у кааператыўную кватэру, з якой яшчэ не выветрыўся дух былой гаспадыні. Не прайшло і паўгода, як яна памерла. Кажуць, гэты адстаўнік, калі хаваў сваю жонку, не сядзеў разам з дзецьмі і родзічамі каля труны, а ішоў следам за машынаю ў натоўпе.

# Частка другая

## КРУШЭННЕ

*Улада заключаецца ў тым,*
*каб прыносіць боль і прыніжаць.*

Д. АРУЭЛ

### 1

На перакрыжаванні яны развярнуліся і сталі блізенька да кювета. Сядзелі ў машыне, а то вылазілі з яе і ўсё кідалі позіркі на шашу. Была субота, і машын ішло зусім мала — адна, другая... Ківайка вельмі хваляваўся. Выкалупваў з пачка цыгарэту за цыгарэтаю і, высока ўзмахваючы рукою, шпурляў доўгія недакуркі ў гразь.

— Можа, не прыедуць? — усумніўся Павел і тут жа пашкадаваў, бо Ківайка нахмурыўся і сказаў зласнавата:

— Ды ну, ты што, Павел!..

Далёка ўперадзе зачарнелася кропка, абрысы якой памалу раслі і выразней праяўляліся, аж покуль не стала відаць, што ляціць чорная «Волга».Ківайка затупаў на месцы, пыхкаючы густым дымам. Спяшаўся дакурыць цыгарэту. Не даязджаючы метраў сто, «Волга» ўключыла падфарнікі, развеяўшы апошняе каліва сумнення, што лядком стыла на душы ўКівайкі. «Яны!..» Кінуў недакурак сабе пад ногі, паправіў капялюш. Вочы нервова свідравалі «Волгу», якая, аб'ехаўшы «ўазік», спынілася воддаль. Дзверцы доўга не адчыняліся, і нават праз заляпанае граззю задняе акно было відаць, што людзі ў ёй не варушацца, прынамсі, не спяшаюцца вылазіць.

Ківайка ўподбег патрухаў да «Волгі». Павел, чамусьці аглянуўшыся, пайшоў следам. Нарэшце дзверцы ў «Волзе» адскочылі — адны, пярэднія, тады другія. З іх вылезлі тры мужчыны, апранутыя цёпла, мала не па-зімоваму. У брызентавыя, з каўнярамі курткі, з вушанкамі на галаве і ў высокіх паляўнічых ботах. Адзін з іх, бадай, самы тоўсты і мажны — з расшпіленай курткі выпінаўся абцягнуты вязаным світэрам жывот — вылучыўся наперад, усе астатнія ўгодліва заступілі за ягоную спіну, і абыякава падаўКівайку руку:

— Буры,— потым гэтак жа бязвольна пацiснуў руку Паўлу. Павел назваў сваё імя.

— А прозвішча? — нечакана зацікавіўся Буры.

— Дроб.

— Ты выпадкова не родзіч...— назваў аднаго даволі ўплывовага чалавека, які жыў і працаваў у Мінску.

— Не... Ва ўсякім выпадку, не раднімся.

Тады ўжо з-за спіны Бурага вынырнула, як рыбіна з-за карча, рука другога мужчыны — сівагаловага, з вугальна-чорнымі бровамі і маладым прыгожым носам. Трэці, у акулярах, зацягнутых бэзавай смугою, акінуў Паўла позіркам надзіва маленькіх шэрых вочак, напомніўшы тонкім галаском і старой заячай шапкаю, неахайна збітай на макаўку, Георгія Віцына. Назваў прозвішча — Хашчаў.

Ківайка глядзеў на «Волгу». Там сядзелі яшчэ два чалавекі: за рулём шафёр, а бледнатвары, з глыбокімі залысінамі ў светлых кучаравых валасах мужчына корпаўся ззаду ў зялёным рыбацкім куфэрку. Нарэшце ён вылез. Яго рудаватыя адкрытыя вочы часта міргалі, а поўныя вусны расцягнуліся ў мяккай усмешцы.

— Грынбер.— І голас у яго быў даверлівы, якісьці цёплы. «Чалавек з такімі вачыма, усмешкаю і голасам павінен быць добры і таварыскі»,— падумаў Павел. І чуццё яго не падвяло. Грынбер сеў з імі ва «ўазік». А калі машыны крануліся, пачаў шчыра і па-вясковаму проста распавядаць, хто яны такія. Сябе назваў апошнім — неяк хуценька, украдкаю, акурат баючыся затрымаць надоўга чужую ўвагу. З ягоных слоў, службовая іерархія гасцей змуравана з такіх прыступак: Буры — начальнік упраўлення, усе астатнія — Хашчаў, ён, Грынбер, і Гаспадзёнак — так было прозвішча сівагаловага, з вугальна-чорнымі бровамі — адпаведна галоўны інжынер, бухгалтар і брыгадзір паліграфкамбіната; Міша — асабісты шафёр Бурага.

— А мы едзем і разважаем, ці будзеце вы нас чакаць? — моцна трымаючыся за скабу на панелі, наіўна і радасна адначасна гучаў голас у Грынбера. Дарога была ўхабістая, і «ўазік» кідала ў бакі. Ківайка ўзлёгся на руль, і засяроджанасць у ягоных вачах ды на вуснах зусім не хавала турботы: дарога дарогаю, але столькі гасцей не чакалі. Як спахапіўся:

— Ну-у, сказалі, Буры пазваніў — і не сустрэць.

— Хашчаў і Гаспадзёнак пасля ўжо далучыліся,— растлумачыў Грынбер, жмурачы свае рудаватыя вочы.— І яшчэ адзін... ужо начальнік над намі, Кацюба ягонае прозвішча, хацеў ехаць, ды ў яго дачка двойню нарадзіла...

«Волга» ззаду засігналіла, прарэзліва і зычна. Ківайка спыніў «уазік», з-пад якога ў адчыненыя дзверцы павалiла пара. Вылез і Павел з Грынберам. У «Волгі» шалёна круцілася левае пярэдняе кола і кідала далёка на чорнае леташняе ржышча рэдкую жоўтую калатушу, якая блішчала там, як перавернутыя казлякі.

— Засела! Вось табе і шафёр-ас,— таемна пасміхнуўся сам сабе Грынбер.

З «Волгі» ніхто не вылез, мусіць, пабаяліся лужыны, ці што. Утрох пачалі штурхаць машыну, упіраючыся рукамі ў бакавіны кузава. Па тым, як яна разгойдвалася, Павел зразумеў, што шафёр сапраўды ас, і насмешка Грынбера нясе ў сабе якісьці іншы, іранічны, сэнс. Абляпаўшы іх з ног да галавы брыдкай ліпучай калатушаю, «Волга» вырвалася з калдобіны, крутнуўшы задняй, багажнай часткаю. Буры адпіхнуў вонкі дзверцы і, усміхнуўшыся, падміргнуў:

— Шафёр-ас, машына-звер — не засядзіма цяпер! — У яго былі буйныя шчыльныя зубы з няпэўным, гарчычнага колеру налётам. Цяпер Павел зразумеў іронію Грынбера.

Спыніліся машыны каля самай хаты, з'ехаўшы з высокай дарогі-сыпанкі на лажкі. Першыя вылезлі з «уазіка» Ківайка і Павел, паказваючы, што ім усё тут знаёмае і прывычнае.

— Ну, вось тут і асядзем! — Ківайка махнуў рукою на хату.

— Тут, так? — абыякава павярнуў галаву Буры, бо неяк трэба было паказаць, што ён мае цікавасць да месца, дзе іх чакае прытулішча, і не такі ўжо ён ганарысты па натуры чалавек.

Астатнія ажыўлена, як цівіняты з кубла, высыпалі з машыны. Хашчаў адчыніў багажнік, і яны пачалі хапатліва вымаць рыбацкае начынне: сачкі, складзеныя ў некалькі столак бамбукавыя вудзільны, бляшаначкі з прынадаю. Напускалі на сябе заклапочанасць і спешку, маўляў, заядлыя рыбакі і вельмі ссумаваліся па клёву. Нецярпліва ўглядаліся ў рэчку, быццам усё астатняе іх не цікавіць і не турбуе. Толькі тут было больш гульні, артыстызму, чым сапраўднага жадання хутчэй і першым закінуць вуду.

— Вось і наша Лабчанка, зусім пад бокам,— Ківайка рэзка крутнуўся, усім сабою паказваючы, дзе працякае рэчка.

— Добра, блізка... — ладкуючы ў зялёны куфэрак вузенькія дошчачкі з наматанаю на іх жылкаю, задаволена прамармытаў Грынбер.

Лабчанка блішчала сумным перадвячэрнім бляскам. Крыху ўбаку, уніз па цячэнні, горбілася жалезная рабрыстая спіна чыгуначнага моста-віядука. Вакол разлягаўся зелянкавы, пасля зімы яшчэ не пасвяжэлы луг, які ў снежныя зімы затапляўся вадою на многія вёрсты, аж да самай палоскі цёмнага, як узаранае зябліва, лесу. А на абалоні, між старым і новым рэчышчам, стаяла цяпер вада, якую здалёк можна было палічыць за самую рэчку. Калі спадала вада, у канаўках, лагчынах іямінах збіралася рыба, і людзі з навакольных вёсак вытоптвалі яе звычайнымі кашамі, таптухамі, венцярамі. А мінулай вясной здаравенны, фунтаў на дзесяць, шчупак зазяваўся і засеў у спадзінцы каля самай хаты Верхаводкі. І калі ўранні сонца прыгрэла яму шыро-

кую, у зялёных махорчыках водарасцей спіну, ён забушаваў хвастом па высокай асацэ, ды плысці ўжо не было па чым.

Цяпер браўся тут, на голым месцы, густы вецер і нёс з сабою тугаваты холад.Ківайка зашпіліў у паліто верхні гузік і, утуліўшы ў каўнер галаву, крануў за локаць Бурага.

— Можна вас, Сцяпан Данілавіч, на хвілінку?

Той глянуў зацікаўлена, але без прыкметнага здзіўлення.

— Калі ласка.

Ківайка адвёў Бурага ўбок.

— Такое дзела,— пачаў ён з непрыхаванаю радасцю, акурат уводзіў у змову, якая давала яму хоць маленькае права на блізкія кантакты з салідным госцем, і пачуццём асаблівага гонару, маўляў, усё прадугледзеў.— Як рыбу лепш прыгатаваць?

Такога пытання, мусіць, не чакаў нават Буры.

— Якую рыбу? — шчыра не зразумеў ён.

— На вячэру... Ёсць тут у нас налоўленая.

Буры плюснуў раз-другі, затраціўшы толькі гэтае імгненне на ацэнку сітуацыі, і быццам пра штосьці зусім-зусім нязначнае сказаў:

— Пасмажыць... Пасмажыць, ды і ўсё.— І паспяшаўся ўслед за сябрамі, акурат баяўся адстаць, хоць яны, паглядваючы на свайго шэфа, не вельмі рваліся да рэчкі, пасоўваліся спавольна, цеснай купкаю.

Павел падышоў даКівайкі.

— Ну што, Павел, пойдзем у хату,— сказаўКівайка, гледзячы на Паўла задуменнымі вачыма.— Што там ды як? Дадзім каманду.

— Ведаеце, Фёдар Андрэевіч, неяк няёмка, усё-ткі чужыя мы людзі, а тут такая капэла...

Ківайка разгублена ўтупіўся на Паўла, калупаючы наском бота свежы краціны копчык.

— Канешне, пяцярых... ды мы з табою, мужчын прыняць не вельмі проста. Але забывай на сумленне, калі начальства сустракаеш.

— Ды ён, вядома, супроць не будзе... дзядзька добры.

— Нічога-нічога!..— падбадзёрыў сябе і ПаўлаКівайка.— Калі што якое — заплоцім.

Павел цяпер адчуваў сябе хоць і скавана, але не настолькі, каб рабіць круты паварот: не, і ўсё. І вось

чаму. На сподзе душы жыло ў ім меркаванне, быццам ён вядзе гасцей як бы ўжо і да сябе. Была ў гэтым меркаванні тая самаўпэўненасць маладога чалавека, якую нараджае адчуванне, што ён — зяць, а таму і можа дазволіць сабе вольнасці. Мусіць, тут адыграў сваю ролю той спрадвечны, ужо, мабыць, застарэлы закон, быццам мужчына заўсёды робіць гонар жанчыне, калі жэніцца з ёю, і справа цешчы і ўсіх ейных сваякоў дагаджаць зяцю ва ўсім — як кажуць тут у Ведравічах, калыхаць у палотнах. Інакш ён можа адкінуцца ад іх. Бывае, што мужчыну жаніцьба гэтая ў людзі выводзіць, але ўсё роўна ён вымаўляе слова «цешча» так, быццам і сумнення не можа быць, што іменна ён — валадар. Павел не сумняваўся, што жэніцца са Светаю.

— Здрасьце! — пачуўся раптам голас. Яны, разгаманіўшыся, заклапочаныя, не заўважылі, як з хаты выйшла Света.— Заходзьце, Фёдар Андрэевіч... А што, Марыі Антонаўны няма?..

Івайка развёў рукамі, імкнучыся ўцяміць, чаму так устрывожылася Света.

— Вой-я-ёй!..— забедавала шчыра Света і ледзь не заплакала.— А як жа я адна? Я ж не ўмею нічога рабіць... Вой-ё-ёечкі! — У сваёй разгубленасці яна была падобна на бабульку, што згубіла вузельчык з грашыма, якія доўга збірала.— І дзядзюша яшчэ няма...

Света была ў караткаватым халаціку, ужо спалавелым і вынашаным, які пакідала ў дзядзькі Юрася з той пары, калі пачала дапамагаць яму па гаспадарцы. Вочы яе радасна свяціліся, у іх было затоенае чаканне сустрэчы з Паўлам.

— Яны што, зразу на рэчку? — спытала яна дрыготкім голасам.

— Так, пайшлі,— сказаў Ківайка і зіркнуў у бок рэчкі. Госці былі каля моста, на невысокім абрыўчыку, па абодва бакі якога размытымі плямамі цямнеліся лазовыя кусты, а за імі роўны пясчаны бераг.— Усё-ткі і я пайду з імі. Празнаю, як клёў... А вы тут покуль... Рыбу, не забудзьце, трэба пасмажыць. Дзядзька Юрась хутка вернецца?

— Во-во павінен,— сказала Света, як баючыся, каб не падумалі, быццам яна вінаватая ў тым, што няма дома дзядзькі Юрася, і прапанавала: — Дык, можа б, вы, Фёдар Андрэевіч, зайшлі спачатку ў хату?

— А не-не! — закруціў галавою Ківайка, выпрост-

ваючы прыстаўленыя адна да аднае маленькія далоні.— Кідаць іх адных нядобра. Ведаеш... Рыбу, Павел, пасмажыць,— зноў сказаў Паўлу, гледзячы на Свету.

«Не шкодзіла б і мне пабыць разам з усімі»,— падумаў Павел, але пакінуць Свету адну ён не мог. Застаўся стаяць разам з ёю пасярод прасторнага, рэдзенька запырсканага кволай зялёнаю муравою двара. Хату ставілі на новым месцы — на дзёран, які пратаптаўся да пяску толькі на дзвюх перакрыжаваных, як нажніцы, сцежачках: рэчка-вуліца, гарод-хлеў. Ад рэчкі двор адмяжоўваў новы дашчаны плот, за якім стаялі ўсцяж старыя вуллі, крытыя жоўтай бяростаю, скручанай па краях у трубачкі.

Павел узяў Свету за руку, і яны пайшлі, кранаючыся плячыма, у хату. Дарэмна Света плакалася, што не ўмее нічога рабіць. Яна так рухава і спрытна занялася кухоннай валтузнёю ды яшчэ ўмела далучыла Паўла, што неўзабаве ў печы сквірчэла на патэльнях рыба, а накрыўкі двух закураных чыгуноў прыпадніmаліся духмянай параю ад бульбы. Наразалася ў глыбокія талеркі ружаватае тонкае сала, роўным кружком раскладвалася на сподкі самаробная каўбаса. Белым пупырышчатым гарбячком выпіналася з вялізнай місы адцэджаная праз друшлаг сыракваша, прызначаная на тварог.

Яны так заняліся, што не пачулі, як у хату пераступіла жанчына. Павел якраз, разрэзаўшы вялікую лілoвую цыбуліну на дзве часткі, дзівіўся, як проста на вачах пяшчотныя, светла-зялёныя зародкі парасткаў прагна выпіналіся на волю тугімі вільготнымі саскамі з малочнымі кропелькамі соку.

Жанчына нерухома стаяла каля парога. Яна была ў фуфайцы, з рукава якой тырчаў жоўты шматок ваты. Жанчына нерашуча павіталася і нейкі момант разгублена глядзела на Паўла, мусіць, дзівілася.

Света адказала ёй на прывітанне, назваўшы яе цёткай Маршаю. Павел здагадаўся, што гэта Марша Лапуцька. Жанчына так перахліпіста дыхала, што відаць было: збіраецца нешта сказаць, ды, разгубленая, не можа падабраць слоў.

— Ета я, Светачка, чула,— запінаючыся і зіркаючы на дзверы ў чыстую палову хаты, пачала яна,— што Наташа Мікрашэвічава дужа хворая... Убачыла, што

ты прыехала, дай, думаю, схаджу папытаю, ці праўда ета?..

Павел ужо ведаў, што Наташа захварэла на рэўматызм і ляжыць пад Мінскам у Бараўлянах. У пісьме да Светы, якое іскрылася гарэзнасцю і гумарам, не было і намёку на сум ці адчай, хоць і пісала Наташа зусім не пра тое, чаму можна радавацца: «Я рухаюся цяпер па алеі з хуткасцю субтрапічнай чарапахі». Паўла гэтая Наташына няшчаднасць да сябе не толькі здзіўляла. Яна так уражвала, што ён, прыгадваючы размову ў кабінеце Сарокінай, не знаходзіў сабе месца і ніяк не мог супакоіцца. Штосьці гняло яго, засмучала. Здаецца, зрабіў бы любы цуд на свеце, паверыў бы ў тых філіпінскіх хілераў-магаў, каб толькі Наташа выздаравела і ён зноў мог убачыць ейную бестурботную, іскрыстую ўсмешку. Праўда ці не, але Касцяніцын нашаптаў яму, што Наташа перажыла і асабістую трагедыю. Цяпер, убачыўшы разгубленую Маршу Лапуцьку, зразумеў, чаму яна непакоіцца за Наташу. Ейны сын Міцька быў віноўнік трагедыі дзяўчыны.

Наташа пазнаёмілася з Міцькам тут, у Ведравічах, куды прыехала са Светаю пазагарацць на Лабчанцы. Міцька толькі што вярнуўся з арміі. Яшчэ нідзе не працаваў. Модна апрануўшыся, фанабэрыста хадзіў па вёсцы, і ў ім мала хто пазнаваў таго смаркатага вісуса, што абтрасаў усе яблыні ў чужых садах і здратаваў не адну граду.

Міцька вылюднеў, як казала ўся вёска, у арміі. Ён служыў не абы-дзе, а ў самой Маскве, ды яшчэ ў камендатуры Крамля. Маючы за плячыма механізатарскае вучылішча, адпускаў на заправачнай гаручае. Хваліўся, што з генераламі быў мала не на «ты», часта запраўляў «Жыгулі» самой Але Пугачовай. Паказваў фотку, дзе ён стаіць у абдымку з Маргуновым. Гэтага было даволі, каб напусціць на сябе дымок таямнічасці і незвычайнасці. Рускае, хоць і скалечанае, вымаўленне таксама рабіла сваё. І Наташа пацягнулася да Міцькі. Ён магічны для дзяўчат, вось гэты таямнічы дымок незвычайнасці.

Міцькава маці, Марша Лапуцька, проста цвіла ад шчасця, што сын так хутка знайшоў сабе такую пазарную нявесту. Яна баялася, каб ён, бязбацькавіч, зноў, як і да арміі, не пайшоў піць і свавoліць. І Марша, як толькі магла, круцілася-бегала каля Наташы, умела

расстаўляючы перад ёю, наіўнай і даверлівай, цянёты. Міцька ўсміхаўся і шматзначна падміргваў. Неяк, змусіўшы Наташу добра выпіць, Марша пайшла начаваць да суседкі...

Задзірлівая і гордая, Наташа не пабаялася і пасля таго, што здарылася ў тую ноч, адкінуцца ад слінявага, з адкапыленай верхняй губою Міцькі. Хоць, ашуканая, шмат і горка плакала.

Марша Лапуцька стаяла, уталопіўшыся на Свету, і чакала адказу. Нервова бегалі ейныя вочы.

— Праўда...— ціха прамовіла Света.

— А што з ёю?

— Сэрца...

— Во божа!..— Марша перахрысцілася.— Маладая такая...

У акне мільгнула Юрасёва постаць. Марша страпянулася. Ківаючы галавою, падалася да дзвярэй.

— Божачка ж мой, божа!.. Такая маладая... Бедная дзевачка...— Так, шэпчучы сабе пад нос, і зачыніла дзверы.

Юрась быў у плашчы-брызентовіку з накінутым на галаву капюшонам, у гумавых ботах. Пах рыбаю і рыжай балотнай асакою. Паздароўкаўся за руку з Паўлам, спытаў, як даехалі, дзе госці. Відаць было, што ён рады новым людзям: не супіўся.

Ківайка тым часам бегаў ад рыбака да рыбака, але больш круціўся каля Бурага. Рэчка кіпела ад хваль, быстрая плынь падманліва тузала паплаўкі, вецер адносіў кручкі на бераг. Было чуваць, як рэзалі паветра гнуткія вудзільны і тоненька, бы камар, зныбела жылка. Рыбакі на вачах хмурнелі. Гэта бачыў Ківайка, і твар ягоны ў прыцемках бялеў, як мелованая папера. У Бурага зачапіўся за куст кручок. Ківайка тут жа рынуўся яго адчапляць. Саслізнуў з берага ў рэчку, набраў поўную халяву вады. Буры не паспачуваў яму, не пахваліў за такую самаахвярнасць. Прывык да ўгодніцтва ніжэйшых па чыну людзей. Аддудурыўшы тоўстую ніжнюю губу, далікатна паправіў на кручку чарвяка. Ківайка, баючыся застудзіцца, патупаў на месцы, аббег усіх рыбакоў. Грынбер трасянуў у руках вудзільна: «Трымайся!» Апынуўшыся зноў за спінаю ў Бурага, не вытрымаў, выціснуў з сябе:

— Мусіць, пайду я, га?.. Ацаню там сітуацыю.

Буры, прыкусіўшы кончык языка, махнуў вольнай рукою ў бок вёскі.

— Мы таксама хутка прымчымся,— пачуўКівайка, прабягаючы міма Грынбера, які, уторкнуўшы вудзільна ў бераг, паціраў ссінелыя рукі, хукаў на іх, быццам грэў у далонях птушанятка.

Ківайка ўскочыў у хату. Павітаўся з Юрасём і тупа ўпёрыўся на Паўла, які праціраў мокраю белаю хусцінкаю яблык. Ківайка сказаў з надрывам, спадзеючыся, што Павел супакоіць яго:

— Падобна, яны крэпенька пакрыўдзіліся на мяне...— Стаяў і лыпаў вачыма, быццам усё астатняе залежала ад таго, што і як скажа Павел.

— З-за чаго?

— Ды рыба... Якая тут рыба?.. Не ловіцца...

— Дык для іх жа не рыба галоўнае, а рэчка, улонне прыроды,— сказаў Павел, успомніўшы, як госці нястрымна рваліся да рэчкі.

— А сапраўды, не рыба,— у задуменні прамовіў Ківайка.— Але ж яны... па-мойму, злыя з-за рыбы.

Павел з палёгкаю ўздыхнуў. Дарэмна перажываў, што не пайшоў на рэчку разам з Ківайкам, думаючы, што той добра там пазнаёміцца з гасцямі, уб'ецца ім у ласку, а ён, Павел, міжволі адыдзе на задні план, і тады яму цяжка будзе ў малазнаёмай кампаніі. І не выкліча ён прыхільнасці, на якую заўсёды спадзяюцца людзі, воляю лёсу ці наўмысна зведзеныя з начальствам.

Юрась корпаўся каля загнета. У ягоных вачах трапяталі жывыя, як ікрынкі экзатычнай рыбы кеты, цяпельцы.

— Па совісці сказаць, якая тут рыба, ды яшчэ ў такое нянасце.

Ківайка тарганууся да Юрася. Застыў, чакаючы ад яго парады.

— Няхай уверацца лішні раз, што нарабілі...— Але не сказаў — хто, адвярнуўся, запоркаў чапялою ў печ.

Павел выцер ручнікам рукі, падышоў да шэфа.

— Ну мы ж не вінаваты... Самі выбіралі месца.

— Яны ж заначуюць? Ага...— павярнуўся да іх Юрась.— Тады заўтра з'ездзім на Сіняе возера. Можа, там...

Надзея, што з'явілася вось так нечакана, заўсёды кружыла Ківайку галаву адчуваннем радасці і адна-

часна боязі: не так усё проста. Ен, балазе, не маладзён, пацёрся ў жыцці, сярод людзей і ведаў, што любая дробязь не даруе, калі да яе ставяцца легкадумна, па логіцы няўдачнікаў і разявак: што не робіцца — усё да лепшага.

Неўзабаве забубнелі на двары галасы. Наўмысна гучна, каб чуваць было ў хаце. Юрась разам з Півайкам выпнуліся на двор. Буры, насуплены, доўга і ўважліва разглядаў Юрася. Потым, павітаўшыся, спытаў:

— Вы гаспадар будзеце? — У голасе прагучала паблажлівая нотка. Буры хацеў зняць ёю звычайную скаванасць простага чалавека, які сустракаецца з выбраннікамі, што акружаюць сябе арэолам загадкавасці. Хацеў зняць і паказаць: маўляў, і мы звычайныя людзі, гэта вам толькі здаецца, што мы недасягальныя, як багі.

— Так, я,— суха сказаў Юрась і кашлянуў.— Ну, як рыбка? — спытаў ужо лагодна, паказваючы, што пра рыбу ён гатовы размаўляць доўга.

— Кепска,— пацісяуў плячыма Буры. Ківайка пераступіў з нагі на нагу.

— Як у каго. У мяне, напрыклад...— Грынбер трымаў за хвост маленькага ярша.

— Не смяшы людзей! — Хашчаў хацеў выхапіць ярша, але Грынбер крута адвёў руку за спіну.

— Не дам сваё апраўданне перад жонкаю. Што зробіш, калі большая не ловіцца.

— На стале лепш лавіць,— зычліва засмяяўся Юрась, і ў яго заварушыліся на твары валасы.

— Ага-ага! — раптам ажывіўся Гаспадзёнак, які па-гаспадарску адкасваў халявы ботаў.

Буры яшчэ больш пасур'ёзнеў з твару. Гаспадзёнак, здаецца, пачынаў траціць стрыманасць. Нахабства дазволіць сабе покуль мог толькі ён, Буры. Для астатніх час яшчэ не прыйшоў. Так лічыў Буры, але напамінаць пра гэта ён не павінен.

— Яшчэ паспытаем шчасця на возеры,— сказаў Юрась.— Заўтра з раніцы.

— Во-во, гэта цікава! — Буры ажно адкінуў галаву назад.

Юрась вынес з сенцаў вядро летняй вады, якая курылася лёгкай параю, доўгі палатняны ручнік з вышытымі па канцах чырвонымі кружкамі, ружовы з вострымі кантамі брусок мыла.

— Мыйцеся,— сказаў і пайшоў зноў у сенцы, са спіны шырокі і збіты, як валун.

2

Госці паволі, не спяшаючыся, мыліся. Па тым, як весялелі галасы і ўсё часцей чуліся жарты, было відаць, што настрой у іх раўнее. Спачатку мыўся Буры. І кожны, чакаючы чаргі, лічыў за гонар паліць яму на рукі, потым шафёр Міша, за ім — усе астатнія.

У хату госці ўваліліся ўжо зусім бадзёрыя, рухавыя. Буры, скмеціўшы Свету, спытаў у Юрася:

— Дачка?

Той, запнуўшыся, адказаў:

— Па совісці сказаць, гэта пляменніца.— Света, бедная, так збянтэжылася, што пачырванела і схавала мокрыя рукі пад фартух.

Два ссунутыя тарцовымі краямі сталы, засланыя белымі абрусамі, стаялі ў чыстай палове хаты. На іх блішчала, чырванелася і бялела, зыходзіла пахамі вячэра. Ківайка, раптам спахапіўшыся, выскачыў з хаты. Чуваць было, як ляпнулі дзверцы «ўазіка». Вярнуўся ён з трыма бутэлькамі каньяку.

Юрась паставіў на стол даверху наліты графін.

— Славутая, так сказаць! — пацёр рукі Гаспадзёнак.— Чулі-чулі...— Ён гладка прычасаў свае сівыя валасы, яны тонка льсніліся жаўцізною ад святла лямпачкі.

За сталы селі дружна, без той замінкі, што зазвычай бывае перад бяседаю. Павел апынуўся між Ківайкам і Гаспадзёнкам. Света зусім не села, сказала, ёй трэба глядзець на кухні. Хашчаў доўга ўпрошваў яе сесці побач, сыпаў самыя вытанчаныя кампліменты, не падазраючы, што яны бянтэжылі Свету яшчэ больш.

Першыя чаркі налілі ўсім каньяком. Толькі Міша паставіў перад сабою вялікі корчык бруснічнага морсу, паверсе якога плавалі тонкая ружовая плёнка і яркачырвоныя шкарлупкі ад ягад.

Буры далікатна ўзяў чарку двума пальцамі і пачаў памалу цадзіць з яе. Хашчаў і Гаспадзёнак, п'ючы, скасіліся на яго. І ледзь ён адняў ад губ чарку, яны тут жа паставілі на стол свае — недапітыя роўна на столькі, на колькі не дапіў Буры. Грынбер зрабіў толькі

глыток. І калі Юрась, па праву гаспадара, паківаў галавою, ён шчыра пажаліўся, што ў яго хворая печань. І праўда, Грынбер браў есці не сала, не каўбасу, на якія налеглі астатнія, і нават не смажаную рыбу, а толькі тварог, смятану, мёд і свежыя яблыкі.

За трэцяй чаркаю госці ад каньяку адмовіліся, папрасілі «славутай». Самагонка была чыстая, як сляза, і, налітыя даверху, чаркі здаваліся пустымі.Ківайка стараўся не адставаць ад гасцей. А яны пілі надзіва стрымана і без таго мужчынскага азарту, што выплёскваецца ад адной толькі думкі пра багатую выпіўку.

Але пасля чацвёртай чаркі гасцей прарвала. Пачалася бязладная гамана. І цяпер ужо ніхто не глядзеў, хто і колькі п'е. Срабрыстая, як у ртутным тэрмометры, палосачка, што падзяляла графін на пусты і наліты, увачавідкі ніжэла: госці ўпадабалі самагонку. Гэта здзівіла Паўла, бо ён лічыў, што высокае начальства п'е толькі каньяк.

Госці быццам забыліся на гаспадароў. Крычалі. Распавядалі пра нешта сваё. Як хтосьці там, салідны, напіўшыся да чорцікаў, прывёз палюбоўніцу не да яе, а да сябе на кватэру і прадставіўся жонцы, як мацеры гэтай палюбоўніцы.

Кожны з намеснікаў стараўся дагадзіць Бураму. Мусіць, добра засвоілі, як гэта важна ў кампаніях вылучыць свайго начальніка, акружыць яго ўвагаю, каб ён сам адчуў, што яго паважаюць, не ставяць з сабою на адну нагу. Як ён скажа, так і будзе. Правільна ці няправільна, абмеркаванню не падлягае.

Юрась падняўся, схадзіў на кухню і хутка вярнуўся. Услед Света, разгубленая і мітуслівая, прынесла вялікую місу тушанай, падружоўленай у печы бульбы.

— А колькі вам гадоў, прабачце? — нахіліўся да Юрася Грынбер.

— Шэсцьдзесят два.

— Вай-вай! Маладым выглядаеце, хоць і барада... Сапраўдны палясоўшчык.

— Калі б ведаў, што будуць такія госці, то пабрыўся б,— засмяяўся Юрась, пагладжваючы бараду.

— Дык яшчэ не позна! — раптам усклікнуў Гаспадзёнак.— У мяне японская электрабрытва ёсць — калі ласка...

— А маю красату электрабрытва не возьме. Трэба касою.

Зарагатаў Хашчаў і, адчуўшы, што гаспадар разумее жарты, таямніча спытаў:

— А як наконт жанчын? — Ягоныя маленькія вочы за бэзавымі шкельцамі акуляраў блішчэлі сінімі, падобнымі на ягаду ядлоўцу, пацеркамі.

У Юрася апусціліся бровы і, раздваіўшыся, распасцерлася на грудзях барада.

— Ну тут... панятнае дзела.

Буры стрэльнуў вачыма на Хашчава.

— Ну тады я анекдоты,— Хашчаў выпрастаў плечы.

Буры падняў палец, і Хашчаў, хмыкнуўшы, кіўнуў галавою. Вытрымаўшы паўзу, сказаў:

— Добра, прыстойны раскажу. Спяшаецца адзін мужчына праз пожню, напрасткі, на аўтобус. А тут гаспадар. «Міл-чалавек,— пытаецца мужчына,— ці паспею я на сямігадзінны?» — «Калі ты сустрэнешся з маім быком, то паспееш на шасцігадзінны».

УКівайкі абшаснулася са стала рука, зачапіўшы чарку. Ён, покуль шнарыў па падлозе, спазніўся пасмяяцца і цяпер захоплена глядзеў у рот Хашчаву.

Павел трымаўся проста і незалежна, можа, як ніколі раней у падобных выпадках. Ён ні на што не спадзяваўся, і яго нічога, апроч гэтай рыбы, не звязвала з гасцямі. Нават патаемна. Але ён не мог не бачыць, як запабягаеКівайка. Успомнілася: «Калі сустракаеш начальства, забывай на сумленне». Хіба ж гэта правільна? Сумленне, яно ніколі не павінна пакідаць чалавека. Да канца, да самай смерці. Не, штосьціКівайка не тое ляпнуў. Няўжо чалавек — як рэчка: з дном і вадою? Яго нутро здрадлівае, як дно ў рэчцы: думаеш, роўна, а там — яма. Даверыўся — і ты ўжо ў ёй, у яме. Гэта страшна, нават у сне.

Юрась гукнуў Свету. Яна выглянула з кухні. У яе былі чырвоныя, як у лялькі, шчокі і распатлачаныя каля вушэй валасы.

— Чай сагрэўся? — спытаў Юрась.

— Ды не, яшчэ не закіпеў... У печы ўжо счахла,— апраўдвалася, сарамліва апускаючы вочы, Света. Яна, мусіць, дзьмула на вуголле.— Як у нас на газе — раздва і гатова.

— А што,у вас няма газпліты? — пацікавіўся Грынбер, тонка намазваючы на лусту батона тварог.

— З газам праблема, у нас толькі тром чалавекам

дазволілі — старшыням калгаса і сельсавета і лесніку.

Гаспадзёнак ікнуў і паставіў на стол поўную, як вока, чарку.

— Што? З газам праблема?.. І гэта гаворыце вы, седзячы... з намі...— Ён устроміў мутныя вочы на Бурага, але яны, здаецца, глядзелі на каго хочаш, толькі не на Бурага.— З намі!..— аж віскнуў, запнуўся, чакаючы слоў ад галоўнага. Буры быў надзіва цвярозы і спакойна-ўраўнаважаны, быццам толькі што сеў за стол.

— Мы сапраўды можам вам памагчы,— нарэшце сказаў Буры дзелавым голасам.

— А не, што вы! Навошта вам лішні клопат? — У Юрася пацямнелі пліты скул.— Па совісці сказаць, мне ён і не трэба. Аднаму... І печы хапае. Узімку жалезную печачку стаўлю... Не трэба.

— Ну глядзіце,— сказаў усё тым жа дзелавым голасам Буры,— мы слоў на вецер не кідаем.

— Во за гэта і вып'ем! — падняў чарку Гаспадзёнак.— Класічны тост! Як толькі ў вас, Сцяпан Данілавіч, яны атрымліваюцца, заўсёды дзіўлюся? — І, крута закіліўшы назад сівую галаву, перакуліў чарку ў рот. Нейкі момант гэтак сядзеў, і добра было відаць, што адтуліны ягоных вялікіх, па лапцю, вушэй зараслі чорнымі густымі валасамі.

— А ўсё-ткі, можа, няхай памогуць,— шапнуў Юрасю Півайка. Ён ведаў: калі ўстановяць пліту, уся падзяка будзе яму, Ківайку.

— Не-не,— Юрась прыкрыў шырокай далонню шчаку з таго боку, дзе сядзеў Ківайка.

Света прынесла ў ліповым сіце фарфоравыя кубкі і сподачкі. Пачала ставіць на стол. Хашчаў указальным пальцам, увенчаным тонкім бліскучым пазногцем, затрымаў ейную руку.

— Даруйце, красуня. Можна адно маленькае пытаннейка? Не хвалюйцеся, вельмі простае. Вы дзе вучыцеся?

Света збянтэжылася.

— Нідзе. Яшчэ нікуды не паступала. Толькі курсы машыністак скончыла.

— А хочаце вучыцца?

— Ну... я... Павел увесь час мне кажа, каб паступала...

— Павел? І правільна кажа. Хочаце ў педінстытут? У жніўні — вы студэнтка педінстытута!..

— Ой, што вы!.. Я ніколі туды не паступлю...— Света, каб унікнуць непрыемнае для яе гаворкі, пацягнулася рукою па кубак.

— Я бяру ўсё на сябе. Хашчаў — не хлапчанё!

— Ды я нават ніколі не думала туды паступаць. Хоць бы ў які захудалы тэхнікум паступіць.

— Вы надта сціплая, а я па вачах бачу, што ў вас незвычайна глыбокая і ўражлівая душа... Хашчаў — не хлапчанё!

— М-мне... адзін званок — і-і вы ў тэхналагічным...— У Гаспадзёнка пасля чаркі, выпітай залпам, ужо слаба варочаўся язык.— Я вам аб-бяцаю, мадонна... Так... Толькі згода!

— Хлопцы! Ай, ну хлопцы!..— спрабаваў уклініцца Грынбер і штосьці сказаць, але яму не давалі. Ягоны мяккі голас патанаў у шуме.

Света не ведала, каго слухаць. Павел бачыў гэта, перажываў за яе і, каб выручыць, сказаў:

— Свеце трэба падумаць... Сапраўды, тут, за сталом, бадай, не месца пра гэта гаварыць.

На ягоны голас ніхто не павярнуўся, толькі Хашчаў выразна, як вучань правіла, адрапартаваў:

— Дзелавыя размовы паспяхова вырашаюцца толькі за чаркаю. Хашчаў — не хлапчанё!

— Чакайце, калі ласка, я зараз чайнік прынясу.

— О-о... Чайнік... гэта добра. Я хачу піць.

Госці пілі чай, падліваючы ў яго каньяк.

Ад вечара было ўжо далёка і да раніцы — няблізка. Павел, падышоўшы да акна і адхінуўшы фіранку, не ўбачыў у цемры прыветліва-цёплых агеньчыкаў. Вёска спала. Толькі на небакраі хліпцела, як вада ў палонцы, кволая пляма святла, напамінаючы зарніцу. Нехта, мусіць, ехаў на матацыкле.

Юрась і Света рыхтавалі гасцям пасцель. Прынеслі з кладоўкі раскладушку, выпрасталі крэсла-ложак. Буры думаў, што будуць спаць дзе-небудзь у адрынцы на саломе, а тут — як панам. Ён быў усё такі ж цвярозы і непахісны, як і ўпачатку, адно лёгкі туманок у вачах сведчыў, што чалавек нямала выпіў.

Гаспадзёнак, трымаючыся рукою за сцяну, папрасіў Юрася, каб заўтра на цёмнай зары пабудзіў. Спрабаваў заспяваць: «Вох, не будзі мяне рана, мама...» Пасоўваючыся, лэпнуў рукою за фікус, хіснуўся і сеў на крэсла-ложак.

— А дзе вы будзеце спаць? — Вочкі ў Хашчава зусім расплыліся і зліліся са шкельцамі акуляраў. Ён паспрабаваў працерці іх голымі пальцамі, якімі толькі што разбіраў звяно са шчупака.

— Ды ў нас месца хапае! —Ківайка зноў не прамінуў казырнуць, што ўлада яго тут неабмежаваная.

Буры загадаў Мішу, які, раздзеўшыся да плавак, ужо ўкладваўся на раскладушку, адвезціКівайку і Паўла. Там і заначаваць. А ранічкаю — назад. Шафёра такая каманда не засмуціла, а, падобна, узрадавала. Тонкія, дзявочыя бровы пацешна пераламаліся, бліснулі белыя зубы.

...Свеціна маці не спала. Яна была невысокага росту, рухавая, акуратна прычасаная і з вялікімі сінімі вачыма. Прапанавала вячэру, алеКівайка наадрэз адмовіўся. І Паўлу было шкада яе, ураз спахмурнелую і прыціхлую. Ён згадзіўся папіць халоднага малака. Павел глядзеў у вочы гаспадыні, сваёй будучай цешчы, а бачыў Свету. З думкаю пра Свету і пра іх са Светаю ён і лёг спаць. Ды яму не спалася. Амаль усю ноч. Думкі лезлі самыя неверагодныя, часам да таго жахлівыя, што ён адплюшчваў вочы і ляжаў. Чуў, як прагуў над хатаю самалёт. Потым бачыў у акне чырвоную міглівую кропку. Варочаўся і ўздыхаў побачКівайка. Мусіць, яго таксама не браў сон. Цікава, што турбуе яго?

Замгнуў толькі пасля паўночы, гадзіны якіх на дзве. УстаўКівайка і разбудзіў яго. Шумела ў галаве, быццам недзе каля вуха тоненька сыпаўся сухі пясок. Як за шпалераю, калі моцна стукнеш дзвярыма.

Сабраліся і паехалі. Сеялася рэдзенькая, як праз марлю, імжа, ліпла на лабавое шкло. Зацята махаліся гумавыя шчоткі. Неба, як за нейкую правіннасць, завала хмарамі. Няма ніводнай зоркі, і нават не відаць плямы ад месяца. Кусты паўз дарогу цямнеюць прывіднымі гурбамі і нагадваюць мядзведзяў, асабліва тыя, да якіх не дастаюць фары «ўазіка».

Ківайка курыў, глыбока ўдыхаючы дым,— перажываў, што кепскае надвор'е і што яны, мусіць, спазніліся. Госці ўжо даўно чакаюць іх. Міша маўчаў, адно таямніча пасміхаўся. Каб развесяліцца,Ківайка пачаў расказваць начны сон. Быццам злавіў ён у канаве жабу. Стаў выдзіраць з губы кручок, які тут жа апынуўся неяк пад яе скураю. Ён чыкнуў па скуры нажычкам — і кручок вылузнуўся. Глянуў — жаба ляжыць ужо да-

гары лапкамі. Жывот у яе распораты, і там розныя вінцікі, шпунцікі, кавалачкі пластмасы... Наглытала, значыць. І здаецца яму, што ва ўсім гэтым павінны быць і залатыя рэчы. І ён шукае яго, золата, корпаецца...

— Дзіўна!..— сказаў Павел, абы не маўчаць. Яго кволіла ў сон.

Ківайка дарэмна турбаваўся. Госці яшчэ спалі. У чыстай палове хаты не было святла. Юрась паліў у печы. Света, накрыўшыся з галавою, спала ў прыдзелку на тапчане, каля ножкі якога бялеўся недакурак. З-пад коўдры тырчала толькі пасма ейных цёмных кучаравістых валасоў.

Нарэшце хтосьці ў чыстай палове хаты гучна крэкнуў. Цупнулі на падлогу босыя ногі. У кухню зайшоў Буры. Вочы ў яго прыкметна падпухлі. Ён зачэрпнуў корчыкам з вядра вады і папіў.

— Вы ўжо тут? — сказаў даКівайкі.— Як на вуліцы?

— Не клімаціць,— адказаўКівайка, гатовы ўзяць на сябе ўсю віну за дрэннае надвор'е.

— Не шанцуе нам,— спакойна, ані не засмуціўшыся, сказаў Буры, чухаючы праз кашулю грудзіну. Завярнуў зноў у чыстую палову хаты. Пачаў будзіць сяброў. Тыя, відаць, неахвотна ўставалі. Буры дакараў іх: — Эх, вы, рыбакі! З вамі толькі мышэй лавіць.

Госці не спяшаліся. Уздыхалі, соваліся па хаце, шукаючы адзенне, цыгарэты, электрабрытву. Грынбер вытрас з пластмасавага патрончыка на далонь шэрую і круглую, як зернетка лубіну, таблетку і ўкінуў у рот. Буры з махровым ручніком на плячы падаўся на двор мыцца.

Хашчаў, прыкра-ліслівым голасам папрасіўшы ў Юрася запалкі, таксама шмыгнуў з хаты. Калі размінаўся ў дзвярах з Паўлам, хуценька апусціў вочы.

Устала Света, начакаўшы момант, калі ў прыдзелку нікога не было. У яе быў бледны твар і тоўстыя чырвоныя жылкі на вачах. Яна зусім не спала.

Снедалі моўчкі, адно Хашчаў вылузваўся і адурыў галаву сваім «Хашчаў — не хлапчанё!». Света нават не паказалася з кухні, была паніклая і спахмурнелая. Павел так і паехаў на возера, не зразумеўшы яе. Света ніколі не скардзілася і ва ўсім вінавацiла толькі сябе. Гэта быў чалавек надзіва бязлітасны да свайго сама-

любства. Здаецца, дай ёй беды ўсяго свету, і яна забярэ іх не задумваючыся.

Надвор'е ўвачавідкі псавалася. З нізкіх хмар густа сыпаўся дождж. Мацнелі парывы ветру, свістала ў шчыліну дзверцаў «уазіка». Юрась сядзеў пануры, з апушчанымі на вочы бровамі.

Сіняе возера разлілося шырока, як сцягнуць вокам. Процілеглага берага зусім не відаць, толькі ў ясны дзень ён гарбее пляскатым рудым боханам. Здавалася, возера нахілілася і зараз упадзе шквалам вады на галовы. Хашчаў, пацёршы пальцамі шкельцы акуляраў, углядаўся ўдалеч, жмурыў вочы і штосьці мармытаў пад нос. З ягонай курткі струменьчыкам цякла вада і трапляла ў халяву бота.

Юрась адчыніў дашчаны прадаўгаваты буданок, які нізка прылёг да зямлі. У ім захоўваліся лодкі, вёслы, маторы, усякае прыладдзе. У буданку гуляў вецер і кратаў на сценах каляровыя плакаты з намаляванымі на іх звярамі, птушкамі і рыбаю. Адзін плакат, расфарбаваны на сіняе, папярэджваў, што ў лодцы на возеры трэба захоўваць тэхніку бяспекі. Юрась, глянуўшы на яго, расказаў, як мінулым летам двое п'яных высокіх начальнікаў задумалі пакатацца і ледзь не патапіліся, перакуліўшы лодку. Пасасцягвалі, бултыхаючыся, адзін з аднаго трусы. І такіх, зусім голых, іх вывалаклі на бераг, дзе загаралі людзі. Пасмешышча было дык пасмешышча. Недарэкі селі хутчэй у «Волгу» — і ходу.

Юрась, узяўшы вёслы, адамкнуў дзве простыя лодкі. Маторнымі, як выявілася, ніхто не ўмеў кіраваць. Паказаў, як плысці на Круглы востраў. Там добра клююць ліні. Бяруцца, надта ў маі, і ляшчы.

Павел іКівайка селі ў лодку Бурага. Паплылі. Буры сам узяўся веславаць. Спачатку лодка круцілася на месцы, аж вірыла за кармою вада. Не хацела ўзяць роўны курс. Потым пайшла плаўна, хоць і павольна. Хашчаў надзіва добра ўпраўляўся з вёсламі, але трымаўся ззаду, не абганяў. Грынбер, нізка прысеўшы на дно, учапіўся аберуч за барты лодкі.

Ёсць бог на свеце — злітасціваіўся. Неба пачало яснець усё больш, ушчук дождж. І вецер нібыта перасціх.Ківаліся ледзь прыкметна выпетраныя за зіму лёгкія чараціны. Буры ажно крэкнуў ад асалоды і ўжо каторы раз сказаў:

— Нам рыба не трэба. Нам абы палавіць.

Прычалілі да берага, зыбкага ад вільгаці, зеленавата-сіняга ад глею. Распрасталі вудзільны. Рыба і праўда клявала. Але браліся часцей плоткі з незвычайна цёмнымі плаўнікамі і невялікія акунькі з чорнымі на спінах палосамі. Ляшчы і ліні, як назло, грэбавалі прынадаю.

— Дайце я вам, Сцяпан Данілавіч, чарвячка пачаплю, можа, я шчаслівы...—Ківайка спаймаў рукою жылку. Узяў з бляшанкі вяртлявага чарвячка і нанізаў на кручок. Папляваўшы на яго, адпусціў.— Лавіся, рыбка, малая і старая!..— Стаў пільна сачыць за паплаўком. Паплавок ляжаў спакойна, злёгку паднімаючы з хвалек то адзін, то другі канец.

— Ат!.. Гэта не рыба! — вылаяўся Буры. У яго, відаць, замлелі рукі ўвесь час трымаць вудзільна.— На, Павел, палаві ты...

Ззяблы, Павел нязграбна махнуў вудзільнам, і кручок зачапіўся за рукаў. Пругкі, каваны, з крута адхіленай зазубрынай, кручок не вымаўся.

— Мадэ ін Япан,— цмокнуў языком Буры і зняў з галавы шапку. Адвярнуў у ёй спераду брылёк. Там ляжаў сіні пакецік з кручкамі. Адлічыў з пяток і даў Паўлу. На памяць аб сустрэчы.

Павел узяў экзатычныя кручкі, мала думаючы, ці спатрэбяцца яны яму. Наўрад ці знойдзе мажлівасць вырвацца яшчэ калі на рыбу. Хіба што пад час адпачынку сходзіць з бацькам на Сож. Няхай будуць. Ён выдраў з блакнота аркушык, загарнуў у яго кручкі і сунуў у кішэню.

Павел злавіў некалькі яршоў. Іх нахабны клёў проста злаваў. І ў астатніх рыбакоў прапала ахвота вудзіць драбязу. Хашчаў скручваў у кольца гнуткі ракітавы пруцік, прадзяваў на палец і круціў. Забаўляўся, як дзіця. Гаспадзёнак сядзеў на засланай цэлафанам купіне і маркотнымі вачыма глядзеў на ваду. Нават Грынбер, па-старэчы схаваўшы рукі ў шырокіх рукавах сваёй курткі, кісла крывіўся і туліў у падняты каўнер галаву.

Ніхто не запярэчыў, калі Буры даў каманду зматваць вуды. Дажджу не было, але не было і сонца. У вадзе адбівалася шэрае неба. Каля самага берага бялела мёртвая, сухая асака з тонкімі рудымі хрыбцінкамі.

На беразе іх ужо чакаў Юрась. У жоўтым да пят плашчы-брызентовіку, дзе-нідзе заквэцаным граззю.

— Дык во, малечы трохі ж нацягалі! — як бы здзівіўся ён.

— Гэта не рыба! — за ўсіх адказаў Гаспадзёнак. Буры і Хашчаў прасунуліся міма моўчкі. Грынбер нёс пад пахаю вёслы з бліскучымі шпянямі ад уключын. Скура вакол яго рудаватых вачэй свяцілася ад холаду матавай жаўцізною.

Селі ў машыны. Нават скрозь гуд матораў быў чуваць сакавіты смех у «Волзе». Што так хутка развесяліла гасцей?

Павел здзівіўся, убачыўшы стол, зноў застаўлены міскамі і талеркамі. Пастаралася Света. Яна была ўсё такая ж зажураная, як і раніцаю. З глыбіні вялікіх разгубленых вачэй сачылася незразумелая пакута. Захварэла?

Скалелыя на дажджы і холадзе, госці без запросін абселі стол. Грынбер, як і за вячэраю, падсунуў да сябе тварог і мёд. Браў лыжачкаю мёд і тоненька паліваў яго на тварог. Шафёр папрасіў бруснічнага морсу.

Зноў пілі самагонку, потым каньяк. Гаварылі шмат тостаў, дзякавалі гаспадарам. За гасціннасць, за шчодрасць, за ласку... Як умелі яны гаварыць, высокія госці! Проста геніяльна! Душы вывяргалі цэлыя вулканы слоў, такіх ялейных, прыгожых, добрых, лагодных... З гэтых бы слоў душэўны бальзам рабіць.

Юрась у адказ адно ківаў валасатай галавою. Нават не глядзеў ужо на таго, хто гаварыў. Ну што тут скажаш, людзі як людзі. Жывыя людзі. Іх трэба толькі разумець і прымаць такімі, як ёсць. А што толку, калі ён, стары, цёмны чалавек, няшчасны і скалечаны, асудзіць іх? Дый якая справа яму да гэтых людзей? Ён глядзіць на іх не сваімі вачыма, а вачыма Ківайкі і Паўла, якія запрасілі іх і, відаць, хочуць ва ўсім дагадзіць. Вось і ён, Юрась, каб дагадзіць сваім, дагаджае ім, чужым людзям. Мусіць, зусім някепскім людзям, простым і неганарлівым, во ж, не адвярнуліся ад стала, п'юць, каму п'ецца, і не баяцца абнясламіцца. Не, гэтак могуць толькі шчырыя людзі. І дзякуюць шчыра. Спадабалася ім тут. Пасцель учора самы важны пахваліў. Самагонку ўпадабалі лепш за каньяк. І цяпер — вясёлыя. Дарма, што рыба не лавілася. Мусіць, і праўда яна не патрэбна ім, рыба гэтая. Адпачыць ім край важна на свежым паветры, атрэсціся ад гарадскога тлуму, мітусні. Сам як паедзе калі ў Магілёў, дык за паўдня так

абрыдне яму таўханіна на тратуарах ды ў падземных пераходах, у магазінах, што хоць гвалт крычы. А яны ўвесь час жывуць тамака.

ІКівайка вунь задаволены, вочы гарэць, як у ката. Павел толькі бязрадасны нейкі. І Света сумная. Ну, яна дык амаль заўсёды такая. А Павел якісьці незразумелы. Чаму незразумелы? Як быццам ён добра ведае Паўла. Разы два ці тры якіх і бачыў... Але, ціш-ка! Павел вунь збіраецца штосьці сказаць.Ківайка, той ужо багата за два дні нагаварыў. А Павел ці не першы раз.

— Я прапаную тост за тыя простыя адносіны, якія ўсталяваліся між намі, людзьмі розных узростаў, рангаў і званняў, за тую даверлівую атмасферу, якая панавала тут, у гэтым гасцінным доме... За шчырасць! — сказаў Павел, глытнуў са свае чаркі і сеў, крыху пачырванеўшы ў шчоках.

Госці запляскалі ў далоні. Грынбер сказаў:

— Добры, Андрэевіч, у цябе адказны сакратар.

— Дык недарма ж ён апынуўся тут, а не намеснік,—Ківайку спадабалася, што пахвалілі Паўла, і ён заззяў усмешкаю, быццам гэта пахвалілі яго, а не Паўла.— А як газета наша?

Грынбер адставіў вялікі палец.

Ну во!.. Не, не памыліўся ён, Юрась. Простыя яны, госці, людзі. І трымаюцца проста. Нават Павел сказаў пра гэта. Юрась так задумаўся, што і не прыкмеціў, як госці пачалі выбаўляцца з-за стала. Гаспадзёнак доўга аслабаняў нагу ад абруса, які абматаў калена.

Юрась дачакаўся, покуль госці, апрануўшыся, выйдуць у сенцы, і вынес з кладоўкі вялікую алюмініевую міску рыбы. Чырванаватым адсвечвалі бакі шырокіх ляшчоў, крута выгінаўся зялёнай спінаю, ашчэрыўшы ўтыканую вострымі іголкамі зяпу, шчупак.

Госці аслупянелі. Хашчаў сутаргава цёр пальцамі акуляры.

— Вось... Засталася, не пасмажылі ўсю,— сказаў Юрась.— Забірайце.

— Ну-у і Юрась Платонавіч!..— прыпомніў імя па бацьку Буры.— Вось гэта рыбак!

— У рыбарцелі папрасіў... для стала.

Буры прысеў каля міскі.

— Вось гэта голас! — Ён запусціў растапыраную, як краб, руку ў міску, намацаў самага вялікага ляшча, ды ён выслізваў, не даваўся.— Ну хадзі сюды, міленькі!..

Хадзі, галубчык. Парасёначак кілаграмы тры будзе, не менш.— Вочы ягоныя гарэлі зялёным спакуслівым агнём. Нарэшце Буры падчапіў ляшча за шчэлепы. І тады да міскі рэзка хітнуліся, як па камандзе, астатнія госці. Яны лавілі ў місцы рыбу, хапалі адзін аднаго за рукі, слізкія, бліскучыя ад лускі, штурхаліся. Гаспадзёнак не ўтрымаўся на кукішках, шлёпнуўся азадкам на падлогу, падпоўз на каленях і тыцнуў рукою ў міску. Нема завыў: пальцы лучылі ў шчупакову зяпу і прыліплі да зубоў, а хтосьці тузануў шчупака за хвост.

— Мой-й-й!..— зароў Гаспадзёнак, накрыўшы левай далонню шчупакову спіну.

Яшчэ імгненне — і ў місцы застаўся адзін невялікі падлешчык з выдаўленым на лоб вокам.

— Бярыце,— сказаў Юрась да Ківайкі, які таптаўся перад міскаю і стрэсваў з ботаў на падлогу гразь. Ен быў зусім бездапаможны ў вялікіх ботах, распатланы, з маленькімі чырвонымі рукамі.

— Што? — не зразумеў Ківайка. Невыразная, згубленая ўсмешка трапятала на ягоных бледных вуснах.

— Падлешчыка, кажу, бярыце.

— Куды? — Ківайка ці то напраўду не цяміў, ці прыкідваўся.

— Як куды? Дахаты, з сабою забірайце.

Ківайка ўкрадкаю бліснуў вачыма на гасцей. Яны кешкаліся са сваімі рыбінамі.

— Ну дзякуй! От парадую жонку... Дзякуй! — радаваўся ён, шчыра, як дзіця новай цаццы. І ледзь не скакаў, калі ў дарогу Юрась паставіў ва «ўазік» наладаваную сумку. Госці як быццам прапусцілі яе міма вачэй, але з ахвотаю згадзіліся, каб іх праводзілі, хоць Міша, шафёр-ас, вядома ж, дарогу запомніў.

Ужо едучы па шашы, яны звярнулі ў хвойнік. Паехалі па ім, покуль зацярушаная ігліцаю забытая дарога не прывяла іх да пянькоў. Вакол цямнелі леташнія цяплішчы, блішчала з травы зялёнымі вочкамі бітае шкло і валяліся пагнутыя ржавыя бляшанкі.

На самы тоўсты пень выставілі з сумкі дзве бутэлькі, заткнутыя наспех газетнымі коркамі, слоік з напіханымі ў яго салёнымі гуркамі і місачку з тварагом.

— О, гэта маё! — усклікнуў адразу, убачыўшы тварог, Грынбер.

Пілі толькі госці. Буры, як і ўчора, як і сёння, быў трывалы на нагах. Гаспадзёнак, бедны, не мог стаяць,

сядзеў на голай зямлі; потым ужо ляжаў, мёртва абвіўшыся вакол пня, толькі рука з чаркаю цягнулася, як галава кобры, уверх. У «Волгу» яго занеслі.

На развітанне госці праслязіліся.

## 3

У Глушава Ківайка і Павел ехалі моўчкі. Манатонна і млява, як стомлены чмель, гуў матор. Злёгку патрэсвала. Павел адчуваў, як прытупляецца свядомасць. Жыгалі, размінаючыся, машыны. Толькі яны парушалі дрымоту. І Павел аж здрыгануўся, калі Ківайка ўсклікнуў:

— Глядзі! Глядзі-глядзі!..

Дарогу перабягала ліса. Рыжы распушаны, якісьці паветрана-лёгкі, замільгаў між бяроз хвост. Колькі імгненняў ён агністым полымем трапятаў у Паўлавых вачах.

— Ліса...— ужо спакойна сказаў Ківайка і, зварухнуўшы так маўчанку, спытаў: — Ну як табе госці? Ад газеты нашай, бачыш, у захапленні.

Павел перабіраў у памяці пражытае за гэтыя два дні. Што ён мог сказаць цяпер, адразу? Не дзіва і памыліцца. Ён, помніцца, з самага пачатку быў абыякавы да гасцей. А пасля сустрэчы? Штосьці ўсё-ткі з'явілася ў душы.

Не, відавочнай пагарды ці прыязнасці ў яго да гасцей не было. Непакоіла Света. Яна з самай раніцы была якаясьці загадкавая. Не сказала — чаму. А калі б сказала?.. Не, пра гэта яна ніколі не раскажа. Хашчаў амаль усю ноч прабалбатаў каля яе, седзячы на канапе з цыгарэтаю. Клаў руку на коўдру, пад якой яна, сцяўшыся, ляжала, і ўгаворваў паступаць у педінстытут. Нахабна намякаў на сваю прыхільнасць да прыгожых маладых дзяўчат.

Павел не ведаў усяго гэтага.

— Ну дык як табе начальства, нешта ты маўчыш? — бліснуў вачыма Ківайка.

— Начальства як начальства,— сказаў Павел такім тонам, каб было відаць, што ў яго няма жадання размаўляць на гэты лад. Людзі, якія зразумелі, што яны патрэбныя і без іх не абысціся, могуць тады-сяды дазволіць сабе нахабства з тым, ад каго залежаць. Павел,

праўда, мала думаў, нахабны ён ці проста стрыманы да плётак.

Пад'язджаючы да Глушава,Ківайка прапанаваў:

— Давай заглянем да мяне? — Мусіць, іншым разам, не затлумлены і не стомлены, ён так проста не зрабіў бы гэтыя запросіны. Прыкінуў бы, у якім настроі жонка, як гэта выглядае з боку чужога чалавека, супрацоўніка.

У Паўла не было вялікай ахвоты ісці даКівайкі. Якніяк валтузні хапіла яму таксама, і цяпер з прыемнасцю думалася пра ўтульную, ціхую пасцель. Але ён добра разумеў і тое, што значыць адмовіцца цяпер ад прапановы рэдактара. Значыцца — здрадзіць у самы апошні момант і наглуха забыць, што табе з чалавекам працаваць, сустракацца, глядзець яму ў вочы. Можа, ні да кога ў рэдакцыі не было такім чуйнымКівайкава самалюбства, як да Паўла. Так няўпэўненая ў сабе жанчына раўнуе свайго дастойнага мужа.

— Ведаеце, Фёдар Андрэевіч, пазнавата ўжо,— адказаў Павел.

— Нічога, мы не дзеці,— проста сказаў ён. Павел махнуў рукою: з вамі, Фёдар Андрэевіч, хоць на край свету.

Ківайка паставіў «уазік» за домам, насупроць свайго пад'езда. Падняліся на трэці паверх.Ківайка дастаў з кішэні важкую звязку ключоў, торкнуў адным у шчыліну, але ключ да канца не лез. Знутры ў замку таксама тырчаў ключ.Ківайка разгублена патаптаўся пад дзвярыма і націснуў кнопку званка. У пярэдняй пераліўна задзілінькала. Пачуліся цубкія, цвёрдыя крокі. Павел, не пераступіўшы парога, спешна павітаўся. Але ці Марыя ад нечаканасці не пачула, ці гэтым выказала незадаволенасць. Яна не адказала. Крутнулася і пайшла, уладна ставячы тоўстыя белыя ногі.

Ківайка ўключыў у пакойчыку, што быў на левы бок, святло. Сам, скінуўшы боты, пайшоў услед за жонкаю ў спальню.

Хоць Павел і не хацеў падслухоўваць, але вушы самі лавілі шолахі і гукі.

— Збыўся!..— Голас у Марыі асуджана-пакутніцкі.

— В-ведаеш, Марыйка, трэба,— апраўдваўсяКівайка, і ў гэтым «трэба» было столькі малення і прыніжанасці.

— Табе — усё «трэба». Ні сям'я цябе не цікавіць,

нішто цябе не цікавіць. З'ехаў на паўтыдня...— Марыя, здаецца, усхліпнула.— Пра жонку і думаць забыў.

— Ну добра, добра, Марыйка. Не злуйся...— стараўся быць лагоднымКівайка, мусіць, помнячы, што ў кватэры чужы чалавек і ўсчынаць пры ім сварку ніяк не варта.

— І госця яшчэ прывалок!..

Паўлу ў гэты момант хацелася праваліцца скрозь зямлю. Ён ужо дакараў сябе, што згадзіўся на запросіны. Але ўцякаць было позна. Заставался адно: рабіць выгляд, што нічога не чуў і не бачыў. Так жыць з жонкаю, падумалася яму, можна толькі ў трох выпадках: вельмі кахаць яе, ці, наадварот, быць зусім абыякавым, ці адчуваць вялікую віну перад ёю.

— Цішэй ты!..— выдыхнуўКівайка. Яны размаўлялі, мусіць, жэстамі і мімікаю.

— Рыбы хоць прывёз? — ужо цішэй і спакайней спытала Марыя.

— Ага... прывёз.

Яны выпнуліся са спальні нечакана. Павел схіліў галаву да размаляванай дзіцячай кніжкі.

— Не заснуў яшчэ тут? — спытаўКівайка.

— Ды не покуль,— абыякава адказаў Павел, паказваючы, што не мае намеру доўга сядзець.

— Хвілінку пачакай...—Ківайка і Марыя звярнулі ў кухню. І амаль тут жа адтуль вылецеў падлешчык і, пляснуўшыся ў сцяну, ледзь не трапіў у люстра, упаў на дарожку. Было чуваць, як шчыльна зачыніліся дзверы на кухню. Павел заткнуў пальцамі вушы і невядома колькі так сядзеў.

Ачнуўся ад дотыку. Перад ім стаяла Марыя і вымучвала ўсмешку. Яна, мусіць, адчула ўсё-такі, што пагарачылася, што дарэмна напала і на Фёдара, і нават ні ў чым не вінаватага Паўла. Яна ўжо баялася не столькі за мужа, колькі за самую сябе. Бо як жа кепска можа падумаць пра яе чужы чалавек і дзе-небудзь пры нагодзе сказаць, што ўКівайкі жонка такая ды гэткая. А яна добра ведала, што плётка ўміг абрастае, бы снежны ком, прыдумкамі...

Марыя адышлася да люстра. Узяўшы ў рот заколку, пачала закручваць на патыліцы свае доўгія светлакаштанавыя валасы. Рукі падняла высока, і з-пад халата выткнуўся беленькі акраек карунка, нечакана ўсхваляваў Паўла.

— Праходзь у залу, Павел, там тэлевізар,— лагодна сказала Марыя.

— Ды нічога, нічога...

— Не саромся.— Марыя старалася быць гасціннай.— Давай я павешу твой пінжак... вось тут, каля выхада.

Павел аддаў пінжак.

Марыя, часта дапякаючы мужа за спазненні, затрымкі, усё ж не хацела перашкаджаць яму ладзіць сувязі з патрэбнымі людзьмі. Таму і зрабілася такой угодліва-мяккай. Цяпер яе пахваліў бы кожны.

Павел сеў у зале на крэсла. Марыя прынесла каву ў сініх фарфоравых кубках. Івайка нейкі час не мог падняць на Паўла вачэй. Доўга памешваў лыжачкаю каву. Марыя таксама была ў зале. То перастаўляла ў буфеце талеркі, то палівала вазоны, а то, знерухомеўшы, глядзела і слухала тэлевізар. Не прапускалі яе вушы і таго, пра што гаварылі Фёдар з Паўлам. Зрэшты, дзеля гэтага яна і тупала тут, інакш бы ўжо даўно пайшла ў ванную, дзе яе чакала намочаная бялізна.

— Запомні гэты дзень, Павел,— сказаў Івайка.— З яго пачнецца ў нас паласа новых удач. Здаецца, мы задаволілі гасцей ва ўсіх адносінах.

— Мусіць, адно другога не тычыцца.

— Чаму так? Не падмажаш — не паедзеш.

— Ай, Фёдар Андрэевіч, стаміўся я ад усяго гэтага.

— На тым свеце адпачнем!..— Івайку разбіраў незразумелы азарт: ці то натхняўся тым, пра што гаварыў, ці то паводзіў сябе па-блазенску таму, каб заспакоіць Паўла, які чуў іх з жонкаю сутычку.

— Сёння хавалі чалавека...— нечакана ўклінілася ў размову Марыя, і гэта не спадабалася Івайку. Ён паспрабаваў загладзіць жончыну прамашку. Спытаў так, як быццам і чакаў ад Марыі такіх слоў:

— Каго?

Павел інтуітыўна адчуў, што чалавека-нябожчыка ён ведае. Адчуў і спалохаўся. Яму хацелася, каб Марыя памарудзіла, не называла таго, хто памёр. Трэба было падрыхтаваць сябе. Перажыць першае ўзрушэнне, якое не дае цвяроза думаць і асэнсоўваць. Марыя ўбачыла Паўлава замяшанне. Зрабіла замінку і потым ужо сказала:

— Ну таго, абпрамененага...

— Памёр ужо,— сказаў Івайка так, быццам ён

чакаў гэтай смерці. Вядома, ён яе не чакаў. Проста ні ў кога не было сумнення, што абпраменены чалавек памрэ.— Хоць мучыцца не будзе...

— Мала зусім людзей за труною ішло. І духавой музыкі не было... Без вянкоў,— расказвала Марыя, і не зразумець было, ці то яна асуджае, маўляў, не маглі як след пахаваць чалавека, ці проста перадае свае ўражанні ад пахавання.

— Ну, ён жа, па сутнасці, падрыхтаваў усіх да свае смерці, на вачах даходзіў,— сказаў Півайка.

— Усё роўна ж ён некаму сын, брат, пляменнік, дзядзька...— Марыі, як і кожнай жанчыне, ды яшчэ за апошнія дні зануджанай, хацелася памянціць языком.

— Так-так,— паківаў галавою Павел, гледзячы на Марыю.

Яму чамусьці таксама, як і Марыі, рупіла гаварыць пра абпраменненага чалавека. Хадзіў па зямлі, думаў, маўчаў, абураўся і ведаў, што доўга яму не жыць. А можа, не ведаў? Можа, яму не сказалі, які фінал яго чакае? Смех! Любы чалавек, покуль не страціў розум, можа здагадацца, што будзе з жывым арганізмам, калі яго пранізаць радыяцыяй. Ды і навошта здагадвацца. Сёння шмат пішуць пра тыя ж Хірасіму і Нагасакі, пра ўцечку радыяцыі з амерыканскіх шахт і падводных лодак і яшчэ пра шмат што іншае.

Так, абпраменены чакаў свайго канца. Але ж і для кожнага чалавека смерць — справа часу. І чаму тады чалавек не апускае безнадзейна рукі, а змагаецца? Баіцца смерці? Не, чалавек не баіцца смерці. Ён проста моцна трымаецца за жыццё. І покуль ёсць дыханне, ёсць і цікавасць да жыцця і свая праўда, як і ў таго абпраменненага чалавека. Яго дні да смерці, мусіць, былі так насычаны думаннем, што яго хапіла б на доўгае здаровае жыццё. Яму было не ўсё роўна, што пачуюць вушы: цвіргатанне ластаўкі на провадзе ці выбух атамнай бомбы. І на зло ён рэагаваў не гэтак, як на дабро. І маўчаць ён умеў, калі маўчала душа.

— Ты што, адключыўся? — Півайка тармаснуў Паўла за плячо.— І вухам не вядзеш... Начуй-ка ты ў мяне, Павел. А? Месца хапае... Што табе там тыя Брэшкі? Яны ўжо спяць. І я не паганю машыну ў гараж. А заўтра з раніцы загонім — парэгулюеш мне... Згода?

Марыі ў зале не было. Цікава, што сказала б яна на

гэтую прапанову? Адразу ж вунь у штыкі сустрэла. Але другі разКівайка рызыкаваць не стаў бы. Ён, мусіць, ужо перамовіўся з жонкаю. Паўлу, без сваёй кватэры, было ўсё роўна, дзе начаваць, абы ў цяпле і спакоі.

### 4

Ранічкаю яны ўсталі, паснедалі і пагналі ў гараж «уазік».

Павел стаў каля задняй сцяны гаража і, абапёршыся спінаю на шафу, у якой Савянкоў хаваў свае прыладдзе, рукамі рэгуляваў, куды вярнуць пярэднія колы.

«Уазік» павольна сунуўся на яго, няўпэўнена патузваючыся. Раптам левае кола пачало забіраць управа, набліжаючыся да краю ямы. Павел затыцкаў правай рукою ўбок... і — у адно імгненне яму здалося, што наступіла ноч і з неба ссыпаліся ўсе зоркі. Ужо ў цемені да свядомасці дайшоў страшны, крамяны хруст...

Калі ў вачах праяснілася, ён убачыў сябе ўціснутым у шафу і ўпёртую ў грудзі радыятарную рашотку, а за шклом кабіны — белыКівайкаў твар. І тут — востры боль абрэзаў яму ногі. Ён быццам павіс у паветры. Абапёрся рукамі на капот «уазіка» і прастагнаў:

— Ногі... Амбец нагам!..

«Уазік» нячутна адкаціўся назад, і Павел ледзь утрымаўся за праламаныя дзверы шафы.

— Абедзве нагі...— І ў галаве з жахлівай хуткасцю пранеслася думка: «Калі яны зажывуць і калі я зноў змагу хадзіць?..»

— Павел!..— выскачыў з «уазіка» збялелыКівайка з ужо не зеленаватымі, а цёмнымі вачыма.— Што, Павел?.. Ачмурэў я, дурань, замест тормаза ціскануў на газ...

— Нагам амбец!.. Не адчуваю...

— Паўлік... Ну, Паўлік...— Вусны ўКівайкі былі сухія і дрыжалі.— Давай...— Не ведаў, што рабіць, куды кінуцца.

Павел абхінуўся на яго.

— Мне блага... Давайце ў машыну.

Павел з вялікай натугаю ўскаціўся на задняе сядзенне. Двума гарачымі струменямі ад ног паліла цела, млосна было ў грудзях, і кружылася галава, як і тады ў радзільнай палаце.

— Вады... Мне блага,— прастагнаў Павел.— Трэба «хуткую дапамогу»...

Ківайка кінуўся як угарэлы з гаража, вярнуўся, зноў выбег. Прынёс конаўку вады. Павел памкнуўся, каб устаць, але рэзкі боль адкінуў яго зноў на спіну.

Ківайка дапамог яму падняцца.

Павел папіў вады, сутаргава сціснуўшы зубамі край конаўкі, зноў лёг. Халодны ліпкі пот пасыпаўся з лоба на вочы. Ён разарваў каўнер сарочкі, не пачуўшы, як пстрыкнулі ў бакі гузікі, заскроб пальцамі па грудзях.

— «Хуткую дапамогу»...

Ківайка матлянуўся з гаража. У чорным пінжаку і шэрай сарочцы, збялелы, ён быў падобны на старую варону, што кружыць каля гнязда, над якім навісла пагроза. Праз хвіліну вярнуўся. Са страхам глядзеў на Паўла. Бегаў, лаяўся, не знаходзячы месца.

Пад'ехала «хуткая дапамога», з яе вываліўся тоўсты чырванатвары дзядзька ў белым халаце. Спакойна спытаў, што здарылася. Павел паказаў на ногі, спрабуючы закасаць калашыны штаноў. Дзядзька дапамог яму. Стаў мацаць ногі. Павел ані не чуў поціску ягоных дужых пальцаў.

— Здаецца, пераломy няма,— нарэшце прамармытаў дзядзька, усё яшчэ мацаючы ногі вышэй каленяў.

— Няма?..— Ківайка асалавела міргаў вачыма.

Дзядзька падсунуў левую руку пад сцягно, правай націснуў на калена.

— Няма... Хутчэй за ўсё, трэшчыны. Трэба ў бальніцу. Давай-ка, дарагі! — Дзядзька ашчаперыў Паўла, які паспрабаваў стаць на ногі, але востры боль працяў яго наскрозь, аж зазвінела ў галаве. Ківайка тут жа падставіў плячо з другога боку. Клыпаючы да машыны, Павел згледзеў на ганку Піліпаўну. Яна стаяла з вядром і анучаю ў руках і штосьці шаптала ці гаварыла — варушыліся вусны.

Бальніца стаяла зацененая густымі прысадамі.

У кабінеце хірурга Паўла паклалі на нізкую кушэтку, засланую сіняй цыратаю, якая здалася халоднай, што лёд, ажно пацішэў у нагах боль.

Хірургам аказаўся сярэдніх год мужчына з прыемнымі карымі вачыма, смуглаю скураю. Рукі ў яго былі вузкія і чуйныя. Ён нагнуўся над Паўлам, падняў левую нагу. Ківайка ўважліва сачыў за рухамі хірурга.

— Трымайце так,— сказаў хірург Паўлу. Павел ха-

цеў напружыць нагу, ды не змог, войкнуў ад болю, што прабег па назе тоненька, як электрычны ток.

— Цяпер — правую,— сказаў хірург. Правая балела яшчэ больш. Павел скрывіўся, на лобе зноў кроплямі выступіў пот.

— Усё зразумела. Пералому няма. Моцны ўдар. Не менш месяца давядзецца паляжаць.

— Дык пералому няма?..— УКівайкі быў разгублены твар.

— Не выявіў. Іванаўна! — хірург паклікаў медсястру, высокую пажылую жанчыну, якая надзіва ўвішна апынулася ў кабінеце.— Трэба пакласці на правую нагу гіпсавую шыну, аж ад галёнкі і на бядро.

Медсястра крутнулася туды-сюды і пачала насыпаць у цынкавы тазік белы парашок.

— Дзе яму давядзецца паляжаць? — стаўшы спінаю да Паўла, ціха і неяк спалохана спытаўКівайка ў хірурга. Хірург здзіўлена глянуў на яго, падышоў да ўмывальніка. Спаласнуў свае арыстакратычныя, вузкія рукі, выцер іх белым ручніком. Сеў за столік, начапіўшы на нос акуляры і прыціснуўшы рукою сіні аркушык паперы.— Дык гэта, Васіль Мітрафанавіч,—Ківайка раптам звярнуўся да хірурга пачціва і з прыкрай ліслівасцю,— можа... Можна вас на хвілінку? — Ён непрыкметна паказаў, міргнуўшы вокам, на філянговыя дзверы, што вялі ў суседні пакой.

Яны выйшлі, хірург — з алоўкам у вузкай чуйнай руцэ. Павел не прыслухоўваўся да іх гаворкі, ды ўсё роўна да яго далятаді абрыўкіКівайкавых фраз: «Ні ў якім разе!.. Васіль Мітрафанавіч, зразумейце... Дома будзе лепш, паверце... Рэзананс пойдзе, ведаеце... А я не паскуплюся...»

Павел не задумваўся над тым, пра што казаўКівайка, наконт чаго дамаўляўся. На яго раптам накацілася глухой хваляю абыякавасць — да ўсяго на свеце. І да сваіх хворых ног, і да ўвішнай медсястры, што размешвала, акурат цеста, у тазіку гіпс, і да століка з бліскучым пластыкавым верхам, за які садзіўся хірург і на якім зіхацелі металічныя скрыначкі і розныя там пінцэты ды трубачкі. Яму хацелася спакойна і нерухома ляжаць, бяздумна глядзець на шырокае акно, завешанае белым цюлем, і ўяўляць, як ён вусцішна падае ў мяккае і цёплае бяздонне...

І далей усё было, як у паўсне,— невыразнае і цьмя-

нае ў памяці.Ківайка з крывой, штучнай усмешкаю на бясформенных губах, хірург над ім з уважлівымі і, як здалося, трывожнымі вачыма, ласкавыя рукі пажылой медсястры, што прыкладвалі да пасінелай нагі цёплую і цяжкую гіпсавую шыну...

Аднекуль паявіўся той самы дзядзька, што прывёз яго сюды, і, падставіўшы спіну, сказаў:

— Бярыся за шыю, браток. Паедзем дамоў.

— Ага, дамоў,— пацвердзіў хірург.

Павел абшчапіў за шыю дзядзьку, і той панёс яго ў машыну. Павел блізка бачыў знявечаную, сплюшчаную ракавінку вуха, пакрытую здзічэлым пушком. Да грудзей зноў падступіла млосць, паслабелі рукі, і ён, мусіць, з'ехаў бы на зямлю, калі б дзядзька не падтрымаў яго ніжэй спіны. Гэтак жа ўзяўшы Паўла, дзядзька занёс яго потым і ў хату, перапалохаўшы Брэшкаў. Як скрозь туман, Павел бачыў вырачаныя нерухомыя Тэрэзіны вочы і разяўлены Іванаў рот, з якога запознена вырвалася пытанне:

— Што з Паўлам?..

Павел ужо не чуў, што адказаўКівайка. Затрашчалі спружыны матраца — ён споўз на ложак.

— Ну, папраўляйся хутчэй,— пажадаў яму дзядзька, па-салдацку ўзяў пад казырок і завярнуўся да выхада.

ЗайшоўКівайка, які затрымаўся каля Брэшкаў.

— Ты, Павел, не сумуй тут... Ляжы спакойна. Не турбуйся за работу. І бюлетэня табе ніякага не трэба.

Павел ляжаў усё з той жа абыякавасцю ў душы, што з'явілася ў бальніцы, і было ў гэтай ягонай ціхамірнасці штосьці ад немаўля. Ён толькі вяла ўсміхнуўся наКівайкавы словы.

Брэшкі, пастаяўшы ў праёме дзвярэй, павойкалі, паспачувалі, і Павел застаўся адзін. Сум абваліўся на яго. Слаба працавалі мазгі, і Павел якісьці час ні пра што не думаў. Потым успомніў Свету. Будзе моцна перажываць, калі ўведае. А ёй, па ўсім, зусім нельга хвалявацца, бо ад нервовага стрэсу яна пачынае загаворвацца. Павел успомніў, як перажываў, калі ўпершыню ўбачыў у ёй прыкметы зрушэння псіхікі. Тады ён зведаў глыбокі адчай. Яму пазваніўКівайка і сказаў, каб зайшоў у кабінет. Перастрэў у прыёмнай: «Свеце, здаецца, блага з галавою... Наташа Мікрашэвіч прыслала пісьмо, што, хворая, ляжыць у Бараўлянскай бальні-

цы». Павел пабялеў. Света сядзела ўКівайкі за сталом і, водзячы пальцам па паліроўцы, плакала. Глянула на Паўла чужымі вачыма і як бы ў працяг ранейшай гаворкі пачала: «Я кажу, пісьмо мне Наташа прыслала... А Фёдар Андрэевіч мне не верыць. А я думаю, мне ж пісьмо Наташа прыслала...» Яна хвілін пяць блытана гаварыла адны і тыя ж словы, потым спахапілася: «Ой, што гэта я?.. Абы-што нешта...» Твар у яе быў белы, але ў вачах заіскрылася ўсмешка, і яны зноў сталі такімі ж чыстымі, блакітнымі, як і раней.

Павел павёў Свету дахаты. Іх заспела навальніца. Яны схаваліся пад стрэшку над парадным уваходам у Дом Саветаў і чакалі, покуль яна скончыцца. Жыхала маланка, магніева-асляпляльная і бязлітасная, сакрушальная ў сваёй імклівасці. Валасы ў Светы паспелі ўжо намокнуць і прыліплі да лоба цёмнымі бліскучымі завіткамі.

І раптам у вочы кінуўся, неяк адразу і востра, бліскучы, яркі клубок. Ён павольна плыў угору, пакалыхваючыся, як выпушчаны з рукі дзіцячы шар. Наближаўся да самай высокай таполі, выцягваючыся, як амёба, і мяняючы круглыя абрысы; крануўшыся першых галін, тоненька заіскрыўся, як пырскі бенгальскага агню, і...

Павел і Света шырокімі вачыма, стаіўшыся, сачылі за клубком.

...і — аглушальны трэск заклаў ім вушы, адно было відаць, як густа заклубіўся дым, шухнуўшы да зямлі, і бліснулі з яго рваныя шматы жоўтага полымя. А тады ўжо з крамяным хрустам раскалолася таполя — на роўныя, акуратныя трэскі.

Яны яшчэ доўга стаялі. Павел бачыў, як у Свецiных вачах стыў халодны, дзікі страх. Для яго таксама той дзень застаўся ў памяці як штосьці нерэальнае і тагасветнае, быццам прыгаданы праз доўгі час сон.

...Павел ляжаў нерухома, пластом. Нельга было паварушыцца. Нават нязначны рух выклікаў боль. Павел моршчыўся і скрыпеў зубамі. Бацькам пра сваю бяду ён покуль паведамляць не будзе. Навошта турбаваць маці. Яна ж не паверыць, што «ўсё ў парадку». Абавязкова прыляціць і будзе сядзець тут пры ім. Тады, як стане на ногі, можа, пры нагодзе і скажа.

Ён паспрабаваў заснуць. Але боль так торгаў у галаву, што вочы самі адкрываліся і пільна ўглядаліся

ў коўдру на нагах, быццам боль — гэта штосьці рэчыўнае і яго можна ўбачыць.

Не заснуў ён і ўначы. Гэта — была ягоная першая бяссонная ноч. Бадай, самая лёгкая з усіх астатніх: арганізм быў яшчэ моцны.

Ён багата перадумаў: калі думаў, забываўся на боль.

«Столькі нараджаецца ў галаве думак... Трэба запісваць. Іначай не вытрымаю — звар'яцею ад болю і тугі».

Павел бачыў, як наступала раніца. Паволі святлелі шыбіны акна, як быццам хтосьці, руплівы і прагны, злізваў з іх густую зацвярдзелую фарбу.

## 5

Раніца ўбіралася ў сілу. Акно было шэрае. На яго знадворку пнуўся мяккі, бы воўна, змрок. Паўзверх фіранкі Павел бачыў, як праляцела глыбока ў небе варона, стомлена махаючы крыламі.

Нечакана пастукалі ў дзверы — нясмела, потым настойлівей, але ўсё роўна неяк мякка. Брэшка закрахтаў на ложку за сцяною, паслухаў, можа, здалося. Стук паўтарыўся, і ён падыбаў адчыняць.

Кроў задугала Паўлу ў скроні, і затузаўся ў нагах боль — гарачымі штуршкамі. Ён пачуў жаночы голас і здзівіўся, пазнаўшы Пілiпаўну. Яна перамаўлялася з Брэшкам. Праз хвіліну Брэшка заглянуў у пакой. Верхнія павекі набрынялыя да ліловасці.

— Ну як ты тут? Піліпаўна-с пажалавала...

Пры ўсёй сваёй фантазіі Павел ніколі б не падумаў, што першай яго праведае Піліпаўна. Ён быў з ёю з самага пачатку ў строгіх, афіцыйных адносінах.

А пасля аднаго выпадку яны зусім стараліся не мазоліць лішне адно аднаму вочы, хоць, адчувалі, ніхто з іх не насіў у душы ні помсты, ні зла.

Было гэта ўзімку, адну з тых, што мала падобны на сапраўдную зіму. Апошнім часам перапады ў прыродзе сталі не такой ужо і рэдкай з'явак: узімку раптам пойдзе дождж, а на мяжы вясны і лета выпадзе снег. Той студзень таксама хутчэй можна было назваць красавіком. Цяплынь стаяла ў паветры, раставаў снег, і на дарогах бурлілі ручаі, неслі на сабе брудную, жоўтую

пену, пакідалі яе ў спадзінах і беглі самі далей. Браўся накрапваць дождж. Раніцаю Павел убачыў, што яго трусіная шапка, намочаная звечара, наяршылася вострымі іголкамі. Тратуары былі коўзкія, блішчалі ад лужын і лёду. І падалі на іх ужо не толькі п'яныя.

Не па-зімоваму мяккая, цвярозлівая цяплынь навяла Паўла на думку з'ездзіць у Мінск на цыркавое відовішча. З ёю згадзіўся іКівайка, нават узяўся выклапатаць у аўтабазе транспарт. Павел павесіў на дошцы аб'яў паперку — каб запісваліся на экскурсію. Людзі, асабліва з друкарні, ахвотна адгукнуліся. Былі нават такія, што заказалі па некалькі білетаў.

Білеты выпала браць Чарткову, які акурат вазіў у Мінск дакументы на ўступленне ў Саюз журналістаў. Ён узяў білеты, але не ў цырк, а ў філармонію — на музычнае рэвю ленінградскіх артыстаў. У цырк, сказаў вінавата, білеты ўсе прададзены. Павел ведаў яшчэ са студэнцтва, што ў цырк білеты браць трэба загадзя.

Як гарох пасыпаліся пытанні: а што такое «музычнае рэвю»? На тварах у жанчын былі расчараванне і засмучанасць. Павел, наколькі ведаў, тлумачыў: гэта песні, арыі, аперэты, балетныя нумары, аб'яднаныя агульнай тэмаю. Чарткову ён сказаў: «Лепш узяў бы білеты на звычайны беларускі спектакль у тэатр Янкі Купалы». Чарткоў ухмыльнуўся, мякка і вінавата. І тут усхапілася Піліпаўна: «Дык што ж ета такое?.. Людзей дурыць! Пісалі і бралі грошы на адно, а цяпер сунеце нам другое... Не трэба мне вашае раву, нікуды я не паеду!» — «Ніхто вас не збіраўся дурыць,— сказаў Павел.— Мы сапраўды збіраліся ў цырк, ды не было білетаў. Чарткоў ездзіў, вось і давялося браць на музычнае рэвю. Перапрашаю, што так атрымалася...» — «Мне ваша выбачэнне не трэба і раву ваша не трэба. Вось так!» — «Сілаю, канечне, нікога цягнуць не будзем»,— спакойным тонам сказаў Павел. «І ўсё! — крыкнула Піліпаўна.— Выкрэслівайце мяне і аддавайце мае грошы!..»

Павел выняў з кішэні трохрублёўку і аддаў Піліпаўне. Яна ўзяла яе і завязала ў чыстую беленькую насоўку. Хаваючы вочы, да Паўла падступіліся яшчэ некалькі жанчын, і ён аддаў ім усе свае грошы.

У тым, што ўзняўся такі вэрхал вакол білетаў, вінавата былаКівайкава жонка. Яна, маючы намер таксама ехаць, першая даведалася пра білеты і пусціла сярод

людзей паніку. Гледзячы на яе і адчуваючы маўклівую падтрымку, узбунтавалася Піліпаўна.

«Мусіць, трэба адмяняць экскурсію,— прапанаваў Чарткоў, і ў яго абыякавых вачах, як зазвычай, плаваў спакой, і толькі ўважлівым позіркам можна было прыкмеціць у зрэнках яхідную іскрынку.— Але ты праф-орг, ты і рашай».— «Я лічу, трэба ехаць»,— цвёрдым голасам, стрымліваючы абурэнне, сказаў Павел. І тыя, хто не аддаў білетаў, паехалі ў Мінск.

...Піліпаўна тапталася на кухні. Было чуваць, як пругка і звонка, што каменьчыкі, капнулі на дно пустога таза некалькі кропель вады. Суха шчоўкнула аб край вядра шкло.

Павел пакутліва чакаў, калі Піліпаўна прыйдзе да яго ў пакой. Хацелася хутчэй праясніць усе здагадкі. Пад сплюшчанай падушкаю канвульсіўна цікаў наручны гадзіннік. Са шчыліны ў століі выпаўз чорны худы павук і заснаваў пярэднімі белымі лапкамі.

Піліпаўна нячутна падышла да дзвярэй. Павел убачыў яе ўжо тады, калі яна апынулася каля ложка. Яна была ў шкарпэтках, у чорнай, нізка павязанай на лоб хустцы. Трымаючы ў руцэ шклянку з вадою, глядзела на Паўла спачувальным позіркам.

— Ну як вы тут, Павел? — Яна звярталася да Паўла на «вы» і называла толькі імя.

— Змагаюся! — Павел бадзёрыўся. Яшчэ не ведаючы, чаго прыйшла Піліпаўна, не хацеў адкрывацца. Мажа, таму, што калі і хацеў Павел кагосьці бачыць тут цяпер, дык толькі не Піліпаўну. Яго перажыванні былі покуль што асабістаю таямніцаю, дзверы ў якую для астатніх зачынены.

— У вас дужа благі твар.— Піліпаўна памацала далонню лоб. Павел пачуў тугі пах часнаку. У Піліпаўны заўсёды пахла з рота часнаком.— Жару няма?

Гэтая клапатлівасць Піліпаўны штосьці зварухнула ў Паўла на душы. Ён падумаў: і маці вось так клала яму на лоб руку, калі падазравала хваробу. Стала шчымліва і цёпла ў грудзях. І ён сказаў простым голасам Піліпаўне, як маці, што жару як быццам няма, але шуміць у галаве, і што амаль усю ноч не спаў, і цяпер, мусіць, у яго біблейскі твар.

Піліпаўне апошнія словы не спадабаліся, яна нахмурыла бровы.

— Сэрца баліць? — спытала.

Паўла гэтае раўніваe стаўленне Піліпаўны да рэлігіі рассмяшыла, і ён ужо не мог без іроніі.

— Сэрца ў чалавека пастаянна павінна балець па нечым, інакш — ачарсцвее.

— Кажаце, баліць? — Піліпаўна, здаецца, пачула адно слова.— І не спалі ўсю ночку?.. Вы дужа спалохаліся, калі вас ударыла... Я бачу па вас, па вачах бачу... У вас многа пуду ў вачах.— Піліпаўна паставіла на табурэт шклянку з вадою.

— Я нават і спалохацца не паспеў...

— Ой, не кажыце!.. У вас рассунутыя зрэнкі.— Яна пагладзіла рукою Паўла па шчоках — так, быццам выцірала далоні. Прашаптала, гледзячы яму на ногі: — І, пуд-упудзішча, выгаворваю я цябе з буйнай галавы, з русага воласа, з руцівага сэрца...

— Вы што, Піліпаўна?!.— адхіліў яе руку Павел, і востры боль прашыў ногі напаленымі дроцікамі, якія завязаў потым, здаецца, за жылы і стаў тузаць.— Я ні ў якія шэпты не веру!

— Чакайце, сын мой...— Піліпаўна насцярожана затрымала каля сябе рукі.— Верыце ці не верыце...

Падумаць толькі! Лячэнне знайшлося... Няхай бы там мазь якая ці адвар з травы, дык яшчэ паўбяды. А то ж... Ну канцэрт, і ўсё, іначай не назавеш.

— Не смейцеся!.. Такая бяда... Як убачыла я вас тады, так і не магу во суняцца...— У словах Піліпаўны было столькі шчырасці і спачування, што Паўлава пярэчанне ўспрымалася як знявага. А навошта чалавека зневажаць, крыўдзіць? Так, ён, Павел, не сумняваецца, Піліпаўна моцна пакрыўдзіцца, калі ён забароніць ёй давесці сваю варажбу да канца. І крыўда яе будзе глыбокая.

— Вы хоць самі, Піліпаўна, верыце ва ўсё гэта? — сур'ёзным голасам спытаў Павел.

Піліпаўна паварушыла сухімі, маршчыністымі вуснамі, і кончык языка задзірліва варухнуўся між імі.

— А вы ў маці сваю верыце?

— Вядома.

— Вось так я веру ва ўсявышнія сілы, у іх я бачу радасць і ратунак,— прамовіла Піліпаўна з пашанотаю ў голасе.

— Як можна імкнуцца да радасцей і ратункаў, ніколі не ўведаўшы, што за звер іх пасылае?

— Згінь!..— Піліпаўна перахрысцілася. Яе вочы па-

чужэлі.— Грэх такімі словамі пра святое! Ты што, не хочаш цягнуцца к дабру і ачышчацца ад зла?..— Здаецца, кожная маршчына на шчацэ Піліпаўны таіла ў сабе пратэст.— Усявышні, ён — правідзец, ён бачыць, хто ўчыняе гвалт над людзьмі, хто заадно з сатаною, хто нячыста жыве... і таго карае! — Піліпаўна скіравала вочы ў столь і штосьці прашаптала.

— Выходзіць, і мяне бог за нешта пакараў?

— А што? І вас... Вы ашукалі тады людзей, калі збіраліся ў Мінск... І не дагадзілі богу.

— Мусіць, не толькі за гэта ён раззлаваўся на мяне. Я скідваю яго з трона... А каму гэта падабаецца?

— Прасці яму, госпадзі!..— Піліпаўна прыплюшчыла вочы і малітоўна скрыжавала на грудзях рукі.— Грэшнаму сыну свайму...

— Уга, вялікі грэшнік! — Павел, заспрачаўшыся з Піліпаўнай, здаецца, забыў на боль.— Толькі перад кім? Касманаўты ж во лятаюць высока, і нешта ж ніхто з іх вашага бога не бачыў.

— Ён вышэй! — Піліпаўна закаціла пад лоб вочы і пачала шаптаць. Павел блізка бачыў яе сухія, зморшчаныя вусны, востры ружова-запалёны кончык языка між імі і чуў тугі пах часнаку.

— ...І, пуд-упудзішча, выгаворваю я цябе з буйнай галавы, з русага воласа, з руцівага сэрца, з жыл, з пажылак, з касцей, пакасцей, з суставаў, з суставак раба божага Паўла...

Цяпер Паўлу было ўсё роўна, што гаварыла Піліпаўна. Ён думаў пра тое, што, мусіць, не заўсёды сярод людзей кепска, калі голас душы бярэ верх над голасам розуму. Іменна ў душы нараджаюцца пачуцці, але розум гвалтуе іх, скіроўвае ў патрэбным яму кірунку. Было б, пэўна, лепш, калі б пачуцці мелі незалежнасць і, вольныя, гулялі на прасторы.

— ...Святы светлы дзянёчак, стань на помач,— захлёбваючыся, шаптала Піліпаўна.— Святы Мікола, стань на помач! Святое ўзнясенне, стань на помач! Святы Пятрок-Павел, стань на помач! Святы Ілля, стань на помач! Святы Спас, стань на помач! Святая прачыстая, стань на помач! Святы Пакроў, стань на помач! Святы Кузьма-Дзям'ян, стань на помач! Упуд-упудзішча, высылаю я цябе на мхі, на балоты, на гнілыя калоды, на белыя каменні, на ракітавыя карэнні...— Піліпаўна махнула на акно рукою, перавяла дух,

і ўся ейная постаць стала як бы змізарнелай, акурат у ёй не засталося і каліва моцы.— Цяпер во глыніце дзесяць глыткоў гэтай вадзіцы...— Піліпаўна ўзяла з табурэта шклянку, падала Паўлу.

— Дайце, калі ласка, мне апомніцца...

— Толькі абавязкова выпіце, а то не паможа... Вот пабачыце, вам стане лепш,— Піліпаўна павярнулася да акна і яшчэ з хвіліну мармытала.— Ну, папраўляйцеся!.. Хай гасподзь бог вас мілуе. Не забудзьцеся — дзесяць глыткоў.

Піліпаўна пайшла. Павел колькі часу слухаў цішыню. І цішыня гэтая яшчэ таіла ў сабе ледзь улоўныя пахі чалавека, які толькі што тут быў, і яны дапамагалі Паўлу жыва ўяўляць перад сабою Піліпаўну. За перагародкаю шапталіся Брэшкі.

Павел гукнуў Івана. Дзугнулі на падлогу ногі. Іван прачыніў дзверы, усунуўшы толькі нос. Павел паказаў вачыма на табурэт.

— Падай, калі ласка, ваду.

— Цёплая? Прынясу свежай.

— Ды не. Гэту...— Ён узяў шклянку і павольна пачаў піць.

6

*2.05.78 г.*

«Такой перапалоханай Светы я яшчэ не бачыў. Яна рынулася да мяне адразу, і я адчуў на шчацэ трапятлівы дотык яе шурпатых вуснаў і цёплыя кроплі слёз. Здаецца, яна зноў гаварыла блытана: «Мяне Піліпаўна сустракае і кажа: «Павел пад машыну трапіў...» — «Не жартуйце, Піліпаўна!..» — смяюся. «Ну праўдачка ж! — яна перахрысцілася.— Я была ў яго». А я тады пытаюся: «Павел пад машыну трапіў?..» Піліпаўна смяецца... ой, не смяецца, а плача: «Ляжыць — не зварухнецца, яй жа божачка!..»

Я пачаў супакойваць Свету, гладзіць яе па валасах: бачыш, зусім здаровы. Толькі ногі трохі... Але хіба гэтым яе суцешыш? Для яе, як я зразумеў, было б лягчэй пакутаваць самой, чым бачыць мае пакуты.

Спытала, мусіць, я галодны. Я адказаў, што мне не хочацца зусім есці. Але яна ўсё роўна дастала з сумкі

круцель самаробнай каўбасы і клінок тугога жоўтага сыру. Схадзіла на кухню і прынесла скібку хлеба.

Я ўзяў Свеціну руку і пацалаваў. Света пачырванела і прыплюшчыла вочы. Мусіць, ніхто яшчэ не цалаваў ёй рукі. «Ты харошая...» — прашаптаў я і, гледзячы на Свету, забыўся, што мне баліць. Яна з хвіліну маўчала, не забіраючы з маіх рук сваёй цёплай далоні. Потым апомнілася: «Ты еш, еш!.. Табе трэба здаравець хутчэй...» — «Я потым, Святло...»

Я, зрэшты, мог бы трохі і перакусіць, няхай сабе з неахвотаю, ды ведаючы, што арганізму патрэбна сіла, але... Вось гэтае «але» прымушала мяне думаць, перажываць, бянтэжыцца і... адмаўляцца ўжо другія суткі ад ежы і вады. Я разумеў, што частка таго, што з'едзена або выпіта, выводзіцца вонкі. А як я мог яе, гэтую частку, вывесці, калі мае «бренные телеса» былі надзейна прыкаваны да ложка?

Света настойвала, каб з'еў цяпер, усё роўна як адчувала, што, застаўшыся сам-насам, я не дакрануся да яды. І я, каб не засмучаць Свету, адламаў маленькі кавалачак каўбасы і зжаваў яе з хлебам. Ледзь праглынуў. Потым выпіў паўшклянкі вады. Здаецца, ніколі ў жыцці вада не была такая смачная і жаданая.

Света пабегла на працу.

Тэрэза падала мне смажанай бульбы з салёным гурком, ды я адмовіўся. Браўся за раман Дастаеўскага «Ідыёт» і тут жа яго адкладваў. Мая ацяжэлая галава не ўспрымала напісанае.

Я дакараў сябе, што з'еў той кавалачак каўбасы і выпіў паўшклянкі вады: мне стала неспакойна ў жываце. І я нецярпліва чакаў Івана — інакшага выйсця покуль проста не знаходзіў. А калі ён не прыйдзе на абед?

Але, як бы сказала Піліпаўна, усявышні бачыць пакуты чалавека. Заявіўся Іван — і адразу да мяне: глянуць, як я маюся.

— Прывітанне табе ад усіх,— сказаў ён.

Я падзякаваў і папрасіў Івана, каб ён вынес мяне «на сонца». Покуль мы вярнуліся зноў у хату, з мяне сагнала сем патоў. Я з цяжкасцю ўяўляў сабе жыццё чалавека без ног. Але ж, пэўна ведаў, такія людзі ёсць і жывуць. Можа, яны неяк прыстасоўваюцца да ўсяго. Можа, ім прасцей усё рабіць, чым мне, бо не адчуваюць

такога болю. Ды ўсё роўна іх жыццё — пакута. У гэтым я перакананы.

Зноў прымчалася Света. Прынесла ў глыбокай металічнай місцы гарохавага супу і ў талерцы — шніцэль з тоўчанай бульбаю. Узяла ў сталоўцы.

— Паеш, Павел... Прашу цябе, паеш...— маліла яна.

Ну хіба я мог адмовіцца, чуючы і бачачы Свету, яе вочы? Я прысіліў сябе і сербануў некалькі лыжак цёплага супу.

Ківайка пад'ехаў на машыне — на тым злашчасным «уазіку», які ўклаў мяне ў пасцель. Рабіў бадзёры, бравы выгляд.

— Ну як ты тут — хваліся? Я з сённяшняга дня ў адпачынку...— І ціхім, змоўніцкім голасам дадаў: — Цябе замяшчаць буду. Во дажыўся ты, Павел! Сам рэдактар замяшчае сакратара.

Але, бачыў я, за гэтай ягонай бравадаю — адны перажыванні. А хваліцца мне не было чым. Ківайка адразу спахмурнеў. Выняў з карабка запалку і пачаў калупацца ёю ў зубах.

Я адхінуў коўдру і паказаў свае ногі. Яны былі нерухомыя, цяжкія, што калоды. Як не свае. І — сінія. Ківайка ўздыхнуў, замаркоціўся яшчэ больш. Я папрасіў, каб ён прывёз мне мыліцы. Можа б, на іх я хоць трохі змог хадзіць.

— А!..— спахапіўся ён, быццам увесь час сам думаў пра гэтыя мыліцы і цяпер успомніў.— Ага, добра... прывязу. Заўтра прывязу.

Цяпер — ужо вечар. І я раблю гэтыя запісы, падклаўшы пад сшытак «Ідыёта». Мне нязручна. Таму ў мяне нязграбны почырк. Перачытваю і сам ледзьве разбіраю тое, што напісаў».

*6.05.78 г.*

«Ківайка прывёз мыліцу. Толькі адну. Заікаючыся, сказаў, што забраў апошнюю ў аптэцы. Мне не спадабаліся ягоныя вочы. Ён іх хаваў, гледзячы ці то міма мяне, ці то ў падлогу. Што яго так бянтэжыць?

Калі ён пайшоў, я, пераадольваючы страшны боль, паспрабаваў абаперціся на мыліцу. Дзе там! Яна выкручвалася з-пад пахі, і я гупаўся, як куль, на ложак. Мяне праняў пот. Я ўспомніў фільм пра Марэсьева, дзе ён таксама, абліваючыся потам, вучыўся нанава ха-

дзіць. Няпроста навучыцца хадзіць маломy, а дарослaму, мусіць, яшчэ горш.

Адна мыліца... Навошта было браць адну? Можа, якраз яе не хапіла якому-небудзь інваліду?»

*14.05.78 г.*

«Света прынесла мне вожыка. Дзіўна! Ішла ўвечары да мяне і наткнулася на яго. Што прыгнала вожыка сюды, у горад? Няўжо тое, што і людзей? Толькі наўрад каб раздолле, жывыя пахі і шолахі вожык прамяняў на брудны, шэры асфальт. Гэта, мусіць, адно людзі кіруюцца безразважным, эгаістычным розумам, а не зрокам, слыхам ды чуццём.

«Вось табе сябра»,— сказала Света сумным голасам, з невыразнаю ўсмешкаю на твары.

Удзень вожык хаваўся пад ложкам, зрэдку фыркаў, і было чуваць, як ён хлябтаў са сподка малако. Ноччу вожык вылез з-пад ложка. У акно свяціў месяц. Шчыльная атласная штора імглілася мірыядамі залацістых пылінак. А з левага боку, дзе яна была адсунута, яркае святло вузкай паскаю клалася на падлогу.

У вожыка быў захмылены ўгору і трохі прыплюшчаны на канцы лычык. Ён тыцкаўся ім у пабеленую сцяну пад акном і злосна чмыхаў. Выбягаў на паску месячнага святла, круціўся, па-свінӧму нязграбна задзіраючы тугі бліскучы лычык, і зноў клышанога тупацеў да сцяны.

Вожык настойліва шукаў сабе вылаз з гэтай незразумелай страшнай нары. Рваўся туды, дзе свяціў месяц і дзе быў для яго прастор. Мне стала шкада яго. Я ўспомніў, як мне хацелася прастору ў хаце Касцянніцына. Усё там гняло мяне, ціснула стопудовым грузам.

А можа, вожык ірвецца не толькі на прастор? Можа, яго чакаюць у гняздзе маленькія важаняткі? Пішчаць ад сырога начнога холаду і шукаюць цёплы матчын жывот з такімі, мусіць, салодкімі для іх саскамі.

Вожык зноў выкуліўся на месячнае святло, і кончыкі іголак у яго зялёна заіскрыліся. Не, не ад таго, што на іх свяціў месяц. Я глядзеў на вожыка скрозь слёзы, што навярнуліся на мае вочы.

— Пацярпі крышку, сябра мой...— прашаптаў я. Вожык пачуў і доўга прынюхваўся, утупіўшыся на мяне пацеркамі аметыставых вачэй. Хтосьці прайшоў

міма хаты. Чуваць было, як стукалі па асфальце абцасы.

Раніцаю прыбегла Света, і я сказаў ёй, каб яна аднесла вожыка на тое месца, дзе падабрала.

«Не пасябравалі?..» — здзівілася яна, безабаронна апусціўшы вочы. «Мне, чалавеку, тут хоць ваўком вый, а вожыку»,— адказаў я, і яна мяне зразумела. Хутчэй — адчула, што я меў на ўвазе».

7

Павел пачуў спачатку гуд машыны. Насупроць хаты ён абарваўся і перайшоў на лёгкае хурканне. Стукнулі дзверцы. І ўжо тады задзугалі на ганку ногі.

Прыйшоў Аднамах. Павел падаў голас і паварушыўся на ложку, каб затрашчалі спружыны. Аднамах паціснуў Паўлу руку. Доўга глядзеў у вочы. Павел падсунуўся да біла ложка, паправіў за спінаю падушку.

— Трохі ўжо можаш кульгікаць? — зычлівая, простая ўсмешка гуляла на ружаватым Аднамахавым твары.

— Толькі з падмогаю...

— А чаму адна? — спытаў Аднамах, кіўнуўшы на прыпятую да сцяны мыліцу.

— Беднаму жаніцца, дык і ноч кароткая,— кісла ўсміхнуўся Павел.— Апошнюю Івайка забраў у аптэцы.

Аднамах хмыкнуў і сцяў, аж пабялелі, вусны. Не пытаючыся дазволу, узяў Паўла за плечы.

— Падымайся!

— Ты што, Цітавіч? — спытаў Павел, хоць і здагадаўся, што намысліў Аднамах.

— Да стала хадзі. А то залежышся тут.

Павел правай рукою абхінуўся на Аднамахава плячо, левай зацiснуў мыліцу. Яны памалу пасунуліся ў прыдзелак. Павел сеў на канапу, паклаўшы выпрастаную правую нагу на мыліцу. Аднамах адчыніў свой саквояж і выставіў на стол трохлітровы слоік самагонкі, закрыты капронавым вечкам. Схадзіў на кухню па шклянкі. Працёр іх шматам газеціны, патрымаўшы кожную насупроць вачэй і акна.

— Тут можна цэлае вяселле справіць! — сказаў Павел жартаўліва.

— Быў на раёне... Артыкул для старонкі народнага кантролю рыхтую. І вось да знаёмых заскочыў... У Сярожы майго дзень нараджэння заўтра. Але хопіць, усё не вып'ем!..— Аднамах засмяяўся, і смех ягоны крамяна забулькаў у горле. Аднамах заўсёды любасна вымаўляў слова «вып'ем», акурат за ім стаяла штосьці дзіцяча-кволае і далікатнае.

— Я ўвогуле маю намер не піць.

— Ад Яўгена Цітавіча не выкруцішся!..— Аднамах наліў шклянкі да паловы. Зноў палез у сакваяж. Дастаў загорнутыя ў газету зморшчаныя салёныя гуркі, парэзанае сала і хлеб. З прадранай газеты ссыпаліся на падлогу крошкі. Аднамах узяў шклянку.— Ну, давай, брат, каб хутчэй адкінуў гэтую дудку!..— І дакрануўся шклянкаю да мыліцы, потым да Паўлавай шклянкі.

Павел адпіў толькі пару глыткоў. Адкусіў салёнага гурка.

— Ты ў курсе, дзе мая палавіна працуе? — нечакана спытаў Аднамах, адтапырваючы вусны і перашчыкваючы ў сале жылку. Павел кіўнуў галавою.— У аптэцы, канечне... Ну дык вось, яна рассмяялася, калі я сказаў ёй, што шэф купіў табе толькі адну мыліцу.

Павел адчуў, як уміг стала цвёрда ў горле і сцягнулася, узялася пупырышкамі скура на руках. Не, тут штосьці не тое. Аднамах, мусіць, пераблытаў. Не можа ж быць, каб пасля ўсягоКівайка разменьваўся на дробязі. Здаецца, усё можна ўявіць, ды толькі не гэта. Павінна ж быць мяжа чалавечым слабасцям.

— Ты канчай, Цітавіч, жартаваць! — сказаў няўпэўнена Павел, усё яшчэ спадзеючыся пачуць Аднамахаў смех, хоць прадчуванне, што заўсёды халадком варушыла душу, падказвала: так, так яно і ёсць.

— Ты мне не верыш? — Аднамах падаў Паўлу шклянку.— Факт ёсць факт! Ты мне дай факты, і я скажу, на якую подласць здольны чалавек. Трэба верыць фактам, а не людзям... Людзі навучыліся маскіравацца і, як у благім магазіне, выстаўляць напаказ адно харошае, а за ім мецьдрэнь...

Павел амаль бясцямна ўзяў з Аднамахавых рук шклянку і не помніў, як выпіў. Ніякага смаку ў роце не засталося, акурат ён глытаў не самагонку, а пустое паветра. Няўжо праўда? У скронях стукала і пульсавала кроў. Быццам жаКівайка напраўду перажываў, што ў аптэцы была толькі адна мыліца.

Павел глянуў Аднамаху ў твар і не ўбачыў у шырокіх зрэнках той недамоўкі, што іншы раз чыталася з іх, калі Аднамах быў няшчыры ці стрыманы. Павел паважаў Аднамаха як журналіста ці, праўдзівей, нічога супроць яго не меў. Бадай, адзінае, што не падабалася,— гэта ягонае жаданне лезці не ў сваю справу, быццам ён цар, бог і воінскі начальнік. І нават бывалі выпадкі, калі з калгасаў прыходзілі пісьмы: рэдактару газеты Аднамаху.Ківайка тады хадзіў хмурны, бліскаў з-пад броў зеленаватымі вачыма, але Аднамаху нічога не казаў.

Павел разумеў, адкуль у Аднамаха такая звычка: ранняя слава, высокая пасада псуюць чалавека. Гэта надта відаць тады, калі чалавек раптам воляю абставін апусціцца на зямлю. І таму Павел не вельмі крыўдзіўся, дараваў Аднамаху ягоную слабасць.

У Аднамаха быў няпросты лёс. Ведаў пра яго і Павел. Зусім малады, дваццаціпяцігадовы, Яўген Аднамах стаў загадчыкам аргаддзела райкома партыі. Узялі яго з пасады намесніка рэдактара. Яго працавітасць і тое, што ведаў у справе толк, усе адзначалі. І мала хто думаў тады, што першы сакратар — родзіч Аднамахавай жонцы. Аднамах патрабаваў, каб да яго ў кабінет стукаліся і называлі толькі Яўгенам Цітавічам. Людзі разумелі і не абураліся. Хіба адзін Касцяніцын з гэтым не пагаджаўся і заўсёды, калі быў на прыёме ў Аднамаха, выкідваў нейкага коніка: то «забудзецца» павітацца, то нібы міжволі прапусціць у звароце «Жэня» або, сеўшы на крэсла, вольна раскінецца, закладзе нагу за нагу. Аднамах бянтэжыўся, асабліва калі хтосьці заходзіў у кабінет. Касцяніцын бачыў усё і падліваў масла ў агонь: браў з пісьмовага прыбора аловак і тэатральна стукаў ім па стале. Аднамах на развітанне адчытваў Касцяніцына: «Ты хоць бы навучыўся салідна сябе весці...» Касцяніцын прыкідваўся прасцячком, паціскаў плячыма і па-блазенску ўсміхаўся. Такая ўжо цаца, калі глядзець збоку і не бачыць ягоных жоўтых вачэй, у якіх, здавалася, ажно плавіліся дзягцярна-чорныя зрэнкі.

Да падначаленых Аднамах быў справядлівы і роўны, але строгі і прынцыповы. Нікому не даваў паблажкі, сабе — таксама. Хворы, з тэмператураю пад сорак, ішоў на працу. Пасля шасці гадзін у яго кабінеце яшчэ доўга была адчынена фортачка, і з яе віўся цыгарэтны

дым. У выхадныя спакой вартаўніка часцей за ўсіх парушаў ён, Аднамах.

Два гады ўсё ішло спакойна і ціха. Быў захоплены сваёю працаю Аднамах, былі задаволены маладым загадчыкам аддзела сакратары. Нават пайшла пагалоска, што Аднамах — кандыдатура на трэцяга сакратара райкома партыі суседняга раёна. Дык вось, усё ішло спакойна і ціха, покуль.. Покуль Аднамах не дазволіў сабе, здавалася б, дробную прыхамаць. Тады-сяды пачаў наязджаць да бацькі ў вёску на «Волзе» першага сакратара. Цёмна-вішнёвага колеру «Волга», адпаліраваная і вымытая, з птушынай лёгкасцю падлятала да хаты старога Аднамаха, і пыл доўга асядаў на лісце дрэў, платы, вокны суседзяў. Гаспадар выбягаў сустракаць сына. Гэтак жа, як і лысіна, у яго блішчэлі вочы і хромавыя боты. Браў з сынавых рук вялікую сумку, і яны ішлі побачкі ў двор. А неяк, пры гальштуку, у новым касцюме, белай кашулі і начышчаных ботах, стары Аднамах сеў з сынам у «Волгу», і яна павезла іх у раён.

І тады з вёскі ў ЦК партыі ўзяло накірунак ананімнае пісьмо. Былі там радкі: «Як гэта так, каб сын былога нямецкага прыслужніка ездзіў на «Волзе» першага сакратара райкома партыі, ды яшчэ і вазіў на ёй ЯГО». Праверылі пісьмо ў лічаныя дні. Таго, хто піша скаргі, нават справядлівыя, такая ўвішнасць здзівіла б. У Аднамаха спыталі: «Чаму, уступаючы ў партыю вы ўтаілі праўду пра свайго бацьку?»

Першы адказ быў такі: «Пра яго ваенны лёс я нічога не ведаў».

Другі — бліжэй да ісціны: «Уступаў у партыю ў калгасе, зусім малады, толькі што споўнілася васемнаццаць гадоў. І мне нават у галаву не прыйшло, што бацькава мінулае нешта значыць для анкеты».

І трэці адказ быў правільны: «Думаў, што, калі скажу праўду, мяне не прымуць у партыю, хоць, як цяпер ведаю, сын за бацьку не адказчык».

Вось тады, калі Аднамаха ўсяго толькі вызвалілі ад абавязкаў загадчыка аргаддзела і запісалі ва ўліковую картачку суровую вымову, усе раптам успомнілі, што першы сакратар — жончын родзіч, і загаварылі пра гэта адкрыта, з рознымі здагадкамі ды меркаваннямі, часцей — памылковымі.

Аднамах змяніўся на вачах: з сябрамі, якіх адразу

крута паменшала, і знаёмымі — маўклівы, задуменны; у сям'і — зласлівы, нервовы. Па вуліцы ішоў з апушчанай галавою. І толькі тыя, хто яшчэ не ведаў, што адбылося, запынялі яго і першыя сунулі руку, лісліва зазіраючы ў вочы і не заўважаючы ў іх ранейшай пыхлівасці. Гэта іх бянтэжыла, яны не ведалі, як сябе паводзіць.

Неўзабаве Аднамах уладкаваўся ў рэдакцыю. Ён стаў кепска жыць з жонкаю. Гэта пацвярджалі і штодзённыя званкі ў канцы дня, пасля якіх Аднамах цвёрда клаў на апарат трубку. Услед яму званіў ужо сын, і Аднамах супакойваў яго, што хутка прыйдзе. Назаўтра ўсё паўтаралася.

А праз год... Тая восень семдзесят шостага года выдалася халодная і ранняя. Спачатку безупынку лілі дажджы. Зямля цвякчэла пад нагамі прыкра і ўгодліва-тлуста. Адно выручалі боты. Потым нясмела пачалі хапацца замаразкі. Нават звечара было чуваць, як шэрхне гразюка. У нізінах расплываўся туман, як гіганцкія блакітныя медузы. А раніцаю ўжо можна было бачыць на чэрствай траве тонкае серабро інею. Трывожна было глядзець на гэты іней. Рана, зусім рана стукаўся ў сэрца зямлі каменны зімовы холад.

На палях гінулі бульба, буракі.

Павел тады, помніцца, падаў ідэю. Усе згадзіліся з ім: трэба выручаць вёску. Адно Касцяніцын сядзеў моўчкі і манікюрнай пілачкаю чысціў пазногці. Потым агрызнуўся:

— Яшчэ чаго не хапала! У такую халадзіну грэбацца ў зямлі. У мяне і так хранічны танзіліт. Хто як хоча, а я не паеду! Не паеду, хоць рэжце!..— І варухнуўся на крэсле, зашныпарыў па баках жоўтымі вачыма. Паўлу іншы раз здавалася, што ў Касцяніцына замест вачэй поўзаюць дзве ядавітыя асы.

— Ты, Касцяніцын, хоць думаеш, што гаварыш? — адчуваючы, як накіпае на сэрцы злосць, стрымана спытаў Павел. Касцяніцын шматзначна гмыкнуў, як гэта ўмеў рабіць толькі ён, сказаў:

— Я заўсёды шчыры. Ты ж ведаеш і, думаю, пераканаўся з самага пачатку.

Павел пачынаў траціць цярпенне.

— Твая шчырасць — сабаку пад хвост. Ты, Касцяніцын,— зараза! Разумееш, за-ра-за,— сказаў з націскам на кожным складзе,— якую трэба знішчаць.

— Ой, дурань! Глядзіце, які Дроб дурань!..— Касцяніцын узяўся рукамі за вушы. Ён умеў балюча ўкалоць чалавека.

— Я сказаў праўду, якой ты так любіш прыкрывацца! — Павел быў непахісны.— І кулакі не сціскай — не вельмі іх баюся. А твае паводзіны вынесу на мясцком.

— Хоць на прэзідыум Белсаўпрофа,— ухмыльнуўся Касцяніцын.— Я не камуніст, і што вы мне зробіце?

— Знойдзем управу,— цвёрда сказаў Павел.

— Не-е, гэта вам не раней: начальства — дык усё можна. Цяпер — я таксама асоба і тое-сёе значу! — Касцяніцын стукнуў кулаком па стале, трапіў на пілачку, і ад яе адскочыў чырвоны чаранок, пацэліў на стол Аднамаху. Аднамах абурыўся:

— Асцярожней! Размахаўся...

— Асоба...— іранічна паківаў галавою Павел.— Ды калі ўжо казаць праўду да канца — кожная бульбіна на полі важней за твой уздых.

Касцяніцын дэманстратыўна выйшаў з кабінета. Цяжка сказаць, што падзейнічала на яго, але назаўтра ён заявіўся з вядром у руках.

На месцах засталіся толькі тыя, хто выпускаў газету, ды адна цяжарная наборшчыца, што стаяла на заказах. Астатнія разам з супрацоўнікамі ваенкамата паехалі ў калгас. Ніхто не скардзіўся, ва ўсіх былі натхнёныя твары. Нават Касцяніцын насіў па два вядры ў кожнай руцэ і ўсіх здзіўляў сваім настроем:

Шел я сквозь вьюгу,
Шел сквозь небо,
Чтобы тебя отыскать вдалеке-е-е...

Спяваў ён добра. Праходзячы з пустымі вёдрамі міма Дашкі, супрацоўніцы ваенкамата, наравіў яе ўшчыкнуць. Дашка была ў балоневай куртцы, і калі нахілялася падбіраць бульбу, тоўстыя лыткі вырывалі з халявак блішчастых гумавых ботаў калашынне.

— Вот перадам жонцы, пагляджу, як тады заспяваеш! — адбівалася ад Касцяніцына Дашка, і ўсе бачылі, што яна робіць гэта дзеля манеры.

Усе смяяліся, толькі ў Светы, бачыў Павел, быў разгублены выраз вачэй.

Холад, холад, а тут раптам і сонца. Цёплыя, як улетку, дні. Забліскала ў паветры павуціна. Як іней,

абвіла галінкі на кустах. Вечары сталі мяккія, лагодныя.

Павел са Светаю гулялі па вуліцы, потым сядзелі на лавачцы. Калі пачаў даймаць холад, пайшлі ў хату і да позняга размаўлялі там аб іх дваіх... Затым ён пачаў збірацца...

Павел ступіў з сянец на ганак, здзівіўся малочна-беламу святлу. Яно роўна заліло страху пуні, голы клён, плот і зямлю на двары. «Ну акурат выпаў снег!..» Была надзвычай ясная і ціхая ноч. У бяздонна-густым небе вісела нізкая яркая поўня. Зоркі, здавалася, глядзелі на яе з далёкага тылу. «Шкада, што не ўбачыла гэтую казку Света...» — пашкадаваў Павел, але вяртацца назад не стаў. Чуў, як услед за ім суха бразнуў за хатнімі дзвярыма шчапок.

Хата, дзе Павел кватараваў разам з Аднамахам, стаяла ў канцы. Мёртва спіць у гэты глухі час знябытая за дзень вёска. Адно сабакі, пачуўшы чалавека, млява пабуркваюць з-за варот. Вусцішна становіцца ад гэтай светлай нязвыклай цішыні.

Павел нячутна адчыніў весніцы. Аднамах ужо, мусіць, даўно дзесятыя сны сніць. Але — што гэта? Павел пачуў рытмічнае шорганне з-за хлява. Там, ведаў, павець. Быў бы вецер — падумалася б: мала што, можа, граблі вісяць і ківаюцца, як маятнік.

Зазвінела ў вушах цішыня. Сапраўды, шоргае за хлявом. Што за дзіва? Павел асцярожна абагнуў вугал хлява. З павеці тырчаў край абернутага кузава ад легкавіка і зыбаўся, як калыска. Што гаспадар замяніў кузаў сваіх «Жыгулёў» і пакінуў яго, скарабачаны пасля аварыі, пад павеццю, а дзеці накідалі ў яго саломы, каб было мякка гуташыцца, Павел ведаў. Але чаму ён цяпер, у глухую поўнач, зыбаецца? Няйнакш, насланнё.

Ён адышоўся далей ад хлява, каб можна было глыбей заглянуць пад павець, і — прысеў: у кузаве насупроць адно аднаго сядзелі Аднамах і... Дашка і зыбаліся, як дзеці. Месяц свяціў на іх, і тоўстая высока аголеная Дашчына нага рэзала вочы белізною. Гэтак жа бела блішчэлі ў Аднамаха зубы. Ён сядзеў тварам да Паўла.

«Рамантыка...» — іранічна ўсміхнуўся Павел.

На гэты выпадак Павел хутка забыўся, а цяпер усё прамільгнула адным дзіўна насычаным кадрам у памя-

ці. Ці праўду сказаў яму Аднамах праКівайку? З цяжкасцю ўяўлялася, штоКівайка на такое здольны. Як тады яго разумець? Усё гэта прадуманае ці выпадковае? Не дала жонка грошай? Але ж у яго яны заўсёды ляжаць у бумажніку. Не дазволіла, забараніла? А навошта тут раіцца з ёю, усё само сабой зразумела.

— Ты не ламай дарма галавы,— сказаў Аднамах, падліваючы ў сваю шклянку самагонкі,— а паслухай маю параду... Дык вось. Абавязкова вазьмі ў бальніцы даведку, што гэта здарылася з табою на рабоце... На ра-бо-це, разумееш? Ведаеш, усяк можа быць... Усякія вынікі гэтага ўдару могуць пасля выявіцца. Цьфу-цьфу, канечне!.. Можна інвалідам стаць. Зразумеў? І я табе кажу, не будзь дурнем! А так, з даведкаю, калі што якое — пенсію атрымаеш. Не глядзі так на мяне і не думай, што Яўген Цітавіч п'яны.

Павел спачатку адчуў, як зябкі халадок агарнуў сэрца. Вунь як яно можа павярнуцца. А ён думаў, глупства ўсё. Паляжыць тыдзень-другі і на ногі. Аказваецца, інвалідам можна стаць. Не, гэта ўжо занадта. У такім узросце інвалідам. Мусіць, Аднамах праз меру абачлівы.

— Ну, да пенсіі, можа, справа не дойдзе,— смехам сказаў Павел.

— Запомні адну ісціну, якую мне калісь сказаў вельмі разумны дзядзька. У жыцці ніколі не пашкодзіць лішні раз падстрахавацца — дужа шмат бед наканавана чалавеку. І я адчуў гэта на сваёй скуры... Цяпер мудрэйшы стаў. Думаеш, не бачыў цябе тады, калі быў з Дашкаю? Бачыў. Месяц — і цень ад цябе вунь які слаўся. Прыкінуў: калі разнясеш аба мне плётку, павінна быць у мяне версія, апраўдальная... Хоць, калі шчыра, мне цяпер ужо ўсё роўна. Са мною ўсё ясна. Але на будучае помні: сямейная здрада — як невылечная хвароба, ёю варта толькі заразіцца.

Аднамах, здаецца, трохі лішне выпіў і разбалбатаўся. Ды Павел слухаў яго ўважліва.

## 8

Павел наліў у чайнік вады і, запырсканы, паставіў на газ. Кроплі сцяклі ўніз і віселі на рубчыку дна блакітнымі пацеркамі, покуль не выпарыліся. Ён за гэты

час паспеў падумаць, як сустрэнуць яго ў рэдакцыі. Канечне, пакажуць, быццам ніякага перапынку не было, маўляў, што тут спачуваць, і так усё зразумела. Узрадуюцца, бадай, два чалавекі:Ківайка і Света. Праўда, радавацца яны будуць па розных прычынах. Света — што выздаравеў, будзе побач. УКівайкі будзе радасць ад таго, што, нарэшце, яму паслабанее, і рэдакцыйны груз ляжа на Дробавы плечы.

Паўлу расхацелася нават піць чай. Ён зрабіў некалькі глыткоў. Яго праняў пот, казытліва папоўз па скронях, заззяў на носе — праз акно ў твар свяціла сонца, малінава і мякка падымаючыся над зямлёю. Павел адставіў кубак. Мільгнула думка глянуць на сябе ў люстэрка, але ведаў і так, што бледны, зняможаны.

Ён узяў «дыпламат», нечакана цяжкі, нязручны, і ўбачыў, што скура на ім патрэсканая, працёртая, а дзе-і прасечаная. Здзівіўся, што раней гэтага не прыкмячаў. Няўжо і «дыпламат» пастарэў разам з ім?

Затое вуліца была маладая. Сады, каштаны, кусты язміну і трава паўз плот узяліся такой чыстаю пахучаю зелянінаю, што глядзець на яе было немагчыма — кружылася галава. Ад гэтага бухматага зялёнага цуду, што таіў у сабе здароўе, волю і цяпло, патыхала вечным і трывожным, думаць пра якое чалавеку заўсёды — уніжэнне. Так. Што ёсць у гэтым свеце ён? Ручаінка на дарозе, а ёсць яшчэ азёры, рэкі, акіяны.

Правая нага ў Паўла кепска гнулася. Ён пераструўляў яе не прама перад сабою, а заграбаў убок, як касою. Сум і нерашучасць тлелі ў вачах. Можа, не столькі праз адчуванне сваёй бездапаможнасці, якая паявілася вось цяпер, ад таго, што так доўга не бачыў ва ўсёй шырыні свету, колькі праз нежаданне ісці на працу. Не, гэта было не тое нежаданне, што кожны раз абязвольвае чалавека, які вяртаецца з адпачынку, крышку ўстрывожаны тым, што без яго адбылося нешта такое, ад чаго стане непамысна. Ён проста разумеў, што не знойдзе на працы тых радасцей і натхнення, з якімі браўся за аловак раней. Канечне, можна было ўявіць: пройдзе нейкі час, усё прытрэцца, забудзецца. Але рашуча пратэставала супроць гэтага тое, чаго нельга было выкінуць з душы як дробны капрыз ці закранутае самалюбства. Змірыцца, зацяцца, заплюшчыць вочы — азначала, трэба ігнараваць тое бясконца-багатае, непараўнана ні з чым складанае, што называецца адносіна-

мі між людзьмі. На гэты крокісці ні ў якім разе нельга, бо гэта ўсё роўна што кінуць зернетка між цяжкімі зубастымі жорнамі. Часам адносіны з адным чалавекам, як гэта здарылася ў яго з Івайкам, так запаскудзяць свет, што не хочацца не толькі пісаць, а нават жыць.

Павел, як і многія людзі яго веку, быў не з тых, чыю заўзятасць у працы тлумачыць прага грошай ці спажывецкі разлік, а з тых, што знаходзяць у гэтай заўзятасці напоўненасць жыцця, без якой не ўяўляюць ні сябе ў гэтым свеце, ні тых, хто іх акружае. Толькі адно ўжо гэта ўсяляла яму давер да ўсяго, што рабіў сам і што рабілі іншыя. І, калі шчыра, дзесьці на сподзе душы песцілася думка (у кожнага чалавека ёсць сваё адчуванне выбранасці месца пад зоркамі), што ён трошачкі нават больш, чым астатнія, аддае сілы газеце. Але думка гэтая не прыносіла яму той асалоды, якая псуе людзей і робіць іх лянівымі.

Ужо як падышоў да рэдакцыі, задумаўся, куды перш зайсці: у кабінет да рэдактара ці адразу за сакратарскі стол. Паводле правілаў этыкі, канечне, трэба спачатку папярэдзіць рэдактара, каб ён ужо з самай раніцы ведаў, куды і што, як планаваць свой дзень. Але Паўлу не хацелася рабіць той маленечкай уступкі, што ладзіць між людзьмі мосцік адносін, па якім яны зближаюцца. Не жадаў ён цяпер гэтай уступкі і ад Ківайкі.

Яму пашэнціла. Акурат на ганку ён сутыкнуўся з Ківайкам. Хапатлівы, збянтэжаны, Ківайка сунуў яму руку. Не ўбачыўшы адпаведнага руху, перавёў яе на жэст і як бы ўзрадаваўся:

— О, Павел!..— І больш нічога не мог сказаць. Павел нічым не выявіў сваю радасць ад сустрэчы. Ківайка калупнуў мысам чаравіка масніцу на ганку. Ужо саступіўшы на зямлю, кінуў: — Я ў райком. Глядзі там...

Выкліканы ў райком Сарокінай, Ківайка цяпер, як ні дзіўна, думаў не пра сваю размову з ёю, а пра Дроба. Ён усё-ткі мог перажываць. Але бяда была ў тым, што перажываў толькі да пэўнай мяжы, якраз за якою і пачалася б шліфоўка характару. Так атрымалася і ў выпадку з Дробам. Ківайку хапіла перажыванняў. На скронях у яго прыкметна забялелася сівізна. Спачатку, у гаражы, ад пярэпалаху. Потым ад думак, як усё ціха і скрытна ўладзіць. Тут ён ужо разумеў, што ідзе на крутню, чаго не павінен сабе дазваляць. Знай-

шоў апраўданне, што робіць ён гэта не з жаданнем скінуць з сябе віну, а каб ухіліцца ад пакарання. Што выйграе Дроб, калі яго,Ківайку, пакараюць? Ды нічога. А яму,Ківайку, заслоніцца высокі журналісцкі свет. Адале, калі змог дамовіцца з хірургам, усё спрасцілася, залежала толькі ад яго. І ён не марудзячы ўзяўся сумяшчаць сваю і Дробаву пасады. Такі крок ён палічыў настолькі высакародным, што, як падумаў, нават змізарнеў у сваіх жа вачах. Узяў і купіў адну мыліцу. Праўда, ён не ведаў, зручна будзе Дробу на адной ці не. Можа, калі б пэўна ведаў, то купіў бы дзве. А потым усё пайшло як нельга лепш. Дроб ляжаў дома, газета выходзіла па графіку. Ён стаў нават нахабнічаць: пытацца ў Дроба, ці хутка выздаравее. Як быццам тут нічога непрыстойнага няма. Але хто калі ўбачыў пацёмкі чалавечай душы, якая хавае ў сабе, як айсберг, дзевяць дзесятых таго, што па чалавеку відаць і што ён гаворыць.

Павел ступіў у калідор, доўгі і вузкі, як тунель. І першае, на што звярнуў увагу,— гэта на густа прыпудраную пылам лямпачку пад столлю. Можа, таму, што лямпачка гэтая гарэла ўдзень і ўначы, быццам не было да яе выключальніка. Кажуць, яшчэ пры Сталіне ў гэтым будынку быў райвыканком. Можа б, і не помнілі людзі гэтую акалічнасць, калі б не старшыня выканкома, які «праславіўся» ў свой час тым, што ў кабінеце побач са Сталіным вешаў і свой партрэт, пацвярджаючы гэтым сваю беззапаветную адданасць правадыру.

Павел смела адчыніў дзверы прыёмнай. Света штосьці пільнае пісала. Не адразу падняла на стук галаву. А калі падняла — усхапілася, села, зноў устала. Сум у яе вачах не быў новы для Паўла. Ён чытаў яго кожны раз, калі Света прыходзіла адведаць. Але Павел убачыў у ім іскрынку адчужанасці. Яна сапраўды з'явілася ў Свеціных вачах ці, можа, Павел раней не прыкмячаў яе? Разгадаць было не проста, а думаць пра штосьці кепскае не хацелася. Павел, падышоўшы і крануўшыся Свецінай рукі, якая ляжала на краі стала, сказаў:

— Добры дзень, Святло!..— У яго ным голасе, які задрыжаў, было столькі ўрачыстасці, якую надаюць толькі артысты на святочнай сцэне. Ён убачыў, што яна прапусціла яго словы міма вушэй, спытала:

— Ну як ты, Павел?..

— Во бачыш, прыйшоў...

Яна глядзела на яго, сілячыся зразумець, што ён яшчэ не дагаварыў.

У прыёмную зайшоў Касцяніцын. Размінаючыся з Паўлам, абдаў вострым пахам духоў і, кінуўшы «добры дзень» так, быццам яны сто гадоў бачыліся, паклаў перад Светаю на стол спісаныя буйным почыркам, што аж праціснуў паперу, аркушы.

— Перадрукуйце, Святлана Міхайлаўна, мой фельетон.

Гэты ягоны афіцыёз інакш не мог успрыняцца, як любімае ім яхідства. Праўда, Паўла яно зусім не закранула.

— А як твае справы, Святло? — спытаў Павел, як толькі за Касцяніцыным, які, павярнуўшыся, яшчэ раз пагардліва глянуў, зачыніліся дзверы. Гэта было не пустое пытанне. Паўла напраўду турбавала Свецiна здароўе. Ён не раз вяртаўся ў думках да свайго намыслу ажаніцца са Светаю.

— Ой, як ужо ў мяне!..— сказала яна і махнула рукою, адмаўляючыся гаварыць пра сваё здароўе. Павел разумеў, што настойваць нетактоўна. Каб не насцярожваць Свету, ён паказаў, што пытаўся проста так, дзеля прыліку, бо і сам загадзя ведае: у яе ўсё добра і ні пра якія заганы ў яго няма думак. Ён раптам узрадаваўся, на нейкае імгненне ўсумніўшыся, што і праўда гэта лухта — быццам у Светы зрушаная псіхіка. Уражлівая душа, вось і адбіваецца на ёй любая эмацыянальная нагрузка. Канечне, жалезабетон не прымусіш трымцець. Павел нават падумаў, што гэта, мусіць, зусім някепска браць да сэрца чужую бяду. Яму яшчэ больш стала шкада Свету, безабаронную перад жыццём. Здавалася, усё зрабіў бы, каб дапамагчы ёй цвёрда ўладзіцца ў гэтым свеце, які яна бачыла такім, як бачыла і разумела сябе. І апошняе, што ён падумаў, выходзячы з прыёмнай: яму трэба заставацца тут дзеля Светы.

**9**

На стадыёне было шмат народу. Стракатае кальцо людзей, што сядзелі на лаўках рознай вышыні, акаймавала футбольнае поле. Павел ледзь ушчаміўся на ніжнюю лаўку.

Сустракаўся мясцовы «Сокал» з камандаю суседняга раёна. За «Сокал» гуляў іх шафёр — Савянкоў, даўгалыгі, як бізун, з вогненна-рыжай галавою хлопец. Павел угледзеў яго і сачыў за ім. Савянкоў гуляў у нападзенні.

«Сокал» покуль прайграваў адзін мяч. Балельшчыкі сумавалі. Вось Савянкоў атрымаў дакладную навясную перадачу з процілеглага краю поля, хітрым фінтам абвёў абаронцу саперніка, да варот — падаць рукою... Удар! Мяч з тугім свістам пралятае над перакладзінаю.

— Мазіла!!!

Павел павярнуўся на дзікі енк суседа і пачуў адборныя мацюкі. Справа сядзела кампанія хлопцаў — у расхрыстаных кашулях, з валасамі-патламі і п'яным бляскам у вачах. Адзін на аднаго падобныя, як фасоліны ў струку.

Хвілін праз пяць яшчэ адзін мяч са звонам уляцеў у сетку «Сокала». Мацюкі, свіст, гіканне пасыпаліся як з прадранай торбы.

— Паводзьце сябе прыстойней! — Павел ужо не мог трываць.

— Што-о-о?..— вырачыўся на яго сусед з маленькай і выцягнутай, як у пацука, прышчаватай мордачкаю.— Сядзі, настаўнік!

Уся кампанія павярнулася да Паўла, лыпаючы вачыма: што здарылася?

— Ды вось выхоўваць сабраўся.— Сусед з прышчаватай мордачкаю хіснуўся на Паўла.

— Асцярожней! — цвёрдым голасам папярэдзіў Павел.

— А ты не можаш памяняцца ролямі, чувак? — заржала кампанія, і зноў усе ўперыліся асалавелымі вачыма на футбольнае поле.

«Хамы,— падумаў Павел,— а міліцыі, як звычайна ў такіх выпадках, няма...» Настрой быў сапсаваны. Павел падняўся і пайшоў са стадыёна, мяркуючы заглянуць у рэдакцыю ды зрабіць на панядзелак макет чацвёртай паласы. Балазе праграму ТБ купіў. Але і разлікі, якімі ён заняўся, не лезлі ў галаву. Павел сядзеў, утупіўшыся ў акно, і думаў, як будзе сустракаць Свету, якая прыедзе ўвечары з дому.

Дзверы адчыніліся нечакана. У кабінет уляцела Света. Запыханая, вочы ў слязах. Павел здрыгануўся, убачыўшы яе. Спалохана ступіў ёй насустрач і ўзяў за

рукі. Яны былі халодныя як лёд. Ён баяўся пачуць зноў нясkладную гаворку. Света вохкала, не могучы прамовіць слова. Павел нават пачаў траціць цярпенне.

— Наташа памерла... Мікрашэвіч.— Света закрыла хусцінкаю вочы.

Павел апусціўся на крэсла. Галава слаба цяміла, але ён разумеў, што гэта — не проста смерць. Ён доўгі час стаяў нерухома, як слуп. Думкі пачыналі праясняцца паволі, як абрысы далёкага дрэва ў ранішнім тумане. Чаму яна памерла, чаму не выратавалі яе ўрачы? Няўжо рэўматызм невылечны? Што не дазволіла ёй стаць на ногі? Ёй — вясёлай, шустрай і жыццярадаснай. Што разбіла яе маладое сэрца? І чаму павінна была памерці іменна яна, дзяўчына, перад якою ўвесь час адчуваў віну? Сэрца яе аказалася разбітым, вядома, не праз яго. Яна ж ведала, што ён не хацеў, каб яе звальнялі. Яна не пакрыўдзілася на яго, толькі пажадала поспеху: «Поспехаў вам, Павел!» Ён помніць ейныя чыстыя вочы ў той момант.

Не, ён не вінаваты, што яна памерла... Ну праўда ж, Наташа? Ён звяртаўся ў думках да дзяўчыны, ведаючы, што ніколі ўжо не пачуе яе голасу. Ён не вінаваты, што яна памерла... Не ві-на-ва-ты. Правільна. І ўсё ж, усё ж... Чалавек павінен адчуваць віну за заўчасную смерць іншых. Калі б яго не накіравалі ў Глушава, яна яшчэ б працавала тут. І, можа б, не захварэла, бо хвароба, мусіць, таксама выбірае пэўныя моманты. Ну чаму яна захварэла, такой маладой і так цяжка, што не дапамагла медыцына? У яго забалела сэрца. Ён падумаў, што таксама гатовы зараз памерці.

Свецін голас яму чуўся як праз вату. Здаецца, яна гаварыла, што паедзе на Наташыну магілку. Ён падняў галаву. Вочы ў Светы былі чырвоныя, дрыжала ніжняя губа. Ён таксама паедзе з ёю. І не толькі таму, што адной Свеце небяспечна выбірацца ў далёкую дарогу. Яны размаўлялі бы праз сцяну ці як у наўмысна разыграным сне.

...Ад райцэнтра да вёскі, дзе жыла Наташа, пайшлі пешкі. Было зусім яшчэ рана. Дарога вяла па жыце. Сонца стаяла ў мутнай жаўтлявай смузе. Шэры цяжкі з начы пыл нізка курэў пад нагамі, браўся на абутак. У прыдарожным кусце лазы ўстрывожана чачэкала сарока.

Света спынялася, зрывала ў жыце васількі, на якіх блішчала раса. Падносіла іх да твару і, удыхаючы водар, плакала. Слёзы капалі на васількі і блішчэлі там разам з расою.

Павел нёс у руцэ сумку. Думна было ў цяжкой ад бяссоння галаве. Успомнілася, як адна студэнтка сказала: «Калі б я адчула, што ў мяне безнадзейная хвароба,— я пакончыла б з сабою». А ці так гэта? Ці бывае хвароба безнадзейнай для чалавека? Для ўрачоў, блізкіх яна можа быць — так. А для самога чалавека, які хварэе? Мусіць, не. Нельга ж уявіць, што цябе не стане, што ты не заснеш і прачнешся, а згубішся. І згубяцца твае вочы, твой слых, твае адчуванні... Для цябе згубіцца свет — гэта цяжка ўявіць, як і тое, што сусвет бясконцы. Не, для чалавека не бывае безнадзейных хвароб. Ён абавязкова будзе думаць: вось пройдзе тыдзень, месяц, няхай год, і ён забудзе пра сваю хваробу. Нарэшце ж павінна абрыднуць мэньчыцца з ёю. Бо што такое хвароба ў параўнанні з самім чалавекам? Хіба яна прымусіць яго скарыцца? Лухта! Чалавек будзе заўсёды бачыць, чуць, адчуваць... Будзе жыць! Аддаваць жыццё ва ўладу якойсьці там хваробы? Ды ніколі!

Павел не разумеў сябе: чаму ён так паўстаў супроць хвароб? Як быццам прадчуванне нейкае, ці што. Падобна, што ён загадзя абараняецца, набірае ў сябе мужнасці змагацца.

Бабулька, што гнала хлудам чорных коз, расказала ім, як знайсці хату Мікрашэвічаў. Потым доўга глядзела ўслед, ківаючы сівою галавою. Козы тым часам шчыпалі з чужога гародчыка шырокія жоўтыя парасоны касачоў.

На двары яны ўбачылі жанчыну. Яна сядзела на слонцы і трымалася за лоб. Пачула людзей і ўстрапянулася, як параненая птушка. Твар яе быў застылы і нерухомы. Пад вочы ўрэзаліся глыбокія чорныя кругі. Вецер матляў каля шчакі пасмачку белых валасоў, што выбіліся з-пад чорнай хусткі. Гэта — Наташына маці. Такой сшарэла-нежывой можа быць толькі маці, якая пахавала дачку.

— Я — сяброўка Наташы, Света...— сказала Света, сустрэўшыся з няцямлівым позіркам жанчыны, якім яна акідвала гасцей. Спахмурнелы, стаяў пасярод двара Павел і глядзеў на жанчыну з болем і смуткам.

— Хто?.. Сяброўка? Света... Наташа ўспамінала ця-

бе часта... Пахавалі доньку...— Вочы ў жанчыны заплывалі слязьмі і рабіліся невыразныя, як сляпыя. Яна падцінала сінія, пакусаныя вусны.— Хай бы яна якая ні была, ды была жывая, са мною, і я бачыла яе жывую... І яна каб толькі знала, што я.., яе маці...— шаптала жанчына, прыгнечаная, ссівелая за кароткі час. Мусіць жа, яшчэ не старая. Наташы, першай дачцэ, толькі дваццаць год. Праўду кажуць: не дай гасподзь хаваць бацькам сваіх дзяцей. Бо яны ж павінны цягнуць нітку роду далей. Іначай не будзе самага каштоўнага золата планеты — чалавецтва. Думайце, людзі, пра гэта, думайце, калі глядзіце на мёртвага чалавека... не, на мёртвага — позна ўжо, думайце, гледзячы на немаўля!

Света ціха сказала жанчыне, што яны сходзяць з Паўлам на Наташыну магілку. Жанчына загаласіла, здушана і сіпла.

Могілкі былі за вёскаю — высокія, з непадатліватугім зялёным вяршаллем сосны. Нізкі сіні штакетнік недарэчна весела апяразваў іх. Магілку знайшлі адразу: новыя вянкі былі відаць здалёк. Ішлі, задыхаючыся, быццам тут, сярод крыжоў і помнікаў, не хапала паветра. Бязглуздзіца нейкая: няўжо і мёртвым патрэбна паветра? Узрушанаму, стомленаму падумаецца што хочаш. Павел прыкмячаў за сабою, што ў стане, непадуладным асэнсаванню, да яго прыходзяць нечаканыя, часам парадаксальныя думкі.

Чырвоная пірамідка з фатаграфіяй Наташы была аслонена вянкамі. Ад родных і блізкіх... Ад калектыву настаўнікаў і вучняў... Ад праўлення калгаса... Вецер вяла варушыў чырвоныя стужкі, і яны ўздымаліся над зямлёю хісткімі вузкімі языкамі полымя.

Павел нахіліўся і пацалаваў халоднае шкло, пад якім была фатаграфія, і на вуснах доўга трымаўся гэты мёртвы, шкляны холад. Наташа была на фатаграфіі надзіва сур'ёзная, з разумнымі, глыбокімі вачыма, з якіх, здалося, чыталіся страх і адчай.

Света стала перад магілкаю на калені. Паклала на яе букет васількоў. Дзве пасаджаныя рудаватыя скочкі глядзелі з жоўтага магільнага грудка мёртвымі Наташынымі вачыма. Па бледных Свецiных шчоках цяклі слёзы. Бліскалі мігатліва і квола, як сняжынкі.

— Даруй, Наташа!..— прашаптаў Павел. Свецiны вусны таксама штосьці шапталі. Думкі Паўлавы зноў закруціліся вакол таго, пра што разважаў дарогаю, калі

ішлі праз жыта. Чаму чалавек не памірае для самога сябе? Бо ён верыць у жыццё — да канца, аж да таго моманту, калі страчвае апошнюю дольку розуму, якая дазваляла яму ўсведамляць, што ён жыве. Нішто іншае, а толькі надзея нараджае ў чалавека і цікавасць да жыцця, прымушае думаць, што ёсць сонца, вецер, дрэвы, кветкі... Вось і той цяжарнай жанчыне патрэбна была рэдкая група крыві, і яе знайшлі дзякуючы яму, Паўлу.

Чалавек з надзеяй глядзіць нават у вочка пісталета. Вядома, цяжка сказаць, што праносіцца гэтым часам у ягонай галаве. Ніхто з забітых яшчэ не вярнуўся і не сказаў, што ён адчуваў да таго апошняга мікраімгнення, покуль куля не дакранецца да скуры лоба.

З такімі цяжкімі думамі Павел вяртаўся з могілак. Ён суцяшаў, супакойваў Свету. Вочы ў яе раптам зрабіліся чужымі і халоднымі, з той самай іскрынкаю адчужанасці, якая ўразіла Паўла ў першы дзень пасля выздараўлення. Няўжо гора забірае з чалавека яшчэ і цяпло?

Паўлу стала трывожна, сэрца раздзіралася скрухаю. І яму было б яшчэ цяжэй, калі б не прыехаў сюды, на Наташыну магілку. Пакутліва было б насіць незразумелую віну перад дзяўчынаю. Лепш павініцца і пэўна ведаць, што не вінаваты, чым, не павініўшыся, сумнявацца ў сваёй невінаватасці.

Раптам Света замарудзіла крок, канвульсіўна тузанула плячом і засмяялася гарэзліва-бязглуздым смехам. Павел з жахам глянуў на яе белы, без крывінкі твар і не мог звесці сківіцы, каб прамовіць слова. Мутная павалока на Свеціных вачах патушыла на яе твары жывое святло.

— Во дурная! — кпіла з сябе Света.— Прыехала да Наташы, а пайшла на могілкі.— І, закінуўшы галаву і звонка смеючыся, пабегла вуліцаю, неяк нязграбна кідаючы ў бакі ногі і ставячы іх роўна адна процi другой.

«Ёй не трэба было хвалявацца!..» — Павел не ведаў, што рабіць. Яна нічога не цяміць, што гаворыць. Ёй стала блага. Яна звар'яцела... Павел не чуў пад сабою ног, не чуў рук і ўсяго сябе. Здавалася, узвіўся ў паветра і вісіць у ім, бязважкі, як касманаўт. Што рабіць? Бачыў, што прамежак між ім і Светаю не павялічваецца — значыць, і ён бяжыць услед за ёю.

— Света, пачакай! Чуеш? Пачакай, Святло!..

Яна не аглянулася нават. Смяялася з сябе, што, як дурніца, пайшла на могілкі, а Наташа чакае яе ў хаце.

Нашчэнт разгублены, Павел не ведаў, куды кінуцца ў гэтай чужой незнаёмай вёсцы. Як растлумачыць людзям усё гэта? Можа, дзе-небудзь блізка тэлефон? Трэба званіць у бальніцу. Няйнакш, у Светы зацьменне розуму. Ну, канечне ж, ёй нельга было так моцна хвалявацца. Ёй трэба пазбягаць стрэсаў. Ён жа думаў пра гэта ўжо не раз.

Света бегла і бегла па вуліцы. Павел то ішоў шырокім крокам, то стрымана трусіў. Куды яна бяжыць? Хату Мікрашэвічаў ён не запомніў. Ды нечакана Света звярнула ў двор. Павел, падбегшы, пазнаў хату — зялёныя вароты, збоч куст бэзу і самалёцік на калку. Света кружыла па двары і чамусьці тузала дзверы ў хлеў.

Павел паспрабаваў пасадзіць яе на слонец, але яна вырвала сваю руку. Іх пачула і выйшла з хаты Наташына маці. Павел убачыў, што ў яе круглыя сінія вочы. «Як у Наташы...»

— Свеце блага,— сказаў Павел.— Яна расхвалявалася на могілках, і ёй стала блага... Вы бачыце, яна ўся белая.

— Мне не блага, я Наташу хачу бачыць. Яна во тут,— Света паказала на дзверы хлява.

Павел глядзеў на гаспадыню. Яна, не сказаўшы ні слова, хітнулася ў хату. Выскачыла адтуль з фуфайкаю ў руках, падбегла да Светы і накінула фуфайку ёй на галаву. Света істэрычна закрычала, сцягваючы з галавы фуфайку. Яе крык быў падобны на перадсмяротны крык зайца, што трапляе ў кіпцюры драпежніка.

— Трэба пазваніць... Дзе тэлефон? — стаяў і махаў рукамі разгублены Павел.

— У нас ёсць тэлефон,— скрозь натугу прамовіла гаспадыня, ямчэй ухутваючы Свеціну галаву фуфайкаю.

Павел кінуўся ў хату. Тэлефон стаяў у прыдзелку на акне. Ён набраў «03». Пот густа блішчэў на яго лобе і носе. На падаконніку ляжалі вялікія чырванабокія яблыкі.

Ён выйшаў з хаты на двор. Света сядзела з гаспадыняю на слонцы. Яе чырвоныя, як вішні, вочы плакалі. Павел падышоў і ўткнуўся тварам Свеце ў калені. Адчуў на галаве руку, і вусцішна затрымцела душа. Чыя гэта рука?

## 10

Пасля таго як Свету забралі ў бальніцу, Павел не помніць, як вярнуўся назад. Помніць толькі, што ехаў цягніком, але ў памяці не засталося ні станцый, ні раз'ездаў, на якія ён любіў глядзець у спакойных паездках і якія, пэўна ж, былі і на гэтым маршруце. Усе яго думкі былі спавіты адным — Свецiным вар'яцтвам.

Некалькі дзён ён хадзіў змрочны, у глыбокай тузе.Ківайка, уведаўшы прычыну, не чапаў яго, але і не вельмі перажываў за Свету. Павел нават чуў, як ён заводзіў размову з Чартковым пра новую машыністку. «Канечне, каму чужое баліць»,— думаў Павел.

Павел пазваніў у райцэнтраўскую бальніцу, куды павезлі Свету, і яму сказалі, што хворую перапраўлілі ў Магілёў. Ён дазваніўся да Магілёва, і прыемны, мяккі жаночы голас адказаў: «Такіх адпраўляюць у спецыяльную бальніцу ў Пячэрск».

Так, яна будзе там. Паклаўшы трубку, ён доўга думаў, што яму рабіць. Думкі разбягаліся: ці то званіць у Пячэрск, ці адразу ехаць туды, ці зусім перш звязацца са Свецінымі бацькамі і ўжо разам вырашаць.

Ён спыніўся на апошнім варыянце, які акурат аказаўся самым правільным. Што ён, Павел, паехаў бы туды, як і чым тлумачыў бы сваё дамаганне пабачыцца з хворай, калі нават маці не пусцілі? Сказалі: хворая ў цяжкім шокавым стане і яе ні ў якім разе нельга трывожыць. Павел шкадаваў ужо не толькі Свету, а і маці, з шырокімі цёмнымі кругамі вакол вачэй, якую не было каму там суцешыць, запаліць у сэрцы хоць маленькую надзею.

А неўзабаве ён і сам апынецца ў такой трывозе і разгубленасці, што на нейкі час прытушыцца неспакой і за Свету, і за яе маці. Тым днём у рэдакцыю прывезлі новую імпартную мэблю, і яе насілі ў кабінеты. Павел нёс з Брэшкам даволі ёмкі двухтумбавы стол. Трымалі яго, абернуты дагары, за слізкі паліраваны верх. Павел ішоў першы задам, і калі падымаліся на ганак, стол пачаў выязджаць з рук. Ён прыпыніў Брэшку і паставіў пад стол правае калена. І ў гэты момант адчуў боль. Адкуль і што? Ён нічога не сказаў Брэшку і, чырвоны ўжо не ад натугі, а ад неспадзяванасці, панёс стол у кабінет.

Назад услед за Брэшкам не пайшоў, затрымаўся, не

знаходзячы смеласці дакрануцца да нагі. Яму здавалася — там нешта жудаснае і балючае.

— Што, Павел, задумаўся? — крануў яго Аднамах. Павел вымучыў усмешку, не адрываючы вачэй ад акна. Ён пайшоў у туалет, сустрэўшы па дарозе Піліпаўну з мятлою ў руках, зачыніўся там і, ссунуўшы да калень штаны, абмацаў правую нагу. Крыху вышэй калена адчуваўся цвёрды выступ, як на паўяйка. Адкуль ён тут узяўся? Павел, здаецца, ніколі яго не намацваў. Ні ў дзяцінстве, калі абдзіраў жывот, лазячы па дрэвах, ні ў школе, дзе быў спартсменам-бегуном, ні ва універсітэце, дзе займаўся трохі барацьбою і футболам. І тут яго апаліла: «Няўжо тое, пра што гаварыў Аднамах?..» Так, так, ён жа казаў Паўлу, каб узяў даведку, што траўму атрымаў на рабоце. Павел тады пасмяяўся.

Павел паспрабаваў сябе супакоіць. Грудзі яму захліснула гарачыня, аддала ў галаву. У вачах мярэжылася блакітнае мроіва. Ён крыху счакаў і адно тады, прычасаўшыся перад люстэркам, выйшаў з туалета. Маладасведчанаму ў медыцыне, яму здавалася, што ў яго самае страшнае — рак косці. А гэта — усё, смерць. Паміраць яму, канечне, не хацелася. Мала пажыў, мала зрабіў, нічога пасля сябе не пакінуў. А як без гэтага паміраць? У кожнага пасля смерці павінна заставацца на зямлі нешта такое, што напамінала б людзям аб ім. У аднаго — дзеці, у другога — кнігі, у трэцяга — будынкі... Як за кволую надзею, ён ухапіўся за тую маладую маці і дзіця, якім ён аддаў сваю кроў. Можа, яна калі-небудзь назаве яго прозвішча і скажа сыну: вось гэты дзядзька твой хросны бацька, ён выратаваў нам жыццё.

Усю ноч ён блага спаў. І гэта было яму так прывычна пасля двух месяцаў пакутлівага ляжання. Раніцаю, папрасіўшы Брэшку, каб папярэдзіў рэдактара, Павел пакіраваў у бальніцу. Прыняў яго той самы, ужо знаёмы хірург — смуглатвары, з вузкімі чуйнымі рукамі. Ён нейкі час уважліва глядзеў на Паўла. Ці то ўспамінаў, дзе бачыў, ці то ўразіўся ягоным хваравітым выглядам. Павел зразумеў, што ён нічога не помніць. Яно і зразумела. Колькі чалавечых твараў праплывае ў яго перад вачыма за дзень. Ён мацаў сваімі чуйнымі рукамі нагу, а Павел, не гледзячы яму ў вочы, чакаў ад яго прысуду. Хірург нічога не сказаў, сеў за стол і стаў заклапочана пісаць. Павел хацеў быў раззлавацца і

спытаць, чаму маўчыць, не гаворыць хірург, але ўспомніў, што ўрач і не павінен нічога тлумачыць. Хірург устаў, порстка, бы салдат, які ўбачыў начальніка, працягнуў Паўлу паперыну.

— Вось вам накіраванне, паедзеце ў Мінск на абследаванне.

— А што ў мяне, таварыш доктар? — вырваўся трагічны голас у Паўла.

— Там скажуць.

Ужо на вуліцы Павел прачытаў, што накіроўваецца ў БелНДІ экспертызы працаздольнасці і арганізацыі працы інвалідаў. Гэта яго ўзрадавала і шакіравала адначасна. Узрадавала, бо, як было відаць з паперы, падазраваецца не самае страшнае, а шакіравала слова «інвалідаў». Ну, дзе тут не ўспомніш Аднамаха і не пазайздросціш ягонай абачлівасці?

Ківайку Павел не прызнаўся, па якой хваробе едзе ў Мінск. Сказаў проста, што кепска сябе адчувае.Ківайка доўга і дапытліва глядзеў на Паўла, мяркуючы зразумець, якую небяспечную справу той задумаў.

— Ну ўсё, я пайшоў,— сказаў Павел і зачыніў за сабою дзверы. Ужо ў акне, агледзеўшыся, убачыў, штоКівайка махае яму рукою і ўсміхаецца.

...На вакзале ў Мінску Павел падышоў да будачкі-даведачнай і спытаў, як даехаць да інстытута. Маладая тоўстая жанчына з чорнымі шырокімі бровамі назвала яму адрас і сказала, як даехаць. Ён прайшоў па падземным пераходзе да станцыі «Дружная», з якой адпраўляўся аўтобус.

Інстытут аказаўся агромністым сучасным збудаваннем з некалькіх карпусоў, якія, злучаныя адзін з адным, стаялі на ўзвышанасці. Павел добра такі пахадзіў, покуль трапіў у патрэбныя яму дзверы. Каля кабінета тоўпілася шмат народу. Забіты ўвесь калідор, аж боязна падыходзіць. Але што рабіць? Не вяртацца ж назад. Павел спытаў, хто апошні. Яму некалькі галасоў дружна адказалі, што чарга ўжо даўно замкнута і што заўтра з раніцы запіс на новую. Павел пацiснуў плячыма, але згледзеў, як у натоўпе заварушыўся высокі чалавек з сівой галавою. Павел адразу не ўцяміў, чаму чалавек так шырока, прыязна ўсміхаецца, гледзячы на яго. Толькі калі пачуў радаснае: «Паўлік, здароў!» — зда-

гадаўся, каго сустрэў тут у гэтую нялёгкую для яго хвіліну. Перад ім стаяў паэт Ляшчэня.

— Ну, давай адыдзем вунь, пагаворым,— Ляшчэня па-сяброўску абняў Паўла за плечы і, накульгваючы на абедзве нагі, павёў яго да шырокай, абцягнутай цыратаю канапы. Для Паўла сустрэча была такой прыемнай нечаканасцю, што ён моўчкі падпарадкаваўся Ляшчэню, ціха радуючыся, што цяпер ужо не прападзе.— Дык якім ветрам, Паўлік? — спытаў Ляшчэня, калі яны селі.— Ты, бачу, узмужнеў!..— І, таксама не хаваючы сваёй радасці, паляпаў Паўла па плячы. Прызнацца, Павел адно цяпер успомніў, што, як паехаў з Мінска, ні разу не напісаў Ляшчэню пісьма, не павіншаваў паштоўкаю. Канечне, каб увесь час сядзела гэтая думка, што сустрэнуцца, дык напісаў бы. Але хто з нас ведае, дзе на гэтай грэшнай зямлі, каго і з кім сутыкне загадкавы і мудры бацюхна-лёс?

Павел расказаў пра сябе. Канечне, зусім мала з таго, што было пражыта. І не таму, што быў стрыманы ці саромеўся ў чым-небудзь прызнацца Ляшчэню. Як бы хораша і падрабязна чалавек ні размалёўваў свой лёс, усё роўна гэта будзе толькі кволы адбітак сапраўднага. Чалавечая памяць трымае або дробязі, або незвычайныя моманты.

— А я таксама во,— Ляшчэня пляснуў па тоўстых, як у жанчыны, каленях растапыранымі рукамі.— Баляць ногі, пухнуць, не магу хадзіць... Солі, ці што?

— Даўно ў вас?

— Ды ўжо даўно. Але ўсё горш і горш. Гады, Паўлік, так ці не? — Ляшчэня патузаў Паўла за плячо, засмяяўся.— Яшчэ не знайшоў сабе там кралю?

— Складана ў мяне з гэтай справаю,— сказаў Павел.

— Нешта вы з Людаю хутка разбегліся?

— А-а!.. Дзе яна цяпер, што з ёю? — Паўлу было цікава пачуць пра Людмілу. Яна напаміна́ла яму пра Мінск, пра студэнцкае жыццё, адна толькі думка пра якое запальвае ў грудзях светлую, шчымлівую радасць.

— Ды ўжо замуж выйшла... Дзіця мае, кватэру... На ўласных «Жыгулях» ездзіць. Словам, знайшла шчасце, якое шукала.

— А хто ў яе муж? — Павел і сам не ўсачыў, як сарвалася з языка пытанне.

— У яе прынцып у выбары просты: менш інтэлекту,

а больш грошай. Прапаршчык яе муж. З ваенкамата. Нібыта палкоўніцкі сынок.

І тут Павел, вярнуўшыся ў даўняе, са страхам падумаў, што зрабіў бы вялікую памылку, калі б ажаніўся з Людмілаю. Ён проста шчаслівы, размінуўшыся з ёю. Напамін пра шчасце, які пачаў ужо лагодзіць яму настрой, раптам вярнуў яго ў сённяшні дзень. Загаманіліся, а што рабіць з чаргою?

— Го-о! Той бяды!.. Іншагародніх без чаргі пускаюць. Там на дзвярах напісана.

— Во добра! Я, мусіць, і не дабраўся б да тых дзвярэй, а мне ніхто не падказаў.

— Спадзявайся ў жыцці заўсёды на старых сяброў,— сказаў бадзёра Ляшчэня, міргнуў вокам і зноў паляпаў Паўла па плячы. Павел адчуў, так проста ён не можа расстацца з Ляшчэнем. Падаць руку і пайсці. Гэта яго цяпер, калі ўладзілася з чаргою, турбавала больш за ўсё. Ляшчэня як бы адгадаў ягоныя думкі, запрасіў да сябе начаваць.

— Я б з задавальненнем, але работа... адпрасіўся на дзень. Калі ўжо не спраўлюся сёння — тады.

Дамовіўшыся, Павел пачаў прабірацца да дзвярэй. Яго штурхалі, тузалі, засланяючы ход. Ён паказваў усім паперу, і яго прапускалі.

У кабінеце за двума ссунутымі сталамі з накладзеным паверх тоўстым шклом, пад якім ляжалі паперы і выразкі з газет, сядзелі мужчына з вострым, як указка, носам, што неяк няўдала падтрымліваў масіўныя акуляры, і светлавалосая жанчына. Між імі спінаю да ўвахода стаяла яшчэ адна жанчына і, нешта паказваючы, бойка выпальвала словы. Мужчына паказаў на жанчыну, што сядзела насупраць і цяпер папраўляла каля вушэй светлыя густыя валасы. Здаецца, жанчына павінна была б звярнуць на яго ўвагу, але яна разглядала бліскучыя басаножкі ў руках той жанчыны, што стаяла і нахвальвала:

— Чэхаславацкія, з высокім абцасікам... І недарагія, скажу я вам.

«Усюды адно і тое»,— падумаў Павел, не ўкладваючы нічога пэўнага ў свае словы. Проста ён хацеў сказаць, што і тут, як у чарзе перад кабінетам, трэба набрацца цярплівасці і чакаць.

Нарэшце светлавалосая жанчына забрала ў Паўла накіраванне. Робячы ў журнале запіс, штосьці прамар-

мытала. Мужчына тут жа паказаў Паўлу на нізкі, з крутым патаўшчэннем у галавах тапчанчык. «І штаны, штаны!..» — хуценька дадаў ён, патрэсваючы тонкай, амаль дзіцячай кісцю.

Павел выканаў загад і лёг. Мужчына паправіў акуляры, ад чаго нос, здалося, яшчэ больш падаўжэў. Папрасіў напружыць мышцы на абедзвюх нагах. Павел напружыў. Мужчына, адышоўшыся, паўглядаўся, схіляючы галаву то ў адзін, то ў другі бок. Сказаў светлавалосай памочніцы:

— Трэба, Еўдакімаўна, здымак...

Усё, пачынаючы яшчэ ад глушаўскага хірурга, нагнятала напружанне. Павел, ужо змэнчаны, не ведаў, што яму рабіць. Гуляюць у маўчанку дактары, хоць забіся!.. Жанчына кіўком галавы паклікала Паўла. Адчыніла дзверы, якія былі за масіўнай шафаю. Яны зайшлі ў паўзмрочны пакой. Справа гарэлі чырвоныя лямпы. Каля іх, схіліўшыся, стаяла некалькі чалавек у халатах, малінава-яркіх і чыстых, злева вісела масіўная штора. Жанчына адхінула штору, з-за якой порстка ўдарыла святло.

На высокім і шырокім стале Павел улёгся гэтак жа, як і ў кабінеце ўрача. Жанчына апусціла ніжэй металічную скрыначку на рычагах і тонкім, як дроцік, промнікам прасвяціла нагу спачатку зверху, потым збоку.

Калі яны зноў вярнуліся ў кабінет, мужчына-ўрач сказаў Паўлу зайсці праз гадзіну. Павел, размінаючыся з чаргою, прыпыніўся каля Ляшчэні. Той, зірнуўшы на ягоны твар, устрывожана спытаў:

— Што сур'ёзнае?.. Не хвалюйся, усё будзе добра.— У Ляшчэні быў такі мяккі, надзіва спакойны голас, што Паўла апанавала абыякавасць да сябе і сваёй нагі. Павесялелым голасам ён сказаў:

— Жывы будзем, не памром!

— Во, правільна! Малайчына Паўлік! Ну, дык як наконт таго, каб да мяне ў госці? І Юрка мой цябе часта ўспамінае...

— Дзякуй, Міхась Пятровіч, але трэба ехаць. Праз гадзіну скажуць вынік.

Ляшчэня спачувальна пахітаў галавою. Было відаць, што ў душы ягонай затаілася маленькая крыўда на Паўла. Лепей было б, як яму ўяўлялася, калі б Павел згадзіўся заначаваць. Але дарослы, разумны чалавек,

Ляшчэня не мог махаць рукою на тое, што Паўлу нявыкрутка.

Роўна праз гадзіну Павел зноў праціснуўся ў кабінет да ўрача. Той адразу пазнаў Паўла і сказаў:

— У вас косна-храстковы экзастос...— замаўчаў, разглядаючы здымак, які выняў з шуфлядкі стала. Павел хацеў спытаць, што гэта такое і што цяпер яму рабіць.— Рэкамендуем аперацыю, бо можа разрасціся з цягам часу і замінаць хадзьбе. Дарэчы, тут усё напісана.— Вярнуў накіраванне.

Павел, ужо выйшаўшы на вуліцу, думаў, дзе можна аперыравацца. «У Магілёве можна, можна ў нас, калі вам зручна...» Цяпер, стоячы на прыпынку, ён думаў — дзе. Трэба звольніцца з работы, каб, паехаўшы на месяц ці два на аперацыю, ужо не вяртацца ў Глушава. Прынамсі, гэтага часу, покуль ён будзе ў бальніцы, яму хопіць, каб адвыкнуць ад наседжанага месца. Але ж пасля бальніцы яму давядзецца шукаць работу. Жыць і працаваць у Мінску, канечне ж, спакусліва, цікава і прэстыжна. Але раптам душа крута павярнула ўсе думкі да Светы. Яна ў Магілёве, і ўжо адно тое, што і ён будзе там, прыдасць ёй сілы. Так, ён будзе звальняцца. Іншага выйсця, здаецца, няма. Як і ў той травінкі, што адным карэньчыкам трымалася за зямлю і жыла і якую потым зусім вырвалі.

## 11

Павел загадзя ведаў, звольніцца яму будзе няпроста. Але не падазраваў, што справа так зацягнецца. Лічы, на месяц.

Прыехаўшы з Мінска, ён два дні нічога не казаў Півайку. Чакаў, можа, той спытае, як справы. Тады лягчэй будзе пра ўсё расказаць. Півайка маўчаў, хоць і хадзіў радасны. Мусіць, бачыў, што Дроб старанна ўзяўся чарціць макеты, а значыць, ніякіх дурных думак у яго няма. Півайка памыляўся і дарэмна, апанаваны радасцю, быў няўважлівы да спахмурнелага, засяроджанага Паўлавага твару. Півайка зразумеў гэта тады, калі неяк раніцаю Павел зайшоў да яго ў кабінет і афіцыйна, з ноткаю іроніі, павітаўся:

— Добры дзень, Фёдар Андрэевіч!

Півайка адразу адчуў: Дроб сказане зараз яму

штосьці нечаканае. Аднак не паказаў выгляду, што ўстрывожыўся. Напусціў на сябе вясёлую міну. Маўляў, усё ў ягонай уладзе. Ніхто і нішто не пахісне яго ўстойлівасці. Толькі ён, як бог, мае права караць і міла-ваць. А парыванні іншых можа стрымліваць адной левай.

— Я звальняюся,— сказаў Павел, нахабнавата гледзячы ў тварКівайку. Той хуценька апусціў вочы ў стол. Павел наглядаў, як Ківайка шумна дыхаў, як вугалькамі запунсавелі кончыкі ягоных вушэй, як ён хапіў аловак і пачаў нервова чыркаць на перакідным календары.

— Жартуеш? — спытаў, не паднімаючы вачэй.

— Не жартую.

Ківайка ніжэй нахіліўся да стала, засоп, выпускаючы паветра праз нос. Яго доўгія рудаватыя вейкі пляцалі раз за разам. Ён напружана думаў, каб не ляпнуць, сарваўшыся, што-небудзь бязглуздае. Ён, канечне, успомніў тут многае з таго, што здарылася апошнім часам з ім, Дробам, і са Светаю. Але не асмельваўся покуль спытаць у Дроба адкрыта. Баяўся пачуць абвінавачанне ў свой адрас.

Бачачы, як нялёгка шэфу, Павел пайшоў яму на выручку:

— Па асабістых абставінах. Вымушаюць.

Зноў Ківайка не спытаў — якіх. Зрэшты, стала зразумела хоць збольшага, і гэта крыху супакоіла. Для яго цяпер нават і добра — не ведаць пэўна, чаму звальняецца Дроб. У райкоме можна будзе вольна тлумачыць сакратару матывы.

— Ты ж ведаеш, што без райкома партыі мы не вырашым гэтую справу? — Ківайка спадзяваўся, што, можа, гэта адверне Дроба ад задумы.— Наменклатура РК КПБ.

— Ведаю.

— Я пагавару з Сарокінай.

Застаўшыся адзін, Ківайка сцяў галаву рукамі, быццам хацеў затрымаць у ёй усе думкі, што хлынулі вадаспадам. Разам з гэтым вадаспадам думак рушыўся свет і ляцела ў прорву ўсё: сам Ківайка, яго крэсла са сталом, уся рэдакцыя, урэшце, глушаўская зямля. Ён добра ведаў, што значыць для газеты Дроб. Страціць яго, здавалася цяпер Ківайку, значыць, усё паставіць на нуль і пачынаць спачатку. Не-е, толькі не спачатку! Ён

пакутліва і доўга думаў. Адрываў ад галавы рукі і, сціскаючы іх у маленькія кулачкі, біў па стале, аж падскокваў пісьмовы прыбор. НяўжоКівайка, які пачынаў сніць сябе ўжо, прынамсі, у абласной газеце, павінен адступацца ад усяго, што надавала яму ўпэўненасці, і спадзявацца зноў на богведама што? Гэта ўяўлялася яму жорсткай несправядлівасцю, згадзіцца з якой ён не мог. Чаму лёс такі здрадлівы? Няхай бы ішло ў чалавека, як ішлося. Гладка, чыста. Дык не. Абавязкова павінна нешта заступіць дарогу, перамалоць радасць жыцця ў бязлітасных жорнах і выкінуць — ужо як непатрэбнае і пачварнае.Ківайка разумеў, што ягоны крах, развал не пройдуць непрыкметна для жонкі, унясуць вэрхал, новыя сутычкі, якія ўжо наўрад ці будуць заканчвацца прымірэннем. У яго падрастаў сын, і ён, бацька, якому не вельмі салодкае дасталося дзяцінства, проста абавязаны забяспечыць яму шчаслівую будучыню.

У адчаі і разгубленасціКівайка ішоў у райком да Сарокінай. Цяпер палохаўся ўжо і таго, што апошнім часам ён зачасціў да яе на прыёмы. Відаць, не на дабро і гэта. У прыёмнай ён, наколькі хапіла артыстызму, напусціў на сябе спахмурнелы выгляд і адчыніў дзверы да сакратара. Сарокіна адразу насцярожылася, крышачку прыўзнялася з крэсла, не спускаючы з яго сваіх блакітных вачэй.

— Што здарылася, Фёдар Андрэевіч?

— Дроб уцякае ад нас...— Першая фраза, прыдуманаяКівайкам на хаду, была акурат. Ён толькі пасля гэта зразумеў, адчуўшы, што адразу падбухторыў Сарокіну супроць Дроба. А скажы ён: Дроб звальняецца ад нас — было б зусім не тое. Падыграла ўсё тая ж інтуіцыя, якая выручала яго ў жыцці часцей, чым розум.

— Не зразумела,— сказала Сарокіна.

— Зразумелая справа, з'ездзіў у Мінск, падшукаў сабе ў салідна газеце работку — і бывайце.

— Вы гаварылі з ім?

— Гаварыў. Цвёрды: звальняюся, і ўсё.

— Дык вось, Фёдар Андрэевіч, ніякіх звальненняў! Што за самасційнасць? Такую маю думку і перадайце, калі ласка, Дробу. Вы як лічыце?

Ківайку здавалася: ён ужо не сядзеў на крэсле, а вісеў у паветры.

— Ні ў якім разе! Што ж, мы падрыхтавалі кадра, а цяпер аддаваць некаму?!

Гарэзліва, як блазнюк, збегшы па прыступках на першы паверх, Ківайка чамусьці пяшчотна памацаў сцяну будынка, усміхнуўся і выкаціўся на вуліцу. Канечне ж, ён быў шчаслівы. Спадзеючыся на горшае, нават і блізка не думаў, што так ладна скончыцца размова з Сарокінай. Баста! Цяпер, таварыш Дроб, ты ў мышалоўцы і нікуды не выкруцішся. А сябе прыкрыць ёсць чым — словамі Сарокінай. Так і перадам: «...ніякіх звальненняў!» У парыве радасці Ківайка цяпер зусім не хацеў разважаць пра тое, як усё гэта ўспрыме Дроб, ці з такой адданасцю ён будзе чарціць свае макеты, як чарціў іх па сваёй волі.

Ківайка па тэлефоне выклікаў да сябе Дроба. Дроб зайшоў у кабінет напяты, з чаканнем у вачах. Ківайка зразумеў, што Дроб у яго адсутнасць удачаю сябе не цешыў.

— Ну што, Павел? Нічога не будзе...— Ківайка сказаў такім паніклым голасам, быццам зрабіў усё, каб дапамагчы Дробу, але не ўдалося, і вось цяпер шкадуе.

— Што Сарокіна сказала? — спытаў Павел, амаль не сумняваючыся, што сакратар райкома павінна была яго зразумець.

— Ніякіх звальненняў! Што за самасційнасць? — Ківайка глядзеў на Паўла сур'ёзнымі вачыма, спрабуючы ўлавіць зрухі, якія адбываліся зараз у ягонай душы. Адразу Павел паверыў у шчырасць Ківайкі. Але ён задумаўся над тым, як пачаў Ківайка размову з Сарокінай. Насцярожваў круты прысуд. Вядома ж, яго нешта выклікала. Вось толькі што? Тое, што сказаў Ківайка? Павел не пайшоў у наступ. Лепш не кіпяціцца. Трэба абдумаць усё халоднай галавою.

Некалькі дзён Павел хадзіў як апушчаны ў ваду. Рукі ні да чога не прычыняліся. Што і рабіў, дык прымусам — макеты ўсіх палос выходзілі нецікавымі, аднастайнымі, матэрыялы — прэснымі. Не, што б цяпер ужо ні здарылася, ён не зможа сябе прымусіць тут працаваць. Гэта будзе не праца, а гвалт. Над сабою і над іншымі. Зачэпка зларадвічаць такім, як Касцяніцын, і пасмейвацца ў рукаў такім, як Чарткоў.

Свеце званіў штодня. Ёй не лепшала. Цяжкі душэўны груз ціснуў на Паўла. У яго балела галава. Ён адчуваў, што доўга так не вытрымае. Няўжо трапіў

у безвыходную пастку? Узбуджаны, ён зацята і шмат думаў. Няхай не круціць хвастомКівайка. Ён — кіраўнік, і ўсё, у рэшце рэшт, залежыць ад яго. Павел свае абавязковыя тры гады пасля універсітэта адпрацаваў, аддаў нялёгкай рабоце раённага газетчыка. Па законе ён мае права пакласці на стол заяву і праз два тыдні не выйсці на працу. Праўда будзе за ім. Так і сказаў юрысконсульт, да якога ён хадзіў. Але ўсё ўпіралася ў тое, што ён член партыі. Ён не можа распараджацца сабою. Але не такі ён ужо і дурны, каб не адчуваць, што тут на першым плане інтарэсы не партыі, аКівайкі.

Ён пазваніў увечарыКівайку дахаты і цвёрда яму сказаў, што звальненне залежыць толькі ад яго, рэдактара.Ківайка, заікаючыся, пачаў быў адмаўляцца. Але Павел быў непахісны, і ён згадзіўся схадзіць да Сарокінай яшчэ раз.

Ківайка пабываў у Сарокінай, але вяртаўся ад яе без радасці, з апушчанай галавою. Сарокіна адчытала яго, што ён,Ківайка, распачаў мышыную валтузню.Ківайку і сапраўды было сорамна. Факт: няўпэўнены ў сабе, ён вырашыў перагарадзіць Дробу дарогу райкомам. На што ён разлічваў? На працячкоў?Ківайка завярнуў у парк, сеў на лаву. На тую, дзе сядзеў у дзень свайго прыезду ў Глушава Павел. Пакутліва мазгаваў. Моцны, зладжаны калектыў рэдакцыі даваў трэшчыну. А гэта — як у той адзежцы: калі пачала ўжо рвацца, дык усё далей і далей. Яго раптам працяла сполашная думка, ад якой ажно пайшлі кругі ў вачах. Так, так, ну канечне, і Брэшка, і Касцяніцын, дый той жа Аднамах — ненадзейныя работнікі. Брэшка ўжо амаль спіўся. З Касцяніцыным цяжка зладзіць. Аднамах невядома што ў сабе тоіць. Прыгожы вунь адуванчык, а фукні — і застанецца адна лысая пляскатая галоўка. Не!.. Трымацца, толькі трымацца — да канца! Нават не дзеля сябе. Дзеля справы.

ДробуКівайка шмат не гаварыў. Насупіўшыся, каб паказаць, які непажаданы кірунак набыла справа,Ківайка, цяпер ужо не баючыся знявагі, сказаў, што Сарокіна выгнала яго з кабінета.

Здаецца, Паўлу было зусім блізка да адчаю. Ён умеў цярпець, цярпець доўга, як гэта рабіў ягоны бацька, верачы, што справядлівасць, якую нельга перамагчы ніякім злом, возьме верх. Павел быў якраз з тых лю-

дзей, якія свае настаянні пакідаюць на потым, да самага нясцерпнага болю. Тады яны выносяць з душы напаверх у с ё і нават тое, што як бы прапускалі міма ўвагі, лічылі за дробязь.

Павел, адчуваючы, як ад хвалявання дрыжаць вусны, пачаў спакойна выдаваць Півайку тое, што злягалася на душы цяжкім, удушлівым пластом.

— Калі так, Фёдар Андрэевіч, я іду на бюро райкома партыі і называю прычыну звальнення. Дзеля вас я рызыкаваў сваім здароўем, выручаў, а вы зараз маладушнічаеце і нават спрабуеце мяне затрымаць. А я, між іншым, не работу сабе шукаў, як, можа, вам здаецца, а кладуся на аперацыю... Дала пра сябе знаць траўма... па вашай віне. Я маўчаў, не гаварыў, не хацеў вам псаваць настрой... Думаў, разбярэмся па-чалавечы і вы зразумееце мяне. Толькі бачу, што — не.

Ківайка сядзеў белы што мел. Вочы ягоныя гарэлі не зялёным, а цёмным агнём. Ён, было відаць, ужо не слухаў, што гаварыў Дроб, а хапатліва думаў. Наліў з графіна вады, прагна выпіў. Наліў яшчэ і падаў шклянку Паўлу.

— Павел, супакойся... На, выпі. Супакойся...

Паўлу цяжка было гаварыць. У нейкі момант ён адчуў, як цвёрды камяк заткнуў яму горла. Стала балюча. Ён не мог болей трываць і выскачыў з кабінета. Ківайка падхапіўся з месца, памкнуўся ўслед, але дабег адно да дзвярэй. Прыкурыў цыгарэту і, раз за разам зацягваючыся, замітусіўся па кабінеце. Цяпер ён не сачыў за паставаю, за жэстамі, якія ў сабе ўвесь час адточваў, рыхтуючыся да павышэння.

Хвілін праз пяць, калі на цыгарэце пачаў ужо смылець жоўты патрончык фільтра, Ківайка адчыніў сейф і дастаў стосік працоўных кніжак.

## 12

...У Сарокінай быў лагодны твар. І не толькі таму, што да яе павінен быў зайсці Павел Дроб, расставацца з якім было ёй чамусьці і шкада, і радасна адначасна. Шкада — бо ад'язджаў цікавы, як ёй здалося, журналіст. А радасна таму, што такога кадра не сорам, як кажуць, паказаць і на людзі.

На лацкане пінжака побач з дэпутацкім значком

у Сарокінай красаваўся ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, які прывезла ўчора з Мінска, куды запрашаў іх, узнагароджаных за поспехі ў дзесятай пяцігодцы, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР. Гэта быў першы ў яе жыцці ордэн і першая радасць, якая так самавіта выплеснулася з душы. Зінаідзе Якаўлеўне здавалася, што разам з ёй радуецца і ўвесь свет. Яна глядзела ў акно на вяршыні таполяў, якія дробна пераліваліся маладым, пяшчотным лісцем, быццам яго варушыла сваімі промнямі шчодрае ліпеньскае сонца. Па дарожцы, узяўшыся парамі за рукі, ішлі дзеці, і ў іх крыклівым бязладным хоры, у прасвечаных сонцам валасах, што пушыста апраўлялі белыя і цёмныя галоўкі, было столькі хараства, мілай бестурботнасці, што ўявіць сабе, быццам дзесьці на свеце ёсць слёзы і беды, вядуцца войны, было проста немагчыма.

Такую, расчуленую, яе і застаў Павел Дроб. Яна прывеціла яго ўсмешкаю, запрасіла да стала. Павел, на што сёння зусім не спадзяваўся, адчуў, як міжволі яго напаўняюць прыемныя сэрцу пачуцці. Увачавідкі пачаў яснець ягоны зрок, той зрок, які гнаў у свядомасць гнятлівую, змрочную інфармацыю. «Як жа добра, што зайшоў да Сарокінай,— падумаў ён.— Іначай паехаў бы адсюль з паганым настроем».

— Я адчувала, штоКівайка нешта круціць з вашым звальненнем,— сказала Зінаіда Якаўлеўна, калі Павел расказаў ёй пра ўсё. І пра Свету таксама.— Я жадаю вам удачы!..— Яна моцна паціснула і далікатна патрэсла Паўлаву руку.— Запомніце, Павел Іванавіч: лёгкае павісне і на павуцінні, а цяжкое прарве яго.

Недзе ў апошняе імгненне, калі ўжо Дроб няўпэўненай, але хуткай хадою ішоў да дзвярэй, у яе мільгнула думка, што, канечне, у яе ўладзе было затрымаць, не звальняць Дроба, можа, і на карысць яму. Але яна засаромелася гэтай думкі, быццам нейкай непрыстойнасці.

* * *

...Павел выйшаў з пакоя, ведаючы, што ўжо ніколі ў жыцці сюды не прыйдзе. І не таму, што разбурыцца хата ці яе перапрададуць некуды ў іншае месца. Нават калі б яна стаяла тут сто гадоў, Павел ні разу не заглянуў бы сюды — у гэты квадратны змрочны пакой. У ім

ён пакінуў мыліцу, якая адразу напомніць яму пра тое, што яму тут балюча патурзалі нервы. Гэты пакойчык — як цэлы свет: ён бачыў і боль, і слёзы, і радасць, і каханне. У ім спелі, нараджаліся думкі, праяўлялі свой характар людзі, несучы ў сабе як дабро, так і зло. Сюды, як у фокус, збіраліся адусюль, куды толькі заносіла Паўла фантазія, падзеі, здарэнні, факты.

Тут ён перажыў трагедыю кахання, і тут у свядомасці квола, як матылёк пасля зімы, запырхала думка (дарэчы, у апошні момант, калі стала вядома, што Света безнадзейна хворая) — напісаць пісьмо маладой маці, якой пералівалі ягоную кроў і якая носіць прозвішча Марачонак. Павел, ад'язджаючы ў Магілёў, чамусьці не сумняваўся, што напіша ёй. Так, ён абавязкова напіша. Што будзе пісаць, цяжка зараз сказаць, але, бадай, пэўна адно — гэта будзе не проста пісьмо. Гэта, можа, будзе пісьмо-прапанова. Страшна покуль пра нешта далёкае думаць. На першы раз ён толькі прапануе пабачыцца. З ёю і сынам. І пагаварыць. Можа, і яна прыйдзе да яго ў бальніцу.

Заняты, няшчасны, думкамі, Павел не ўгледзеў, як падкаціў да хаты «ўазік». Адно як паплыў па двары пыл, ён спахапіўся. Савянкоў, прыгладжваючы рыжыя валасы, ішоў ужо ў двор і ўсміхаўся.

— Адчальваем?

— Так точна!..— Павел бадзёрыўся, але неймаверным высілкам.

Яны перанеслі ва «ўазік» рэчы, потым стосы кніг. Каля весніц Павел прыпыніўся, акінуў паглядам хату, запудраную пылам, усё роўна як пабеленую на свята, і ў яго зварухнулася на душы глыбокая туга. Ужо калі селі ў машыну, рукавом хапатліва працёр задняе шкло, каб у апошняе імгненне ўбачыць акно свайго пакоя.



# Апавяданні

# Белая ружа

Я — не жанчына. Я — самая нікчэмная, брудная істота. Мне няма ніякага апраўдання, я не прыкрыюся ніякай мараллю, мяне не ўлагодзіць голас самай адданай сяброўкі. Я зразумела гэта адно цяпер — на этапе, у цягніку, які вязе мяне кудысьці за Урал. Чаму празорлівасць заўсёды прыходзіць праз трагедыю, балючыя перажыванні? Але — па парадку.

Я не ведаю, скуль у мяне рана з'явілася цяга прыгожа, з шыкам жыць, падабацца, ставіць сябе ў цэнтр увагі і амаль заўсёды перабольшваць свае магчымасці, ацэньваць сябе вышэй, чым вызначыла прырода. Я з вёскі. Бацькі мае — простыя калгаснікі. Дзецьмі яны жылі ў нястачы, цяпер толькі, я адчуваю па сабе, зажылі багата, маюць грошы. Я з маленства бачыла, як яны працавалі з цёмнага да цёмнага, у іх не было вольнае хвіліны; і нават увечары, перад тым як, перакусіўшы, збіраліся класціся спаць, у іх была адна і тая ж гаворка: што і чаму не дарабілі сёння, што трэба зрабіць заўтра. І ўсё іх жыццё, здавалася, складалася толькі з працы і кароткага сну.

Нельга сказаць, што я цуралася працы. Я дапамагала па гаспадарцы, карміла свіней, курэй, мыла, капала бульбу, палола грады, хадзіла ў ягады і па грыбы... Сорам, але я не ўмела даіць каровы, нават баялася падысці да яе, але гэта як прыкрая недарэчнасць. Варыць есці, гатаваць стравы так-сяк я магла, але не вельмі хацела, дый мама не давярала мне ў гэтым.

Зноў-такі, мне цяжка сказаць, чаму я любіла прыгожа адзявацца. Я першая ў вёсцы, тады яшчэ сямікласніца, пашыла ў атэлье штаны. Я лічыла, што яны мне «ідуць», робяць зграбнай і моднай. Мне здавалася, што я разумная, сучасная, з маёй думкай павінны ўсе лі-

чыцца, я не саступала ў спрэчцы сяброўкам, канфліктавала і з дарослымі — бацькамі і нават настаўнікамі. І хоць часам першая замаўкала, унутры ў мяне кіпеў пратэст. Я проста дзівілася, што людзі такія бязглуздыя, не разумеюць простых рэчаў. Мне было прыемна, калі я думала, што сам бог, прырода паставілі мяне над усімі. А што, здольнасці размяркоўваюцца не пароўну, і з гэтым трэба лічыцца.

Я задужа рана стала дарослай і незалежнай. Мая душа прагла волі, шырокага свету, а розум — праверкі на сваю цвярозасць і лагічнасць. Пасля васьмі класаў я заявіла бацькам, што не хачу далей вучыцца ў школе, буду паступаць у медвучылішча. Я лічыла, самая лепшая прафесія ў свеце — медык. Белы халат, стэрыльная чысціня, само сабою, гэта як быццам і не самае важнае, галоўнае — гуманнасць, адгукацца на людскія беды, ісці на дапамогу, змагацца з хваробамі, адчаем, адрынутасцю, што ўсё яшчэ палоняць чалавека. Бацькі спярша пярэчылі — не супроць прафесіі, канечне, а супроць таго, што я, «яшчэ дзіцёнак», «зялепуха», паеду з двара ў свет. Гэтая вечная перасцярога бацькоў, іх замшэлая хвароба лічыць сваіх дзяцей малымі, бязглуздымі, непрызвычаенымі да жыцця яшчэ болей развярэдзілі мяне, пераканалі ў правільнасці майго выбару. Я стаяла на сваім, і бацькі перасталі спрачацца. У іх маўчанні я прачытала згоду ці, прынамсі, тое, што яны зміры-ліся.

Я павезла дакументы ў Мінск (далей ад вёскі, ад бацькоўскае апекі!), прызнаюся, з хваляваннем, нерашучасцю, калі не сказаць — са страхам. Першы раз у далёкі свет! Адна! Вакол будзе ўсё незнаёмае, чужое, непрывычнае.

Помню, быў пахмурны дзень, усё роўна як не ліпеньскі, а восеньскі. Я ішла на шашу. Дождж наліў лужыны, і дробныя рэдкія кропелькі, што ўсё яшчэ падалі з неба, нудліва пускалі па іх кволыя, як з нітак, кругі, якія тут жа ў мяне на вачах раставалі. Моцна пахла з сасонніку смалою, ажно кружылася галава. Ад паху смалы ў мяне з маленства чамусьці баліць галава, і я іншы раз пад прыкрыццем гэтае прычыны ленавалася ісці з маці ў ягады. Калі чалавек разгублены ды яшчэ штосьці ўспрымаецца ім хваравіта — тады наогул цяжка. З такою цяжкаю ношаю на душы я і паехала ў Мінск.

Зусім нечакана гэтая ношка на душы пацяжэла яшчэ ўдвая. Я была на мяжы адчаю і хацела ўжо кінуцца на вакзал, сесці ў аўтобус ды хутчэй, хутчэй дахаты. Справа ў тым, што ў медвучылішча мае дакументы не прынялі: патрэбна гарадская прапіска. Гэта быў мой першы сур'ёзны правал. Чаму я не ведала пра гэтую ўмову і мяне ніхто аб ёй не папярэдзіў? Аказваецца, мы ведаем жыццё ў межах сваіх прыхамацей, а яно ж нашмат багацейшае. Я ўпершыню задумалася над гэтай ісцінаю.

Я сядзела на лаўцы пад каштанамі прыбітая, паніклая, знясіленая няўдачаю; з маіх вачэй каціліся слёзы і капалі на сумачку, якая ляжала ў мяне на каленях і ў якой былі дакументы.

Я не пачула, як да мяне падсеў чалавек, я глянула на яго, калі ён сказаў: «Хто вас пакрыўдзіў?» Гэта быў хлопец, старэйшы за мяне, у джынсах, у цёмна-сіняй кашулі з пагончыкамі, прымацаванымі да плячэй белымі гузікамі. У яго былі доўгія валасы, зачасаныя ўверх, блакітныя вочы, не то сумныя, не то стомленыя, і трохі буйнаватыя зубы — гэта я адразу заўважыла, і хлопец мне не спадабаўся. Я надзьмулася яшчэ больш і нават адсунулася ад яго, мацней прыціснуўшы да сябе сумачку. Але ў хлопца быў прыемны голас — такое ўражанне, што дзесьці яго ўжо чула: можа, у сне, можа, у кіно ці ў тэлевізары. Ён і сам крыху падобны ці то на спевака, ці на артыста. Спакваля я павесялела і як бы ўжо з ахвотаю пачала адказваць на яго пытанні, бо мне хоць з кімсьці хацелася параіцца, што рабіць далей.

«Ну, навошта так адчайвацца? — сказаў хлопец сваім прыемным голасам, калі я распавяла пра сваю бяду.— Столькі ў Мінску ўсякіх тэхнікумаў! Чым, напрыклад, кепскі тэхнікум лёгкай прамысловасці? Лёгкай — значыць, лёгка і вучыцца»,— засмяяўся мой новы знаёмы.

Дзіўна цяпер, але тады мне здавалася: у яго словах столькі пераканаўчасці і логікі, што я паверыла яму, і столькі адразу ўдзячнасці з'явілася да зусім чужога чалавека. Хто першы на бяду адгукнецца — таму чалавек гатовы ўсё аддаць.

Хлопца звалі Юрка. Ён павёў мяне ў той тэхнікум лёгкай прамысловасці. Я здала дакументы. Экзамены былі праз два дні. «Дзе спынілася жыць?» — спытаў хлопец. Я адказала: покуль нідзе.

Я мала бачыла такіх чулых людзей нават у вёсцы: Юрка падрадзіўся знайсці мне кватэру. Ставіў ён ці не ставіў якую-небудзь сваю, далёкую мэту — я не ведаю. Я была наіўная і даверлівая.

Ён уладкаваў мяне да адзінокага мужчыны-інваліда, непадалёку ад дома, у якім жыў сам. Юрка амаль кожны дзень пасля работы сустракаўся са мною — ён працаваў у тэлеатэльне і завочна вучыўся ў радыётэхнічным інстытуце. Пытаўся, ці баюся я экзаменаў, падбадзёрваў. Мне было шкада яго, столькі марнуе на мяне часу, але я сумавала, калі ён адыходзіў.

Я — паступіла! Я была самы шчаслівы чалавек у свеце. У мяне кружылася галава: і ад поспеху, і ад таго, што маю надзейнага сябра, і ад шматколернасці гарадскіх вуліц, ад нязвыклых гукаў і пахаў...

І калі нас у верасні павезлі на сельгасработы, мне раптам здалося, што шчасце маё скончылася: так не хацелася адрывацца ад гэтага вялікага тлумнага горада, ад Юркі. Дурніца! Я не ведала, што ў новым студэнцкім асяроддзі, сярод незнаёмых і такіх розных нават па размове дзяўчат і хлопцаў неймаверна цікава, таямніча, вольна... Баючыся не спадабацца модніцам, я ўзяла ў рукі цыгарэту — уначы каля цяпла на высокім беразе рэчкі, сярод выносных, загадкава-нерухомых, бы за́мкі, ялін. Мясцовыя хлопцы, кінуўшыся заляцацца да нас, студэнтак, прыносілі ў кішэнях бутэлькі, і я бачыла, як нашы пры́ткія модніцы пілі віно проста з рыльца. Пасля ішлі ў клуб на танцы.

Я танцаваць умела і без віна была «смелая». Не было адбою ад сваіх і мясцовых хлопцаў. Да дзіўнага хутка прыходзіла ўпэўненасць, што я адзіная, роўных мне няма, я ўсім патрэбна. І так будзе ўсё жыццё. Мабыць, ад гэтага адчування пачалося маё падзенне. Я не абуралася, калі хлопец, танцуючы, шаптаў мне на вуха крыўдныя слоўцы, не адбівалася, калі ў прыцемках ягоныя рукі нахабна лапалі мяне.

З калгаса я вярнулася пасталелая на пяць гадоў, самастойная і раскаваная. Гэта заўважыў Юрка, не без рэўнасці здзівіўшыся. Ён акурат прыліп да мяне, цяпер не было таго дня, каб мы не бачыліся. У кватэры інваліда быў тэлефон, і Юрка часта званіў, нават сярэдначы. Гэта мяне раздражняла, бо трубку зазвычай падымаў гаспадар, а хадзіць яму на мыліцах было цяжка.

Юрка зарабляў неблагія грошы, і мы хадзілі з ім

у кіно, а часцей на дыскатэку. Нейкая магія авалодвала мною, калі я апыналася ў цьмяна асветленай зале, падыходзіла да стала з белымі, скручанымі ў трубачку сурвэткамі, а Юрка перш адсоўваў, затым падсоўваў маё крэсла. Пазней з'яўляліся музыкі. Спявалі сучасныя песні. Асабліва мне падабалася «Не сыпь мне соль на рану». Юрка запрашаў мяне танцаваць. Пасля танца садзіліся да стойкі на мяккія высокія пуфікі і пілі кактэйлі ці каву. Ад шчасця ў мяне сціскалася сэрца. Калі мы ішлі дахаты, я дазваляла Юрку абдымаць і цалаваць мяне. Ён умела, далікатна гэта рабіў, не так, як вясковыя хлопцы. Такая Юркава галантнасць выклікала ў мяне павагу да яго. Мае сяброўкі-аднакурсніцы, таксама вясковыя дзяўчаты, зайздросцілі, нават не верылі, што я закадрыла гарадскога хлопца, мінчаніна. Я з радасцю распавядала ім, дзе мы з Юркам былі, куды ён мяне вадзіў, што рабілі. Адзін на адзін са мною Юрка быў па-ранейшаму вытрыманы. Я проста дзівілася, бачачы, як ён знемагае ад маіх мілаванняў. Мне лесціла, што я валодаю такою зачараванасцю. Паверце, на маім месцы заганарылася б любая дзяўчына. Паволі я скідвала з сябе рэшткі вясковай скаванасці. Па першым часе я хадзіла на ўсе ўрокі, старанна да іх рыхтавалася. Адале, адчуўшы ўпэўненасць, займеўшы інтарэс па-за тэхнікумам, магла збегчы з апошняга ўрока. Рэдка, але дазваляла сабе прапусціць і цэлы дзень. Мне здавалася, што мэта жыцця не ў вучобе, не ў працы, а ў гэтым галавакружным віхры закаханасці. Божа, няўжо ў маіх гадах хтосьці думае іначай? Я ўпэўнена: так думае кожная дзяўчына. Мяжою шчасця мне ўяўлялася замужжа. Я разважала: выйду за Юрку замуж, а ўсё астатняе, як кажуць, прыкладзецца, яно будзе толькі падсвечваць маё вялікае шчасце.

Я забылася на бацькоў. Перастала пісаць ім лісты. Адно зрэдку званіла. Маці трывожылася і казала мне: «Глядзі ж тамака, не згуляйся...» Неверагодна, але хтосьці са знаёмых бачыў мяне на лужку ў кампаніі, што сядзела вакол гары бутэлек, і перадаў бацькам. Зрэшты, цяпер уся моладзь выязджае з вёскі. І я разумею яе. Я з жахам уяўляю, што са мною было б, калі б я засталася ў сваёй Малінаўцы. Я згніла б у гнаі, не бачачы свету. А я ўсё-ткі прыгожая. Бог надзяліў мяне паставаю, тварам, нагамі — усім тым, чым вабіць жанчына. Толькі, мабыць, не дадаў мне розуму. Іначай бы

я не дакацілася да такой несусветнай ганьбы. Я кляну сябе апошнімі словамі і не прашу даравання, але, дзівадзіўнае, душа мая пратэстуе. Няўжо яна хоча апраўдаць мой учынак?

Але не буду забягаць наперад у сваёй споведзі.

На другім годзе вучобы мне далі інтэрнат. Я была радая бясконца. Шчыра кажучы, мне абрыдла жыць на кватэры, пераносіць непрыемныя, тхлінныя пахі. Горш таго, калі я разы два прывяла да сябе ў госці Юрку, інвалід, нестары, пяцідзесяцігадовы мужчына, пачаў да мяне чапіцца. Прапаноўваў каньяк, грошы, золата, каб толькі я згадзілася з ім пераспаць. Божа, ды я не дазволіла сабе гэтага покуль з Юркам, якога кахала да бясцямнасці.

На душы было цяжка, прыкра, і, ачмураная гэтым чадам бясцямнасці, я аддалася Юрку. На Майскія святы сяброўкі параз'ехаліся да бацькоў. Яны жылі блізка ад Мінска: адна — у Дзяржынску, другая — у Валожыне, трэцяя — у Вілейцы. Да мяне ўвечары прыйшоў Юрка. Прынёс букет белых руж, тры бутэлькі венгерскага шампанскага і магнітафон «Соні». Мы пілі і танцавалі. Танцавалі і пілі. Я не магла налюбавацца на ружы. Хіба ў вёсцы мне хто-небудзь падараваў бы іх? Г... на лапаце. Неяк жа я павінна была аддзячыць Юрку. Мне не хацелася быць эгаісткаю і карыстацца Юркавай прыстойнасцю.

Мы разам леглі спаць, праўдзівей, леглі ў адзін ложак, бо ніякага сну да раніцы не было. Юрка раздзеў мяне нагала. Асуджайце мяне, але мне было прыемна ад усяго, і ад гэтага раздзявання таксама. А пасля таго, што непазбежна здарылася, я плакала. Выскачыла з-пад коўдры, сядзела каля акна і, водзячы тварам па тугіх пялёстках руж, удыхаючы мятны водар, плакала. Слёзы былі шчырыя і горкія. Я развітвалася са сваёй цнатлівасцю. Каб не звар'яцець, з ёю рана ці позна трэба развітвацца.

Я спадзявалася, што Юрка возьме мяне замуж. Мы, зрэшты, і жылі з ім як муж і жонка. Ён прасіў пачакаць канца вучобы. Але я зацяжарала. Сказала Юрку. Ён спахмурнеў: навошта паспяшалася? Што гэта, жорсткасць? Я не чакала яе ад яго. Сяброўкам я не прызналася. Можа, і дарэмна. Яны нешта падказалі б. «Выпі ёду і залезь у гарачую ванну»,— параіў Юрка. Я так і зрабіла. Пот градам сыпаўся з мяне, моцна, як не выска-

чыць, білася сэрца, але я цярпела. Напружана чакала — нічога не дапамагло. «Трэба панасіць што-небудзь цяжкое»,— прапанаваў «новы сродак» мой ненаглядны Юрка. У пакоі нічога такога не было, што б я магла ўзяць у рукі і насіць. Тады Юрка прапанаваў свае паслугі: абшчаперыўшы за шыю, павіс на мне, і я, бы дурніца, цягала яго па пакоі. Усё дарэмна. Прырода мацнейшая за ўсякія хітрыкі.

А час ішоў. «Трэба да доктара»,— сказаў Юрка, не падымаючы на мяне вачэй. Я была паслухмяная як авечка. Пайшла да гінеколага, але ён сказаў, што позна ўжо рабіць аборт. Я не хацела да канца прыніжацца перад Юркам, ганарлівасць не забіваецца нават каханнем, таму больш не прасіла яго падаць заяву на шлюб. Але ён бачыў, як мне цяжка, і каб я не палічыла яго апошнім мярзотнікам, прызнаўся, што жаніцца яму не дазваляюць бацькі. Я ні разу не была ў Юркі на кватэры (не запрашаў), не бачыла ягоных бацькоў, але ведала, што бацька ў Юркі пракурор, маці — выкладчыца музычнай школы. Мабыць, маё вясковае паходжанне, сярэдняя адукацыя адпуджвалі іх. Што зробіш, людзьмі кіруе разлік, выгада, выйгрыш. Апынуўшыся ў горадзе, я ўбачыла гэта асабліва яскрава. Многія ганарыліся, не ўтойвалі, што несумленна жывуць, карыстаюцца блатам, сувязямі, сваяцтвам. Нейкая святасць, што прывілася мне ад маіх працавітых бацькоў, разляцелася, як ад удару шкло. Я баялася здацца несучаснай, адсталай, нямоднай і свядома цягнулася да заган, як кволы веснавы парастак да сонца.

Я таўсцела, жывот мой тужэў. Як магла ўціскалася, абвязвалася, каб не заўважылі сяброўкі, выкладчыкі. Што рабіць, куды кінуцца, дзе раджаць? Абнязлавілася ўшчэнт. Вёска не даруе мне. Бацькам на вочы не паказвайся. Для маці-адзіночкі я зусім маладая. Разумею тых, хто да трыццаці не выйшаў замуж. Юрка ад мяне не адцураўся. Прыходзіў, суцяшаў, даваў грошы і ўжо не настойваў на аборце. Я амаль не вінаваціла яго. Ён не наносіў мне ўдару спадцішка, як многія хлопцы, ён не адмаўляў, што я зацяжарала ад яго. І ад гэтага мне было лягчэй, прынамсі, да роспачы не даходзіла. Хоць і не ведала я, што рабіць. Тэрмін імкліва набліжаўся. Я вылічыла, што роды павінны пачацца з дня на дзень. Гэта будзе выбух для ўсіх. Псіхалагічна я да яго не была падрыхтавана. З тэхнікума мяне, канечне, выклю-

чаць. Што я скажу бацькам? Але гэта паўбяды. Як і што рабіць з дзіцём? Хіба я маці, зялёнае дзяўчо.

Аднойчы, не памятаю, як, у якім стане, мне прыйшла вар'яцкая думка пазбавіцца ад дзіцяці. Адразу, не бачачы яго, каб не ведаць і не сніць. Цяпер я маліла бога, каб схваткі пачаліся ўначы. Бог пачуў маю просьбу.

Гэта было глыбокай ноччу. Дзяўчаты спалі. Я кусала да крыві вусны, але цярпела. Баялася страціць прытомнасць. Тады ўсё — выявіцца. «Што ты стогнеш? Табе блага?» — скрозь сон спытала адна з маіх сябровак. «Жывот баліць...» — зманіла я, глытаючы салёны пот з твару. У пальцах трымала іголку, паколвала ёю сябе, каб не адключыцца. Боль стаў невыносны. Я была амаль у бясцямнасці. Але тое, што дзіця ўжо нарадзілася, я зразумела. Абяссіленая, я шукала іголкаю цемечка дзіцяці. Госпадзі, што я раблю?.. Я забіваю сваю крывінку... Я — не жанчына. Я нават не самка. Бо самка бароніць дзіця, ахвяруючы дзеля яго сваім жыццём. Ваўчыца, львіца, тыгрыца... Я іду супроць прыроды. І не магу спыніцца. Услед за дзіцём мне самой трэба прымаць смерць. Няўжо гэта не сон?

Пыхнула ў пакоі святло — прачнуліся ад дзіцячага піску сяброўкі. Я ўбачыла сябе акрываўленую, ружовенькае вільготнае немаўлятка і зразумела, што ўсё адбываецца са мною ў сапраўднасці.

Сяброўкі кінуліся выклікаць «хуткую», а я страціла прытомнасць. Ачнулася — у пакоі было поўна людзей: дактары, міліцыя... Далейшае памятаю слаба. Я высілкам намагаюся прыгадаць, але памяць трымае толькі бязладныя, цьмяныя абрыўкі. Бацькі... Суд... Прыгавор... А Юрка помніцца выразна. Ён прыходзіў да мяне, калі я сядзела ў следчым ізалятары. Вочы ў яго глыбока запалі, былі вінаватыя. Мне здавалася, што ён ненавідзіць і асуджае мяне разам з усімі, разам з маімі бацькамі, якія на судзе заявілі, што адмаўляюцца ад мяне, а дзіцятка забіраюць і будуць гадаваць. Цяжка ўявіць, што мяне чакае, як я гляну ў вочы свайму дзіцяці, калі яно вырасце, як увогуле буду пачувацца сярод людзей? Мне трэба пасля пакарання збягаць на край свету. Я змагу жыць толькі там, дзе мяне не ведаюць. Ці мне зусім трэба прыкончыць сябе.

...Вагон хістае ў бакі. Колы стукаюць цвёрда і злосна: ду-ду, ду-ду... ду-ду, ду-ду... У закратаванае акенца

я бачу падзелены на частачкі месяц. Магільная туга разрывае мае набрынялыя малаком грудзі. Я ў няволі. У вагоне са мною здаровыя грубыя цёткі, і я сярод іх, як кветачка, як белая ружа. Мне толькі васемнаццаць гадкоў. Ці даруюць мне зэчкі, калі даведаюцца, які ў мяне жахлівы артыкул? Невядомасць палохае, хочацца галасіць. Але хто мяне пачуе? Хіба што падзелены на частачкі месяц. Юрка не будзе мяне чакаць. Бацькі хуценька ажэняць з другою. Яны не ўпусцяць магчымасці. І правільна зробяць. Мяне трэба пазбягаць, шарахацца ад мяне, як ад пракажонай.

Я нічым сябе не апраўдаю. Мяне ніхто не зразумее. Гэта нельга зразумець. За што мяне так пакараў бог? Я нікому не зрабіла ніякай брыдоты. Я заплаціла за сваё каханне самай вялікай цаною пакут.

Месяц шчэрыцца на мяне ў злосці. Я адхіляюся, але ў цеснаце ніяк не магу ад яго схавацца.

# Чалавек з гармонікам

Чалавек увесь вечар іграў адну песню. Гармонік перакрываў галасы за сталом. Гасцей на бабуліным дні анёла сабралася небагата: блізкія сваякі ды сусед — гэты чалавек з гармонікам. Раней я ніколі яго не бачыў. Незнаёмец міжволі прыцягваў да сябе позіркі. Бабуля, не па ўзросце прыхарошаная, з гладка прычасанымі чорнымі валасамі, маршчыністым запудраным тварам, на якім крыкліва цвілі пунсовыя ад памады вусны і чарнелі нітачкі падмаляваных броваў, называла яго ласкава: Шурачка. Ён быў адзеты ў зялёную клятчастую кашулю і сінія штаны. Спачатку ён паводзіўся ціхмяна, як бы сарамліва, і я падумаў, што гэтае імя да яго стасуецца. Невысокі ростам, твар дробны, завостраны маленькі носік, лысіна, абапал якой рожкамі тырчалі пучкі злямчаных валасоў. Адале, калі цешча мая, празваная за вясёлы нораў Сербіянкаю, завяла песню:

На дварэ ідзе дождж,
А у клубе суха,
Музыкант, польку ўрэж,
Полечку-трасуху!—

я змяніў сваё першае ўражанне. Шурачка паварушыў сваім вострым носікам, як бы прынюхваючыся, адкуль цягне смажаным, нахмурыў пакаты, захмылены, нібы ў пітэкантрапа, лоб і гаркнуў: «Маўчаць!» Ён ужо рэзнуў добрую чарку — піў хвацка, куляючы адным махам. Шчокі ягоныя ўзяліся лёгкай шызаватасцю, і праз гэта ён аж памаладзеў, скінуў гадоў з пяток са свайго даволі сталага веку.

Усе паглядзелі на яго са шчырым здзіўленнем. Цешча перастала спяваць. Шурачка абвёў застолле надзіва пранізлівым, цвёрдзенькім, як джала касы, позіркам,

і мне раптам уявілася высокая трава, якая, падкошаная, гуртам валіцца на зямлю.

— Маўчаць!

Мяне ўразіў крамяны Шурачкаў голас. На бабулін твар лёг цень вінаватасці: «Не крыўдуйце, госцейкі, выпіў троха чалавек...» Я бачыў, што для яе, набожнай, гэты суседаў выбрык нечаканы ўдвайне.

Шурачка адсунуў табурэтку ад стала і з сілаю расцягнуў мяхі. Я заўважыў, што мяхі на рагах працёртыя ад даўнасці. Песня была ўсім знаёмая: «Широка-а-а страна-а-а моя родная-я-я...» Шурачка схіліў над гармонікам галаву і рупна ціснуў на пішчыкі.

Людзі паслухалі, а тады загаманілі між сабою. Я сядзеў упобачкі з дзядзькам Тамашом. Мужчына з трыма класамі польскай школы, ён меў востры прыродны розум і ведаў з замежных радыёстанцый пра ўсё, што робіцца ў свеце. Я балакаў з ім часцей, чым з цесцем, у якога шчырая, дзіцячая непасрэднасць межавалася з простымі развагамі, хоць і не забываў ён тады-сяды нагадаць пра сваю «сярэдне-тэхнічную адукацыю». Дзецьмі сваімі дзядзька Тамаш не вельмі мог казырнуць: тры дачкі ледзь выцягнулі дзесяць класаў. А ў цесця дачка, мая жонка, і сын скончылі інстытуты. У дзядзькі Тамаша ёсць балесная тэма. Ён пры кожнай сустрэчы звяртаецца з ёю да мяне — ураджэнца ўсходняй Беларусі.

— Саветы вашыя? Мы жылі як людзі...— Ён, прыжмурыўшы вочы, зацята і з нахабнаватасцю глядзеў мне ў твар, чакаючы і гатовы для адпору.— Прыйшлі — усё кувыркам паляцела!

Я хацеў сказаць пра вядомы з падручнікаў па гісторыі вызваленчы паход Чырвонай Арміі перад вайною, але мяне апярэдзіў Шурачка, які, здавалася, нас не слухаў, заўзята рыпаў на гармоніку:

— Маўчаць!

Дзядзька Тамаш з ганарыстай і незалежнай душою шляхцюка, якога нават у спякоту ніхто не мог прымусіць скінуць з плячэй пінжак, грэбліва махнуў рукою: сядзі, чалавеча, спакойна.

— Маўчаць! — Шызаватасць у Шурачкі на твары аж забарвовела, рука спрытна саслізнула з пішчыкаў да сцягна. Дзядзька Тамаш здзіўлена ўпёрыўся на мяне, быццам пытаўся: што ўсё-ткі ён хоча? І праўда, Шурачкавы паводзіны былі нязвыклыя, і я не мог іх вы-

тлумачыць. Шурачка разбураў усякія пачынанні, што намячаліся ў застоллі, хоць сярод незнаёмых павінен быў трымацца сціпла, прынамсі, те так бойка, задзірліва.

Шурачка ўзяў са стала чарку і, глыкнуўшы яе, зноў расцягнуў абшарпаныя мяхі гармоніка.

Як асцюк трапляе за каўнер і муляе, так Шурачка муляў у нашай ціхамірнай, неназойлівай зборні сваякоў. Цікаўнасць перарастала ў загадкавасць, ад якой было недалёка ўжо да таямніцы. Здавалася, у Шурачкі ўсюды ёсць вочы і вушы. Варта было мне падсесці да швагра, рукі якога да локцяў былі сінія ад татуіроўкі, анекдотчыка і веселуна, як і там мяне прашыла куляю Шурачкава «маўчаць!». Швагер спакойна спытаў у мяне, кіўнуўшы на Шурачку:

— Чаму ён не ўгамуецца?

— Каб жа я ведаў.

Швагер устаў і, дэманструючы сваю рашучасць і сілу, узяў рукі ў бокі. Шурачка не зважаў на яго, іграў, прытуліўшы вуха да гармоніка. Верхняе адтапырылася, як лакатар. Вочы былі прыплюшчаны, толькі вейкі ўздрыгвалі, бы ў цяляці, якое джаляць авадні.

Мяне гэты Шурачка скаваў. Я не зводзіў з яго вачэй, баючыся да каго-небудзь загаварыць, каб не быць спыненым грозным «маўчаць!». У трывозе, душэўнай безладдзі я міжволі перабіраў мноства, часам неверагодных, небяспек, якія падсцерагаюць чалавека. Святочнага настрою я не адчуваў. Заміж таго каб забыцца на ўсё, на жыццёвую сумятню і з хмельнай ласкі пусціць душу ў прыволле лёгкай і пуставатай гаманы, я ўкруціў сябе ў вір неадчэпных думак пра Шурачку. Не браў я пад сумненне аднаго: гэтае ягонае «маўчаць!» — не слова-паразіт, што аздабляе гаворку ледзь не кожнага, і не п'янае трызненне, абы павыдурняцца, а водгулле далёкіх дзён, тых часоў, калі душа выяўляла сваю існасць, сцвярджала сябе ў жыццёвай праўдзе.

Нязмушана сябе адчувалі, здаецца, адны жанчыны. Толькі цешча, пасля таго як яе груба абарваў Шурачка, кружыла каля сталоў з талеркамі ў руках з нязвыклай для яе засяроджанасцю ў вачах. Ён, мабыць, параніў яе самалюбства прызнанай спявачкі.

Але вось што дзіўна: усе весяліліся не так, як зазвычай весяляцца ў застоллі. І віною таму быў Шурачка. Ягонае «маўчаць!», нябачнае, бы здань, ад якой усім

страшна, цяжка вісела ў пакої, зусім цесным ад чатырох сумешчаных сталоў.

Калі ўсе пад нечыя запросіны браліся выпіваць, Шурачка падымаў сваю чарку, а пасля доўга цэліўся, куды яе прыткнуць між талерак. Людзі закусвалі, а ён сядзеў панураны і задуменны. Хвіліны праз тры-чатыры пачынаў наярваць, і толькі ў якісьці аднаму яму вядомы момант заціскаў двума пальцамі, бы абцугамі, чарку і перакульваў яе ў рот. Амаль не закусваў, адно праводзіў далонню па сініх сухіх губах. Па лысіне ягонай скакала бліскаўка ад лямпачкі. Рожкі валасоў тырчалі ўверх, як антэны.

Да мяне падышоў цесць — зграбны, маладжавы на свае пяцьдзесят пяць, палажыў руку на плячо і ціхім голасам сказаў:

— Не звяртай, Віця, на яго ўвагі. Відаць, не аднаго ў свой час ухайдокаў...

Каб узгарэлася полымя ісціны, часам даволі іскрыны здагадкі. Гэтую іскрыну выкрасаў сваімі словамі цесць, і ў маёй галаве вобміг усё праяснілася: гэты Шурачка — сталінскі энкавэдэшнік. Стары, забыты, адрынуты. Цяпер, пенсіянер, мусіць, дажывае свой век у дакоры, ва ўспамінах ды яшчэ, можа, у нікім не зведанай тузе. Вось і просты цесць: убачыў жа, што мяне даканаў гэты Шурачка, і здагадаўся, хто ён такі. А можа, і не варта багата заслуг прыпісваць цесцю, можа, бабуля паспела распавесці яму пра суседа, які з месяц таму засяліўся ў кватэру. Зрэшты, гэта не так важна. Факт, туман рассейваўся, выяўляючы праўдзівы малюнак. Але — я не стаў пачувацца лепш. Фантазія падзьмула на мяне халадком, а тады калючай жарсцвою 30-х гадоў: начныя «варанкі», нечакана-трывожны выпад святла з акна ў цемру, плач дзяцей, камеры, допыты, чэргі, этапы... Пра ўсё гэта апошнім часам багата пісалі ў газетах і часопісах. Шурачка быў тады малады дзяцюк, і цяпер,ужо ў гадах, ён ніяк не мог адкараскацца ад мінулага: і адчужанасць, і словы ягонае, і падбор адзення па колеры сведчылі, што ён жыў у тым ранейшым часе. У гэтым кепскага нічога не было, гледзячы што яго туды вабіла, што ён там пакінуў. Я ўжо думаў: калі б Шурачка не піў, ён бы і не выкрыкваў гэтае сваё жудаснае «маўчаць!». Гарэлка расслабіла яго, даўшы рух прытоеным у падсвядомасці пачуццям.

Узаемаадносіны людзей — гэта назойлівае распа-

знанне чалавечай душы, выяўленне ў ёй кепскага і добрага. Навошта гэта патрэбна чалавеку, які і сам не без недахопаў, застаецца для мяне загадкаю. Я ўжо глядзеў на Шурачку зусім інакшымі вачыма, без насцярогі і дзіўлення. Усё стала на сваё месца: небарака Шурачка — ахвяра часу. У мяне нават неўспадзеўкі абудзілася шкадоба да яго. Ён сярод нас чужы, як востраў у моры, непрыкаяны, ратуецца гэтым сваім адзіным вокрыкам.

Здаецца, я раскілзаў душу. Мне хацелася весяліцца. Да гэтага змушала і сакатлівая Янэчка, старэйшая дачка дзядзькі Тамаша. Яна да кожнага знаходзіла зачэпку. Я згадзіўся б, што яна легкадумная і нават абмежаваная, калі б не яе любоў да чытання. Янэчка чытала ўсё, што лучала пад руку — кнігі, часопісы, газеты. Стоячы каля пліты над патэльняю, прыладкоўвала збоч кнігу. Мая жонка была ў захапленні ад Янэчкі, лічыла: гэтая прага чытаць — яскравая прыкмета эмансіпацыі. Я думаў крыху іначай: гэта, вядома, добра пры ўмове, што не церпіць сям'я, муж, дзеці, гаспадарка. Захапіцца чымсьці адным і занядбаць усё астатняе, без чаго няможна ўявіць жыцця, не так ужо турботліва і не богведама які гонар. Але так меркавалі мы з жонкаю адзін на адзін. Пры Янэчцы мы такой размовы не заводзілі, але яна сама ахвотна ўцягвала ў яе.

Убачыўшы, што я павесялеў, заварушыўся, яна падышла і, як заўсёды, штурханула ў плячо. У яе быў белы кругленькі, як мяч, тварык, гладкая, без маршчын шыя, налітыя, цяжкаватыя рукі з глыбокімі ямачкамі на локцях. Порсткімі смародзінамі блішчэлі блізенька пасаджаныя вочы.

— Калі ты ўжо, Віцюня, мне кнігу сваю падпішаш?

— А што, ты і на беларускай мове чытаеш? — прытворна здзівіўся я.

— На любой! — Яна грубавата рагатнула.— На рускай, польскай, беларускай, ангельскай.

— Во малайчына! Што ж ты не прызналася — ужо даўно б падпісаў. Цяпер так мала людзей чытае пабеларуску...

— Маўчаць! — бы стрэл, ляснула адтуль, дзе сядзеў Шурачка. Яму было ўжо цяжка падымаць галаву ад гармоніка. Ён ускінуў уверх кулак і патузаў ім, як бы страляў у столь з пісталета.— Маўчаць!

Шурачка зусім ацяжэў. Ён піў шмат, не пільнуючы-

ся тостаў і прапаноў, акурат прывык піць на адзіноце. «Ён саспеў, і яму пара ісці дахаты»,— падумаў я. Але дахаты збіраліся астатнія госці, а Шурачка сядзеў. Ківаўся, крахтаў, але азадак як прымёрз да табурэткі. Па моцным голасе адчувалася, што Шурачка яшчэ цяміць. І з мелодыі гармонік не збіваўся, кароценькія пальцы, падобныя на прысоскі васьмінога, гнутка варушыліся на пішчыках.

На Шурачку ўжо мала хто зважаў. Дзядзька Тамаш запрашаў мяне выпіць «на пасашок». Я не мог яму адмовіць, бо крыўда магла быць смяротная.

Каля стала па-ранейшаму тырчаў толькі Шурачка. Відаць было, што госці яго мала займалі, ён быў ва ўладзе песні. Песня так сабе, я шмат разоў чуў яе ў дзяцінстве, нават развучваў у школе.

Каб не замінаць гасцям у вузенькай вітальні, я завярнуў на кухню. Быў позні час.

Я стаяў на кухні і глядзеў праз акно ў блізкую чорную цемру, у якой патануў чысты, зялёны гарадок-райцэнтр. З фортачкі мне ў твар струменіла свежае вільготнае паветра з вастраватым водарам язміну, што кусціўся каля дома пад бабуліным акном. Цяпер ён цвіў, і праз фіялетавае шкло кветкі ягоныя былі салатава-жоўтыя на колер. Якраз такога ж колеру заляцеў на кухню і біўся ў акно вялікі начны матыль. Ад калмаценькіх крыльцаў на шкле заставаліся плямы пылку. Я ўзяў са стала газету і падкіраваў матыля да фортачкі. Ён мільгануў за акном, як сняжынка, знік у цемры.

Мне прыемна было адчуваць, што я вызваліў з палону жывую істоту. Любы, нават нязначны замах на волю — страшны. Навязалася скульсьці бязглуздая думка, быццам адкрылася мне сёння чы вялікая таямніца быцця. Гэта неймаверна радасная хвіліна, яе трэба лавіць гадамі, а прыходзіць яна імгненна і невядома па якой прычыне.

Заглянула на кухню жонка. Яна была змарнелая.

— Ну, што, муж, будзем класціся спаць, а посуд заўтра прыбярэм? — спытала, гледзячы на мяне.

— А ён? — кіўнуў я на сцяну, за якой быў пакой.

Жонка не зразумела. Я далікатна ўзяў яе за руку і павёў у пакой.

Шурачка ляжаў на падлозе, абхапіўшы рукамі гармонік, і твар ягоны быў па-дзіцячы бяскрыўдны, рахманы.

# Рэха

Ігната Вяршылу хавала ўся вёска. Не пайшоў на могілкі толькі адзін Рыгор Аксютовіч. Ён стаяў каля акна, захінутага з бакоў белымі, падсіненымі фіранкамі, калі пахавальная працэсія параўнялася з хатаю. Галасіла Вяршылава жонка, Марыля. На машыне з адкрытымі бартамі сіратліва, як цагліна, стаяла чырвоная труна, з якой глядзеў у неба фіялетавы нябожчыкаў твар. Паперадзе машыны неслі партрэт, абвязаны чорнай стужкаю, на пунсовых атласных падушачках — ордэны і медалі.

Усе мінулыя дні стаяла кепскае надвор'е, хмурылася неба, дзьмуў сухі вецер, ад якога трывожна шумеў каля хаты клён і пранізліва свісталі правады. Нарэшце стала ціха, заззяла сонца, амаладзіўшы наваколле і падвесяліўшы людзей, якім яшчэ рупіла сена, але ўжо думалася і пра колас, што наліваўся пругкаю духмянаю спеласцю.

Рыгораў позірк з машыны слізгануў на твары людзей — яны праплывалі аднакава нерухомыя, засмучаныя. Лёгкая, сухарлявая Марыля павісала на руках у жанчын, якія вялі яе,— падгіналіся ногі. Густаваты аранжавы пыл курэў над галовамі людзей, сплываў на агароды.

Туга грызла сэрца. Цяжка пераносіў ён пахаванні, доўга не мог атрэсціся ад галашэнняў, ад глухога бурбацення камякоў на веку труны, у вачах, калі лажыўся спаць, мільтусіўся нябожчыкаў твар, сніліся сны — што нябожчык устае, варочаецца ў труне. Але не гэта яго цяпер утрымала. Бог з імі, снамі, перажыў бы. Сядзела ў сэрцы, як скабка, няскрутнае пачуццё непрыязі да Ігната Вяршылы. Чорт, незлапомны ж ён, Рыгор, па натуры, чаго толькі не дараваў людзям за сваё нека-

роткае жыццё: і знявагі, і здрады, і мярзоту, і нахабства; пераступаў праз гонар, пыху — і дараваў. Разумеў людзей, ведаў іх слабасці, апраўдваў заганы. Можа, таму, што ўпэўніўся: і сам небязгрэшны, нясоладка і з ім было камусьці, той жа Анюце. Канечне, кожны чалавек думае, што толькі ён чысценькі, а ўсе астатнія вакол — нягоднікі; думаў так і Аксютовіч, але не закалыхваў сябе, і калі жыццё плыло роўна, без перападаў, як бы знарок прыпісваў сабе неіснуючыя і памылкі, і дзёрзкасць, і няўступчывасць. Гэта трымала ягоную душу ў скрусе, і калі не ачышчала, то, факт, не давала ёй заплываць брудам, таіць злосць на людзей.

Ён не мог толькі нічога з сабою зрабіць, пераламаць сябе, калі думаў пра Вяршылу. Яны віталіся, размаўлялі, нават выраташалі разам такія-сякія справы, і наўрад ці можна было заўважыць між імі адчужанасць. Невядома, ці адчуваў гэта Вяршыла, а ён, Аксютовіч, адчуваў. Хоць бы ўжо праз тое, што не мог, як астатнім мужчынам, расказаць Вяршылу пра самае патаемнае, нават пад чаркаю. А ён з маленства не вадзіўся з тымі, з кім не было шчырасці, нешта ў душы пакідаў, не даверыўшы.

Ён добра помніць, калі і з-за чаго ўсё гэта пачалося.

* * *

...Сямёра баб цягнулі плуг. Рыгор, брыгадзір, ішоў за аратага. Не ішоў, лічы, стаяў, таптаўся на месцы, упіраўся ў тоўстыя драўляныя ручкі, падсабляў бабам. Ён бачыў, як вяроўка ўпівалася ў плячо Анютцы, цёрла шыю, выслізгвала з рук. Раз-пораз Анютка падала, але хуценька падхаплівалася, атрэпвала зямлю са спадніцы. Яму хацелася падысці, паспачуваць Анютцы, прыгалубіць, але саромеўся баб: панясуць плёткі. І ён цярпеў, абліваючыся потам.

У Пенькамоччы яны ўжо трэці дзень. Аруць поле пад ячмень. Услед за імі з жоўтай ліпавай сявенькаю на жываце брыдзе стары сівабароды Свірыдон. Ён заграбае прыгоршчаю зярняты, б'е ў гладкі бок сявенькі — і зярняты, як іскры, пырскаюць у розныя бакі.

Ядавіта-чорныя гракі сіпла крычаць, запускаюць доўгія белыя дзюбы ў мяккую раллю. Рыгор злуе на іх — яны падзяўбуць зярняты, і рунь узыдзе рэдкая.

Рыгор бачыць, што спіна ў Анюткі мокрая, да шыі

прыліплі чорнымі ніткамі валасы. «Яшчэ маладая, нецягучая...» — шкадуе Рыгор.

— Перадыхніце, бабачкі-ласачкі! — камандуе ён.

Бабы садзяцца на сухую, няворaную зямлю, моўчкі расціраюць намуленыя чырвоныя плечы, а ён бяжыць да чарады гракоў і махае рукамі.

— Халера іх спудзіць! — хмурачыся, кажа Свірыдон, выціраючы падалом спалавелай палатнянай кашулі твар.— Мусіць, чарвякоў яны...

— Няхай вунь туды ляцяць на спажыву,— ківае Рыгор на недалёкі лес, з краю якога пярэстымі ствaламі адсвечваюць бярозы, між якімі губляецца дарога ў вёску.

Раптам пачуўся трэск, і на дарогу спаміж бяроз выскачыў матацыкл. Ехаў старшыня сельсавета Ігнат Вяршыла. Дзеці выпаралі недзе ў ямінах ад бомб скурожаны нямецкі матацыкл з каляскаю, прыцягнулі ў вёску — Вяршыла падладзіў, падкляпаў і ўжо другі год ездзіць на ім.

Вяршыла прывёз у калясцы мяшок ячменю. Кіўнуў пальцам Рыгору, адвёў убок. Ён быў у вайсковай гімнасцёрцы, падпяразаны шырокім афіцэрскім рэменем з двума радамі часта прашчыкнутых дзірачак. Твар нахмураны.

Сэрца ў Рыгора застукала гулка, трывожна.

— Уш панімаеш, колькі засеяў? — спытаў па-змоўніцку, як не шэптам.

— Дзесяцін каля шасці... Бабы ёсць бабы.— Развёў рукамі і доўга іх не апускаў, як грак, які раздумвае, ляцець або не ляцець.

Вяршыла паварушыў пашчэнкамі.

— Малавата, уш панімаеш! Напішы мне ў зводцы — што пятнаццаць.

— Як? — не зразумеў Рыгор.— Усё поле не будзе столькі...

— Трэба, уш панімаеш.— Голас у Вяршылы пацвярдзеў: відаць, і праўда штосьці прыпякло старшыні.

Рыгор стаяў і, як вінаватае хлапчанё, плюскаў вачыма.

— Мы валім план па веснавой сяўбе,— насядаў Вяршыла.— А раён патрабуе, уш панімаеш.

Просьба для Рыгора была нечаканая. Ён не ведаў, як паводзіць сябе ў такіх выпадках, бо ніколі не падрабляў ніякіх папер, нічога не ўтойваў, ні ў чым не хлусіў

нават тады, калі разумеў, што яму будзе горай. Але ж тут прасіў не сябра і не хаўруснік, не выпадковы чалавек, а старшыня сельсавета, Ігнат Вяршыла, якога і ў вёсцы, і нават у раёне цанілі: вярнуўся з вайны старшым лейтэнантам, усе грудзі ў ордэнах і медалях. Роўных у акрузе, здаецца, яму не было.

— Разумею, але як я напішу...— разгублена прамовіў Рыгор, аглушаны прапановаю Вяршылы. Яму было і дзіка, і страшна. Сам ён раней і блізка не імкнуўся, каб дзесьці схібіць, падмазаць, скруціць. Вочы ў Вяршылы былі і порсткія, і лагодныя адначасна. Глянуўшы на іх, Рыгор утупіў свой позірк у зямлю, на свае босыя парэпаныя ногі.

— Уш панімаеш, табе нічога не пагражае... калі што якое,— пад'юджваў Вяршыла, убачыўшы, што Рыгор вагаецца.

«А я нічога не баюся! Страшней за нямецкі палон пекла не прыдумаеш»,— хацеў сказаць Рыгор, але не стаў вытыкаць сваё мінулае, што і так неадчэпна лезла ў думкі, не давала спакойна жыць. І яшчэ адну балячку садзіць на душу? Тады лепш у сіло, бо здурнець можна.

— Не ўмею я...— прамармытаў ён і ажно скрыпнуў зубамі ад прыкрасці за сябе, за сваю падатлівасць.

— Ды што тут умець? Чыркані пару слоўцаў, падпішыся, а пячатка вось.— Вяршыла дакрануўся да нагруднай кішэні, на якой унізе распаўзлася чарнільная пляма.

— Я гэтага рабіць не буду,— сказаў Рыгор і чамусьці пачырванеў. Яму было няёмка адмаўляць хоць і начальніку, але свайму вясковаму чалавеку, з якім да вайны разам хадзілі на вечарынкі.

— Падумай, уш-ш панімаеш,— сказаў Вяршыла і сцяў пашчэнкі. Абцягнуў гімнасцёрку, выпнуўшы жывоцік.

Рыгор думаў. І пакуль аралі, і тады, як ішоў з бабамі дахаты. Анютка, няўрымслівіца, мітусілася ў яго перад вачыма, круціла спадніцаю, а ён, як адаўбешаны, бязглузда лыпаў вейкамі. Дарога здалася кароткай, быццам і праўда, як у той казцы, яго перанёс вецер.

Сваю зажуранасць ён не змог схаваць і за вячэраю. Маці спытала, што ў яго за бяда. Ен скупа расказаў: не хацеў вярэдзіць мацеры сэрца, якое зрушыла ёй вайна, смерць бацькі.

— Напішы ты, мой татка, яму,— сказала маці, і го-

лас ейны задрыжаў. Сядзела на лаве, як старая знясіленая птушка, трымаючы глыбока ў падоле сашчэпленыя лёгенькія рукі. Ён адчуваў, маці перажывае за яго, баіцца, каб нязгода з Вяршылам не абярнулася якойнебудзь нядоляю. Удава, яна не магла яго абараніць, заступіцца. Каб не засмучаць мацеры, ён не сказаў усёй праўды, але сам намерыўся цвёрда: не набаўляць дзесяцін.

Назаўтра Вяршыла спытаў: «Ну, уш панімаеш, што ты там надумаўся?» Па вясёленька-скаклівым голасе можна было зразумець: у яго няма сумневу, што ён, Рыгор, саступіў. «Я не перадумаў»,— сказаў Рыгор з дзіўным, проста недарэчным адчуваннем, што робіць памылку, што Вяршыла запомніць ягоную зацятасць. «Э-эх! — крэкнуў Вяршыла, бліснуўшы бялкамі вачэй.— Калі б у вайну, я б цябе, уш-ш-ш панімаеш!..» — Штырхануў кулаком, плюнуў і пайшоў, уразаючы канты абцасаў у зямлю.

Рыгору было хоць воўкам вый. За якую такую няміласць боскую ён павінен цярпець?

* * *

Вечар быў цёплы, парны. Жаўтлявы маладзічок ліў цьмянае святло — паўз сцежку квола паблісквала лісце трыпутніку з белымі елачкамі жылак. Рыгор ішоў у клуб на партсход. Ён знарок не даганяў групку людзей, што галёкалі ўперадзе, каб на адзіноце перажываць, хваляваацца, думаць. Ён прывык да адзіноты ў лагеры, дзе рызыкоўна было паскардзіцца каму-небудзь, прапанаваць ці папрасіць. Анюта часта ўпікала яго, што ён маўчун і маруда. Гэта вонкава ён такі, а душа ў яго як мае быць: і крычыць, і лямантуе, і плача, і смяецца...

Пад бярозкаю ў кусціку сіўцу ён раптам згледзеў светлячка. Падняў яго, мякенькага, безабароннага, падобнага на бяскрылага сляпня, і чамусьці засунуў у карабок з-пад запалак.

Чырвонымі плямамі вокнаў вынырнуў з цемры клуб, і Рыгор забыўся на светлячка.

Апошнім на сход з'явіўся Ігнат Вяршыла. Начальнік, яму дазволена, у яго багата клопатаў. На парадку дня стаяла адзінае пытанне: прыём у партыю брыгадзіра Аксютовіча Рыгора Максімавіча. Сакратар партарганізацыі, нядаўна прысланы ў калгас па пуцёўцы райко-

ма, зачытаў заяву: «Прашу прыняць мяне ў члены Камуністычнай партыі, бо я хачу справядліва жыць». І яшчэ там былі словы: «Да партыі камуністаў у мяне вялікі давер». Сакратар палажыў заяву на стол — двайны аркуш з сярэдзіны сшытка — і спытаў у камуністаў, хто хоча сказаць пра Аксютовіча. У клубе зазвінела цішыня, ажно чуваць было, як у балоце за вёскаю вухае дзікі голуб: ву-ву, ву-ву... Быццам нямецкая «рама» ляціць.

Устаў Васіль Свірыдонаў, маленькі, смуглявы; праз увесь лоб у яго залёг глыбокі белы шрам,— адзін канец хаваўся ў валасах, другі ўтыкаўся ў чорнае, як намоклае грачынае пёрка, брыво. Гэты шрам, быццам і бяскрыўдны, прыносіў Васілю шмат мучэнняў: балела галава, міргала правае вока і мярцвела на холадзе правая рука. Крыўдней за ўсё было тое, што Васіля параніла ўжо ў Берліне, на сконе вайны.

— Што гаварыць, што тут гаварыць доўга... Нас праверыла вайна. Грышка не гультай, не пасядзіць. Жылы рве дай бог. Брыгадзір з яго, скажу, хвацкі. Жонка гаворыць, што бабы давольныя...

Лёгкі смех, як ветрык па сухім лісці, прашумеў па клубе.

Рыгор ажно сцяўся: пацвельванне гэтае яго нідзе не абміне. І, хваравіта насцярожаны, пачуў, як за спінаю хтосьці з мужчын прабубнеў: «А начальства ці давольнае?»

— Я даваў яму рэкамендацыю і ад сваіх слоў не адракаюся. Маю прапанову: прыняць безагаворачна.

Неяк рэзка, бы салдат перад генералам, ускочыў Ігнат Вяршыла. Засунуў пад рэмень пальцы, адвёў локці назад, сабраўшы за спінаю гімнасцёрку, абцягнуў з бакоў. Над рэменем кругленька выпнуўся жывот.

— Уш панімаеш, таварышы камуністы! Я не буду гаварыць тут, як працуе Аксютовіч... А дзе нашая пільнасць, уш панімаеш? Не трэба забываць, што таварыш Аксютовіч быў у палоне... І мы не знаем, чым ён там займаўся... уш-ш панімаеш.— Вяршылу няпроста было гаварыць, у яго дрыжалі вусны, і ён прыцінаў іх моцнымі жоўтымі зубамі.

Рыгор адчуў, як гарачая страла, бы куля, упілася ў сэрца: «Ну і гад жа! Бач, куды падкручвае...» Як праз заткнутыя ватаю вушы пачуў: «І пакуль, уш панімаеш, нашыя рады чыстыя, прапаную ўстрымацца ад прыёму

таварыша Аксютовіча Рыгора Максімавіча ў партыю».

З клуба Рыгор выскачыў як звар'яцелы, пабег у цемру, не разбіраючы, дзе дарога, дзе кусты, дзе плот, дзе балота з глыбокаю чорнаю прорваю. Кіпела душа ад крыўды, ад абразы, ад подлага ўдару: «Ён не ведае, што я ў палоне рабіў, гад! Пальцы свае ў бясцямнасці грыз ад голаду... Украінец адзін, Махайбарада, дзякуй богу, выратаваў — карміў вартавых аўчарак, дык прыносіў у кішэні костку. А так бы...» І ў палон ён не здаваўся, проста накрылі іх немцы пад Баранавічамі, сонных, знясіленых, у адрыне, зброю сабралі — і: «Хэндэ хох!»

Начная прахалода крыху астудзіла галаву. Нясцерпна захацелася курыць. Выняў з кішэні пачак «Беламору», адчыніў карабок з запалкамі і — аж злякнуўся: зеленаватая кропелька свяціла яму маленькай надзеяй.

* * *

...Гукі жалобнай музыкі аддаляліся, глушэлі. Рыгор адчуваў, што пачынае нервавацца, трывога назойліва пілуе душу. Адасобіцца ад усіх, пайсці насуперак натоўпу заўсёды неймаверна цяжка, далёка не кожны на такое здольны. Здаецца, не было раней волі і ў яго, але ж сёння скульсьці ўзялася. Праўда, перажываў. Можа, усё-такі варта было пайсці, скрышыць сваю зацятасць? Не зразумеюць многія, чаму гэта Рыгор Аксютовіч не быў на пахаванні. Не вораг жа яму Вяршыла. На той партсход ужо ўсе забылі, дый каму гэта ў галаве чужая бяда. А яму смылела, усё жыццё баліць той «адлуп». Чым жа ён сябе знясла віў, зганьбіў перад светам, каб гэтак падсекчы яго: «І пакуль, уш panімаеш, нашыя рады чыстыя...» Ні ён, ні бацькі ягоныя, простыя сяляне, нідзе ні ў чым не правініліся, ад працы не адлыньвалі. І ў вайну бацька галаву зложыў, маці пякла хлеб партызанам, мыла бялізну. Выходзіць, сам Вяршыла нячыста абышоўся з ім. Не ўпусціў момантy — ударыў па галаве тым страшным сталінскім загадам пад нумарам 270, які аб'яўляў усіх палонных здраднікамі. Ва ўсякім разе, яшчэ доўга пасля вайны было забаронена казаць добрае слова пра палонных. А калі начальнік гаворыць, усе павінны падпяваць ці маўчаць. Вось і не запярэчыў ніхто з камуністаў, і Ва-

сіль Свірыдонаў апусціў галаву — прагаласавалі «супраць». Рыгор цэлы год хадзіў учарнелы, схуднеў. Лес ыратаваў. Хадзіў у лес, наглядаў за птушкамі, кветкамі, кузуркамі ўсякімі. Лажыўся спаць — тады ў яго перад вачыма кружляў карагод з гэтых птушак, кветак ды кузурак, а змрочныя думкі адляталі. Праўда, далёка яны не залятаті, не-не дый вярталіся назад, як тое рэха ў лесе. Вярнуліся і цяпер...

Хата здавалася цеснай, Рыгор адчуваў сябе як бы ў клетцы. Яму перацінала дыханне, быццам ён доўга бег, па руках і нагах папоўз ледзяны холад. З акна светлай паловы хаты ён глянуў на вуліцу: машына з труною і людзі схаваліся за паваротам. Ён папіў вады і выткнуўся на двор. Там, седзячы ў цяньку пад сцяною, ён і дачакаўся Анюту. Яна была ў чорнай хустцы, белая ў твары.

Анюта недаверліва глянула на яго: гаварыла ж, куды іду, звала цябе. Яму нецярплівілася, карцела край хутчэй даведацца, як там і што было на могілках.

— Адзін ты і не быў, мабыць, усе людзі сабраліся,— сказала Анюта, але без папроку ў голасе: ведала, лепш чым хто, у якой лагодні яны з Вяршылам.— Гаварылі пра яго дужа... І з раёна чалавек, і пляменнік, Пятрок Мукамолаў, і дачка... Калі б не ён, гаварылі, то «не хадзілі б мы пад чыстым небам». Што такі ўжо чалавек улядельны...— Анюта змоўкла. Яна не насміхвалася, апавядаючы, проста пра ўсіх нябожчыкаў заўсёды кажуць толькі добрае. Хацела, каб і Рыгор ведаў, бо ён жа таксама быў на вайне, хоць і не меў ні ордэнаў, ні медалёў.

Рыгору кальнула ў сэрца: пра яго, калі памрэ, мабыць, так не скажуць. Можа, нават не ўспомняць, што і яго вайна не абмінула, праарала ў душы глыбокую баразну. Ён і цяпер пакутуе, не паранены і нічым не абдзелены. Чаму ўсё жыццё яму адгукаецца той палон? У чым яго віна? Чаму ён расплачваецца крывёю без віны? Бывалі хвіліны адчаю, калі дакараў лёс, што не даў яму загінуць у баі. Раз — і ўсе пакуты, і помнік памяці тваёй няхай бы ляпілі іншыя. Гэта лепш, чым самому яго ляпіць, калі кожны глядзіць на цябе з недаверам: захацеў...

«Можа, усё-ткі дарма не пайшоў на могілкі — было б лягчэй»,— дакараў сябе Рыгор, не ўпэўнены, што праўда за ім.

Ен пачаў ужо забываць гэты дзень, калі сустрэўся каля магазіна з Вяршылавай жонкаю. Яна першая абмовілася:

— А чым жа цябе ўгнявіў бедны нябожчычак, што ты адзін не быў на пахаванні? Ён жа пра цябе словачка дрэннага не сказаў.

— Мяне не было дома, я на ўколы ў бальніцу ездзіў,— зманіў Рыгор, каб Марыля не вельмі пераважывала, і сорам, як вар, абліў ягоную душу.

— Дык ба хоць на памінкі прыйшоў, пасядзеў з людзьмі...

Бач, не ўпусціла людское вока, што ён, Рыгор Аксютовіч, не апошні ў вёсцы мужчына, не прыйшоў развітацца з Вяршылам.

— Блага я пачуваўся ў той дзень,— і далей выкручваўся Рыгор, не могучы сказаць збедаванай Марылі праўды.

— Во так, во бачыш, якія людзі на свеце ёсць,— мармычучы і ківаючы сівой галавою, пайшла ад яго Марыля, маленькая, згорбленая, як камячок яшчэ аднаго дакору яму, і так змэнчанаму, пашматанаму жыццём.

Як і ў дзень пахавання Ігната Вяршылы, свяціла шчодрае для ўсяго жывога сонца, і пранізлівай яснасці паветра адкрывала вачам жытнёвае поле, што пералівалася жоўта-рудымі ценямі, лес, над якім кучаравымі ваўняна-белымі кудзелямі віселі воблакі.

Рыгор Аксютовіч у хвіліны тугі меў звычку глядзець удалеч. Ён тады забываў на ўсё, як бы выключаў сваю памяць, атрасаючы з душы накіп гарчэчы, пражытага, часам дробязнага, але неадчэпнага, што не давала яму вольна, як чалавеку, жыць.

# Стрэл у начным полі

Прачнуўшыся, Цішура з натугаю пачаў перабіраць у памяці ўчарашняе.

...Пасля нарады паехаў у горад. Там жыла ягоная сям'я. Дачка, праўда, вучылася ў Віцебску ў медінстытуце і прыязджала толькі на вакацыі ды зрэдчас — на святы. Нядаўна заявіла, што выходзіць замуж. Ні ён, ні жонка не запярэчылі, адно спыталі, што жадае ў падарунак, машыну ці каапертыўную кватэру. Яна, смеючыся, адказала: «І тое і другое». Жартаўліўкаю нарадзілася, з маленства ўсіх пацяшае. Сын — хлопец сур'ёзны, вучыцца ў дзесятым класе, захапіўся электронікаю. Цяперашнім светам дык проста золата, а не дзеці.

Жонка загадвае раённай бібліятэкаю; таксама не расчаравала за іх некароткае сумеснае жыццё. Не сказаць, што ва ўсім дагаджала яму, узносіла да нябёсаў, але — цуд! — лішне не лезла ў вочы. І тады, калі яго выбралі старшынёю калгаса, яна лёгка згадзілася з ягонай просьбаю не пераязджаць у вёску. Цяпер яны жывуць як бы паасобку. Праўда, ледзь не штодня ён бывае ў горадзе: то па службе, то самахоць, тады-сяды начуе дома.

У вёсцы ў яго таксама кватэра — два вялікія пакоі ў асабняку, у якім месцяцца яшчэ тры сям'і. А яму што: уваход асобны, кухня, ванная. Жонка колькісь разоў наведвалася, хваліла ягоныя пенаты, нават летавала ў іх.

Дык вось, прыехаўшы ў горад, ён пабываў на кватэры, пагаманіў з сынам, а потым пазваніў жонцы: «Лена, прывітанне! Ну, гэта я...» — «Як ты там?» — «Нармалёва. Сумую».— «І ёсць жа ў цябе час сумаваць».— «Адзін. Вакол чужыя людзі».— «Дзіму бачыў?» — «Бачыў. Відэакасеты круціць».— «Людачка пісьмо прысла-

ла. На Кастрычніцкія распісвацца будуць».— «Гарыць у іх там, ці што?» Пасля размовы з жонкаю дзеянні ягоныя былі рашучыя і ўпэўненыя. Узяў з халадзільніка пару слоікаў самаробнай дзіковай тушонкі, бляшанку афганскіх маслін і, канечне, тое, дзеля чаго ехаў,— прыпасы пораху і жаканаў.

Завярнуў на базар. Там была адзіная на райцэнтр крамка, у якой прадавалі гарэлку і віно. Чарга, як зазвычай, сабралася вялікая, людзі стаялі, сядзелі на лавах пад стрэхамі, проста на зямлі на мураўцы, у легкавіках і нават на калёсах. «На работу дык не хапае коней, а па гарэлку ехаць знаходзяцца»,— абурыўся Цішура. Ён вылез з «Нівы», задумаўся: не штурхацца ж яму тут, сярод людства. І часу шкада, і з начальства хто-небудзь скмеціць. Ён віхнуўся за крамку: «Белыя людзі бяруць з чорнага хода, а чорныя — з белага». Папрасіў азызлатварага знаёмага грузчыка Сямёна, каб клікнуў прадаўшчыцу. Ён добра ведаў яе з той пары, калі рабіў бухгалтарам у райпо. Яе звалі Раіса. Мажная, сінявокая, з белымі валасамі маладзіца. Яна падабалася яму, і ён прыходзіў да яе ў інтэрнат, дзе яна жыла да замуства. На мужа ёй не пашэнціла, бязбожна піў, і яна неўзабаве развялася, не захацеўшы мець ад яго дзяцей. Пазней нарадзіла дачку — па чутках, ад дырэктара музычнай школы, ужо ці не тройчы жанатага, але акуратнага, ветлівага, душэўнага мужчыны, на якога заглядвалася ўся жаночая палова райцэнтра. А там хто ведае, можа, і яго, Цішуру, павінна называць дзяўчынка татам.

— Каму там? — пачуў Цішура незадаволены Раісін голас і хуценька запхаў пад рэмень сінюю кашулю-безрукаўку, уцягнуў жывот. З-за груды скрынь выйшла Раіса — у белым халаце, з высока начасанымі валасамі, яркашчокая, бы лялька.

— Гэта я.— Цішура ступіў ёй насустрач і, аблапіўшы за стан, юрліва зазірнуў у вочы.— Ненаглядная, дапамажы атаварыцца.— Ён, не зважаючы на Сямёна, прыгарнуў яе да сябе, бо ведаў: жанчыне палесціць, што ён, вядомы ў раёне чалавек, такі прыязны да яе, простай прадаўшчыцы.

— Чаго хочаш? Давай хутчэй, людзі сцяну праламаюць...— Яна ў знак таго, што саступае і што не забыла ранейшыя заляцанні, дазволіла сабе вольнасць з ім.

Ён купіў скрыню гарэлкі і, падагнаўшы «Ніву» пад

самыя дзверы, паставіў у багажнік. Хацеў, але не паспеў цмокнуць Раісу ў расчырванелую, як жар, шчаку, бо тая бяжком пашыбавала да прылаўка. Але настрой яму гэта не сапсула. І з ёй, і з тою, на якую палажыў вока там, у вёсцы, усё яшчэ наперадзе. Падлівала ў сэрца радасці і паляванне. Дамовіліся з Антонам Храмянком паехаць на дзікоў. Дзіўна, што ён падсябрыўся да былога зэка. Другі, як кажуць, на гарматны выстрал не падпусціў бы, а ён, Цішура, захаўрусаваў з ім. Прыкінуць, дык нічога страшнага тут няма — навошта адрывацца ад народа. Падумаеш, чалавек аступіўся, з кім не бывае. Дый віны ў Храмянка вялікай няма: ячменю кузава загнаў сваяку на самагонку.

Прысмеркамі ён зазірнуў да Аксаны Пятрушы. Хат цяпер на вёсках пустуе дай божа, і калгас не пашкадаваў грошай, каб некалькі купіць. Для маладых спецыялістаў. У адной з такіх хат, наводшыбе, і жыла Аксана Пятруша, дырэктарка Дома культуры. Яе накіравалі сюды год назад. Дзяўчына нудзілася, ледзь трывала, каб не напісаць заяву і вярнуцца ў горад, дзе рэстараны, танцпляцоўкі, дыскатэкі. Тыя хлопцы, якія, адслужыўшы армію, засталіся ў калгасе, ёй не падабаліся. Яны былі грубыя, неахайныя і нахабныя. Зрэшты, яна не цнатліўка і не супроць нахабства, каб толькі было яно інтэлігентнае, тонкае, а не мядзведжае. Цішура трохі разбавіў ейны сум, вярнуў ёй цікавасць да жыцця, усмешку, скарацію ночы, пасеяў у душы радасць, няхай маленькую, але яе хапала, каб раніцаю ўставаць бадзёрай, з думкаю, што камусьці патрэбна. А калі не ў гэтым жаночае шчасце, то ў чым тады?

Аксана сядзела за сталом у сваім цёмна-вішнёвым халаце.

— Чаму не зашчапляешся? — Не пытаючы дазволу, як гаспадар, ён дастаў з саквояжа бутэльку, тушонку, масліны.

— Каму я тут патрэбна...— Яна ўсміхнулася са шчырай тужлівасцю.

Ён падышоў да яе, памкнуўся абняць, ды яна не далася, сціснула ягоныя рукі ў сябе на грудзях. Не хацеў у соты раз гаварыць надакучлівае «мне». Яе, разумную дзяўчыну, у рэшце рэшт гэты фальш мог раззлаваць. Так яны знерухомелі, можа, хвіліны на дзве, кожны думаў пра адно і тое ж, пра сваё месца ў заблытанай гульні, канца якой не было відаць. Яна

рэзка ўстала, адвёўшы ягоныя рукі праз галаву назад. Націснула клавішу магнітафона і пайшла на кухню. Цішура астаўся ў зале. Мікалай Гнацюк спяваў «Малінавы звон». Гэтая песня Цішуру падабалася, да шчымлівасці развярэджвала душу: уяўленне малявала расійскія прасторы, дарогу ў стэпе, конніка на ёй і чырвоны круг сонца на змглёным рудаватым небасхіле... Аднаго разу ён сказаў пра свае адчуванні Аксане, і яна, ведаючы, што ён прыйдзе, мабыць, наўмысна спыніла стужку на гэтай песні. Чуллівасць захліснула яму грудзі. Здавалася, такога прыемнага моманту ў жыцці болей не будзе.

Адале яны сядзелі за сталом на кухні, маленькімі крышталёвымі кілішкамі пілі гарэлку; у правай руцэ Аксаны дымілася цыгарэта, двума пальцамі левай яна брала са сподка зеленаватыя бліскучыя масліны, засяроджана жавала, а прадаўгаватыя, як фасоліны, костачкі выплёўвала на жоўтае металічнае вечка з-пад слоіка.

Цішура ўважліва глядзеў на яе, прыгожую, маладую, адукаваную, і сэрца заходзілася ад шкадобы: ён упадае за ёю, а знаць, забірае ў яе шанец сустрэць хлопца, халасцяка, які мог бы ажаніцца з ёю. І сам ён, замест таго каб дбаць пра калгас, думаць, як выйсці з прарыву, падняць ураджаі, траціць час на залёты, здраджвае жонцы, якая перажывае, што ён тут адзін, ненакормлены і неабагрэты.

Ён разумеў сваё незайздроснае становішча, але ўпэўненасць, што ягоная святасць і чысціня нікому не патрэбныя, нікім не будуць ацэнены, вельмі хутка адагнала ўсякія сумненні, і ён з лёгкасцю неймавернай, хлапчукоўскай нястрыманасцю хіліўся да Аксаны, дакранаўся вуснамі да яе гарачага, пакрытага пушком вуха... А праз нейкі час, збіўшыся з падліку выпітых кілішкаў, ён ужо не цяміў, якія словы шаптаў Аксане.

...Прыгадаўшы ўчарашняе, Цішура адчуў на душы цяжар — не дакору, а якойсьці зныблівай, прыкраватахалоднай тугі. Гэтага цяжару раней ён не адчуваў, выявіў яго ў сабе ўжо тут, у вёсцы, і не напачатку, а пасля таго, як зблізіўся з Аксанаю. Яму было хораша з ёю, і чым большую асалоду меў, тым мацней назаўтра ціснуў цяжар. Праца, старшынёўскія клопаты не дапамагалі яму пазбавіцца ад душэўнай няўтульнасці, і

толькі на паляванні ён пра ўсё забываў. Яны і згаворваліся з Антонам Храмянком сёння ўначы ехаць на дзікоў, але запазніўся ў Аксаны, узяў добрую чарку — якое паляванне? Няхай даруе чалавек, зразумее, што ў старшыні мора народу, а не толькі ён адзін, надзейны ад сваёй безвыходнасці.

Цішура ўстаў з ложка, зачыніў фортачку, каб не прахапіў скразняк. Махнуў рукамі, прысеў, але закалола ў патыліцу, і ён, баючыся, каб чаго не здарылася з галавою (нядаўна ягонага таварыша, зусім маладога, скасіў інсульт), не стаў рабіць зарадкі; падыбаў босы на кухню, паставіў на пліту ваду: кава на пахмелку лепш за бальзам.

Было зусім рана. Акно шарэла ад кропель расы. Сонца толькі-толькі паднялося, рассейвала нізкі белы туман яшчэ млявымі, халоднымі промнямі. У садзе за выганам трэнькаў драч, гучна, быццам пад прызбаю, незадаволена і злосна. Мабыць, яго сагналі з гнязда: у Саракавым ужо трэці дзень калгаснікі косяць канюшыну.

Увосень палётаў на «Ніве» сваёй па Саракавым. Храмянка за руль, а сам з акна ба-бэх па дзіку; у маі казулю загналі. Храмянок — жалезны мужык: «Звярну лыч, пушчу крывянку». Хоць і за начальніцкімі плячыма, але ўпэўненасці не адчувае. Чалавек не можа быць вольны, покуль ёсць магчымасць расквітацца з ім. І ў другі раз годам не адбрыкнешся, поўную катушку наматаюць. Уздыхнуў неяк: «А не ўляціць нам, звярну лыч, пушчу крывянку, за тое, што людзі сеялі, а мы вытоптваем?» — «Грэх на душу бярэм, канешне, але не па жывому топчамся, адрасце»,— адказаў ён наўмысна бадзёрым голасам.

Кава падвесяліла яго. Перад тым як ехаць у кантору, ён зазірнуў да Антона Храмянка на склад. Той нярэдка і начаваў там: прымаку, яму іншы раз мяшкі з жытам здаваліся цяплейшымі і мякчэйшымі за жончын бок.

— Ты не крыўдуй, Антоне, што падвёў,— ляпнуў ён Храмянка па плячы.— Закруціўся. Сёння гайсанём на дзікоў.

Храмянок з зарослым чорнай шчацінаю пляскатым тварам, у фуфайцы, белай ад мукі і павуціны, заморгаў вейкамі і, пакруціўшы доўгім носам, сказаў:

— Сянні ў Саракавым дакосяць канюшыну, звярну

лыч, пушчу крывянку. На голае поле дзікі наўрад ці сунуцца...

«Хайлук хайлуком, а галава прафесарская! — падумаў сам сабе Цішура, гледзячы на Храмянка з грэблівасцю і захапленнем адначасна.— Трэба ж помніць такое. Я сам не ведаю, калі яе, тую канюшыну, убяруць...»

Яго так уразіла Храмянкова кемлівасць, што ён доўга дакараў сябе за бязглуздасць і за тое, што не мае такой патрэбнай кіраўніку празорлівасці. А можа, ён свядома не хацеў глядзець далей заўтрашняга дня? Прынамсі, ягоных папярэднікаў гэта не вельмі бянтэжыла, і яны, здаецца, няблага пражылі на малінаўскай зямлі блаславёныя начальствам гады. Што можа ў нашым супярэчлівым, перавернутым дагары нагамі свеце адзін чалавек, нават калі ён разумны, сумленны, самаадданы? Нічога. У гэтым Цішура быў перакананы яшчэ са студэнцтва, калі яго, выдатніка, накіравалі ў глыбінку, з якой ён і цяпер не можа выбрацца.

І падчас нараду, і тады, як застаўся ў кабінеце самнасам, з галавы не ішла гэтая Храмянкова падказка: у Саракавым сёння дакосяць канюшыну. Ён не знаходзіў сабе месца і вельмі абрадаваўся, калі рыпнулі дзверы. «Зноў гасцявыя»,— так ён называў выпадковых наведнікаў.

Прыйшла старая. Ён не ведаў ейнага прозвішча, але, праязджаючы па вуліцы, не раз бачыў на лавачцы каля цёмнай пахілай хаціны з дзвюма белымі фанернымі шыбкамі ў акне.

— Здрасце, старшынька! — павіталася старая.

— Праходзь, бабуля,— ветліва запрасіў Цішура.

— Я не буду вас доўгенька тлуміць... Ета ж карову шчэ трымаю... Мне ўжо восьмы дзесятак, але трымаю. Касіць ужо не магу... Сена я прыйшла... Можа б, выпісалі. Летась Васіль Апанасенка перабіраўся ў раён, дык прадаў мне сваё сянцо. А сёлета нямаш...— Старая, хоць і з прыдыханнем, гаварыла безупыну.

«Ці языкастая бабуленцыя, ці перажывае,— падумаў, дэманструючы свае псіхалагічныя назіркі, Цішура.— Канечне, шкада старую, уважыць трэба. Хто ж ёй дапаможа?»

— А дзеці ёсць? — спытаў.

— Ёсцека. Сын. Ён далёка, у етым... як яго, еты горад? Забыла старая баба! — засмяялася.— Адзін

толькі сынок у мяне. Як чалавек мой у вайну паў, так я ўжо і жыла адна.

— Трэба выручыць,— сказаў Цішура хутчэй свайму ўнутранаму «я», чым старой.

— Во-во, любы дзетка...

— Я буду пытанне вырашаць, а ты, бабуля, недзе праз месяц падыдзі сюды. Дабро?

— За сенам? — разгубілася старая.

— За паперай, бабуля!

— Дык ці я паперай етай кароўку накармлю? — развяла рукі старая.

— Якая ты някемлівая, бабуля! — паўшчуваў Цішура.— Там будзе напісана, каб брыгадзір адмераў табе трыццаць сотак атаўкі.

— Атаўкі, глытаўкі...— Старая, бы малітву шэпчучы, патупала да дзвярэй. Глянуўшы на яе са спіны, ён раптам успомніў сваю маці, таксама ўжо не маладую: лічы, забыў яе, рэдка наведвае; дзякуй богу, і бацька жыве, удваіх кеўляюць патроху.

У кабінеце яму не сядзелася. Нахапіў на галаву капялюш і паруліў у Саракавое. Вялізная плаха канюшыннага поля была акаймавана дзвюма падковамі — лесу і балота. На ёй стракаталі дзве касілкі, каля іх марудна паўзлі трактары «Беларусь» з прычэпамі. Няскошанай заставалася паласа ад балота. Можа, метраў трыста-чатырыста шырыні.

Ён падкаціў да першай касілкі, вылез з машыны і, падняўшы руку, даў знак спыніцца. Другая касілка таксама спынілася. Не часта старшыня калгаса радуе трактарыстаў такою ўвагаю. Няйначай, штосьці здарылася.

— Як працуецца? — Ён павітаўся з кожным за руку, некаторым паціснуў локаць.

— Да абеду скосім,— сказаў высокі трактарыст з рыжымі брывамі і маленькімі чырвонымі, як журавіны, вочкамі.— Добры сілас будзе ўперамешку з лубінам. Праўда, дзікі панадзіліся... Дый, мусібыць, каровы паклычылі.

— Ага,— пацвердзіў каранасты, з шырокімі шчокамі і тоўстымі, як у ляшча, губамі дзяцюк.

У твар Цішура іх добра ведаў, а прозвішчы блытаў. Лагуцёнак, Тарасенка — хто з іх каторы?

— Малайцы! — пахваліў Цішура.— Стаўлю «пяць» і прашу вас пераязджаць на другое поле. Гэты лапік

канюшыны няхай застаецца... «Што тут сказаць?» — Для другіх патрэб.

Трактарысты пераглянуліся; начальства камандуе — яны выконваюць. А хто-кольвечы з іх нават абрадаваўся: пад маркаю пераезду можна скруціць паўдня, адскочыць па дровы ці ношку-другую сена на ўзлеску адкасіць. І Цішура, і трактарысты асталіся задаволеныя.

Ідучы да машыны, Цішура адчуваў, як стрыжакі канюшыны хрупаюць пад нагамі, і яму здавалася, быццам ён наступае на нешта жывое. Дзіўнае адчуванне ажно закалола ў мазгі, і ў ім прачнулася шкадаванне невядома каго і чаго. Няўжо вярнуўся ранішні цяжар тугі і зноў лёг на душу? Не, без палявання яму не абысціся.

Спаць ён уклаўся рана. Адвячорак толькі засінеў.

Яму прысніўся сон. Дзікі, ласі і ваўкі гоняцца за ім. Ён бяжыць па голым полі да лесу. Там ягонае выратаванне. Ён чуе ззаду звярыны роў, стук капытоў і кляцанне іклаў. Яго ахінае халодны жах, але ён упэўнены, што дабяжыць да лесу і ўскочыць на дрэва. Ён чалавек, разумная істота, канечне ж, пераможа дурных звяроў. Так і ёсць. Ён дабягае да лесу, перад ім сукаватая тоўстая бяроза, і ён спрытна, бы кот, залятае на яе... і — о госпадзі! — бяроза пачынае хіліцца да зямлі, як травіна. Ён вар'яцее ад страху: «Яна такая тоўстая, няўжо не вытрымае?» Унізе, б'ючы капытамі, шчэрачы іклы, бегаюць дзікі, ласі і ваўкі. Ён цаляе, каб скочыць на суседнюю сасну, і чуе, як трашчыць пад ім ствол бярозы... Ён разумее, што павінен разляпіць вочы, зараз жа, гэтую хвіліну. Інача амба: упадзе, і яго пашматуюць звяры. Павекі свінцовыя, бы на іх паклалі па жакану, але вялікім намаганнем ён расплюшчвае вочы...

Колькісь часу Цішура ляжаў нерухома, слухаючы, як грукоча ў грудзях сэрца, і трэск будзільніка на стале не можа заглушыць ягоных ударaў. «Ну і сон, ліха яго! Так і да інфаркту недалёка... Можа, не валачыся на гэтае дурное паляванне?» — засумняваўся ён.

Як і ўсякі чалавек, якога бог не абдзяліў ласкаю, ён быў прымхлівы і баяўся смерці. Запаліў настольную лямпу, глянуў на гадзіннік: было а палове другой. У дзве за вёскаю, на раз'ездзе дарог, яго будзе чакаць Антон Храмянок. Зноў яго падводзіць?

Шыбы вокнаў адлівалі бэзавай густой сінявою. На

дварэ плаваў морак: ноч была не вельмі цёмная, дзесьці высока ў небе зырчэлі зоркі. У галаве звінела. Дурнота — гэтае паляванне, злаваўся ён, пад'юджваючы сябе, падсцёбваючы паляўніцкае самалюбства. Быццам у бясцямнасці, ён напяў штармоўку, абуў гумавыя боты і выйшаў у ноч. Сцюдзёны ветрык ласкава прытуліўся да ягонага твару.

Ехаў, не ўключаючы фар.

Храмянок стаяў на краі дарогі пад елкаю. У руках трымаў складзены цэлафан — вялікія мяшкі. На поясе цьмяна паблісквала сякера.

Цішура адчыніў дзверцы. Храмянок гупнуўся на пярэдняе сядзенне.

— Светла,— сказаў ён са шкадаваннем, зацята гледзячы ўперад.

— Можа, вернемся? — шчыра, усур'ёз прапанаваў Цішура: трывога як засела ў грудзях пасля страхотнага сну, так і халадзіла да гэтага часу.

— Рыскнём, звярну лыч, пушчу крывянку! — ударыў па калене рукою Храмянок. Ён адным махам умеў адсекчы ў Цішуры ўсе сумненні, а тут не выпадала вяртацца з пустымі рукамі: дзічына ў хаце скончылася, і жонка пачала ўжо дапякаць яго, абзываць нахлебнікам. Гэта была каманда на папаўненне мясных прыпасаў. Горкая прымачая доля.— А вы, Сцяпанавіч, малайцом,— пахваліў Цішуру,— перапраўілі трактарыстаў на другое поле.

Цішура не мог цярпець ліслівасці дробных, няважкіх павагі людзей. Зусім іншае, калі лісліваць людзі, блізкія табе па рангу, не кажучы ўжо пра тых, якія стаяць вышэй і пра ліслівасць якіх можна толькі марыць. Ён уздыхнуў, паддаў газу. Машына кацілася лёгка, амаль нячутна, як шар: механік, ведаючы, што шэф сам ездзіць за рулём, штодня правяраў машыну. Зрэшты, гэтыя дзікі сталі нахабныя, як людзі, так асмялелі, што падпускаюць да сябе зусім блізка тэхніку. Распавядалі трактарысты, якія працавалі ўначы.

Яны ўз'ехалі на поле ў тым месцы, дзе стыкаюцца падковы — краі балота і лесу. Туды, віхляючы, вывела дарога. Вылезлі з машыны. Цішура трымаў у руках зачахлёную дубальтоўку. Вецер дзьмуў якраз з поля — дзікі не ўчуюць. У лесе здурнела галасіў пугач: «у-ху-ху!», «у-ху-ху!».

Храмянок пагробся на дубок — глянуць, у якім мес-

цы пасуцца на полі дзікі. Спрытна, як вуж, саслізнуў уніз.

— Ёсць! — узрадавана прашаптаў і пацёр рукі, ажно тыя зарыпелі, бы качаны капусты.

Цішура ўжо злажыў дубальтоўку і загнаў у абодва ствалы па жакану.

Над полем вісеў спакойны, строгі, як лязо, месяц. Скошаная паласа была светлая, бялелася, адсвечвала, як палатно, а тая, што засталася няскошанай, слалася чорнаю, бы асфальт, стужкаю, канца якой не было відаць, ён зліваўся з балотам.

— Садзіся за руль, паехалі! — скамандаваў Цішура і адчуў, што ад хвалявання зводзіць сківіцы. Ён адчыніў правыя дзверцы, уставіў у паз спецыяльную распорку,— каб не зачыняліся.

Спачатку ехалі ціха, машына паўзла няўклюдна, як чарапаха, пускала белы дымок, які, абганяючы, плыў паўз акно.

— Давай! — зноў падаў каманду Цішура. Машына тарганулася, як бы ўдыхнуўшы ў сябе паветра, і паляцела па полі туды, дзе чорнымі кучкамі віднеўся статак дзікоў. Цішура ведаў, покуль дзікі ачухаюцца, разбяруцца, што да чаго, скуль чакаць небяспеку і куды бегчы, яны параўняюцца з імі, і можна будзе паліць дуплетам. Храмянок быў умелы вадзіцель, з вялікім вопытам язды па лясах і палях, і Цішура мог смела, не асцерагаючыся, сачыць за дзікамі.

Дзікі, пачуўшы машыну, заламалі да лесу, збіваючыся кучней. Мабыць, яны недаацанілі небяспеку ці не разлічвалі, што яна так хутка наблізіцца, бо калі машына параўнялася з імі, да іх было не больш паўсотні метраў.

Цішура яшчэ зводдалі намеціў сабе ахвяру — падсвінка, які, трохі адстаўшы, пароўся лычам у зямлі. І як толькі Храмянок прытармазіў — націснуў на абодва куркі, лічы, адначасна. Бліснула блакітнае, як доўгі шар, полымя — і вочы мяккаю лапаю закрыла чарната. У гэтае імгненне Цішуру здалося, што ён сам кудысьці знік, няма яго, засталася толькі думка, што быў такі на свеце чалавек — Цішура.

Дзікі шуганулі да лесу, за адну секунду выпалі з поля зроку, і Цішура, выскачыўшы з машыны, убачыў, што ў канюшыне б'ецца і вішчыць на ўсё поле

подсвінак. Храмянок першы дабег да яго і ўдарыў два разы абухом па галаве.

— Снайперскі выстрал, звярну лыч, пушчу крывянку! — захікаў Храмянок, калі падбег Цішура.— Акурат у пазванок... Але ж і крычаў, ажно ў вушах і цяпер звініць.

У Цішуры сэрца білася так, што здавалася, ягоныя ўдары чуюць навакольныя вёскі. Самы страх у яго заўсёды пачынаўся тады, калі дзічына мёртвая ляжала на зямлі: цяпер не дакажаш, што выпадкова апынуўся тут, у полі, што збіўся з дарогі, што сапсавалася машына. Яму ўспомнілася Аксана, да болю крыўдна было, што не нацешыўся ўволю яе маладым каханнем. То раптам станавілася шкода сябе, дзяцей, жонку... Мала, што сам зняславіўся, дык і ім будзе ганьба, калі выкрыюцца ягоныя штучкі. Ён ведаў, што ўсё непрыстойнае, чорнае ў чалавеку рана ці позна вылазіць напаверх, але бралася скульсьці ўпэўненасць, што якраз з ім такога не здарыцца, бо заўтра ж раніцаю ён парве з усімі ганебнымі прывычкамі. І назаўтра ён сапраўды адчуваў у сабе шчырую цвёрдасць парваць. Але мінаў дзень, тыдзень, і ён не мог знайсці сабе месца, нябачны вораг, які сядзеў у падсвядомасці, уладна загадваў яму, прагнуў асалоды. І тады Цішура казаў сабе: «Ну, усё, д'ябал пабяры, сёння апошні раз!» Такіх «апошніх разоў» у яго набралася багата, як на канторскіх лічыльніках костачак. Прадаеш сумленне толькі раз, а торг за яго вядзеш потым усё жыццё.

Подсвінак быў чорны, як і канюшына, толькі шчацінкі на хібе жоўта бліскалі, як саломіны. Храмянок, нахіліўшыся над ім, успорваў нажом шкуру, саладжава прыцмокваў: «Тлусценькі япручок, звярну лыч, пушчу крывянку!..» — тыцкаў пальцам у сцягняк.

Цішура не ведаў, куды прычаліць рукі, стаяў, думаючы, што ягоны самы лепшы ўдзел у свежаванні — не замінаць Храмянку, чыёй хвацкасці ўжо не раз зайздросціў. Стоячы, ён першы і ўбачыў, што ў лесе, на той дарозе, па якой і яны ехалі, таямніча бліснулі агеньчыкі.

# ЖУРБА

Я б узяў матыку ў рукі,
Карчаваў бы, чысціў поле,
Але — там... Я тут бязрукі,
Я бяссільны... Я без волі.

АЛЕСЬ ГАРУН

Я ездзіў у вёску па радасць, цяпер еxаў туды, як на пахаванне. Вёску маю засыпала смертаносная радыяцыя. Я раней мала ведаў і задумваўся, што такое радыяцыя, які яе ўплыў на жывое. Але трывога міжволі запаўзала ў душу, прыгнятала: няма чысціні! У лесе, у полі, на лузе, каля рэчкі, а менавіта неадольнае жаданне пахадзіць па сцежках маленства заўсёды напаўняла сэрца салодкай, радаснай і прыемнай шчымлівасцю.

Турбота расла яшчэ і з таго, што еxаў я ў вёску з сямігадовым сынам. Да дзяцей гэтая радыяцыя асабліва бязлітасная. А які большы клопат можа быць у бацькоў, калі не клопат пра свайго нашчадка? Самі ўжо як-небудзь, а дзіця павінна расці здаровым, цягнуць далей нітку роду, пераліваць беларускую кроў у наступныя пакаленні.

Мы дамовіліся са старэйшым братам Жэнем, што і ён наведае вёску. Якраз ён пазваніў напярэдадні і сказаў, што выязджае і што прыхапу з сабою рэнтгенаметр. У ягоным голасе і блізка не было заклапочанасці ці трывогі, і рэнтгенаметр гэты ён вёз хутчэй дзеля забавы, чым дзеля перасцярогі.

У Мінску мы з сынам селі ранічкаю і меркавалі гадзін каля трох быць на паваротцы. Калі чакаеш сустрэчы з чымсьці незвычайным, час цягнецца пачарапашы марудна. Смаліла чэрвеньскае сонца, было горача. У прачыненае акно ўрываўся вецер і калашмаціў жоўтую штору. Сын адхіляў яе, засоўваў у спецыяльны зачэп, але яна вырывалася, бы крыло дужай птушкі, замінала глядзець. За акном аўтобуса прабягалі вёскі з машынамі, трактарамі, стажкамі сена, кучамі дроў каля хат, чароды аднакава пярэстых

калгасных кароў, маленькія і вялікія рэчкі, азёры, бяскрайнія прасторы зажаўцелай ужо збажыны, сады з маленькімі зялёнымі шарыкамі яблыкаў.

Гэты свет быў мне блізкі, знаёмы. Ён быў — мой. Я імкнуўся зацікавіць ім і сына, паказваючы то навязанае на вяроўку цяля, то магніева-белыя сянажныя вежы каля фермаў, то прытоенага пад кустом рыбака на беразе рачулкі.

Асабліва пільна я навастрыў зрок, калі перасеклі мяжу свайго раёна. Ну, як там зямля, лес, поле, луг? Ці змянілася што? Не. Усё па колеры, па выгляду, па месцы ў свеце было ранейшае. Нічога не панавілася. Заві ці не заві штучна радасць — не прыйдзе. Неба маёй радасці наглуха зацягнулі чорныя хмары чарнобыльскай бяды.

Ад шашы ішлі па дарозе, якая вяла па жыце. Каласы і пясок пад нагамі шапацелі неяк жалобна-прыцішана. Ныраючы, ляцела над светлым жытам чорная жаўна з чырвонай плямкаю на галаве. Прыгадалася пысінскае: «Мне ў жыта хочацца ўвайсці, мне вечнасцю здаецца жыта...»

— Дзяцей вывезлі адсюлека пад Магілёў, а вы сваіх прывезлі...— сустрэла нас маці і радасна, і з дакорам. Яна шчыра пацалавала ўнука.— Як ты ўжо вырас, Дзімачка... Ну што ў вас тамака ў Мінску кажуць пра радыяцыю? — спытала ў мяне з надзеяй пачуць ісціну.

— Нічога пэўнага не кажуць...— Я і праўда мала ведаў пра гэтую радыяцыю. Чуткі хадзілі ўсякія, аж такія, што Мінск збіраліся высяляць, ужо былі падрыхтаваны эшалоны.

Брат са сваім сынам Ігарком прыехаў на пару гадзін раней. Ён ужо паспеў «вывесці» радыяцыю добрай чаркаю і быў бестурботна-вясёлы.

— Усё нармалёва, я замяраў,— сказаў ён безапеляцыйным голасам.

Я папрасіў у яго рэнтгенаметр. Ён прынёс ладнаваты ёмкі прыборчык у чорным бліскучым футарале. Дастаў з яго і прыладзіў гладкую металічную качулку, якою трэба дакранацца там, дзе хочаш зрабіць замер. Мне было цікава. Я ўзяў прыборчык, пачаў яго вывучаць.

— Сама больш на двары, на страсе, а ў хаце на падаконніку.

Я шчоўкнуў кнопкаю «рэжым», перавёў дыяпазон

на мілірэнтгены і паднёс качулку да падаконніка. Стрэлка за шкельцам зварухнулася.

— Нуль пяць мілірэнтгена ў гадзіну,— сказаў брат.— Нармалёва!..

Ён, ваенны, ракетчык, падумаў я, і не такія дозы прымаў. Што яму нейкія там дзесятыя, сотыя долі. Для мяне ж гэтая радыяцыя была штука новая, а таму і цікавая, і трывожная, і загадкавая, і небяспечная. Яе трэба было спасцігаць.

— Заўтра на рыбу, Віктар,— сказаў брат.— Чарвякоў мы з Ігарам ужо накапалі...

— Якая вам рыба! — запярэчыла маці.— У лесе ды на беразе, кажуць, сама больш гэтай заразы.

— Нармалёва...— ужо ў каторы раз супакоіў усіх брат, выхаваны ў непрыязі да панікі. Ён і ў Мінск званіў з месца службы адразу пасля аварыі і казаў, што ніякай пагрозы здароўю няма. Але ў многіх раёнах Гомельшчыны і Магілёўшчыны трывога і нявер'е не спадалі, раслі. Цяжарных жанчын, дзяцей эвакуіравалі з небяспечных зон, якіх павялічылася пасля таго, як пайшоў погалас, што над паўднёва-ўсходняй часткаю Магілёўшчыны «расстралялі» з гармат радыеактыўныя хмары.

— Я таксама з табою,— папрасіўся сын.

— І я,— захныкаў Ігарок.

— Цыц! — сказаў брат.— Мы раненька ўстанем.

— А можа, няхай...— Мне па ранейшай звычцы хацелася і сына вывесці на прыроду, у лес, на рэчку, паказаць яму кветку, жука, след на пяску, птушку, рыбіну. Да жывога ў яго, здаецца, была цікаўнасць.

Спаць з сынам мы леглі ў верандзе. Я доўга не мог заснуць. І не толькі праз камароў. Непакоіла, расло адчуванне, што ў лёсе, у гісторыі, у народзе адбылося ўзрушэнне, якое пераверне свет, ад якога пачне адлік новы погляд на жыццё, на чалавека, на ўзаемаадносіны людзей і краін.

Прачнуўся рана. Ледзь засвятleліся вокны, і чорнымі кроплямі на іх застыла раса. Ядрана трэнькаў на балоце каля стаўка нястомны драч. У гэтай птушкі голас заўсёды незадаволены і якісьці злосны. Толькі ластаўкі легкадумна цвіргаталі на правадах пад страхою. І ў нейкае імгненне мне здалося, што я ў дзяцінстве, радасны і бесклапотны, а бяда, няшчасце мне няйначай прысніліся. Зараз я ўсхаплюся з ложка і забуду на

іх. А ў наступную ноч мне прысніцца прыемны сон: луг у красках, сіняя вада ці штосьці такое.

Уставаць не хацелася — адчуваў у целе млявасць. Перажываў за сына: ці варта яго браць? Колькі трэба той радыяцыі кволаму дзіцячаму арганізму, каб зачахнуць. Але ж і не вазьмі — будзе нудзіцца, румзаць, капрызіць. Можа, і абыдзецца: мы доўга не будзем.

Ляжаў, покуль не прыйшоў брат. Ён ужо апрануўся.

— Уставай, Віктар. Дзяцей будзіць? Возьмем з сабою рэнтгенаметр, замераем каля Сожа.

Хвілін праз дзесяць мы выйшлі з хаты. На клёне не варушыўся ніводны ліст. У небе сярод зорак вісела празрыстая пласцінка месяца.

На вуліцы нас нечакана асвяцілі фары машыны, якая вынырнула з завулка. Спыніўся «ўазік» з вялікімі белымі літарамі на дзверцах: ВАІ. У мяне замерла сэрца: «Няўжо тэрмінова спатрэбіўся брат?..» Да нас падбег прапаршчык з апухлым тварам, мяшкамі пад вачыма.

— Вы часам два «ўазікі» ваенныя не бачылі?

— Не,— адказаў брат.— Праўда, мы толькі ўсталі.

— Паступілі звесткі, што іх засеклі ў раёне вашай Маліна́ўкі.

— Мы нічога не чулі,— пацвердзіў я.

— Тады трэба ехаць на Слаўгарад,— сказаў прапаршчык.

— Месца ёсць? Падкіньце да шашы.— Брат адчуў сябе ў сваёй — ваеннай — стыхіі.

— Сядайце. На рыбу?

У машыне сядзеў хударлявы капітан. Баранку круціў вясёлы белабрысы салдат.

— Укралі? — спытаў брат, павярнуўшыся да капітана.

— Так,— кіўнуў той.

— У мяне ў дывізіёне летась салдат з аўтаматам збег,— даў зразумець брат, што і ён вайсковец.

— Цяпер гэта часта здараецца,— абыякавым голасам прамовіў прапаршчык.— Нікога не ўкакошыў, злавілі?

— Школьніцу згвалціў... Злавілі ў цягніку, пераапранутага ўжо.

На шашы мы вылезлі. Далей пайшлі пехатою — вясёлыя ад таго, што падфарціла так хутка пераадолець паўтара кіламетра.

Над канюшынаю, што расла праваруч паўз дарогу, вісеў шчыльнай завесаю туман, а між ім і верхам канюшыны праслойка пустаты — чыстага, як бы адфільтраванага паветра. Дзіўна, чаму туман не апускаецца да самае зямлі?

Дарога была чорная ад вільгаці. На ёй за ноч наблыталі слядоў зайцы. І за намі заставаліся белыя адбіткі, як прапаленыя дзіркі ў чорным палатне. У гэтых белых дзірках убачыўся мне сімвал трывогі. На далёкім лясным хутары, які называлі Пугачоўшчына, затрубіла карова.

Ручча — альхова-крушынавую балацявіну, праз якую цякла шыракаватая канава,— мы перайшлі па кладзі. Пад гэтай кладдзю калісь адзін наш аднавясковец голымі рукамі налавіў мяшок шчупакоў.

Нам стала яшчэ весялей. Ад Ручча да Сожа рукою падаць. Увачавідкі святлела. Ажыў лес, напоўніўся трэлямі, шматгалоссем птушак. Паспрабуй разбярыся, дзе якая спявае. Няўжо яны, маленькія маэстра, не адчулі яшчэ страшэннай пагрозы, якая навісла над усім на зямлі? Колькі ж ім трэба пажыць, каб набраць смяротную дозу? Чалавек ведае, што за пагроза, як ратавацца, а птушка, звер, расліна? Хто іх выратуе, захавае, папярэдзіць? А можа, тут не выпала радыяцыя, раз яны так расспяваліся?

— Давай, Жэня, замераем,— прапанаваў я брату. Ён незадаволеным голасам адказаў:

— На ранішні жор спознімся! Бачыш, разаднелася...

Таксама праўду кажа, падумаў я.

— Хлопцы, жвавей! — крыкнуў я, азірнуўшыся: нашы сыны адсталі на добрую трэць вярсты.

Сосны стаялі ў суровай маўклівасці, закамянела. Толькі на адной шуршэла, мабыць, вавёрка.

І Сож сустрэў нас маўкліва. Ён быў ухутаны ў густую, непраглядную пару, адно пры самым беразе яна была празрыстая.

Мы дапалі на сваё ўлюбёнае з дзіцячых гадоў месца — да Крынічкі. Пад вялізнай вольхаю з незапамятных часоў бруіла крынічка. Вада ў ёй была чыстая, як сляза, і халодная; яна цякла па раўчуку ў Сож, звонка цурчэла. На калку каля крынічкі заўсёды вісела нейкая пасудзіна, часцей звычайная бутэлька. Людзі пілі ваду — касцы, грыбнікі, рыбаловы. Улетку сюды з'язджа-

лася шмат падарожнікаў з Масквы, Ленінграда, Кіева. Пасля іх заставаліся кастрышчы ды выбітая пад палаткамі зямля. Цяпер тут не было ні адной жывой душы, толькі скакалі па змятай траве маленькія чорныя жабкі.

Помніцца, раней бераг быў чысты, голы — кідай сабе вуду і не азірайся па баках. Цяпер яго заглушылі кусты лазы, маліннiку, асака, парасоны дзягілю. Як усё-ткі нага чалавека прыдушвае, марнуе прыроду, падумалася мне. Прырода не любіць гвалту, любіць волю. Як яна ачомаецца ад гэтае напасці — радыяцыі?

Сонца прыўзнялося над далёкім дубняком, каля якога была вёска Крамянка, і лёгенькім бляскам узяліся пры беразе краі альховага лісця, быццам на іх адзелі футаральчыкі з фольгі. Сонная бронзавая лютка на кончыку сагнутай асачыны расправіла доўгія і вузенькія, бы запалкі, крылы, спяшаючыся абсушыць іх у першых промнях. А куды ёй спяшацца, спытаць бы? У галодны рот язю ці галаўню?

Мы разматвалі вуды; закінулі донкі — у закабане, абціснутым з двух бакоў вялізнымі, як стагі, кустамі лазы. Яны стаялі быццам на пене — так раскашоўвалі белай тугой квеценню зараснікі ажыны.

Хлопцы нашы раз за разам выцягвалі вуды, ашукваючыся хуткай плынню ракі.

Я стаяў на высокім кліне, які ўразаўся ў ваду, і з яго мне шырока і далёка бачылася наваколле.

Там-сям, але не відно — дзе, плёскала хвастом рыба. З усходам сонца яна заўсёды ажыўляецца.

Уцягнуўшы доўгую шыю так, што яна прагнулася ўніз кальцом, праляцела ўсцяж па рацэ шэрая чапля. Несла сваю вострую, бы піка, дзюбу важна, з годнасцю, як пераможца.

Першы ладнага акунька падцяў брат. Гэта надало ўсім нам паляўнічага азарту, якога чамусьці не адчувалася, але не радасці. Хоць вакол нас была дабрыня невымоўная. Не верылася, не прымала душа, што ва ўсё гэта ўварваўся вораг бязлітасны і каварны праз сваю нябачнасць. Толькі халодны металічны прыбор у чорным бліскучым футарале мог яго выявіць.

Я ўзяў з рукзака рэнтгенаметр, наладзіў яго. Правёў качулкаю над травою, і стрэлка пад запацелым шкельцам запаўзла далей, чым звычайна: нуль сем мілірэнтгена ў гадзіну.

— Нармалёва,— сказаў брат і кінуў у ваду недакурак.

— А як наша рыба? — Я апусціў качулку на трэць у раку.— Дзіўна: амаль нічога не паказвае.

— Так што юшка будзе чыстая,— з яшчэ большай бесклапотнасцю сказаў брат. Сонца асвятляла яго змарнелы, няголены твар.

— Тата, рыбка! — У сына на кручку трапяталася, бліскала плотка.

— Малайцом,— пахваліў я сына.

Туман над Сожам рассейваўся, плыў тонкай павуцінкаю і амаль не зыбаўся. Ажывіліся пры самым беразе вадзяныя даўганожкі — цень ад іх на чыстым пясчаным дне мітусіўся чорнымі плямкамі.

Затраскатаў на тым баку Сожа, пад Крамянкаю, трактар. Гэта — касілка, на якой працуе Масляк. Чалавек ён нетутэйшы, прыехаў аднекуль у нашу вёску. Працавіты і сумленны, але пасля аварыі пачаў лайдачыць: два разы аб'едзе, трактар паставіць у арэшніку і ловіць рыбу ўвесь дзень. «Навошта мне глытаць гэты радыеактыўны пыл»,— кажа, і ніхто яго не прымушае і не асуджае. Паводле ягоных слоў, рыбы ў Сожы прыбавілася, бо раней «дачнікі высцёбвалі ёй вочы». На панцак за дзень Масляк з сынам-пяцікласнікам налоўлівалі цэлую торбу.

Рыба і праўда клявала, бы здурнелая. Як жа я засмуціўся, калі ў мяне сышоў лешч фунтаў на шэсць. Я падцягнуў яго ўжо да самага берага, але не даў глытнуць паветра, пасля чаго лешч на колькі секунд абмірае, і ён, забушаваўшы хвастом, ажно закіпела пена, рвануў у глыбіню.

Сярэдзінаю Сожа на малых абаротах пратарахцела маторка. У ёй сядзеў мужчына ў фуфайцы і трымаў, прыціскаючы каленам да борта, спінінг.

— Ці клюе? — галёкнуў ён.

Я паказаў вялікі палец.

Сонца ўжо прыпякала як мае быць. Навалілася стома. Цяжэла галава, і рэзалі, як засыпаныя пяском, вочы. Прыціхлі і дзеці. Яны ўжо не лавілі, а сядзелі пад кустом на разасланай куртцы.

Раптам зусім непадалёку я ўбачыў на вадзе качку з вывадкам рабенькіх пухавічкоў. Яны, як мячыкі, плылі за асцярожнай, настрыненай матуляю.

— Глядзіце!..— прашаптаў я.

— Што там? — падхапіліся дзеці.

Качка трывожна кракнула, прыпынілася і нечакана павярнула назад, хоць была ўжо далей сярэдзіны Сожа. Ад яе і качанят разбягаліся чорныя лініі хвалек. Мяне здзівіла, чаму качка не паплыла на той бераг, дзе яе чакалі зараснікі аеру. Што за інстынкт у яе спрацаваў, бо мы ж, людзі, на гэтым беразе ўяўлялі для яе небяспеку? Прырода спрэс на загадках.

— Рулюем і мы дахаты,— скамандаваў весела я, хоць камандаваць па сваім прызванні павінен быў брат.

Вярталіся другой, карацейшай дарогаю — па тэлефоннай лініі. Натужна стагналі правады. Раса абмывала з нашага абутку прыбярэжны пясок. Там-сям на палянках было чырвона ад суніц. Што за ягады — буйныя, цёмна-барвовыя, самі просяцца ў рот. Да чаго дажыліся! Нельга есці... Ды як утрымацца, шматгадовы чалавечы інстынкт перасіліў — па некалькі ўкінулі ў рот. Не верылася, хоць забі, што яны нясуць хваробу, а не здароўе. Жоўтую купку дабраполю апанавалі чорныя земляныя чмялі — мабыць, дзесьці паблізу было іх гняздо; яны гулі, басілі, пералятаі з кветкі на кветку, часам нападалі адзін на аднаго, адганялі. Больш міралюбна паводзілі сябе каля ліловых званкоў чорныя вялікія, з жоўтаю аблямоўкаю на краі крылаў матылі, якіх маці, помніцца, называла жалобніцамі. Скуль іх столькі набралася на гэтую тэлефонную лінію?

Каля самае шашы пад лізе́ртам пасвіліся каровы з нашай вёскі. Чыя ж гэта сёння радоўка? Я пазнаў Міколу Малеценкава. Па другі бок чарады бялелася хустка ягонай жонкі Наталлі. Мы вучыліся ў школе разам з іх сынамі.

А ўвечары цётка Наталля нечакана завітала да нас.

— Жэнечка,— вохкаючы, звярнулася да брата,— змерай-ка ты мне радзіяцыю... Ета ж пахадзіла па лесе за каровамі, дык во дзярэ ў горле, як таркаю...— Яна глядзела сумнымі вачыма, была белая з твару.— У Чарнобылі, кажуць, пачкамі дзеткі паміраюць. Не ў бальніцы, а так... Ідзе і брык.

Брат узяў рэнтгенаметр, павадзіў у цёткі Наталлі каля шыі.

— Нармалёва. Агульны фон паказвае. Лішняга вы не набралі,— супакоіў ён.

Вестка пра чарнобыльскіх дзяцей напалохала маці.

Яна дрыжала за нас з братам маленькіх, цяпер — за ўнукаў.

— Едзьце вы, хлопцы, назад, а то яшчэ...— Маці гладзіла па галоўцы майго сына.— Нешта ён звяў зусім. Заўтра во збірайцеся і едзьце. Людскіх жа дзяцей паадкамандзіравалі. Пінчуковых дзевак не ўзялі, вошы ў валасах знайшлі, дык Паліна папёрла іх да сястры ажно ў Валгаград. Які гэта воддых, калі думаеш, што цябе есць гэтая радыяцыя...

Божа!.. Маці гаварыла праўду. Я першы раз у жыцці, прыехаўшы ў вёску, быў сам не свой. Усё і ўсе адчуванні былі не тымі, якімі помніліся, да якіх прагла і якімі напаўнялася мая душа.

Людзі жылі, жыла прырода, але нават само паветра, здавалася, было наэлектрызавана набліжэннем страшнай бяды. Прыцемкамі, вылезшы з-за развітальнага стала, я выйшаў праз вясніцы на агарод. Над сядзібамі пластаўся дзіўны жаўтаваты туман. Заўсёды тужлівае перапёлчына «піць-пабіць» разрывала сэрца смуткам і няўцешнасцю. Каго «пабіць»?

Назаўтра ўчатырох мы выехалі на Мінск, пакінуўшы вёску, але не перастаўшы з болем думаць пра яе.

# ЗМЕСТ

## АПОВЕСЦІ

Распусная, або Дзяўчына з начной кавярні

4

Насустрач твайму сэрцу

38

## АПАВЯДАННІ

Белая ружа

223

Чалавек з гармонікам

232

Рэха

238

Стрэл у начным полі

247

Журба

258

Літаратурна-мастацкае выданне

РУБАНАЎ Уладзіслаў Якаўлевіч

ДЗЯЎЧЫНА
З НАЧНОЙ
КАВЯРНІ

Аповесці, апавяданні

Рэдактар *Я. І. Хвалей*
Мастацкі рэдактар *В. А. Макаранка*
Тэхнічны рэдактар *Г. Ф. Дуброўская*
Карэктар *Д. Р. Лосік*

Здадзена ў набор 06.01.93. Падпісана да друку 07.02.94. Фармат 84×108 1/32. Папера друкарская. Гарнітура Школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 14,28. Ум. фарб.-адб. 14,28. Ул.-выд. арк. 14,65. Тыраж 1500 экз. Зак. 5.

Выдавецтва «Юнацтва» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 7. 220600, Мінск, Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

**Рубанаў У.**

Р82 Дзяўчына з начной кавярні: Аповесці. Апавяданні: Для ст. шк. узросту / Мастак А. В. Дзмітрыеў. Мн.: Юнацтва, 1994.— 267 с., іл.

ISBN 5-7880-0882-4.

У сваёй новай кнізе пісьменнік вядзе шчырую гаворку пра моладзь. Аповесць «Распусная» — пра лёс наркаманкі, якую імкнецца выратаваць сямейны мужчына, і сам трапляе ў незайздросную сітуацыю. У жанры дэтэктыва пададзены раскайванні маладой мацi-забойцы («Белая ружа»). Супярэчнасці між абавязкам і сумленнем, трагічнае каханне да хворай дзяўчыны — праз гэтыя выпрабаванні пройдзе чытач разам з героем аповесці «Насустрач твайму сэрцу».

Р $\frac{8820600000-058}{М\ 307(03)-94}$ 56—94

ББК 84(4 Беи)6

**Мінск**
**«Юнацтва»**
**1994**

**КНІГІ ДЛЯ СТАРЭЙШАГА ШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ**

*Л. Дайнека*
ЧАЛАВЕК З БРЫЛЬЯНТАВЫМ СЭРЦАМ
*Прыгодніцка-фантастычны раман*

*М. Качан*
АПАЛЕНЫ РАНАК
*Аповесць*

*А. Якімовіч*
ПАСТКА ДЛЯ ПЯРЭВАРАТНЯ
*Аповесці*

**Мінск**
**«Юнацтва»**
**1994**

## КНІГІ ДЛЯ СТАРЭЙШАГА ШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

СЛАЎНЫ СЫН БЕЛАРУСІ

*Зборнік твораў пра Ф. Скарыну*

А ЧАСУ БОЛЬШ,
ЧЫМ ВЕЧНАСЦЬ

*Творы пісьменнікаў беларускага замежжа*

СУЧАСНАЯ
БЕЛАРУСКАЯ П'ЕСА

*Зборнік*

Уладзіслаў Рубанаў

# ДЗЯЎЧЫНА З НАЧНОЙ КАВЯРНІ